АНДРУСЬ ГОРВАТ · РАДЗІВА <ПРУДОК>



дзённік

## Раздзел 1

# Мемуары дворніка



# 2013 год

## ЛІСТАПАД

•

Хачу быць дворнікам.

•

Ноччу сасніў Ганну Чарнушку з «Людзей на балоце». У сне мы цалаваліся, і Ганна нават паказала мне калена.

Калена Чарнушкі – от сапраўдны беларускі эратычны сон.

•

Ганна пайшла за багацея Яўхіма, а я хадзіў на суразмоўе ў гандлёвы цэнтр «Карона». І такое адчуванне, што я прасіўся да іх не дворнікам, а дырэктарам мяснога аддзела.

– Мы вам перезвоним, – кажуць.

Ага, так я і паверыў. Убачылі дыплом журналіста і спужаліся.

•

Дворнік Купалаўскага тэатра зарабляе два мільёны. Дворнік Галоўпаштамта – два з паловай. Дворнік камерцыйнай установы – тры. Дворнік гандлёвага цэнтра «Карона» – чатыры.

Чым болей для душы, тым меней для кішэні.

У тэатры пацікавіліся, ці валодаю я беларускай мовай. У астатніх месцах – ці п'ю.

Пайшоў на каву да Машы. Заадно паеў. Маша кажа, што дворнічаць за грошы – гэта дурны тон. І што ўсе прыстойныя фрыкі працавалі дворнікамі. І што Чарнушка б ухваліла.

То добра.

•

У тэатры ёсць свая легенда – бабуля, якая працавала дворнічыхай паўстагоддзя. Цэлыя пяцьдзясят гадоў!

Начальніца аддзела кадраў паведаміла, што ёй неаднойчы прапаноўвалі іншую пасаду, на прыступку вышэй. Але бабуля адмаўлялася. Куды тая дворнічыха падзелася і калі ўсё гэта адбывалася, ніхто не змог узгадаць.

•

Засталося прайсці медкамісію, і ў маёй працоўнай кніжцы з'явіцца новы запіс.

•

Сусед знізу, Алег, пытае:

– Ты яшчэ на волі?

Нечакана я стаў мясцовым аўтарытэтам. Тры дні таму нейкі крыміналіст хадзіў па пад'ездзе і выпытваў, як я выглядаю, як сябе паводжу, з кім жыву. Не ведаю, што ён ад мяне хацеў, але сусед стаў паважаць мяне яшчэ болей.

Летась я хадзіў да псіхатэрапеўткі Леры. Яна вучыла мяне выказваць затоеную агрэсію. Потым я пераехаў сюды, пазнаёміўся з Алегам, і мяне прарвала. Ужо год мінуў, а ён дагэтуль апасліва пазірае на мяне.

Алег адзіны, хто са мной вітаецца. Калі выходжу пакурыць на балкон, ён крычыць мне:

– Прывет, сусед!

Ён цэлымі днямі бадзяецца па двары і зазірае ў вокны.

Праз дзесяць-пятнаццаць гадоў я стану такім, як Алег, – непатрэбным чалавекам.

•

Сёння не зачыніў балконныя дзверы, і кот Рома скочыў за голубам, але не ўтрымаўся і паляцеў уніз. Калі Ромка мінаў другі паверх, учапіўся кіпцюрамі за балкон.

Хто ведае замову ад спуду? Для трыццацігадовага мужчыны.

Пайшоў да Алега па Ромку, убачыў, што Алегаў ложак знаходзіцца там, дзе мой. Цяпер кожны раз, як лягу спаць, буду думаць, што пада мною ляжыць тое, чым я не хачу стаць. Часам чую ягоны храп ці як ён варочаецца ў сне. Гэта вельмі страшна. Гэта адзінае, чаго я баюся да ўсрачкі, – калі самая нежаданая будучыня ўвесь час нагадвае пра сябе.

•

Я дворнік!

•

Першы працоўны дзень. Працаваў у малінавых джынсах, бо тэатральныя порткі былі такія вялізныя, што туды можна ўсунуць дзесяць мяне.

У малінавых джынсах і з зялёнай мятлою я самы модны дворнік!

•

Раней я думаў, што галоўныя людзі ў тэатры – рэжысёры і акцёры. Але не. Папраўдзе самая галоўная тут аканомка Іосіфаўна. Яна бландзінка, падобная да Мэрылін Манро. Але, ну, такая – беларуская Манро. Добрая і клапатлівая. Месцамі нават занадта.

•

Электрык папрасіў паказаць яму рукі. Я паказаў.

– І ты з такімі рукамі прыйшоў працаваць дворнікам?! Ідзі, хлопча, займіся чым-небудзь іншым. Не смяшы мае дыёды.

•

Нядаўна ехаў у метро і глядзеў на твары людзей з вышэйшай адукацыяй. Кожны другі – пляменнік Бога. Астатнія – такое ўражанне – увесь час бегаюць, збіраюць паперкі, каб пацвердзіць, што і яны ягоныя пляменнікі. У тым самым метро сядзелі два прасценькія мужыкі. Яны былі шчаслівыя, бо весела і шчыра варушылі сваімі вусамі. І калі вышэйшая адукацыя пазбаўляе права весела варушыць вусамі – ну яе к чорту.

У майго бацькі таксама ёсць вусы. Ён, палкоўнік, калі мне было пятнаццаць і я ганарыўся сваймі дасягненнямі ў раённай газеце, казаў мне:

– Будзь прасцейшым, і да цябе пацягнуцца людзі.

•

Самае складанае ў дворнікавым жыцці – прачынацца тады, калі вельмі зручна класціся спаць.

## СНЕЖАНЬ

•

Калі выпадае першы снег, у дворнікаў выпростваюцца спіны. Гэтыя ўвесь год незаўважныя людзі цяпер глядзяць не долу, як учора, а ў самыя вочы кожнаму стрэчнаму.

Акрамя сваёй патрэбнасці, у гэты дзень я адчуў мышцы недзе паміж плячыма і грудзьмі. Яны так балелі, што я ледзьве змог зняць куртку з вешалкі ў сваёй каморы.

Дадому вяртаўся знявечаны. У метро на пытанне міліцыянта:

– Дзе працуеш?

Адказаў:

– У Купалаўскім тэатры.

І ён адчапіўся.

Напэўна, да смерці будзе думаць, што купалаўцы выглядаюць так.

•

Сёння электрык ізноў папрасіў паказаць яму рукі.

– Во, гэта ўжо рукі дворніка! Віншую!

А я гляджу на іх і не ведаю, ці то радавацца, ці то плакаць. Такімі рукамі ўжо непрыстойна дакранацца да жанчыны – толькі да рыдлёўкі.

Толькі да рыдлёўкі.

•

Маці па тэлефоне расказала чарговую сямейную сенсацыю: быццам вобраз Ганны Чарнушкі з «Людзей на балоце» Мележ спісаў са Сцепы – сястры маёй прабабкі Ёўгі.

От табе, прабабка, і Юр'еў дзень! А я цалаваўся з ёю ў сне. Гэта ж псіхалагічная траўма! Трэба схадзіць да Леры. Лера любіць слухаць мае эратычныя сны.

•

Учора прачытаў у Адама Багдановіча: «Если несущій воду встрѣчаетъ кого нибудь идущаго по дѣлу, то высказываетъ нѣчто въ родѣ привѣтствія: «съ поунымъ цябе!» и ему отвѣчаютъ: «дзякуй», т.е. благодарю».

А сёння (праз сто дваццаць гадоў!) іду сабе па тэатры з вядром солі, а насустрач шпацыруюць дзве прыбіральшчыцы.

Адна другой:

– З поўным цябе!

– Дзякуй.

•

На батарэі сохнуць мае шкарпэткі, якія я памыў пасля працы. Я ўяўляю сабе ўвесь такі акадэмічны тэатр, дзе ставяць «Паўлінку» і «Пінскую шляхту». Тэатр, які назвалі ў гонар не кагосьці там, а самога Янкі Купалы. І шкарпэткі, купленыя ў ЦУМе за дванаццаць тысяч рублёў. Тэатр Купалы – мае шкарпэткі. Тэатр – шкарпэткі. Гэтая думка мяне непакоіць.

Ідуць такія кітайскія турысты. А экскурсавод кажа:

– А цяпер у тэатры ў сто чатырнаццатым пакоі на батарэі сохнуць шкарпэткі дворніка Горвата.

А яны такія (па-кітайску, вядома):

– Нічога сабе!

•

Атрымаў першы заробак – 773 200 рублёў!

Гэта сапраўднае багацце, бо кожны рубель зароблены мазалямі і сваркамі з прэзідэнцкімі дворнічыхамі.

•

Пасля працы звычайна заходжу ў букіністычны аддзел «Белкнігі», палюю на «Караля Стаха». Сёння таго «Стаха» ізноў не было, затое патрымаў у руках часопіс «Вясёлка» за 1990 год.

Уявіце, у 1990 годзе наклад «Вясёлкі» быў 180 000 асобнікаў. 180 000 асобнікаў часопіса для дзяцей на беларускай мове! Як усё змянілася ўсяго за дваццаць тры гады!

Я памятаю іншы часопіс – студзеньскі нумар «Вожыка» за 1988 год. Мне тады толькі споўнілася пяць гадоў. На вуліцы вельмі сцюдзёна, мама хварэе. Я на падлозе гартаю часопіс. Ведаю ўсе літары, але чытаць не ўмею: не магу зразумець прынцып чытання. І раптам бачу два словы: «каляндар вожыка». Не літары, а словы цалкам!

Гэта першыя два словы, якія я прачытаў сам!

•

А сёння амаль пяць гадоў маёй дачцэ.
– Тата, дзе мой асёл?
– Які асёл?
– Ну асёл. Такая фея.
– Фея-асёл?
– Ага. Дзе мая фея-асёл?
Паказваю асла: «Іа-іа».
– Такі асёл?
– Не, не такі.
Варвара адводзіць рукі за спіну і лётае па пакоі.
– Вось які.
Гляджу і чашу патыліцу. Ага – анёл!

•

Сёння быў вельмі прыемны вечар: галерэя «Ў», кнігарня «Логвінаў», прэзентацыя пятага нумара часопіса «Макулатура», дзе адзінае, што я пабачыў, – правае вуха Марціновіча, бо людзей, ахвотных чытаць беларускую прозу, было занадта многа, каб пабачыць два Марціновічавы вухі.

Потым шпацыраваў па Мінску і глядзеў, як у цемры цалуюцца неадзінокія людзі.

•

Цікава, а ў маім узросце яшчэ рэальна закахацца, ці гэта ўсё – фініта ля камедыя? Хто-небудзь ведае дакладна?

•

Мой калега Пятро вучыў мяне спакушаць жанчын. Усё проста – запісвайце: трэба пры сустрэчы здымаць капялюш.

– У вас, мабыць, увесь тэатр – палюбоўніцы? – цікаўлюся.

– А то! Калі нада ксеракопію зрабіць, ніхто не адмаўляе. Мне не цяжка зняць шляпу, а жанчыне прыемна. Разумееш?

Разумею, разумею. Трэба спешна набыць капялюш, бо здымаць капюшон пры сустрэчы з жанчынай у дворнікавай справе, як высветлілася, лічыцца mauvais ton.

Даўней Пятро вучыў мяне, дзе солі сыпаць паболей, калі галалёд:

– Не шкадуй, бо будзе скакаць козачка – яна ж не разумее, што можна пакаўзнуцца і ўпасці. Сып, не шкадуй. Хай смела скача.

Козачкі на абцасіках, асцярожней там, за межамі Купалаўскага тэатра. Мы з Пятром яшчэ пільнуем вашыя жыцці, але нашых паўнамоцтваў мала, каб вы скакалі па ўсім горадзе.

•

Сёння, пакуль я прыбіраў, з боку Адміністрацыі прэзідэнта да мяне падышла цётачка і сказала:

– Я за вами давно наблюдаю.

Опанькі, падумаў я, прыехалі. А я Вольскага ў навушніках слухаю. Чамусьці найперш падумаў, што справа ў гэтым. Зараз мяне арыштуюць і застрэляць.

– Вы не хотели бы работать ТАМ?

Я ўсё жыццё буду ганарыцца, што адмовіўся працаваць у Адміністрацыі прэзідэнта на карысць тэатра імя Янкі Купалы.

## 2014 год

### СТУДЗЕНЬ

•

Мне 31. Віншую вас, Андрусік Іванавіч. Можаце задзьмуць свечку.

•

У мяне ёсць бутэлька каньяку, але піць не буду. Пайду спаць: ну яго к чорту, той алкагалізм у адзіноце.

•

Апошні раз так, як учора, я напіваўся ў верасні з расійцамі пад Адэсай. Нараніцу яны расказалі, што ў пэўны момант я перайшоў на беларускую мову, і ўсё, што яны змаглі зразумець, – гэта слова «маскалі».

Ат, папаўзу я ў тэатр. Сёння хоць падобны да нармальнага дворніка. Каб толькі нікога не сустрэць.

•

Як у тым анекдоце, сустрэў усіх. Іосіфаўна сказала, што я смешны. Але на «Пана Тадэвуша» мне паставяць дадатковае крэсла.

Атрымаў заробак і пайшоў не апахмяліцца, а ў кнігарню. На ўсе грошы купіў кніг. Нават «Дзікае паляванне» ўхапіў. Толькі ў Купалаўскім тэатры ёсць такі дворнік. Культура!

•

Пакуль сур'ёзныя журналісты абсмоктваюць скандал пра сцяг з выявай «Пагоні» ў «Пане Тадэвушы», я раскажу вам свежыя плёткі.

– Як вам спектакль? – выпытвае купалаўская вахцёрка. – Мне вельмі спадабаўся! Такія дэкарацыі, такія эфекты! А ў фінале – гэта ж згарэў Мірскі замак, вы гэта зразумелі? Я чайнік паставіла. Будзеце чай?

Не ведаю, які там замак згарэў, мо і сапраўды Мірскі (а я, невук, усё думаў, што гэта метафара), але люблю сваю працу за тое, што вахцёрка і дворнік могуць от так, па-свойску, абмеркаваць апошнія культурніцкія падзеі.

## ЛЮТЫ

•

Мяне аштрафавалі за курэнне на тэрыторыі метрапалітэна. От вам і культура. Унеслі ў сшытак «Доставленные». Цяпер я – «доставленный».

Міліцыянтка заўважыла бранзалецік-вышыванку на руцэ.

– Бандэравец?

– Купалавец.

Нешта я зусім псую рэпутацыю купалаўцам. Трэба казаць, што я купалавец, толькі калі выношу дзяцей з полымя. А калі куру на тэрыторыі метрапалітэна, лепей казаць, што я дворнік з Адміністрацыі.

•

Вахцёр учыніў несанкцыяваную акцыю: усім даваў па цукерцы. Таму сёння тэатр пачынаўся не з вешалкі, а з усмешак і «вой, дзя-я-я-куй». Я на ўсялякі выпадак сваю цукерку прыхаваў у кішэні. Калі заўтра ўсе выйдуць на працу жывымі, тады і з'ем.

•

Прыехалі да мяне паляшучкі пажыць на час сесіі. Яны ўвесь час ядуць. А калі не ядуць, размаўляюць пра ежу.

Гляджу на пражэрлівасць палескіх дзевак і бачу за акном не мінскія хрушчоўкі, а запруду, зарослую кураслепам і дзядамі. А ў хаце баба Ганна ўчыніла кіслыя аладкі, насмажыла сала.

Паляшучкі прывезлі мне маё палескае дзяцінства.

•

Узгадаў гісторыю пра боршч.

Бацькі пасварыліся. Тата застаўся жыць у гарадской кватэры, маці паехала ў вясковую хату. Першыя тры-чатыры тыдні яны дэманстравалі адно аднаму, што шчаслівыя самі па сабе. Калі стала халодна, маці троху засумавала, бо працы паменела, адзіноты паболела. Бацька стаў ніякавець: схуднеў і пасівеў. Было заўважна, што ім надакучыла халасцяцкае жыццё, але зрабіць першы крок да прыяднання не маглі. Тады маці ўжыла забаронены прыём: перадала бацьку слоік з баршчом. Маўляў, засталося, не свінням жа выліваць. Калі гэты наркатычны сродак трапіў у бацькаву кроў, да прыяднання засталіся хвіліны.

•

АААА! Мая дачка сказала першае слова па-беларуску – «дзякуй».

Я ёй: «Спі, я цябе люблю». А яна такая: «Дзякуй».

•

Сёння напісаў тры звароты ў дзяржаўныя ўстановы наконт зменаў у законы «Аб мовах» і «Аб назвах геаграфічных аб'ектаў». Мне гэты працэс спадабаўся. Таму я падумаў і напісаў яшчэ ліст з падзякай фабрыцы «Сонца» за пральны парашок «Мара».

Цяпер я дакладна не баюся старэць: я ведаю, як бавіць час на пенсіі, калі буду дзедам.

•

Свайго дзеда я ніколі не бачыў, ніколі не сядзеў у яго на каленях.



У 1931 годзе, у чатырнаццацігадовым узросце, ён быў «признан виновным в том, что являлся участником контрреволюционной повстанческой организации».

А я ў трыццаць адзін прыбіраю смецце.

От як!

### САКАВІК

•

Хто-небудзь мо збіраецца неўзабаве ехаць у бок Палесся і потым вярнуцца ў Мінск? Патрэбна жменя роднай зямлі.

•

Для мяне тэлефонныя размовы з мамай – гэта як чытаць «Беларусь у фантастычных апавяданнях», толькі тыя гісторыі, якія Баршчэўскі не паспеў сабраць.

Сёння пачуў гісторыю, як мая баба Ганна пасварылася са сваёй свякрухай – маёй прабабкай Ёўгай. І прабабка зашаптала бабуліну карову. Карова перастала даваць малако. Мая бабуля паехала да сваёй цёткі ў Боруск, тая зрабіла процітруту: зашаптала хлеб для каровы і наказала бабулі адзін дзень нікому нічога не даваць, хто б ні прасіў.

Як толькі карова атрымала антыдот, бабу Ёўгу пачало круціць – месца сабе не знаходзіла.

Прыйшла да маёй бабкі:

– Ганно, дай хлеба.

– Не дам. Карову лячу, нікому нічога сёння не даю.

– Ат, што ты ўздумала! Мы ж амаль у адной хаце жывем, – і сама ўзяла хлебную лусту.

Карова ноччу здохла.

### КРАСАВІК

•

Усё, я цалкам шчаслівы, бо ў мяне ёсць паўкіло палескай зямлі. Яна пахне хвоямі. Калі я хачу дадому, я высыпаю зямлю на газетку і станаўлюся на яе басаногам. Заплюшчваю вочы і чую Прыпяць.

Зямлю мне перадала маці. Каб патлумачыць, навошта яна мне, прыдумаў гісторыю пра тое, што маім сябрам-біёлагам трэба зрабіць аналіз палескай глебы.

•

З маёй чароўнай палескай зямлі ва ўсе бакі лезуць палескія казяўкі. Не паспяваю кідаць іх на клумбу. Цяпер не толькі я тут палеская навалач.

## ТРАВЕНЬ

•

Адных толькі заробкаў дворніка мне не хапае. Сёння быў мой першы працоўны дзень у жаночым манастыры.

•

Вельмі складана расказваць пра сваю новую працу, бо амаль немагчыма размежаваць, дзе шчырыя пачуцці, а з чаго можна кпіць.

От сёння ў суседнім кабінеце працяглы час адбываўся канфлікт, а мае каляжанкі запалілі свечкі і ціхенька маліліся, каб канфлікт хутка скончыўся. Я не разумею, як да гэтага ставіцца. Жыццё, дзе ёсць смецце і аканомка Іосіфаўна, нашмат прасцейшае. Заўтра а сёмай раніцы я буду сядзець у сваёй тэатральнай каморы на падлозе, піць кефір і думаць, як ставіцца да таго, што манашкі ў фоташопе апрацоўваюць выявы Хрыста. І ці правільна падчас працы слухаць беларускія аўдыякнігі, пакуль знаходзішся ў эпіцэнтры расійскай культуры.

•

У манастыры падчас малебну я разглядаў ногі каляжанкі Евы.
Цудоўна, што ў манастыр дзяўчынам забараняецца надзяваць порткі.
Прасці, Госпадзі.

•

Дзе ў Мінску набыць жывую лаванду? Ева любіць лаванду.

•

У галаве адна Ева. Сёння не захацеў ісці на працу.

Я кажу:

– Іосіфаўна, у мяне тэмпература трыццаць восем, як у Турцыі.

А яна мне:

– Ну і мужыкі пайшлі! З тэмпературай трыццаць восем не могуць выйсці на працу!

Бляха, ну і аканомкі пайшлі! Усё, мне не сорамна за гэты падман пра тэмпературу. І гэта не завод – гэта тэатр, дзе тонкая душэўная арганізацыя ёсць нават у швабры.

Манастырская дырэктарка на просьбу не выходзіць сёння адказала:

– Задзёўб ужо, Андрушка.

Усіх я задзёўб.

•

Ева расчулілася ад лаванды. Цікава, як яна адрэагуе на тое, што з раніцы я дворнік і корпаюся ў смецці? Дзяўчаты, як вы рэагуеце на тое, што вашыя хлопцы корпаюцца ў смецці?

## ЧЭРВЕНЬ

•

Мне падабаецца штодня мыць галаву не дома, а ў Купалаўскім тэатры. Я нашу ў заплечніку шампунь і пасля прыбірання тэрыторыі мыю валасы ў сваім цесным пакойчыку над рукамыйнікам. Гэтая дробязь надае ўсяму майму жыццю пах бясконцых вандровак. Потым хаваю мокрыя валасы пад капялюш, і, пакуль даязджаю да манастыра, яны высыхаюць. А ў манастыры слухаю Лявона Вольскага і назіраю, як манашка ў навушніках робіць мантаж фільма пра бацюшку. Простыя словы. Простыя з'явы.

Сказаў Еве, што я дворнік. Яна зноў расчулілася.

•

Не, адназначна, у мяне ў галаве каша. Тэатр, манастыр, Ева...

На днях паеду ў Каленкавічы, потым у Польшчу. Буду глядзець у акно цягніка і думаць сваю кашу.

•

Каленкавічы – гэта вялікая вёска. Пад ліхтаром у цемры сумуюць без працы дзве прастытуткі – сапраўдныя, у парыках і з вялікімі грудзямі. Як у фільмах Альмадовара. Побач двое міліцыянтаў шукаюць мінакоў без флікераў. Знайшлі мяне, узрадаваліся.

Знайшлі б лепей прастытутак – усім было б добра. Там ужо і флікер няма куды чапляць.

•

Як жа я блізенька да таго месца, дзе прывязаны да гэтай планеты!

Сэрца енчыць: «Едзь у Прудок! Едзь у дзедаву хату!».

У 1931 годзе майго прадзеда Андрэя з сям'ёй саслалі на руднікі. Праз два гады ён збег і вярнуўся назад. Яго хату ўжо прыстасавалі пад сельскую школу, таму ён тры гады бадзяўся па суседзях. Бадзяўся-бадзяўся, яго ізноў саслалі. Болей ён не вярнуўся. Памёр няведама дзе і калі. Аднак у Прудок вярнуўся мой дзед і пабудаваў там хату. Сёння яна паціху разбураецца. А што, калі...

•

– Алё, прывет. Мама, дай што скажу.

– Грошы скончыліся?

– Не. А хто жыве ў дзедавай хаце?

– У якой хаце? У Прудку?

– Ага.

– Нашто табе?

– Ай, проста скажы.

– Табе ўжо тая хата трэба!

– Ну, проста скажы, жыве хто ці не.

– Што ты ўжо прыдумаў, а? Сядзі ў Мінску і не дуры галаву.

– А хата тая яшчэ хоць стаіць?

•

Даслаў эсэмэску Еве: «Я ў Прудку. Тут лес маўчыць. Сяджу пад ігрушай, гляджу на расу ў павуцінні».

Ева зноў расчулілася.

•

Гэта ўжо не той двор, якім я яго запомніў. Ён зарос смеццем, акацыяй і дзікімі слівамі. Студня ўвалілася, і вада схавалася пад тоўстым слоем гнілых дошак. Зніклі прыбудовы. Няма лазні, куратніка, няма хлява і дрывотні.

Болей няма дзедавай майстэрні. А я яшчэ помню вялікі варштат пад маленькім акенцам. Я ніколі не бачыў дзеда. Але ўвесь час думаў, што ён жыве ў майстэрні. Калі я лазіў па дзедавых шуфлядах з інструментамі, мама казала:

– Асцярожна, нічога не паламай, бо дзед рассердзіцца.

Болей няма ні тых шуфлядаў, ні сталоў, ні майстэрні, ні дзеда.

Вокны ў хаце забіты дошкамі. А калісь, помню, паміж шыбамі ляжала сіняя вата. І віселі такія белыя фіранкі з узорам, які ўтваралі дзіркі, абшытыя ніткамі. Як жа яны называліся? Ат, ужо не помню.

У меншым пакоі, дзе стаіць груба, ляжак з трубой упаў на столь, і бэлька храснула пасярэдзіне і абрынулася на падлогу разам з столлю, цаглінкамі і пяском.

Хата, якую збудаваў дзед, разбураецца. Я хаджу па ёй у даражэнных беластоцкіх ботах.

Вясной па Птушыным Шляху разам з журавамі я вярнуся на Палессе і буду тут жыць.

Не ўсё ж жыццё быць дворнікам!

А Іосіфаўна скажа:

– Што за мужыкі пайшлі – за трыста кіламетраў не могуць ездзіць на працу.

•

Пазычыў у доні прылады для малявання і раблю ўяўны рамонт у хаце. У сталовай-кухні не будзе столі, а па рыпучай драўлянай лесвіцы адтуль можна будзе трапіць на другі паверх у адзін пакой.

## ЛІПЕНЬ

•

Я от што падумаў. Чаму б мне не стаць сталяром, як дзед? Падумаў – і пайшоў у манастырскую сталярню запісвацца чаляднікам.

А яны мне такія:

– Калі ласка.

Мой нос учуяў пах пілавіння і шэпча мне: галоўнае ў жыцці – навучыцца рабіць табурэтку. Галоўнае ў жыцці – навучыцца рабіць стол. Галоўнае ў жыцці – навучыцца рабіць простыя рэчы.

А я сваёй арт-дырэктарцы такі:

– Не хачу быць дызайнерам, хачу быць сталяром.

Мая арт-дырэктарка мне такая:

– Заўдзёўб ты мяне, Андрушка.

Я ёй такі:

– Я ж рознабаковая асоба.

Яна мне такая:

– Пагаворым у аўторак.

Я ёй такі:

– Пагаворым у аўторак.

Уяўны рамонт працягваецца. У кухні ўжо квяцістае сонечнае святло падае на табурэтку, зробленую сваімі рукамі.

•

Сёння трапіў у закрыты музей старажытнабеларускай культуры ў Акадэміі навук.

Па-сапраўднаму маё сэрца ёкнула ля інструментаў і прыладаў. Нацягіч, зачэртач, скобля, шаршэрка, шпунтоўнік, струг... Як бы я хацеў пачуць гэтыя словы ў сапраўдным жыцці:

– Жонка, ты не бачыла маю шаршэрку? Яна ляжала ля шпунтоўніка, а цяпер тут нацягіч.

Як бы я хацеў, каб у музей трапілі зусім іншыя словы.

## ЖНІВЕНЬ

•

Прыехаў я да дваюраднага дзеда Косціка і бабы Гашы ў вёску Боруск. Гэта паблізу Прудка. Мы з бацькамі часта ездзілі да іх, калі я быў малы. На вяселлі іхніх дзяцей, на іншыя святы. Гэта была не такая краіна, як у нашым савецкім Петрыкаве, дзе я хадзіў у школу. У Боруску вышывалі, ткалі, спявалі народныя песні, працавалі, кахалі, жартавалі, гатавалі вясковыя стравы, замаўлялі ад урокаў, даглядалі адно аднаго.

Там на печы жыла гарбатая бабця за сто гадоў (маці бабы Гашы). Дзед вырабляў з драўніны ўсё ад лавы да галавы лася. Там, у Боруску, склалася маё ўяўленне пра Беларусь. Менавіта такой я бачу яе дагэтуль.

Цяпер я зноў прыехаў у Боруск пасля доўгай мінскай эміграцыі. Ад вялікай вёскі – ад маёй Беларусі – амаль нічога не засталося. Навакольныя лясы заціснулі Боруск у сваю мёртвую цішу. Дзед з бабай сталі старымі, хвароба скруціла іх і цягне да зямлі. Іх сын, дзядзька Валодзя, час ад часу разбівае цішыню начным стрэлам у ваўка.

Я зваліўся ім на галаву са сталіцы. Такі звычайны мінскі хіпстар. І першай справай палез у бабіну шафу:

– Раскажыце мне пра арнаменты. Раскажыце мне пра рэгіяналізм «анігадкі». Чаму мужчынская вышываная кашуля ў вас называецца гуцулкай? Адкуль пайшла назва Боруск?

Баба Гаша дзівіцца маім пытанням і адказвае:

– Вой, нехарошы свет пайшоў, нехарошы.

Дзед Косцік набівае тытунем самакрутку і цяжка ўздыхае.

– Вой, нехарошы свет пайшоў, – паўтарае баба Гаша.

Я з замілаваннем слухаю яе мову.

Етака, чагойліся, кажны, лісянкі, роскідуўся, куплеюць...

Адна з адметнасцяў барусканскай гаворкі – канчатак «ом» заўсёды пераходзіць у «эм». Напрыклад, не малаком, а малакэм.

Цікаўлюся ў бабы Гашы:

– Тапаром будзе тапарэм?

– Тапаром будзе сякерай.

•

Радзіва «Прудок». Экстраны выпуск пейзажных замалёвак.

Праводжу водпуск у Прудку. Начую ў свайго брата Шурыка. У дзедавай хаце яшчэ няможна спаць. Восем год у ёй ніхто не спаў.

Штораніцы хаджу праз усю вёску. Побач каровы і трактары. Мухі, лес і яблыні. І гэта ўсё самае галоўнае.

•

Пайшоў па ваду да бабы Наташы.

– Як ты? – пытае.

– Паціху.

– Ну дзякуй Богу. І я тупаю паціху. Мабуць, гаруеш?

– Не, баб Наташ, чаму гарую? Работаю.
– Ну ідзі гаруй паціху. А я яечка звару і буду тупаць.
– Паціху?
– Паціху, сынок, паціху.

•

Прыходжу, а ў садзе да яблыні прывязана кабыла, каля яе верціцца жарабя. Дарма, думаю, ніхто ж не ведае, што з'явіўся гаспадар.

Аднак потым сяджу сабе на ганку, п'ю каву з вогнішча, нікога не чапаю, як раптам прыязджае ў двор на ровары малады мужчына, мо гадоў на пяць старэйшы за мяне. Кідае ровар на траву, сядае побач з ім, моўчкі закурвае цыгарку. У гэты момант мне ў спіну тыцкае пысай кабыла.

«Мо так і трэба?» – праносіцца ў галаве філасофская думка.

Пакурыў той мужык дый кажа:

– Дай трыццаць тысяч.

•

Сёння ён ізноў прыехаў. А я ўвесь такі ў рабоце: выношу з хаты столь, якая ўпала.

– Андруха.
– Ну.
– Ну ты маладзец.
– А што такое?
– Дай пацісну руку.
– Ну, што?
– От я думаў, што ты от тэты во. А ты не от тэты во.
– Што?
– Ну не от тэты во, не абы-што!
– А што?
– Андруха, от маладзец ты, гляджу на цябе і думаю: дай сто тысяч, а?

•

Пайшоў я да цёткі Дуні па яйкі. Тая доўга на мяне пазірала ды кажа:
– А чый то ты? Свецін ці Іванаў?
– Іванаў.
– Я так і падумала, сынок. На табе яшчэ два яйкі.

•

У фэйсбуку пішуць: каб сказаў, што Свецін, дала б тры.

•

Прыйшла сёння ў мой агарод нейкая маладзіца красці бульбу, якую пасадзіў Шурык, ды ўбачыла, што дзверы ў хату адчынены. А тут неспадзеўкі выйшаў я. Маладзіца ажно перахрысцілася.

– А я бачу, дзверы адчынены. Думаю, прыкрыю, каб ніхто не ўлез.

Ага, так я і паверыў.

– А вы тут будзеце жыць?

– Буду.

– А можна я тры картопліны дзіцятку выкапаю ў супчык?

Шурык жаліцца, што бульбы сёлета зусім няма – усе карчы пустыя. Дрэнны год на бульбу. От яно як!

•

Красці – то даўняя палеская традыцыя. Бацька расказваў, як у дзяцінстве калгаснае збожжа краў.

Пабудзіць яго мой дзед сярод ночы, скажа:

– Пара.

Бацька не хацеў ісці. Але няможна было дзеду пярэчыць.

Той няспешна, па-кацінаму краўся ў цемры. Бацька ішоў абы-як: спатыкаўся ды хныкаў.

– Цішэй, чорт цябе дзяры! – лаяўся дзед.

Дзверы калгаснага гумна няможна было адчыніць, але можна было неяк прыпадняць угару. Дзед дужы быў – мог падняць дзверы. Бацька быў худзенькі ды маленькі – мог шмыгануць у шчыліну. Там ужо навобмацак насыпаў зерне ў мех і выпіхваў яго.

Потым ідуць дзед з бацькам па цёмнай вуліцы. У дзеда за плячыма крадзенае збожжа. А насустрач сунуцца цені.

У бацькі сэрца дрыжыць: гамон, папаліся!

А дзед яму шыкае:

– Шшш, шшш...

Калі цені наблізіліся, бацька пазнаў іх: то сусед Дэдаль са сваім сынам. Ноч. Дэдаль і Дэдаляня ідуць з пустым мехам у бок гумна. Дзед і бацька вяртаюцца адтуль з поўным. Але во дзіва: на вузкай вуліцы не бачаць

адзін аднаго, разыходзяцца моўчкі. Такое правіла ў іх было: калі ідзеш красці – кум ты мне, брат ці які яшчэ чорт, але я не бачыў цябе, ты не бачыў мяне.

А сёння ў нейкай прудкаўской хаце ядуць крадзеную Шурыкаву бульбу. Не ўмірае палеская традыцыя!

•

Яшчэ помню Вову Зайчыкава, які краў у свайго бацькі цыгарэты і прадаваў цыганам. А на грошы мы куцілі разам. Гэта мой вясковы сябар дзяцінства. Яму было пяць гадоў, мне – чатыры. Я стаў дворнікам, Вова – п'якам.

Але самая вялікая памяць пра яго – шрам на правай руцэ. Мы капалі ямку пад клёнам. Хацелі схаваць там скрадзеныя цыгарэты. Вова капаў віламі, а я – рукамі. Усё было нічога, пакуль мы не згубілі рытм. Вова прапароў наскрозь маю далонь.

Ужо і Вовы Зайчыкава няма ў жывых, а шрам на руцэ застаўся як запавет ніколі не красці.

Паглядзеў на шрам і ўспомніў гэтую гісторыю.

Цяпер я гэтай рукой трымаю тэатральную мятлу. Мой водпуск скончыўся, а на маім твары ўсё яшчэ водбліск цёплага палескага сонца.

## ВЕРАСЕНЬ

•

З'ездзілі з Евай у Беласток. Там мусіла адбыцца наша першая ноч.

Пасля чаго, як прыстойны чалавек, я меў намер сказаць ёй:

– Я разумею, што гэта не было ў тваіх планах, але мо зусім трошкі ты хацела б жыць у глухой вёсцы і даіць карову?

Аднак Ева прапанавала спаць у розных пакоях.

Калі я лёг, яна прыйшла да мяне, села на ложак і сказала:

– А давай адно аднаму расказваць страшныя гісторыі.

•

Памерла маладая суседка, пакінула немаўля. Мужык расказваў суседзям, што дзіця ніхто не корміць, а яно накормленае. Людзі сталі шаптацца, што нябожчыца прыходзіць і дае цыцку.

Маці па тэлефоне расказала такую байку – дзіцячы ўспамін з вёскі Бярозаўка.

Яшчэ помню Шэльмікаў. Вельмі даўно жылі ў Бярозаўцы муж з жонкай і мелі такое прозвішча. Усё нічога, ды любілі сварыцца. Мо Шэльмікі і харошымі людзьмі былі, але пасмяротную славу займелі праз любоў сварыцца на ўсю вёску. Мая бабуля, калі на тое была нагода, казала:

– Што вы равяце, як тыя Шэльмікі!

А сёння і я ўзгадаў іх, калі пачуў, як суседзі сварацца. У Мінску ў верасні 2014 года я на балконе міжволі падумаў: «Ну і шэльмікі!».

## КАСТРЫЧНІК

•

Напрыканцы лета Ева паехала ў Іерусалім, каб атрымаць благаславенне звязаць свой лёс з маім. Разам з благаславеннем яна прывезла драўляны крыжык – выраб майстра з Грэцыі. Я сказаў:

– Але ў мяне на шыі вісіць шкляначка з зямлёй.

– Насі іх разам.

І я павесіў крыжык побач са шкляначкай. У ёй была зямля з Прудка, Каранеўкі, Каленкавіч, Бярозаўкі, Боруска – з усіх месцаў, дзе жылі мае прадзеды. Зямля ўтварала такую сумесь, як я сам. Менавіта такой зямлёй я мушу стаць некалі. Гэты амулет расказваў пра маё зямное жыццё, а крыжык – пра тое, іншае. Але насіць іх разам не атрымалася: яны чапляліся і блыталіся. Я зняў крыжык і паклаў яго ў чамадан. Нашыя лёсы з Евай таксама чапляліся і блыталіся. Мы іх разнялі і забралі – кожны сабе свой.

Я зразумеў, што добрая жонка – тая, што з вады і мукі можа зрабіць блін, а не верш пра страказу. Усё чотка: яна – блін, я – табурэт. І ніякіх ямбаў і харэяў.

Каб даіла карову, трэба шукаць такую жонку, якая любіць пах палыну, а не лаванды.

## ЛІСТАПАД

•

Купіў у «букінісце» кнігу «Лекавыя расліны ў комплексным лячэнні», а там пазнака: «З кніг Вольгі Іпатавай». Такія ставяцца, каб кнігі не губляліся, таму мушу прызнацца: спадарыня Вольга, калі што, кніга на паліцы

паміж скруткамі з чаборам і святаяннікам. Я магу вярнуць кнігу, але з вашага дазволу буду збіраць па ёй прудкаўскія зёлкі.

•

Наступнай восенню я адсвяткую Дзяды ў сваёй хаце. Нічога кніжнага – усё, як дагэтуль робіць маці: прыгатую вячэру, адчыню вокны і дзверы для памерлых, на стол пастаўлю лішні сталовы прыбор. Але ці не замала гэтага будзе? У Прудку на могілках пахаваны прынамсі шэсцьдзесят адзін мой продак. Столькі я налічыў у метрычных запісах у архіве. Там, напэўна, кожнае дрэва захоўвае частку майго генетычнага матэрыялу, бо вырасла з праху дзядоў.

### СНЕЖАНЬ

•

«Гуляць дык гуляць», – падумаў я і купіў квіток на цягнік да Вільні.

## 2015 год

### СТУДЗЕНЬ

•

У Вільні ёсць традыцыя, калі суседзі і сябры сустракаюць Новы год у любімай кавярні – у такім амаль сямейным коле, дзе трыццаць першага вам скажуць:

– Выбачайце, сёння мы зачыненыя, мы святкуем Новы год з нашымі суседзямі-сябрамі.

І нават калі ў вас будзе самая прыгожая сукенка ці самы тоўсты гаманец, трапіць туды немагчыма.

Нам з Кацяй пашчасціла. Можа, таму, што мы беларусы і гаспадыні захацелася падараваць нам асаблівыя ўспаміны пра Вільню.

– Што з вамі рабіць? Не пакідаць жа вас на дварэ? – сказала яна нам у тры гадзіны ночы.

У кавярні і папраўдзе былі толькі свае. Літоўская княгіня, мастак, хірург, яшчэ некалькі чалавек. Усе яны жывуць у дамах побач. Пазней зайшоў

паліцыянт пасля начнога дзяжурства. Ён таксама мясцовы. Большасць з іх яшчэ дзецьмі гулялі разам, залазілі на муры ля вежы Гедыміна, кахалі адно аднаго, потым жаніліся, разыходзіліся.

І сустракалі Новы год разам. Нехта – усю ноч. Нехта толькі заходзіў павіншаваць, абняць.

Былі і замежныя госці. З тых тутэйшых, што з'ехалі, але вяртаюцца сустракаць Новы год дома. Яны прывозяць сваіх мужоў-жонак і далучаюць да яшчэ адной сям'і – сям'і суседзяў.

Кавярня расцягваецца, калі трэба, каб усім было ўтульна.

Альбо сціскаецца да маленькага пакойчыка, калі застаюцца толькі княгіня, мастак, паліцыянт, спячы хірург. І мы ўдвох – навалач-беларусы.

Княгіня запрасіла мяне на танец. Тое, што яна княгіня, было заўважна і без словаў. Я на развітанне сказаў:

– Мы никогда не встретимся, и мне очень жаль.

А яна адказала:

– Мой милый, не жалей о том, что тебе не принадлежит. Береги то, что твоё по праву.

•

Скончыцца зіма, і я пераеду жыць у сваю хату.

Таму я люблю прыбіраць снег. Люблю прачынацца раней за самага спрытнага пеўня, есці вялікую талерку аўсянай кашы, бадзёра шпацыраваць упоцемках, калі ўсе прыстойныя людзі толькі пачынаюць ненавідзець свае будзільнікі. Люблю выносіць з тэатральнай каморкі рыдлёўку і рабіць на белай прасціне першую сцежку.

Люблю вяртацца дадому, дзе ёсць суп, гарачая ліпавая гарбата і цёплы Рома.

Скончыцца зіма, і я пераеду жыць у сваю хату. Таму я люблю прыбіраць снег: гэта як чысціць доўгую дарогу дадому.

•

Размаўляў з братам Шурыкам. Кажа, хата стаіць на месцы, а мяне возьмуць у Юравіцкую школу. З першага верасня я буду працаваць настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Я ў дзяцінстве марыў пра гэта – стаць сельскім настаўнікам, але стаў журналістам. І тут раптам.

У гэтай школе навучаўся мой бацька. Ён хадзіў туды пешшу па пятнаццаць кіламетраў у адзін бок.

## ЛЮТЫ

•

Праз адзін мільён восемсот чатырнаццаць тысяч чатырыста секунд я буду дома. А ўчора Іосіфаўна падпісала маю заяву на звальненне.

Куля зямная нахіляецца ў бок вясны.

•

Пабачыў новага дворніка Купалаўскага тэатра. Мы сутыкнуліся ў аддзеле кадраў. Як старае і новае, смерць і жыццё, зіма і вясна.

Але ў мяне засталіся тры апошнія дні. Тэатральныя рыдлёўкі і мётлы яшчэ тры дні падначалены мне. Каморка яшчэ тры дні мая.

А потым вазьму з сабой тэрмас, сяду ля фантана, буду піць гарбату ў сем раніцы і назіраць, як я не дворнік.

Абавязкова так зраблю.

Крыху падумаў і вырашыў замест гарбаты ўзяць каньяк.

•

Збіраю рэчы. Знайшоў свой дзіцячы вершык:

Справа пижама.
Слева кровать.
На кухне ножами
Орудует мать.

•

У летапісах Купалаўскага тэатра цяпер два Горваты. Першы – маршалак шляхты Мінскай губерніі Атон Горват, які ахвяраваў 50 рублёў на будаўніцтва тэатра. І я, які сыграў ролю дворніка ў рэалістычнай працяглай дзеі. Ключ ад грымёркі здадзены, пячатка пастаўлена. Без авацый, без кветак і падзякаў, ціха, лёгка, незаўважна перацякаю ў новую ёмістасць. З галоўным набытым уменнем – не саромецца рабіць простыя рэчы.

Таксама нагадваю, што заўтра а сёмай адбудзецца ўрачысты алкаранішнік ля фантана і агледзіны новага дворніка. Усе ахвочыя могуць далучыцца.





•

Вельмі добра памятаю пачатак свайго сталічнага жыцця. Я называў кока-колу сокам, модна апранаўся на Жданах, вазіў з дому закаткі. Потым хутка пасталеў, стаў апранацца на Дынама, навучыўся казаць: «Мама, не нужны мне эці закаткі, што я буду с німі цягацца».

Я аніколькі не шкадую, што засталіся толькі дзве ночы пад мінскім небам. Гэта вельмі каштоўнае ўменне – без болю пакідаць месцы і людзей. Бо самае галоўнае ж застанецца, нікуды не дзенецца.

Папраўдзе, я проста сябе падбадзёрваю.

# Лахатрон

Гадоў дзесяць таму ўладкаваўся я на фірму, якая займалася рэалізацыяй бытавой тэхнікі. Карацей, у лахатрон. Тое, што ў газетнай аб'яве называла сябе гандлёвым прадстаўніком, папраўдзе хадзіла па кватэрах і пад выглядам уяўных рэкламных акцый збывала дробную бытавую тэхніку і кухонныя прылады: прасы, электрачайнікі, нажы.

Што гэта лахатрон, я дацяміў запозна, калі ўжо прызвычаіўся да лёгкіх грошай. За месяц мяне натрэніравалі так, што я мог прадаць што заўгодна і каму заўгодна.

Маімі калегамі былі студэнты-завочнікі, маладыя настаўнікі і медыкі – наймілейшыя прайдзісветы, добрыя і прастадушныя. Мы падымаліся на апошні паверх і надзявалі на сябе нябачны скафандр, які не ўпускаў ні страх, ні сумленне.

– Добры дзень. Вы гаспадыня?

Недаверлівыя позіркі за дваццаць хвілін напаўняліся цеплынёй. А нашыя кішэні – грашыма.

Там, у кватэрах, маё сэрца ніколі не ёкала. Бабця з царкоўнага хору, палкоўнік, інвалід у вазку, сямейная пара лесбіянак, цётка, яшчэ адна цётка, яшчэ сто цётак – я ўсіх не злічу. Сэрца ёкала, калі мы збіраліся ля машыны, запіхвалі ў багажнік рэшткі і моўчкі вярталіся ў кантору. То была не проста стома, а душэўнае знясіленне праз гвалт, які мы самі ўчынялі.

Так цягнулася некалькі месяцаў, пакуль наш офіс не займеў сур'ёзную праблему. Быліператрусы, і кіраўніцтва стала збіраць свае манаткі, каб збегчы ў Самару. Было прапанавана далучыцца да ўсеагульнай міграцыі.

– Самара – гэта маленькі Лас-Вегас, – сказалі нам.

І мы паверылі.

Перад самым ад'ездам усхваляваліся. Спявалі ля чыгуначнага вакзала: «Ах, Самара-городок, беспокойная я, беспокойная я, успокой ты меня!». Пілі піва, смяяліся, уяўлялі наперадзе шчасце. Лічылі вялікую Расію сваім выйгрышам і шанцам.

Выявілася, што Самары не толькі да Лас-Вегаса было далёка – ёй было далёка да Шабаноў.

Хочаш перайсці дарогу – спадзявайся толькі на свайго анёла. Расія запусціла ў космас ракету з Гагарыным, а самарцы па вечарах запускалі з вокнаў пакеты са смеццем.

Давялося прыстасоўвацца не толькі да новых бытавых умоў. Ужо першы працоўны дзень выявіў, што нашыя ўменні, набытыя ў Мінску, можна перакрэсліць, і трэба вучыцца лахатрону нанова – на расійскі манер.

Першай пад нож легла наша інтэлігентнасць. Яна дапамагала ў Мінску, але яна замінала ў Самары. Каб збыць тавар, трэба было стаць галодным зверам. У бабулі, якая адчыняе дзверы, у вачах няма недаверу і каровінай прастадушнасці – ёсць страх. Гэты страх можна перамагчы толькі сілай. Нас навучылі простаму прыёму: найперш трэба прасоўваць нагу ў дзвярны праём, а ўжо потым усміхацца. Калі гаспадар слабейшы за цябе, калі ён не здолее выпіхнуць тваю нагу, то ты адсунеш яго і патрапіш у сярэдзіну.

Клапаціцца пра тое, што нехта выкліча міліцыю, не было ніякай патрэбы. Міліцыя рэгулярна атрымлівала ад нашай фірмы свой працэнт з продажаў. Таму нахабства дазвалялася. Адзінае, чаго трэба было баяцца, – дужых гаспадароў. Таму мы хадзілі ўдвох і ўтрох.

У мінскіх кватэрах дыялог з «кліентам» быў даўгі. «А хто ў вашай сям'і вострыць нажы?», «А як маецца былая жонка вашага траюраднага брата?». Заваяваць давер у беларуса лёгка – трэба толькі пацікавіцца ягоным жыццём і пачуццямі. І праз дваццаць хвілін беларус накорміць абедам, аддасць свае грошы, яшчэ і падзякуе наўздагон.

Атрымаць давер у самарскага расійца немагчыма. Таму дыялогу ў нас не было – быў сквапны, спешны, агрэсіўны маналог на тры-пяць хвілінаў, які завяршаўся словамі: «Як гэта няма грошай!? А калі я пашукаю?». І шукалі ж па шуфлядках, пакуль гаспадар баязліва стаяў у калідоры. Не мы – нашыя самарскія калегі. А мы так і не навучыліся. Хадзілі са сваімі торбамі, сарамліва ўсміхаліся, безнадзейна ўсміхаліся.

Усміхаліся, усміхаліся, усміхаліся. Па-беларуску. Нас выганялі, выкідалі з пад'ездаў, як пакеты са смеццем, білі нагамі.

Аднойчы дзверы адчыніла жанчына. Я ўсміхнуўся і сказаў ёй: «Здраствуйця». Яна ўсміхнулася і сказала мне: «Здраствуйця». Мы былі ўтрох: я, мой лепшы сябар Лёха і Вася. Разам з гаспадыняй мы ўтваралі маленькі статак з чатырох добрых кароваў.

Вася застаўся на лесвічнай пляцоўцы: ён стаміўся болей за нас. А мы з Лёхам паставілі свае торбы ў калідоры і пачалі працаваць. Гэта быў самы даўгі маналог у маёй кар'еры прайдзісвета. Я ўклаў усю сваю пяшчоту ў няспешныя словы па амаль забытай мінскай сістэме. Я атрымліваў асалоду ад кожнага гуку, бо мой кожны гук слухалі. Я слухаў. Лёха слухаў. Слухала гаспадыня. Мы ўжо не хацелі грошай – мы хацелі застацца самімі сабою. Вярнуцца ў свае інтэлігентныя ўсмешлівыя целы.

Я не помню, ці прадалі мы што-небудзь. Гэта цяпер неістотна. Калі я закончыў, гаспадыня прамовіла: «Дзякуй». Па-беларуску.

Вася за дзвярыма плакаў.

Раздзел 2

# Тут палку кінъ – і тая папаўзе



## САКАВІК

•

Я ніяк не магу сабрацца ў адным месцы.

•

Начую ў бацькоў у Петрыкаве, штодня езджу ў Прудок. Скарбонкі з маймі рэчамі стаяць у бацькавым гаражы. Ноўтбук – у брата на кватэры. Рома жыве пад маміным ложкам.

•

Сёння ля петрыкаўскай аўтастанцыі ледзьве не сутыкнуліся лбамі з барадатым дзядзькам, які нагадаў мне Гналя.

Гналь быў адзіны ў раёне, хто стрыг. Па святочныя прычоскі трэба было ехаць у Мазыр. Усё сваё дзяцінства-юнацтва я спраўна хадзіў да яго. Ён не шкадаваў адэкалону, меў даўгую бараду. Я пабойваўся яго. Тое, што Гналь – прозвішча, я даведаўся пасля, а спярша лічыў, што гналь – тое ж, што і цырульнік. Таму «схадзіць да Гналя» азначала «падстрыгчыся». Калі я з'ехаў у Мінск, засумняваўся: а ці быў Гналь?

А сёння я ледзьве не наскочыў на яго. Барадач увайшоў у драўляную хатку, на якой вісела шыльда «Цырульня Гналя».

Гналь існуе!

•

Радзіва «Прудок». Перадача пра матылькоў.

Перанёс з каморы на гарышча пяцьдзясят заспаных матылькоў. Яны ледзь варухнулі кволымі крыламі, паглядзелі на мяне дрымотнымі вачыма – і зноў вырубіліся. Цяпер на маім гарышчы жывуць матылькі.

А ў каморы буду жыць я. Гэта адзіны пакой, у якім ёсць усё: сцены, столь і падлога.

•

Сяджу ў яблыневым садзе: пяе птушка, лётае пчала, брэша сабака, гудзе трактар.

На руках і ботах гліна.
За кароўнікамі Мінск.
А за лесам Украіна.

•

Шлях да Украіны ляжыць праз Юравічы.

Там жылі людзі дваццаць пяць тысяч гадоў да нашай эры. Рабілі хаткі з костак мамантаў. Тады ў Юравічах не было сельсавета. І тыя людзі не прапісаліся і з'ехалі. А от я прапісаўся. Ад сёння я афіцыйна тутэйшы. Перадайце ў Цэнтр: урбанізацыя адмяняецца.

•

Пакуль мяне прапісвалі, у кабінет увайшла цётка ў працоўных анучах. Столаначальнікі далікатна адмахнуліся ад яе, як ад мухі, якая лётае над прыгожай сукенкай:

– Што нада? Цяперака няма часу.

А ў мяне ёсць шапка-гандонка і польскі світар, куплёны ў 90-я. Я тады брату напісаў ліст у войска: «Цёця Каця прывязла нянашый світар із Польшчы».

У нас тут так модна. Я модны. Прывітанне.

•

З Юравіч ехаў спадарожкай.
– У Прудку жывеш?
– Ну.
– Адзін? З сям'ей?
– Ага.
– Жонка харошая? А дзеці е?
– Е.
– Два?
– Не.
– Тры! Як у мяне. Работаеш дзе?
– А-а-а, так...
– Мо будуеш што?
– Як сказаць...
– Тут ці ў Маскве?

– Ну.

– Многа даюць у Маскве?

– Ну, э-э-э...

– Я ж бачу, што нармальны хлопец. І жонка, і дзеткі, і работаеш у Маскве. Маладзец!

•

Сёння будзе мая першая сапраўдная ноч у сваёй хаце.

•

Радзіва «Прудок». Начны выпуск перадачы «Для тых, хто не спіць».

Электраабагравальнік зламаўся.

Развёў вогнішча ля хаты, грэю цаглінкі.

•

А неба! Якое ж тут неба! І зусім бясплатна.

Космас так блізка.

•

Учора кіроўца, які падвозіў мяне з Юравіч у Прудок, кажа:

– Я от так ехаў, а ля Прудка з лесу нешта выбегла. Такое, як кенгуру, толькі меншае. Еду назад – ізноў яно. Мо то такая чупакабра?

– Мо.

Больш я нічога не адказаў, то ён зрабіў музыку грамчэй, і далей мы ехалі моўчкі. Калі пад'язджалі да Прудка, абодва ўглядаліся ў лес.

– Сёння няма.

– Няма.

Я забыўся на тую гісторыю, а цяпер гляджу ў цемру за дзедавым акном і думаю пра кенгуру-чупакабру ў ёй.

Калі быў маленькі і прыязджаў да бабулі, стаяў гэтак жа ў сенцах і пазіраў у тую самую цемру. Тады ў ёй жылі ваўкі. У хаце гаманіла бабця.

Ужо няма ваўкоў, бабці, па лесе бегаюць чупакабры, на падваконні ляжыць вялізны іржавы цвік, які я ледзь выцягнуў з бэлькі, што паламалася і ўпала.

Усё змянілася. Толькі цемра за дзедавым акном засталася тая самая.

•

Іду па Прудку з малаком, а сабака:

– Ррррр.

Гаспадар яму:

– Няможна, свае!

У мяне ажно спіна выпрасталася – так прыемна быць сваім.

•

Баяўся за Ромку, але дарэмна. Ноччу ён ходзіць па дзеўках, а днём спіць у маім ложку.

•

Радзіва «Прудок». Перадача пра сварлівых жукоў і інтраверта.

Вычышчаў пограб, выкапаў калонію жукоў.

Яны мне:

– Якой халеры?! Выключы святло!

Я ім:

– Пад'ём! Вясна!

– Трасца табе ў сраку! Дай паспаць.

– Спіце на дварэ. Гэта мая хата.

– Чагоооо?! Навалач сталічная, шкындзёхай адселя. Мы тут нарадзіліся. Хата наша.

А вы кажаце: як ты там будзеш адзін? У інтравертаў няма часу на адзіноту: столькі ўсяго адбываецца! Будзе сумна – пафарбую зялёнкай лямпачкі.

•

Навіна пра тое, што ў Прудок прыехаў жыць сталічны журналіст, хутка абляцела вёску. Але недзе чутку перабрахалі і кажуць, што прыехаў пісьменнік.

•

У Мінску чысценька, як па тэлевізары. Усе людзі памытыя. Гэта неверагодна!

•

– Здароў, сусед! А праўда, што ў цябе быў свой бізнес?

– Хто сказаў?

– А, там адзін. Кажа, што ўсё кінуў – кватэру і хвірму – і пераехаў сюды. Хіба праўда?

– Ну.

– Ат, прадаў бы. Нашто было кідаць?!

## КРАСАВІК

•

Крапіва – мой ранішні эліксір бессмяротнасці. Выпіў – і да вечара бессмяротны. Унутры ўключаецца генератар. Адразу хочацца перанесці хату бліжэй да сонца або выкарчаваць стары пень.

•

У мяне дваццаць саджанцаў вішні. Заўтра яны стануць садам. Не разумею, чаму я пятнаццаць гадоў жыў у Мінску.

•

Радзіва «Прудок». Перадача «Апошні герой».

Электраабагравальнік зламаўся, 3G-мадэм не працуе, малако не кісне. А ў каморы, дзе я сплю, плюс восем.

•

Суседка адключыла мяне ад электрычнасці (спужалася, што яе хата згарыць праз мяне). Я купіў у краме свечку, сшытак і аловак. І ведаеце што? Так крута! Так проста. Так зразумела ўсё. Ежа – гэта вогнішча. Святло – гэта агонь. Тэкст – гэта папера.

•

«Паляшук, прыйшоўшы на белы свет, жыццё пачынае ў сасновай калысцы, цэлае жыццё жывучы ў сасновай хаце, абаграванай і асветленай



сасной, спіць, адпачывае і есць на сасновай мэблі. У вольны ад працы час слухае гукі, узмоцненыя слаямі сасновага дэка скрыпкі, а адыходзячы на вечны адпачынак ад зямных турбот, забірае з сабой чатыры сасновыя дошкі ў выглядзе дамавіны».

Часлаў Пяткевіч, «Рэчыцкае Палессе».

•

Дзень пачаўся з грукату ў дзверы.

Цётка Дуня пабачыла тое, што пабачыла, – памятага барадатага мужыка са спужанымі вачыма.

– Я табе картоплю прынесла. Баршчы ясі? У мяне борщч е закатаны. І яйцы вечарам прывязу. А жыр нада?

•

Калі я б'юся галавой аб дзвярны праём, я кажу не «Халера!» і нават не «Іці тваю маць!». Я кажу: «Выбачай». Дзед наўмысна рабіў дзверы такімі нізкімі, каб кожны, хто ўваходзіць у хату, пакланіўся. Занадта ганарысты – на табе цацку на галаву. У расійскай мове ёсць «отвесить поклон», у беларускай – «адбіць паклон». Я яшчэ свой паклон, мабыць, не надта добра адбіў, бо і сёння ў тым праёме пабачыў прыгожыя іскры.

•

Меў кароткую гутарку з братам Шурыкам. Ён працуе ў школе.

Аказваецца, сёлета ў праграме ажно тры ўрокі беларускай мовы штотыдзень, як і расійскай, а гэта «безабразіе».

– Чаму так? – пытаюся. – Добра ж, што дзеці вучаць родную мову.

– Ты міня не агіціруй. Я протіф всех эціх нацыаналізацый. Мы часць рускай культуры і нікуда ат этава не дзенемся. Нацыаналізацыі фсе эці вашы прыводзят да таго, што на Украіне, – да настаяшчага фашызму. Мы с Расіяй, а не з Амерыкай.

– А прычым тут Амерыка? Сваю мову ж нада ведаць.

– Не нада. Дзеці і так у дзярэвні растуць, ім нада выпраўляць рэч.

Шурык не п'е і любіць сваіх дзяцей. Яго маці, мая цётка, даўно памерла. Ён тады падлеткам быў. І тут на табе – такая філасофія. Земляка Мележа – у топку, бо беларуская мова вядзе да «настаяшчага фашызму».

Нічога, пакрысе разбяромся.

•

Прыехаў да бацькоў, паглядзеў тэлевізар. Пасля расійскага тэлебачання хочацца каго-небудзь застрэліць, а потым памыцца і нажэрціся канопляў. І справа не ў змесце, а ў агрэсіі, з якой ядуць мазгі. А беларускае тэлебачанне мяне супакойвае.

•

Вы не паверыце, але гэтую сваю хату я таксама згубіў. Праз Шурыка, які не захацеў перапісваць хату на мяне, хоць усе дакументы амаль гатовы.

От табе і Вялікдзень! Са святам! Хрыстос уваскрос!

•

Мая баба Ганна казала, што па пятніцах напярэдадні вялікіх царкоўных святаў трэба пакідаць куццю на стале для продкаў. Але бабуля не ведала, калі тыя святы, і пакідала куццю штопятніцу.

•

У чаканні самага важнага дыялогу з Шурыкам паразмаўляў з партрэтам дзеда.

– Дзед, – кажу, – ты ж бачыш, як мне хочацца адбудаваць хату. Памажы мне. Памажы, – кажу, – дзеда.

Шурык сказаў, што падумае да Радаўніцы.

•

А вы ведаеце пра традыцыю падпальваць цыгарэту і класці на магілу памерламу курцу? Мой дзядзька зараз так «курыць». Учора да яго прыязджалі мае дваюрадныя сёстры, прывезлі пакурыць.

•

У скарбонку беларускай лаянкі: «Мацъ яго дыхала!». Перакладаецца так: «Шурык такі-сякі, але няхай робіць што хоча, я больш умешвацца не буду».

•

Радзіва «Прудок». Паведамленне з лініі фронту: «Прудокнаш».

•

Маша цікавіцца, чаму я не жыву ў Варшаве. А я сёння пасадзіў буракі, моркву, рэдзьку, цыбулю, часнок, кроп, пятрушку. Зараз пайду па лазу, каб сплесці кошык. Што, у той Варшаве кроп зелянейшы, Маша?

•

Сублімую сексуальную энергію ў пасеў гародніны. І будзе ў мяне восенню сексуальны ўраджай. Вельмі-вельмі-вельмі багаты.

•

У Каленкавічах дзеўкі ў кароткіх спадніцах і высокіх ботах. Мабыць, пра такіх казала баба Параска, калі перасцерагала мяне ад жонкі-лацугі.

Але я на тых дзевак глядзеў яшчэ да таго, як памыўся. Нямытым адно што глядзець можна. Калі памыўся, дзевак ужо не ўгледзеў. А калі б і ўгледзеў, то што?

Вы праслухалі новую радзіварэфлексію «Горват і дзеўкі». Не пераключайцеся.

•

У мяне зноў расце барада. Не наўмысна яе рашчу – проста няма ўмоваў галіцца, дый у люстэрка сябе бачу, толькі калі прыязджаю да цёткі Волі ў Каленкавічы (опа, а я зноў барадаты). Адзін дзядзька ў Прудку сёння сказаў, што я падобны да святара. Параіў павесіць на страху крыж, а ў хаце – абраз. Людзі будуць прыходзіць маліцца. Абраз у мяне ўжо ёсць. Мая бабця прыцягнула з Пскова Дзеву Марыю.

•

Колісь ліштвы вокнаў па-пагански аздаблялі сімваламі сонца, каб у хату не трапіла штосьці цёмнае і злое. Гэта ніякая не навіна, нават самы лянівы этнограф пра гэта ведае. Але чытаць пра тое ў кнігах не тое самае,

што ламаць сабе галаву: мой дзед, калі выразаў сонейкі, хацеў абараніць хату ад цёмнага і злога ці проста аздобіў вокны традыцыйнымі сімваламі без усведамлення іх значэння?

•

Не ведаю, што сёння зрабілі вы, а я дык зрабіў нейкую драўляную хярню-вешалку. Сяджу, гляджу на яе і радуюся.

Пакуль я рабіў вешалку, Ромка спаймаў сваю першую мыш. Як той кажа, усе пры справе.

Расказвае мне, што яму падабаюцца мышы і што я мушу менавіта такую ежу купляць яму ў краме. Я таксама люблю мышэй, але жывых, таму раблю выгляд, што нічога не разумею.

– Гэта твая прырода, – кажу. – Калі-небудзь і цябе з'ядуць.

•

Учора быў у Боруску. Дзядзька Валодзя сказаў, што адчувае пах дыму і што вецер нехарошы. Я нічога не адчуваў. Ён мне ўвесь час:

– Ну, от зараз панюхай.

Вечарам прачытаў пра пажар ля Чарнобыля. Раніцой не ўбачыў свайго леса: ён стаў сівым ад дыму. Праз гэты дым няможна дыхаць. Як гаворыць баба Васіліна з Каранеўкі – у грудзях зацінае.

•

На Палессі маленькіх кусачых мошак называюць маскалямі.

– А хто то так казаў?

– А то шчэ колісь казалі.

## ТРАВЕНЬ

•

Усё самае страшнае пачынаецца словамі: «Ничто не предвещало беды». Ранак. Восем гадзін. Заліты сонцам сад. Сяджу пад ігрушай, п'ю сырадой з пернікамі. І ў гэты момант на мой агарод нясецца зграя раз'юшаных калгасных кароваў. Схапіў дубца і рынуўся ім насустрач.

А як дзень пачынаецца ў вас?

•

Штораніцы ў 7:40 міма маёй хаты на лісапедзе праязджае маладая жанчынка. Штораніцы яна гучна крычыць: «Добрае утра!». З гэтага ўтварылася традыцыя. Я мушу паспець прачнуцца, прыбраць ложак, пакарміць Ромку, распаліць вогнішча, прыгатаваць каву і сесці на ганак. Яна мусіць здалёк пабачыць мяне, пад'ехаць бліжэй і гучна вымавіць: «Добрае утра!». Тады будзе добры дзень.

Сёння будзе добры дзень.

•

Радзіва «Прудок». Перадача «Тэатр ля мікрафона».

Рома знайшоў сабе чорную котку. Ужо мо тыдзень начуе ў яе, дадому прыходзіць толькі падсілкавацца.

– Што, палюбоўніца не накарміла? – кажу. – Ты зразумей, Ромка, яна возьме ўсё, а потым зробіць выгляд, што і не ведае цябе. Трэба як я – будаваць хату і дбаць пра пограб, каб на зіму было куды бульбу пакласці. Дзеўкі выціснуць з цябе ўсе сокі ды знойдуць сабе новага ката – маладога ды энергічнага.

– Каў.

– Паеў бы хоць, пане Каханку.

– Каў. Каў.

Ледзьве жывы, але пайшоў мой дурань да сваёй брунеткі.

А я тварог раблю.

•

Мой першынец – Гарох Андрэевіч. Ён такі малы, а я ўсміхаюся.

Корпаешся ў зямлі, націраеш рукі-ногі, спальваеш спіну, а тут бац – і зялёны карапуз. Сядзіш ля яго і думаеш, што, можа, не зменіш сусвет, не злётаеш у космас, але вырасціў жывую зялёную казяўку.

•

У мяне актывізаваўся нейкі паляшуцкі ген, які штодня па дваццаць чатыры гадзіны нудзіць: што яшчэ пасеяць? Зямля прападае дарэмна. Што яшчэ пасадзіць? Купіць карову. Купіць казу. Не, лепей дзве каровы. І казу. Тры. І трактар. І зямлю яшчэ.

•

Пасеяў трыста трыццаць тры сланечнікі. Зімой прыеду ў Мінск ля метро семкі прадаваць.

•

Радзіва «Прудок». Навіны замежжа.

– Абама прыжаў Меркель, і яна не можа прыехаць у Маскву павіншаваць Пуціна.

У цягніку гавораць палескія бабулі. Нашто мне тэлевізар? Я ўсё ведаю і так.

•

Да маіх бацькоў прыехалі госці з Расіі. І я тут гасцюю разам з Варварай. Дай мне, божа, цярпення. Мая тонкая душэўная арганізацыя псуецца ад украінафобій. Вярнуся дадому – нап'юся крапівы.

•

А ў мяне лён павылазіў з зямлі. Гэта нешта такое сакральнае беларускае. Кожны мусіць пасеяць лён, каб адчуць урачыстасць моманту.

•

У пошуках бабулі, якая робіць вышыванку, званю сваёй маці.

– Ма, – кажу, – а мо ты ведаеш такую?

– Ведаю, – адказвае, – гэта я.

Тое ды сёе, кажа, што ейны бацька быў апошнім вясковым майстрам, хто рабіў пасталы.

– І я пару разоў пастолікі насіла, – кажа маці.

А яе дзед апошні ў вёсцы насіў вышываную кашулю.

– Я вышывала, а дзед надзяваў і ганарысты такі хадзіў па вуліцы.

•

Сёння ў нашай хаце свята. Калі ласка ў нашу хату. Будзем сядзець, хто хоча, хоць да ночы, бо мяне электрыфікавалі.



Болей не давядзецца зараджаць тэлефон у калгасе імя Ф. Э. Дзяржынскага. Я так і казаў:

– Рома, ты за гаспадара, а я пайшоў да Фелікса Эдмундавіча.

•

У Каленкавічах дагэтуль прынята хадзіць па вуліцы з музыкай. Раней шпана цягала з сабой магнітолы на батарэйках. Цяпер – мабільныя тэлефоны. Тэлефона не бачна, таму ідзе такі хлопец – музычная скарбонка, а з яго льецца блатняк.

Мне пашчасціла ўбачыць каленкавіцкую бабулю, з глыбіні якой цурчыць акардэон.

•

Колісь, калі жанчына не хацела мець дзяцей, яна замыкала замок і кідала яго ў студню. Чысцілі маю студню і на дне знайшлі стары замкнуты замок. Цікава, гэта замок-замок ці замок-кантрацэпцыя? Ці, можа, ён там ляжаў з іншай нагоды, трапіў на дно праз невядомы мне рытуал? Ці проста ўпаў, калі баба Дуся набірала ваду?

•

Радзіва «Прудок». Навуковая перадача пра металалом.

Палешукі вельмі сквапныя на жалеза. Мо праз генетычную памяць пра жалезную руду, якую колісь сям-там на Палессі здабывалі.

Мае бацькі жывуць крыху вышэй па Прыпяці. У іх быў сусед, ужо нябожчык, меў мянушку Жалезны. Тую мянушку атрымаў менавіта праз схільнасць цягнуць у свой двор усё жалезнае.

Ёсць патрэба абрасці жалезам і ў мяне.

Пакуль вычышчаў двор ад хламу, назбіраў кучу металалому: нейкія зубчатыя колы, дэталі ад прыстасаванняў, імя якім і сто гадоў таму ўжо не помнілі. На першы погляд, непатрэбшчына, але зрабіў у двары закуток («жалезная покуць») для гэтага хламу – хай будзе. Супраціўляцца генам не дам рады.

Коля кажа:

– Аддай жалеза, а я табе ўсё смецце вывезу.

– Не аддам.

– Нашто яно табе?

– А табе?
– А я люблю такое, мне нада.
– І мне нада, і я люблю.
Не аддаў. Але перахаваю. Бо ўкрадуць.

•

Радзіва «Прудок». Начны эфір. Страшны.
Стаўлю я ў сне тычкі на фасолю, а яны падаюць. Нейкія фільмы жахаў паказваюць у гэтых вашых прудкаўскіх снах.

•

Не даюць мне сёння спаць. Рома туды-сюды праз акно носіцца. Сам не ведае, дзе хоча быць. Нехта жарэ маю сцяну. Па руцэ паўзе жук-насарог. Эпіцэнтр падзей, а не ціхае вясковае жыццё.

•

Болей за ўсё палешукі баяцца ўроку. Калі ўсё добра, пра гэта нельга нікому казаць. Лепей і не думаць. Таму тут не працуюць, а гаруюць. Свойская жывёліна заўсёды – худобіна.
Цётка Дуня пытаецца:
– Што ты тут пасадзіў?
– Тое ды сёе.
– Дажджу не будзе, нічога не вырасце.
Я падумаў: «От жа каза якая!»
Потым мне патлумачылі, што так пажадалі добрага ўраджаю. Я мусіў у адказ паскардзіцца на надвор'е, нікчэмную зямлю і на тое, што няма гожых дзевак у радыусе дваццаці кіламетраў.
Я ўсё яшчэ актыўны аптыміст, таму не самы сапраўдны паляшук.
Але я выпраўлюся.

•

Або беларусы такія цярплівыя таму, што шмат стагоддзяў запар вырошчвалі і палолі лён, або беларусы шмат стагоддзяў запар вырошчвалі і палолі лён таму, што такія цярплівыя. Мае харвацкія гены пужліва глядзяць, як мае беларускія гены цярпліва полюць.

## ЧЭРВЕНЬ

•

Радзіва «Прудок». Перадача пра птушак Палесся.

Раніцой адна скочыла мне на галаву, другая пасялілася на маім капелюшы. Маю хату атакавалі сітаўкі. Мо так і трэба?

•

Гляджу я на свае кабачкі, града з якімі хіба што ўкраінскай мяжы не дасягае, і думаю, што я псіх. Сквапны палескі псіх.

•

Усё як мае быць: і кабачкі, і сонца, і чыстае неба над галавой. А трэба трохі дажджу. Агарод гарыць. Цётка Воля звоніць з Каленкавіч, кажа:

– Сынок, як ты там?

– Гару, цётка, гару.

– І я гару.

– Прыехаць памагчы?

– Прыедзь памажы.

•

Палескія жанчыны ўмеюць адной рукой трымаць стырно машыны, другой – без промаху лавіць мух. На хуткасці 120 км/г. Сяджу побач і здымаю капялюш.

•

Сёння я правёў дзень са сваёй цёткай. Яна не глядзіць тэлевізар, належыць да «Сведкаў Іеговы» і баіцца гадзюк. Тыдзень таму цётка Воля няўдала павярнулася ў ложку і атрымала пералом ключыцы.

– Папалась я дык папалась, як цыган у калхоз.

Прачнуліся мы ў чатыры раніцы, прайшлі восем кіламетраў, пабачылі сем маленькіх чорненькіх гадзючак. Цётка кажа, што, каб забіць гада, яго трэба праткнуць наскрозь галінкай. Калі не праткнуць, іншыя гады выцягнуць яго з іншасвету. Яна ў гэта верыць. Я ў гэта веру.

•

Пра Палессе кажуць так: «Тут палку кінь – і тая папаўзе».

•

Вярнуўся ў Прудок. Прадаўчыха кажа, што ў маю адсутнасць дажджу не было.

•

Дажджу няма, а інтэрнэт е. Не трэба больш бегаць з ноўтбукам па хаце ў пошуках адзінай маленькай хвалі. Не трэба збіраць часткі мадэма, разбітага аб сцяну (бо я псіх). Velcom – гэта ўсё ж такі не МТС (дзе забраць ганарар за рэкламу?).

УУУУУУУЎЎЎЎЎЎЎЎЁЁЁЁЁЁЁЁ!!!!!!!!!!

Мне трэба было сорак хвілін бегаць па хаце, каб прачытаць паведамленне ў фэйсбуку. Болей за ўсё злавала, калі паведамленне было кароткае – якоесь «ок».

Не, гэта часам было весела, але годзе.

•

Яшчэ сто мільёнаў гадоў, і калодзежны зруб будзе гатовы.

А вы кажаце: кабачкі, тонкая душэўная арганізацыя і філосаф.

•

Радзіва «Прудок». Начны эфір.

На Палессі жыве таямнічы Той, які пра ўсё ведае. Даўно мусіць быць выдадзены «Кішэнны шматтомнік афарызмаў Тоя», бо там-сям на ўзбярэжжах Прыпяці фіксуюцца выпадкі махлярства. Напрыклад, калі палешук хоча, каб яго словы мелі большую вартасць, ён лёгка прыпісвае іх Тою: «Як Той кажа», «Як Той казаў».

Праз недастатковую вывучанасць з'явы цяжка вызначыць, якія афарызмы належаць непасрэдна Тою, а якія былі прыдуманы хітраватым мясцовым насельніцтвам.

Канец начнога эфіру. Гімн. Ідзіце ўжо спаць, не дурыце галаву ні мне, ні людзям.

•

Мае стасункі з жывымі людзьмі за чатыры дні.

Серада. Пяць хвілін – з прадаўчыхай.

Чацвер. З жывымі людзьмі не размаўляў.

Пятніца. Адну хвіліну – з Алесяй, у якой бяру малако. Дзве хвіліны – з чалавекам, які лічыць, што ён мой сусед, хоць я яго ніколі не бачыў. Тры хвіліны – з прадаўчыхай.

Субота. З жывымі людзьмі не размаўляў.

0,1909722222222222% часу я быў онлайн.

•

Да абвесткі «Калі ласка, прыедзьце і забярыце ад мяне гэтыя кабачкі» засталіся лічаныя дні.

•

Мой агарод перарэзаны роўнай лініяй. Падобна на след ад лісапеды, але штосьці лягчэйшае, бо расліны не паламаныя і след неглыбокі. З аднаго боку лініі праз кожны метр – яміна, бы варонка якая. Слядоў чалавека ці жывёлы няма.

Прабацька беларусаў Той, гэта ты? То спі, я больш не буду.

Ці палка прапаўзла?

•

Я бы тая зязюля. Хаджу па Прудку і падкідваю прыстойным людзям кабачкі. Пакуль прадаўчыха ў краме, я ёй на лісапеду пакет з сённяшнім вывадкам павесіў. І збег абходнымі сцежкамі. Адбіткаў пальцаў не пакінуў. Падазроных асобаў з біноклямі ў вокнах не бачыў. Бадзяюся па двары з выразам на твары «гэта не я».

•

Я зразумеў, што адзін у полі не воін, і прашу дапамогі: збіраю ў сябе талаку на будаўнічыя працы. Ну як талаку – маленькую талаконьку, чалавек на пяць. Асаблівых уменняў не трэба (у мяне іх таксама няма). Галоўнае, каб былі рукі, пачуццё гумару (якое спатрэбіцца, каб з рыдлёўкай

наведваць лясную прыбіральню), уменне спаць на падлозе ці ў намётах у двары і любоў да кабачкоў. Фармат – палескі, мова – беларуская, ежа – вясковая.

Будзе наладжана экскурсія ў мясцовую краму, дэфіле калгасных кароў, піццё крапівы і свойскага малака. Клімат – субкантынентальны, блізкі да трапічнага. Ёсць лісапеда. Што яшчэ? Чым яшчэ прывабіць?

•

У мяне ёсць мухі. Самую надакучлівую муху завуць Наташа. Я люблю ўвечары легчы, выключыць святло і сказаць уголас:

– Наташа, адчапіся. Не сёння.

•

З усіх маіх унутраных асобаў крыху пакіраваць целам захацелася хіпстару.

Ён сказаў: «Не хачу будаваць хату – хачу маленькія бутэлечкі, як у модных мінскіх кавярнях». Унутраны этнограф не стаў пярэчыць, бо коркі з бярозавай губы выраблялі даўно-даўно. Унутраны пісьменнік вырашыў пра гэта напісаць. Унутраны гаспадар парадаваўся, што будзе чым затыкаць бутэлькі.

Усе мы тут рады. Усім нам тут добра. І Наташа ўсміхаецца.

## ЛІПЕНЬ

•

Месяц таму мы з цёткай Воляй заўзята дзяліліся агародніцкімі поспехамі: я от гэта пасадзіў, а я гэта. Мы не слухалі адно аднаго, увесь час перабівалі, каб паспець пераказаць паболей дасягненняў.

Цяпер правілы змяніліся. У размовах мы жалімся на надвор'е і яго наступствы: у мяне гэта пагарэла, а ў мяне яно ўвогуле не вырасла, бе-бебе. Перамагае той, хто больш пацярпеў ад сонца.

•

Неспадзеўкі на Прудок напаўзла чорная хмара. Усе мы ціхенька сядзім пад вокнамі і молімся: толькі б хмара не збочыла, толькі б пайшоў дождж,

толькі б сёння не Юравічам, а нам. Ужо няма розніцы, каму маліцца. Усё навокал заціхла ў спадзяванні. Усё навокал прасякнута спужаным нявер'ем.

Дождж пайшоў. Выдых. Палёгка. Шчасце.

Апасля скажуць: то не дождж быў – то хлеб быў.

Апасля маці запытаецца: «Ну што, павесялелі градкі?».

Мы тут вельмі залежым ад дажджу.

Мы тут вельмі весялеем ад дажджу.

•

Мой дваюрадны дзед зачарпнуў вады з лужыны твар памыць. Раз зачарпнуў. Другі зачарпнуў. А дзе вада? А няма вады. Глядзіць, а з таго месца вясёлка пачынаецца.

– От ты вер ці не вер, а так і было.

– Веру.

•

Ягор дапамог зразумець магічную палескую фразу «Тут палку кінь – і тая папаўзе». Калі Тая – жонка Тоя, то гэта просты спосаб выклікаць Таю. Цяпер мы ведаем, што Той – тутэйшы аўтарытэт і што Тая можа паўзці.

Хм.

•

Эўрыка! «Неспадзеўкі на Прудок напаўзла чорная хмара». Тая – гэта хмара. Тут палку кінь – і Тая папаўзе. Гэта старадаўні магічны спосаб выклікаць дождж. Апошні раз я кідаў палку ў сне, калі тычкі на фасолю ставіў, а яны падалі.

Хочаце дажджу – кідайце палку ў агарод.

•

Купіў у бабулі сала для заўтрашніх талакоўцаў. Сам я, хто не ведае, даўно не ем ні сала, ні мяса. Старанна схаваў шматок у пограб. Пяць хвілін я і сала неяк абыякава ставіліся адзін да аднаго. Што было потым, я не памятаю. Памяць вярнулася да мяне, калі на талерцы засталіся толькі недаедзеныя кавалкі цыбулі.

•

Жыць на Палессі – гэта легчы спаць і пакутаваць, пакутаваць, пакутаваць. Потым а палове першай ізноў дастаць сала.

Чым я буду талакоўцаў карміць?

•

Калі мой унук пацікавіцца, хто ж зрабіў такі ладненькі брыль над ганкам і дах над сенцамі з каморай, я раскажу яму пра першых талакоўцаў: Віталіка, які, апроч таго што добра дапамагаў ва ўсім, пацешыў вершыкам пра ката, у якога яйцы «блішчаць у лучыках фанарыка», Сашу, які любую працу пачынаў словамі: «Гэта дурная работа», а потым яго няможна было за вушы адцягнуць ад той работы, Сержука, які распілаваў нажоўкай мо сто кубаметраў бэлек, а яшчэ заўзята ратаваў маю нагу, каторай я стаў на цвік, і Янку, якая бегала ў краму, каб даведацца ў прадаўчыхі, як гатуюць халаднік, і карміла нас як на ўбой.

Я абяцаю, што ніколі не забуду гэтыя тры дні.

Дзякуй.

# Палескае сафары

Прыйшлі мы з сябрам Арцёмам у Боруск да дзеда Косціка і бабы Гашы, а іх сын, дзядзька Валодзя, кажа:

– За хатай сляды ваўка. Шура ўгледзеў.

– Мо то сабака? – дзед Косцік не хацеў верыць.

– Не, бацька, воўк. Барсук усю ноч брахаў.

Вечарэла марудна.

– Ну і ціш. Лісток не шалахнецца, – штораз паўтараў дзед Косцік.

Дзядзька Валодзя курыў на лаўцы ля хаты. Ён чакаў ночы. Ваўка трэба застрэліць. Курыць болей не хацелася, і ён павёў нас да суседа Шуры, які ўгледзеў ваўка. Той быў п'яны, сварыўся са сваім сабакам.

– Што ты Палкана ганяеш? Ён на Вову брэша, каб не лазіў ля цябе.

Шура пачаў блытана распавядаць, як выйшаў на воўчае кубло за грэбляй. З сабой меў ружжо.

– Ваўчыца – во такая малая. Воўк здаравенны – кабанё! Ён і ходзіць. А там тры штучкі. Шчаня-я-яткі. Яна – ваўчыца – паглядзела на мяне. Дык я кажу: да ідзіце вы! Жывіце вы, кажу.

Ён пераказаў гісторыю некалькі разоў. Пакрысе ружжо ператварылася ў гранатамёт. Бжжжжжж! – страляў з уяўнага гранатамёта Шура ў сваім аповедзе.

Мы смяяліся. Дзядзька паблажліва падражніваў Шуру. Таго было не суняць.

Калі поўня паднялася над лесам, дзядзька вынес з хаты стрэльбу. Мы круціліся ля яе, трымалі ў руках. Дзядзьку гэта цешыла.

А першай ночы пайшлі ў лес. Спачатку ішліляснымі сцежкамі цераз хвойнік. Хоць я і спрабаваў ступаць асцярожна, галінкі пад нагамі трашчалі. Дзядзька ішоў першым. У адной руцэ ён трымаў напагатове стрэльбу, у другой – маленькі ліхтарык, якім свяціў на кусты і карчагі, падобныя да ваўкоў. Выйшлі да кукурузнага поля. Месяц акуратна ляжаў над ім. Танюсенькая сцежка паміж полем і лесам была даўгой – здаецца, некалькі кіламетраў. Дзядзька штораз спыняўся, услухоўваўся ў цішыню, свяціў ліхтарыкам у глыб лесу. Калі ён спыняўся, спыняліся і мы з Арцёмам, каб не перашкаджаць яму слухаць. Часта даводзілася хвіліну стаяць у нязвыклай позе – на адной назе – і трымацца за хваіну. Пасля доўгай нуднай хадзьбы пачало здавацца, што воўк асцярожна ідзе за намі. Некалькі разоў я азіраўся.

Кукурузнае поле нарэшце скончылася, і мы залезлі ў хмызняк. Мае ногі ўжо былі мокрыя. Ніхто з нас не сказаў ні слова. Толькі з Арцёмам

перакідваліся ўсмешкамі. Мая ўсмешка азначала: «Ну як табе?». Арцём усміхаўся ў адказ: «Гэта і ёсць палескае сафары?».

Выйшлі на запруду. Наваколле далёка праглядалася. На зямлі ляжалі цені ад хвояў. Гэтым разам я заняў пазіцыю пасярэдзіне і ішоў нага ў нагу за дзядзькам. Я пільна сачыў за рухам ягоных ботаў і паддаўся гіпнозу. Хацелася ісці доўга. Здавалася, хапае моцы, каб ісці ўсё жыццё.

Але брэх Барсука перарваў той паўсон. Я пачаў пазнаваць дзедава селішча, што, як паўвостраў, адным краем улеплена ў дзікае наваколле. Дзядзька Валодзя паставіў стрэльбу на ганак, сам сеў на лаўку, дастаў пачак з цыгарэтамі.

– Месячна сёння. Калі б не было месячна, патрапілі б.

Закурыў цыгарэту.

«Ну і ціш. Лісток не шалахнецца», – узгадаў я дзедавы словы.

А там, у лесе, сёння вернецца ў кубло здаравенны воўк. Да маленькай ваўчыцы і трох ваўчанят.

Ранкам пілі каву ў кухні. Дзядзька Валодзя ізноў апраўдваўся, што было месячна.

– Таго ваўка хіба стрэліш? То, бра, хітры паскуда. Яго так не патрапіш, – баба Гаша пазірала на лес за акном. – Хітры, бра...

– Каб не было месячна, стрэліў бы.

– Ага, стрэліў бы... Усроўся б...

Раздзел 3

# Сёння я піў самагон



•

Часам хочацца піва, а купіць не магу.

•

Сказаў прудкаўцам, што я не п'ю. Гэтым адрозніваецца жыццё ў вёсцы: няможна схавацца. З кім спаў і што піў – усе даведаюцца.

Добры дзень, мяне завуць Андрусь Іванавіч, мне 32 гады і я не магу купіць піва.

•

«Рухаючыся праз Мінск, Мазыр, Нароўлю ў Чарнобыль, мы амаль увесь час ішлі лясамі. Каля Нароўлі мы праходзілі па такіх мясцінах у першабытных лясах, дзе нейкую вёсачку ці ліхую карчомку можна было ўбачыць толькі праз некалькі міляў адна ад адной. Жыхары гэтых малых паселішчаў былі такімі палахлівымі, што перад нашым набліжэннем з жонкамі і дзецьмі хаваліся ў лясах, а мы натыкаліся на пустыя сялібы. І толькі пазней, прываблены нашымі падарункамі, а канкрэтна гарэлкай, асобныя з іх вярталіся дадому».

«Дзённік генерала Яна Вейсенгофа», 1790.

•

Дыялог у краме.

– Е ці не е?

– Е.

–Дай.

– На.

Калі ўвядуць падатак на літары, мы выжывем. Мы нават зэканоміць можам у ліхія часіны:

– Е?

– Е!

•

Ляжу пад яблынькай. Трэцяя ноч не ў ложку, а на зямлі ў садзе. Каровы варушацца ў кароўніку. Суседскі сабака брэша на купальскага дзядка.

Ёсць імавернасць дажджу. Ці што заказыча ў сне русалка. Ці яблык упадзе на галаву. Але мы, прудкаўскія хлопцы, нічога не баімся.

Канец сённяшняга эфіру. Дабранач. Гімн.

•

Прачнуўся, бо адчуў, што на мяне хтосьці пазірае. Расплюшчыў вочы і ўбачыў Колю Валодзі Кульгавага. А я ніяк не магу схаваць, як мне хараша было спаць. Коля бачыць, што мне шчасліва, і хоча, каб і яму было шчасліва таксама, то адразу пытаецца:

– Выпіць е?

Ці то зямля пацвярдзела. Ці то пацвярдзеў я. Але не даў яму выпіць. Узяў нож і пайшоў рэзаць гіпсакартон.

– Не дасі?

– Ну да.

– Калі нуда, ідзі пад плот.

•

Увечары прыйшла цётка Дуня.

– Сынок, а хто то да цябе заходзіў?

– Калі?

– Удзень.

– А то Коля Валодзі Кульгавага.

– Та пра Колю я ведаю. Апасля Колі.

– Я ж у лесе быў.

– Я ведаю, што ты ў лесе буў.

– Скуль?

– Маруся казала. Бачыла, як ты лісапедай ехаў. Ты не туды паехаў, сынок, у тым хмызняку ягад не будзе.

– Я не па ягады.

– Ай, расказвай. А што Коля хацеў? Выпіць ізноў прасіў? Ніяк не нап'ецца, алкаш! І п'е, і п'е, і п'е.

– Не, закурыць прасіў.

– От курэц! Ужэ выпіў – і курыць пайшоў. Абы-што, а не Коля. І курыць, і курыць – ніяк не накурыцца. Усю вуліцу пракурыў. І ты яму даў?

– Цётка, а чаго Маруся Зайчыкава да вас заходзіла?

– А якое табе дзела? От цікаўны які! Іш!

•

Паехаў я лісапедай на пошту ў Каленкавічы. Праз дваццаць кіламетраў вырашыў заскочыць да цёткі Волі. Той не было ўдому, але былі мае любімыя крышані. Пад'еў гэтых крышанёў, падумаў: не грэх і паспаць. Пакуль даехаў да пошты, яна закрылася. Вяртаюся дадому любімым хойніцкім шляхам. Наездзіў сорак пяць кіламетраў, каб проста паесці і вылежацца.

•

Калі ехаў на лісапедзе, пабачыў пяткі дзеда Ганушы. Ён бегае ад мяне, бо месяц таму пазычыў «да вечара» трыццаць тысяч, каб апахмяліцца пасля Тройцы.

•

Радзіва «Прудок». Вячэрні выпуск навінаў.

Па небе перадаюць зоркі. Быццам не ў двары спіш, а ў космасе. Я Маленькі Прынц з Ромам замест ружы. Касмічны сабака брэша. Касмічная карова варушыцца. Як учора і як мільён гадоў таму. Як тут і як усюды.

А я ўжо не стану касманаўтам.

•

Цётка Дуня любіць чытаць мае тэксты. То бок дачка паказала ёй некалькі ў інтэрнеце. Цяпер яна прыходзіць да мяне і кажа:

– Напісаў штоліся?

– Напісаў.

– Пра што?

– Пра Колю.

– Гэта той – Валодзін?

– Ну.

– А што пра яго можна пісаць? Ён жа п'яніца. Напішы пра Марусю Зайчыкаву – як яна трыццаць гадоў даяркай адпрацавала, як ёй грамату далі.

– Я ўжо напісаў пра Колю.

– Ну, пачытай.

Я ўключаю ноўтбук і пачынаю чытаць:

– Коля хацеў выпіць.

– Абы-што! І куды ты гэта пішаш – мо ў раённую газету?

– Паслухайце далей.

– Давай, чытай.

– Коля хацеў выпіць. Ён абмацаў кішэні, хоць і так ведаў, што ў адной ляжаў вялікі цвік, а ў другой – цыгарэты з запалкамі. Прадаўчыха каму давала ў крэдыт, а яму – ніколі.

– Яна і не дасць! Было б каму. От раскажа Галі – тая яму дасць дык дасць.

– Я чытаю далей?

– Давай.

– Коля плёўся ўздоўж агародаў, пануры і задуменны. Падумаў, што свет да яго несправядлівы. Мужык ён харошы. Гаруе-гаруе ў тым калхозе, а выпіць няма як.

– Ажнедзе гаруе! От Галя – тая гаруе. На той Галі, беднай, жывога месца няма. Давай далей, ну.

– Ля Еўчынага плота Коля спыніўся. Зімой Ева пахавала свайго чалавека. Коля на памінкі не патрапіў, прыйшоў апасля, яна яму не наліла.

– Правільна зрабіла, што не наліла. Ну, што далей?

– ...Прыйшоў апасля, яна яму не наліла. «А я табе налью. Мне для цябе, Еванька, не шкада. От на табе, пі, Еванька, пі», – сказаў Коля ўголас і шчодра паліў Еўчын куст парэчак мачою.

– Абы-што! Той алкаш нашкодзіў маладзіцы пад куст, а ты ўжо і рады старацца! От нашто ты пішаш такое?

– ...І шчодра паліў Еўчын куст парэчак мачою. Адчуў палёгку. Далей ісці было весялей. Але выпіць усё адно хацелася.

– І гэта так пішуць у Мінску? Як п'яніца маладзіцы пад куст пасцаў – такое сягоння пішуць?

– Пішуць, цётка, пішуць.

– Абы-што.

– Увечары Коля вяртаўся дадому тымі ж агародамі. Адзін раз ён няўдала абапёрся аб Еўчын плот і перамог яго – плот упаў на парэчкі, а Коля – на плот. Прабрала на смех, які вырываўся з рота разам са слінай.

– Нашто ты пішаш пра тое, мой ты галубок? Марусі Зайчыкавай граммату далі – пра яе напішы. Яна ж без мужа век пражыла. Хатка ў яе бы лялька. Акуратненька, чысценька, есці наварана. І сама яна – лялька. А ты пішаш пра алкаша. Хіба пра такое можна пісаць, мой ты харошы?

– Пачакайце, цётка, я не скончыў.

– Не трэба мне, не чытай. Я, баба дурная, сяджу і вушы развесіла. Ідзі свайму Колю чытай. От яму ідзі і чытай, а мне такое не чытай.

– Далей усё хараша будзе. Мо дачытаю, а?

– Ай, не знаю. Не хочу я.

– От слухайце. Яшчэ колечкі часу Коля паляжаў, памармытаў сабе нешта пад нос і захрапеў. Прачнуўся ён пад гімн з Еўчынага прыёмніка. Галава моцна гудзела. Побач заспяваў певень, яму адказалі іншыя па сяле. Коля агледзеўся. Дзе ён ляжыць, то зразумеў адразу, а як сюды патрапіў – і не спрабаваў думаць. Ужо не першы раз ён прачынаўся не дома і трохі да таго прызвычаіўся.

– Не буду слухаць. Нават не чытай.

– На ім ляжала коўдра. Відаць, Еўка пашкадавала ды накінула.

– Няма ёй чаго рабіць. Я б яму вады з калодзезя выліла на морду яго паганую.

– Коля сеў на зламаны плот, яшчэ раз агледзеўся, дастаў з кішэні цыгарэты. Закурыў. Зараз Галя вернецца з начнога дзяжурства. Трэба хутчэй дадому, каб яна не дазналася, дзе ён начаваў. Але Еўка раскажа. А мо і не раскажа.

– Раскажа. А не раскажа – я раскажу.

– Коля ўстаў. У галаве нешта стрэльнула. Асцярожна паклаў коўдру пад брылём ганка і пайшоў дадому па малаток. Па радзіва сказалі, што надвор'е будзе добрае.

– Усё?

– Усё.

– Абы-што. Больш да цябе не прыйду.

•

Перад дажджом мухі шалеюць. Не дажыве Наташа да Спаса. Пацярплю-пацярплю – ды размажу па сцяне.

•

Мой дзед казаў: «Гаспадарку весці – не яйцамі трэсці». Ён меў найлепшую ў вёсцы хату. А я гарадскі лапух, які нічога не разумее ў будаўніцтве. Усё згніе, усё абрынецца.

Вы праслухалі перадачу «Чалавек, які ведаў дзеда, заходзіў у госці».

•

Шурык меў намер пусціць дзедаву хату на дровы. Яна муляла вочы сельсавету, і чыноўнікі летась далі Шурыку адзін год.

Сёння я б мог піць каву на балконе ў Мінску, мне б пазваніла маці і між іншым паведаміла б, што ў Прудку болей няма дзедавага селішча. Потым тут вырасла б калгаснае жыта, і штогод на Радаўніцу мы, нашчадкі, гулялі б у гульню: тамака быў плот, тутака баба Дуся сядзела на лаўцы. Мы штогод гуляем у гэтую гульню на вотчыне маці.

Аднак я неяк скочыў у апошні вагон, п'ю каву на ганку дзедавай хаты, Шурык застаўся без дроваў, калгас без жыта, нашчадкі без штогадовай забавы.

Я сёння сабраў гарох і цэлы дзень думаю, што яго магло не быць. У мяне мала фантазіі, каб уявіць гэты свет без гароху.

•

Дзедава хата не толькі стаіць на месцы, але просіць, каб яе адрамантавалі.

Заўтра распачнецца другі сезон прудкаўской талакі. Гэтым разам – самаарганізаванай. Калі раптам хто хоча далучыцца, пішыце. А я пайшоў па сала.

•

Радзіва «Прудок». Начны выпуск навінаў з гарышча.

Побач варушыцца талаковец Ягор, дождж б'е ў шыфер. Цені вячэрніх размоваў пра дзядоў вісяць пад страхою. А я сёння піў самагон. Але не так многа, як дзед Гануша, якога мы ўдвох цягнулі да хаты. Дзед прасіў не расказваць бабе Наташы. Спадзяюся, яна не чытае мой фэйсбук. Спадзяюся, ніхто не чытае мой фэйсбук.

•

Усю ноч перажываў за дзеда Ганушу. Ранкам пайшлі з Ягорам праведаць яго. Дзякуй богу – жывы. Быццам і не піў учора – сядзіць і глядзіць тэлевізар.

•

У мяне толькі адна шкарпэтка. Надзяваю яе, бо нага, якой я нядаўна стаў на цвік, яшчэ не зажыла да канца.

– А чаго ў цябе адзін насок? – пытае дзед Гануша.



– Што, хіба не чулі? Вы ж тэлевізар глядзіце. Увесь Мінск так ходзіць. Модна.

– Зусім людзі здурнелі ў гэтым Мінску.

Людзі ў гэтым Мінску, не дурнейце. Дзед Ануша з вас смяецца.

•

У пластыкавай бутэльцы засталося трохі самагонкі. А я нешта не падумаў і выкінуў.

Прыйшла цётка Дуня.

– Ну, от і я прыйшла.

– Здароўце.

– Здароў, ну. А чаго ты не радуешся? Я ж сказала, што болей не прыйду. Аж во – прыйшла!

– Ай, што тут радавацца? Самагонку я выкінуў.

– Куды выкінуў?

– У трактар. Трактар ехаў, я і выкінуў.

– Нашто ты яе выкінуў?

– Дык яна была ў зялёнай бутэльцы ад піва. Я падумаў, што то піва пракіслае.

– А колькі там было?

– Сямсот грам.

– От бесталач! Ну, бляха! Вой-вой-вой! От растроіў ты мяне. Ну выкінуў і выкінуў. Маць яе дыхала! Чаго плакаць? Плюнь і дунь. Ты ж усё адно не п'еш.

– Няхай была б. Я нагу націраю.

– От праўда. Няхай была б. Пашлі наллю.

– Я ж не п'ю.

– Ай, ідзі ты.

– У мяне госці.

– Якія госці?

– Ягор з Польшчы.

– А дзе той Ягор?

– У лес пайшоў.

– Па ягады?

– Па якія ягады? Да хвоі пайшоў.

– Да якой хвоі? Ён што, дурны?

– Ай, цётка, пасядзець пад хвояй пайшоў. Што вы як маленькая.

– А цьху ты! Пайшлі. Памянём тваю самагонку.

•

У Часлава Пяткевіча цікавая прыказка ёсць: «Тое, што мужык за вуглом кідае свінням, тое пан, схаваўшыся, нюхае сам».

От і ў мяне няма прыбіральні. Таму выраз «сходзіць да ветру» выглядае натуральным. Але падчас талакі высветлілася, што аднаго «сходзіць да ветру» мала. У выніку мы ўзбагацілі не толькі палескую зямлю, але і беларускую мову, бо ўвялі ва ўжытак яшчэ і «сходзіць да хвоі».

•

Другая талака скончылася. У мяне ёсць столь і сябры. І я не ведаю, чаму болей радавацца. Прадаўчыха яшчэ месяц будзе ўспамінаць Ягора: «Які харошы хлопец! А як жа ён прыгожа размаўляе па-беларуску!». Прудкаўцы паназіралі, як мы скубём палын за плотам, але не дацямілі, што калі пап'еш гарбату з палыну, можна пабачыць мастацкія вобразы. Алесіна малако выпіта. Радзіва «Культура» выслухана. Лес добра ўгноены.

Мне тут кажуць, што першай справай трэба пабудаваць прыбіральню, бо хадзіць да хвоі не камільфо. Але я першай справай, калі прыехаў жыць у дзедаву хату, зняў са сцяны партрэт Лукашэнкі, які павесіў Шурык, і павесіў партрэт дзеда. А прыбіральню зраблю, абяцаю.

•

Будуеш-будуеш хату, азірнешся – а дзеці-кавуняты павырасталі ўжо з градак. Трэба рабіцьградкі нападрост.

•

Дзед Ануша прытаптаў сцежку да маёй хаты. Сёння ізноў прыйшоў пазычаць грошы. А я, халера яго бяры, не магу дзеду адмовіць. Жанчыне адмовіць магу – дзеду не магу.

– Дзед, няма.

– Ну пашукааааай...

А вочы такія добрыя-добрыя.

Пашукаў.

Знайшоў.

Заб'ю я дзеда гэтымі пазыкамі.

Баба Наташа па тэлефоне дала яму ўтык: «А чаго ета цябе, красаўчыка такова, Горватаў з нейкім хлопцам дадому прывалаклі?»

Вернецца з лякарні – і мне дасць у тык.

«Нейкі хлопец» Ягор, табе добра: ты нашкодзіў і з'ехаў.

Баба Наташа, я больш не буду. Чэснае піянерскае.

•

Сёння дзед Гануша пайшоў ад мяне ні з чым. Я трымаў абарону шаснаццаць хвілін.

•

2:0. Гэны паганы пісака зноў не даў дзеду.

•

Радзіва «Прудок». Дзённы выпуск перадачы «Вы не паверыце».

Маці перадала каньяку ў трохлітровым слоіку. Сіцылійскія мафіёзі проста дзеці на фоне брутальных палескіх мам.

Не панікаваць: гэта на магарыч. У нас тут лепшы самагон і лепшае сала на магарыч ідуць.

•

Напіўся каньяком з Колем.

Коля гаворыць, што я харошы мужык.

– Маладзец, – кажа.

•

Думаў, пабудую хату, завяду казу, потым карову і каня. Буду апрацоўваць зямлю, карміць восем ратоў, прадаваць лішкі гораду. То бок жыць, як усе нармальныя вяскоўцы. Але гэта быў ідэалістычны малюнак утопіі пра тое, як беларуская вёска жыве. Папраўдзе ж няма ў вёсцы ніякага гаспадара, няма на каго раўняцца, у каго вучыцца.

Цётка Маруся з Аўцюкоў запэўнівае мяне, што алкаголік – «прапашчы чалавек». Маўляў, ён ужо «ні сям'і, ні хаты не пабудуіць». І я ўзгадваю бацькавага суседа, які спаліў на дровы хлеў, дрыботню, лазню. Сёння той

сусед, як бацька расказвае, выходзіць ранкам пакурыць на ганак і думае пра тое, ці так ужо яму той ганак патрэбны.

Яшчэ адзін – майстар па дрэве – жыве ў хаце без падлогі. У грубе ж паліць трэба было. Чым падлога не дровы?

Гэтым двум пашчасціла, што ў іхніх хатах е печы.

У Борускү жыве цётка, якая ўжо цяпер на вачах ператвараецца ў звера. Мяжу, дзе чалавек навучыўся ацяпляць хату, яна пасьпяхова перасекла ў адваротным напрамку. Летам неяк жыве, зімой разам з сабакам забіраецца пад падлогу хаты і зімуе там у кучцы анучак.

У вёсках ёсць сем'і, дзе старэнькія бабулі даглядаюць сваіх саракагадовых сыноў. Мыюць ім трусы, вараць есці. Сыны б'юць іх і прапіваюць іх пенсіі. Калі матка не дасць выпіць, сын можа проста забіць яе.

У Аўцюках толькі сёлета два сыны забілі сваіх матак за тое, што тыя ім не налілі.

Калі ж алкаголік не мае побач дарослага, які яго даглядае, не мае сваёй хаты, дзе б можна было перазімаваць у анучах, ён становіцца бяздомным сабакам. Ходзіць ля сметніц, вынюхвае сабе костку.

Далей – турма, смерць або рабства.

Мець свайго раба – гэта прывілей цыганоў. Такога, каб раб батрачыў на беларуса, на Палессі амаль не бывае. Ёсць асобныя шчасліўцы.

У суседняй вёсцы беларус Юрка з такіх. Ён неяк апярэдзіў цыганоў і месяц таму знайшоў сабе раба з каленкавіцкіх валацуг-алкаголікаў, забраў да сябе, і той цяпер працуе на яго селішчы ад світання да ночы. Юрка даў яму жытло ў дрывотні, корміць і налівае гарэлку раніцой і ўвечары. Астатні час раб робіць тое, што яму наказваюць.

У цыганоў рабы жывуць значна горш за таго, што ў Юркі. Той хоць раскладушку ў дрывотні паставіў. У цыганоў рабы спяць са свіннямі, ядуць абы-што. Да таго ж не маюць права ўвайсці ў хату. Дазволена толькі стаць на ганак, адчыніць дзверы і паклікаць гаспадара. Акрамя галавы, нішто рабскае ў цыганскую хату трапіць не можа. Юрка казаў, што свайго раба памыў, даў яму адзежу, а цыганы сваіх не мыюць, і тыя смярдзяць, як бамжы.

Я не ведаю, якім свет уяўляецца ў тых галовах. Можа, там ужо ўсё зламанае і нават ніякага пачуцця самасці няма. Гэта тая прорва, куды мне не хочацца зазіраць.

Мы – краіна-пераможніца, краіна герояў. Мы жывем у квітнеючай Беларусі. Мы ўсміхаемся з плакатаў з бусламі і вясёлкамі. Мы нясем свету мір і дабрабыт.

У нас няма вайны.

•

– Андрэй!

– Оў!

– Здароў. Я прыйшла саліць твае агуркі.

– Не трэба, цётка.

– Не дуры галаву. Дай мне вядро.

– Няма мне калі.

– Я сама пасалю. Паслухай мяне сюды: выцягні вады, прынясі балею і пачысць часнок. Чуеш?

– Ну.

– Андрэй!

– Оў!

– А дзе соль?

– Ота во.

– Андрэй!

– Цётка, я заняты.

– Займайся, хіба я не даю. Пакажы, дзе кроп.

– Тама во.

– Андрэй!

– Оў!

– Хадзі сюды, што скажу.

– Ну.

– Ідзі нарві вішні.

– Зара.

– Андрэй!

– Оў!

– Бяры лыжку і мяшай соль.

– Угу.

– От і пасаліла я табе агуркі. А ты не хацеў.

•

У маёй бабулі прозвішча Стома. От і я цяпер адчуваю стому. Нехта едзе на мора, а я хачу залезці ў куфар, узяць з сабою зямельны надзел, хату, кнігі, рэшту лета, заткнуць замочную шчыліну бабуліным вышываным ручніком і проста пабыць кабачком, для якога Космас – гэта агарод.

Праз тыдзень-два-тры вярнуся.

Да сустрэчы.





## У Шуры ёсць толькі сабака Палкан

У Шуры ёсць толькі сабака Палкан. Ён брэша на мяне здалёк, блізка падыйсці не асмельваецца.

– Палкан есці хоча, – кажу. – Ты б пакарміў яго.

– Мацъ яго дыхала! Няхай падохне! То паскудны сабака.

– Дзядзька Валодзя казаў, што Палкан ваўкоў ганяе.

– Срэцца ён, а не ганяе. Пшоў! Пшоў!

Мы ўвайшлі ў кухню. Гадоў дзесяць таму памерла Шурава матка, то ён увесь час жыве адзін.

– Колькі ў цябе пакояў?

– Мо тры. Ат, не ведаю! Я ў хату не хаджу. Там халодна. Я тут жыву.

Кухня нагадвае гараж майго брата. Я ссунуў з прыслона смярдзючае ашмоцце, сеў.

– Скідай. Халера яго бяры. То цётка не прыбрала.

Раз на месяц да Шуры з Аўцюкоў ходзіць цётка, прыбірае ягонае кубло. Але Шура не любіць той дзень, бо цётка сварыцца.

– Ат, паскуда, як мой Палкан. Толькі брэша. Укусіла б, дык забіў бы.

Шура дзьме ў шклянкі, каб вылецела смецце, праціpae іх засаленай кашуляй.

– Зараз вып'ем. Гэта маё, сам гнаў. Недзе гурок быў. Не, дзядзька, я гуркі ў суботу з'еў, выбачай. На, хлебам занюхай.

Мне піць не хочацца. Але мушу хаця б выгляд рабіць, што п'ю, бо Шураў нораў добра ведаю. Мужык ён спакойны, а потым як храсне па галаве – не паспееш з хаты выбегчы.

– Зламала мне ўсё жыццё тая хахлушка. Але нічога, жыву не горай за іншых. Хата е, рукі е, галава е.

Пра якую хахлушку ён гавора, я яшчэ не разумею, але ўжо здагадваюся, што сёння мы п'ём пад размовы пра жанчын. На кухні цёмна. Адзінае невялічкае акенца выходзіць на поўнач. Лямпачка пад столлю свеціць цьмяна. Гнілое паветра становіцца цяжкім ад смуродных Шуравых цыгарэт. Але я сяджу і цярпліва трымаю ў руках шклянку. Шура выпівае мо трэцюю.

– А-а-а, я табе ўжо наліў? – далівае толькі сабе.

Сядзім моўчкі. Цішыня становіцца невыноснай, але я не намагаюся яе парушыць. Шура доўга глядзіць на нож, што ляжыць на стале. Я думаю: от скончыцца цішыня, скажу далікатна, што хачу пайсці да ветру. І вазьму з сабой заплечнік. Пакуль Шура дацяміць, што я збег, я буду ўжо ў Аўцюках, то не дагоніць. А мо і не дазнаецца, упадзе і засне.

– Сука! – ён раптам б'е па стале кулаком.

Я разумею, што пайсці да ветру – ужо не хітрык, а пільная патрэба.

– Усё жыццё мне спаганіла! Чаго прысунулася? Заб'ю, сука!

У нашай размове настае той момант, калі дыялог узнікае паміж Шурам і ягоным нябачным суразмоўцам. А я станаўлюся выпадковым сведкам, які мае шанец за падслух быць пабітым. І сеў жа так нязручна – Шуру ніяк не абмінуць, калі раптам давядзецца бегчы.

– Заб'ю, хахлуха!

Аксана ніякая не хахлуха. Яна з аўцюкоўскіх дзевак. Калі Шура ў войска пайшоў, яна выскачыла за ўкраінца і з'ехала да яго пад Чарнігаў. Шура вярнуўся і забыўся, што такая была. Пачаў ездзіць на трактары, да дзевак чапляцца. Калі халодна, то ў качагарку іх вадзіў, а калі цёпленька, то ў хвойнічак. Рукамі ўмеў не толькі аўцючак мацаць – мог з трактара зрабіць верталёт і паляцець на ім. То ягоная матка – тады яшчэ жывая была – не сумнявалася, што сына некалі ўчэпіць самая спрытная аўцючка і не адчэпіцца ад яго. То будзе лад, як ва ўсіх. Усе хлопцы так – гуляюць, гуляюць, а потым:

– Матко, рэж кабанчыка, бо я жанюся.

– Жаніся, сынку, дай вам божанька шчасцейка ды дзетак здаровенькіх. Ды каб сонейка ў вашыя вокны пазірала.

Пакуль учэпістая аўцючка не патрапілася, Шура гуляў, колькі хацелася маладому целу. Але вярнулася ў вёску тая Аксана. Гадоў мо шэсць ці сем яе не было. А тут прыехала з чамаданам да сваіх бацькоў. Быццам бы муж у яе памёр. Людзі не дурныя былі, вушастыя, то і дачуліся, што мужык ейны пагнаў яе з хаты.

Шура на трактары ехаў, а тут Аксана шлях пераходзіла. Зірнула на яго, Шура і зніякавеў. Матка вечарам баршчу наліла – хлопец есці не стаў. Ранкам памыўся і паехаў да Аксаны. Стаў ля хаты, дзе яна жыла. Хвілін праз пятнаццаць Аксана выйшла, ізноў зірнула на яго.

– Ты, Шура, мо хочаш мяне на сваім трактары пакатаць? То ў мяне спадніца непрыгожая. А трактар у цябе – вунь які прыгожы.

Шура разгубіўся ды моўчкі з'ехаў. З тых часоў яго бы падмянілі. Перастаў вадзіць дзевак у хвойнік. Пасля працы ехаў дадому. Стаў маўчаць ды нешта сабе думаць.

З'явіўся ў Шуры сакрэт. За хлявом пад навесам ён выразаў з вялікай калоды Аксанін бюст. Калі той быў амаль гатовы, суседскія хлапчукі ўгледзелі ды пусцілі плётку па вёсцы: Шура закахаўся ў Аксанку і хоча ёй помнік з фантанам паставіць пасярод двара. Ён так раззлаваўся, што сякерай раздроб бюст і спаліў.

Аднойчы моцна напіўся, прыйшоў да Аксанінага акна, каб прызнацца ва ўсім, але не хапіла смеласці, і Шура заплакаў. Яна неяк угледзела тое і назаўтра пасмяялася з яго:

– Ты, Шура, калі яшчэ плакаць захочаш, то прыходзь. Толькі не пад вокнамі плач. А ў агародзе, бо памідоры сохнуць.

Шура стаў піць часцей. Матка глядзела-глядзела на яго хваробу ды не вытрывала – памерла.

Аксана доўга ў вёсцы не ўсядзела – пайшла на нейкія курсы і з'ехала ў Каленкавічы.

Я глядзеў на сваю пустую шклянку і думаў, што ўжо не баюся Шуры. Ужо не страшны ён. Не можа быць страшным чалавек, які носіць пад сэрцам боль.

– Я табе пакажу яе.

Шура не ўстаяў і ўпаў. Я дапамог яму падняцца.

– Нармальна, нармальна, дзядзька. Я шчэ не п'яны.

Ён пакорпаўся ў анучах на печы і дастаў адтуль невялікую фотакартку. З яе паглядала маладая ўсмешлівая дзяўчына.

– Во, глядзі якая паскуда.

– Прыгожая.

– То паскуда!

– Я і бачу, што ты спіш з ёю на адной печы.

– Ты, дзядзька, мусіць, даўно аўцюкоўскага кулака блізка не бачыў? То я пакажу табе.

Не, не можа быць страшным чалавек, які носіць пад сэрцам боль.

Заначаваў я ў дзядзькі Валодзі. Ноччу сасніў Аксану. Мы елі памідоры ў агародзе, а Шура стаяў там, нібы пудзіла, і плакаў.

Зранку пайшоў я на аўтобусны прыпынак. Палкан здалёк пачаў прыветліва брахаць на мяне. Шура неспакойна мераў крокамі даўжыню бардзюра. Ён быў памыты і паголены. Пах адэкалону перабіваў пах хвояў у лесе. Мяне Шура не пазнаў, бо быў цвярозы, але падобны да брагі: нешта ўнутры яго бурліла, не давала стаяць на адным месцы. Бы чужыя адзін аднаму, мы моўчкі ўглядаліся ў сіні плот, скуль мусіў павярнуць аўтобус на Каленкавічы.

# Раздзел 4

# Мяне не бяруць у касманаўты

•

Рома з'еў Наташу.

•

У навакольных вёсках пазакрываліся школы, усе настаўнікі згуртаваліся ў Юравічах і Аўцюках. Вакансій болей няма. Мяне не бяруць у касманаўты.

Жыццё боль. А я дармаед.

•

Няхай мяне не бяруць у касманаўты, але калі зрання едзеш на лісапедзе па Палессі, увесь такі памыты халоднай вадой са студні, увесь такі вылежаны на цвёрдых дошках, увесь такі наеты сырадоем, увесь такі напоўнены любоўю; калі едзеш вось так на лісапедзе, то не шкада, што не бяруць у касманаўты, бо Космас унутры. І думаеш: а калі хтосьці захоча забраць у цябе твой Космас – наважышся праткнуць яго віламі?

Наважышся праткнуць яго віламі.

•

Пазваніў дырэктару школы, дзе вучылася мая маці.
– Які-які настаўнік?
– Магу мову, літаратуру, гісто..
– А геаграфію?
– У прынцыпе... Ну... Калі падумаць...
– Вы нам падыходзіце. Вы нам ідэальна падыходзіце.

•

Радзіва «Прудок». Святочная віншаванка.
Географии учитель –
Наш живой путеводитель.
Поздравляем, ждем открытий
И торжественных событий,
И за Ваш прекрасный труд
Вами остров назовут.

•

Дырэктар школы рыхтуе мяне па тэлефоне да гутаркі з начальнікам аддзела адукацыі. Я мушу асабіста запэўніць столаначальніка ў сваім жаданні быць настаўнікам.

– У вас спросяць, чаму з Мінска пераехалі ў Прудок. Што вы скажаце?

– Прыехаў жыць на сваю радзіму, адрамантаваць хату дзеда, якая разбуралася.

– Папраўдзе, гэта несур'ёзная прычына. Што б вам такое сказаць?.. Эм... Ну, скажыце, што ў Мінску былі праблемы з жыллём.

•

Прагледзеў метадычку па геаграфіі. Дурная справа, лепей паслухаць Вольскага.

Міністэрства адукацыі vs Лявон Вольскі.

Міністэрства адукацыі:

«Воспитание чувства патриотизма», «региональный обзор земного шара», «отдельные сведения по философии, религии, искусству, морали».

Лявон Вольскі:

«Каб любіць Беларусь, нашу мілую маму,
Трэба ў розных краях пабываць.
Зразумееш тады: пад твaімі нагамі
Тры сланы нерухома стаяць».

•

Радзіва «Прудок». Навіны з перадавой.

Не назавуць мною востраў. Мяне не бяруць у касманаўты.

Жыццё боль. А я дармаед.

•

Радзіва «Прудок». Літаратурна-забаўляльная перадача.

Ларыса Фёдараўна Касячок сядзела ў сваім кабінеце і разгублена назірала, як муха спрабуе вырвацца з павуціння за партрэтам Лукашэнкі.

«Рома з'еў Наташу», – узгадала яна фразу са старонкі ў фэйсбуку маладога спецыяліста, які мусіць зайсці да яе з хвіліны на хвіліну. І трэба ж было ёй увечары натрапіць на той фэйсбук! Такая добрая навіна была,

што аб'явіўся малады настаўнік у Хвойніцкую школу. Дырэктар школы Васіль Пятровіч напрамілы бог прасіў яе па тэлефоне: «Толькі не суроч мне хлопца, Хведараўна. Ён нават пра заробак не пытаў. Не будзе настаўніка, сама будзеш ездзіць у Хвойнікі настаўнічаць. Сама панімаеш».

Пятровічу да пенсіі блізенька. Яму ўжо нічога не страшна. А Ларысе Фёдараўне яшчэ б шэсць гадочкаў за крэсла патрымацца. Далей няхай піша, хоць усрэцца.

Муха ўжо амаль не бзынкала. Самой ёй, без дапамогі, не ўратавацца. Павук сядзеў у шчыліне на рагу рамы і цярпліва чакаў, пакуль тая скарыцца мушынаму лёсу.

Халера яго бяры! Няхай старшыня бярэ на сябе адказнасць.

– Сямён Адольфавіч? Касячок на провадзе.

– Слухаю, Ларыса Хведараўна.

– Сямён Адольфавіч, тут такое дзела. Да мяне хутка прыйдзе адзін малады спецыяліст. Е вакансія. Я з Пятровічам рашыла вапрос. Но тут такое дзела. Хлопец піша многа лішняга ў гэтым фэйсбуку. Самі панімаяця, Сямён Адольфавіч, што могуць быць праблемы. Напіша не так, паляцім і я, і вы, як фанеры над Парыжам.

– З нашых хто?

– З Мінску, Сямён Адольфавіч. Але хто яго ведае, самі панімаяця.

– А што там з вакансіяй?

– Няма нікога, Сямён Адольфавіч, самі панімаяця.

– Учыцель нам нада, а праблемы нам не нада, самі панімаяця.

– Панімаю, панімаю, Сямён Адольфавіч. Самі панімаяця, панімаю, Сямён Адольфавіч.

Пасля размовы са старшынём Ларыса Фёдараўна паправіла на стале скрынку з канцылярскімі прыладамі і пацягнулася да партрэта.

– Кшшш, пайшоў, кшшш.

Павук трохі не паспеў дапаўзці да мухі. Ад кшыкання ён даў дзёру ў шчыліну на рагу рамы. Ларыса Фёдараўна накруціла павуцінне з мухай на аловак. Муха ўзбудзілася, загула. Фёдараўна не стала яе выблытваць, скінула з алоўка ў фортку.

Няхай яна там, на двары, сама сябе ратуе.

•

Прыйшла цётка Дуня. Села на ганак ды кажа:

– Пайшла я, сынок, па лісянкі. От.

– І што?

– І што? І нічога. Хаджу, хаджу па тым лесе – анічагусенькі. І мухамора не ўгледзела. От. Выйшла я на шлях, там у траве – а лісянак! Верыш?

– Ну.

– Што ты нукаеш! На ў кош паглядзі, колькі. Во багата як! А мамачкі! Я нагнулася ды збіраю. Тут нейкая машынка едзе. Едзе і спыняецца ля мяне. Выходзіць мужчына. Ага. Ну такі – пенсіянер. А я ракам стаю ля дарогі. Ён мне і кажа: «Жэншчына, вам плоха?».

– А вы што?

– А што я? «Харашо мне, харашо, – кажу. – Едзь адселя!». Паслухай што скажу. Папіць дай. Піць хочу. Што ты трасешся? Табе што, холадна?

– Ну, нешта змерз.

– Вунь жа кохта на цвіку! Ты як той – і кашуля вісіць, і дурань дрыжыць. Падштанікі ідзі надзень. Е падштанікі?

– Дык лета ж.

– Што лета? Я сама во паясніцу хусткай абматала, каб спіну не прадула. Лета… Няма ўжо лета. Усё. Жаніцца табе нада. От.

## ЖНІВЕНЬ

•

– Гэтага жонка забіла, гэны сам павесіўся, Хведарава патравіла сваіх дзяцей, жонка хрышчэніка зноў украла і ў турме. Гэтая п’яная памерла пад плотам, гэная збегла ў Мінск, – бабця на прыпынку проста расказвае пра сваіх суседзяў.

Вось так ажэнішся, а потым будзеш ламаць галаву: ці то павесіцца, ці то чакаць, пакуль жонка заб’е.

•

Баба Гаша кажа, што жаніцца трэба, але ў Бoруску дзевак няма.

– Е не жонкі, а мандажонкі. Такіх трэба вешаць цераз вуліцу, ды не за шыі, а за ногі – галовамі долу.

Дзядзька Валодзя сцвярджае, што жанкі п’юць кроў. Дзед Касцік цяжка ўздыхае і расказвае пра голую жанчыну, якую намаляваў, калі быў у войску. Баба Гаша смяецца.

У Аўцюках цётка Маруся, баба Воля і цётка Дуня знайшлі мне толькі адну гожую аўцючку. Але ёй усяго сямнаццаць. Неспадзеўкі.

Не спаць, дзеўкі!

•

Мае сябры з дыпломамі на развітанне кажуць «пакуль». А непісьменная баба Воля з Аўцюкоў – «ідзіце здаровенькі», як доктар славянскага мовазнаўства і гісторыі Ян Станкевіч прапісаў у сваім «Маленькім маскоўска-беларускім слоўнічку»: «Той, што адыходзе, кажа таму ці тым, што застаюцца: «Заставайся (заставайцеся) здароў! (здаровы!)». На гэта адзержуе адказ: «Ідзі (пайдзі, хадзі), ідзеце (пайдзеце, хадзеце) здароў! здаровы! (здаровенькі!)».

•

Вяртаюся ад бабы Гашы пешшу. За два дні падарожжаў ногі сцёртыя да крыві. На сонцы хоць ты гада пакладзі – і той спячэцца. Праз тры кіламетры пачнецца лес – будзе палёгка.

Ем сырую калгасную кукурузу. Пяю «Тры чарапахі». Каровам падабаецца. Я люблю.

•

Сяджу на ганку, думаю пра аўцюкоўскіх дзевак. Ідзе нейкі дзядзька. Углядаецца ў мяне. Крычыць:

– Здароў, сваяк!
– А чый то ты?
– А таго.
– А твой бацька.
– А мой дзед.
– А што ты робіш?
– А міма праходзіў.
– А заходзь у госці.
– А я дзевак прывяду.
– А дзе тут дзеўкі?
– А я ведаю дзе.
– А бывай здаровы.

•

Лёша кажа, што няма такіх дзевак, якія хочуць жыць у вёсцы і даіць карову. Што ёсць толькі ахвотніцы да ладу жыцця «вёска-лайт» – гэта

хіпстарская варыяцыя: какаву піць у сукенцы для какавы і пчолак на шкле вітражнымі фарбамі маляваць.

Я кажу, што ў свеце ўсякай усячыны ёсць. І што не ўсіх дурных вайна пабіла.

Ён не верыць.

•

Радзіва «Прудок». Навуковая перадача пра аўцючак.

Аўцюкоўскія сем'і карэннем сягаюць да глыбінных матрыярхальных асноваў. Аўцючка выбірае сабе мужа, як цыган каня: каб здаровы быў, дужы і цярплівы. Бо муж – гэта тая ж худобіна. Мо крыху больш статусная за каня (а мо і менш).

Мяне дык на аўцюкоўскім кірмашы мужоў узялі б у апошнюю чаргу – дый толькі таму, што ў поцемках добра не ўгледзелі б усіх хібаў. Найперш аўцючкі разабралі б лесарубаў у вышыванках.

Тое, што адрознівае аўцюкоўскі матрыярхат ад любога іншага беларускага, – гэта ўменне жонкі шанаваць сваю худобіну-чалавека. Калі мужык мусіць зрабіць шмат працы, яго трэба рэгулярна карміць і прыгалубліваць. Шчаслівы конь удвая хутчэй і болей працы зробіць. Таму кожны аўцюк пры аўцючцы пачувае сябе па-мужчынску рэалізаваным.

У Прудку да мужоў ставяцца інакш: таксама як да худобіны, але нелюбімай, абрыдлай. Гэта такі гвалтоўны матрыярхат.

Была б у мяне жонка-аўцючка, я б ужо тры кнігі напісаў.

•

Трыццаць шэсць і шэсць. Тэмпература паветра ў норме. Быццам з усіх бакоў абдымаюць здаровыя чалавечыя целы.

Пайду папляжую на курорце.

•

Ёсць у маім двары месца, дзе забуяла лебяда. Высачэнная – вышэй за мой рост. Вядома, можна было яе пакасіць, але, як той кажа, дурная работа. Я ў гэтым лябедніку нарабіў круглых пляцаў, злучыў іх калідорамі і назваў увесь мікрараён курортам. Калі нагляджуся ў інтэрнеце рэпартажаў з мора, бяру посцілку, кнігу і іду на курорт загараць. Угледзець мяне могуць толькі з верталёта, таму прыахвоціўся да нудысцкага пляжавання.

Вы кажаце: «Глухая вёска». А я кажу: «Курорт all inclusive». І не трэба плаціць мільёны, каб нарабіць сэлфі з нагамі: «Я ўвесь такі пляжую: мора, дзеўкі і загар».

•

Радзівапастаноўка з Аўцюкоў.

«Я як паглядзела, што там робіцца на гэных курортах – не лечацца там, а толькі гуляюць. Прыехала дадому, кажу:

– Больш не еду.

– Анігадкі! А чаго?

– Так...

Мой мужык таксама ездзіў з жалудкам. Прыехаў і кажа:

– Я больш на курорты не паеду.

– Анігадкі! А чаго?

– Так.

Дык і я прыехала і кажу:

– Так.

– Дык чаго так?

– Так. Ты не едзеш, і я больш не паеду. Таму шта так.

Дык ён:

– Дык чаго так?

– Так!»

•

Калі ў мяне выйдзе свая кніга, я назаву яе «Анігадкі», – пра што б яна ні была. Для мяне гэта самае загадкавае слова. Я чуў яго з дзяцінства, але дагэтуль не магу дакладна патлумачыць. Калі ласка, адгукніцеся, хто яшчэ дзе чуў «анігадкі». І што яно азначае ў вас?

•

Эй вы там, у Мінску, сядайце за стол і перапісвайце слоўнікі!

Мы тут учора правялі інтэрактыўную нараду па слове «анігадкі» і гуртам уразумелі, што слоўнікавае тлумачэнне – *анігадкі, прысл., разм. Хоць бы што* – нават прудкаўскія куры засмяюць. Высветлілася наступнае. Па звестках з Рэчыцкага Палесся, Любаншчыны, Магілёўшчыны, слова «анігадкі» відавочна паходзіць ад выразу «не думаў, не гадаў», але з большай

экспрэсіўнай афарбоўкай. Гэта такое «сюрпрайз!» («Вось буракі параслі, два ўкінеш і кош поўны, анігадкі!»).

У большасці выпадкаў, як заўважыла першая хваля аўцюкоўскіх перасяленцаў, «анігадкі» лёгка замяняецца на «гэта ж трэба!» («Гэта ж трэба, якія знянацку здаравенныя буракі параслі – аёечкі, божа ж ты мой! – Анігадкі буракі параслі!»). На Любаншчыне фіксуецца скарочаная форма – «анігадк».

На Мазыршчыне – «нягадкі». І тут слова набывае зусім іншае значэнне. («Нясеш талерку з баршчом, а тут захацелася чхнуць. Чхнуў – увесь боршч разліўся нахран па ўсім пакоі. Наеўся, нягадкі!»).

Як бачна, «нягадкі» – гэта беларускае «как бы не так!», але з больш эмацыйнай афарбоўкай.

І, нарэшце, трэцяе значэнне слова – тое самае слоўнікавае «хоць бы што» («Білі яго, калацілі, а яму ўсё анігадкі»). Хаця сувязь з першасным значэннем пакуль што не ўглядаецца.

•

Я зразумеў!
Любую расійскую ідыёму можна замяніць словам «анігадкі»!

•

Радзіва «Прудок». Перадача «Анігадкі!».
Прудкаўскі кнігазбор сёння ўзбагаціўся кавалкам Кракава.
Паштарка прывезла на лісапедзе апавяданні Ежы Пільха.
– Здраствуйця, гэта я!
– Мо вам кабачкі трэба?
– Вой, у самой багата. Аддайця каму-небудзь.
– Дык ніхто не бярэ.
– Карову трэба завесці. Ці жонку.

•

Урывак з кнігі «Беззваротна згубленая леварукасць», Ежы Пільх:
«Чалавек, які піша, у пошуках жанчыны свайго жыцця неаднаразова завязваў знаёмствы з патэнцыйнымі кандыдаткамі на гэтую ролю, але, на яго бяду, кожны раз выходзіла, што патэнцыйныя кандыдаткі таксама пішуць».

•

– Што робіш, сынок?

– Тварог.

– Ай, кідай! Ідзі чайнік стаў. Пабач, якія рукі! Бачыў такія? То я так хвасолю ўбірала. Натамілася. От прыйшла цябе паслухаць. Напісаў штоліся?

– Ага.

– Як назваў?

– «Ябвдул».

– Пра што то?

– Пра дзевак.

– Ну маладзец! Хоць раз нармальнае напісаў. Чытай.

– У нашым грамадстве існуе культ «ябвдул». Мяне да яго прывёў старэйшы брат, які сваімі штодзённымі гулянкамі прачытаў родавы спецкурс «Як стаць “ябвдулам” і ганарыцца сабой».

– От і мой меншы, Антон, такі самы. Таўчэ і таўчэ тых дзевак. І скуль, бра, толькі сілу бярэ?

– Але ўзорным «ябвдулам» я не стаў. Бывалі выпадкі, калі заставаўся з падпітай дзеўкай сам-насам, і яна пачынала цiснуцца да мяне, а я не хацеў.

– Дзеўкі цяпер такія – самі лезуць. Калісь такога не было, сынок. Калісь дзеўкі былі як дзеўкі.

– У такія моманты я вельмі перажываў, што дзяўчына можа падумаць, што я не «ябвдул».

– У такія моманты яна падумае, што ты еўнух, сынок. Нікому хоць не расказвай, што дзеўка цябе абдымала, а ты не хацеў. Сорам! Мужчына заўсёды дзеўку прылашчыць, на тое ён і мужчына.

– Я вырас у грамадстве, дзе мужчына хоча і можа заўсёды, усіх і ўсюды. Ён (я), можна сказаць, спецыяльна нарадзіўся для сексу.

– Ну правільна. Усе мужыкі такія. Што б харошае, а ў вас толькі адно ў галаве. От і мой Антон кажа: «Мамо, пайду да дзевак». Ідзі, кажу, сынок. Ты, Антон, кажу, етае во. На то ты і мужчынка, кажу, каб хадзіць.

– Узгадваю выпадак, як вельмі даўно святкаваў свой дзень народзінаў. Сярод іншых гасцей была Валя. Я зашмат выпіў і нясцерпна захацеў пацалаваць тую Валю.

– Пацалаваў?

– Ну. Я выйшаў за ёй у ванную. Валя не супраціўлялася, і наш пацалунак адбыўся палюбоўна. Валя хіхікала і жартавала, а потым пабегла на спатканку да свайго хлопца.

– Ат, цалавацца не ўмееш, што дзеўка да хлопца пабегла.

– Я паставіў мэту і праявіў ініцыятыву, як грамадства патрабуе ад мужчыны.

– Маладзец. Давай чытай далей пра Валю. А з хлопцам тым у яе што? Мо замуж узяў?

– Не ведаю, цётка. Я ж не пра тое напісаў.

– І дзеўку пацалаваць не ўмееш, і расказваць не ўмееш. Ат! Ідзі, мой харошы, і рабі тварог. От.

•

Калі сказаць расійскай мовай «За мной побежала Валя», то не зразумела, ці то я ад яе ўцякаю, ці то Валя бяжыць з добрымі намерамі. У беларускай мове ўсё чотка: «За мной пабегла Валя» – трэба ўцякаць. «Па мяне пабегла Валя» – трэба бегчы насустрач, мо дасць што.

•

Страшныя справы дзеяцца. Я ж упэўнены, што фэйсбук – гэта адзін свет, а рэальнасць – зусім іншы. І што гэтыя светы перасякаюцца толькі па маім хаценні. Як той кажа, нягадкі! Прыехала нейкая цётка, перадала мёд ад сваякоў. Папрасіла:

– Толькі ж не пішы ў фэйсбуку, што прыехала нейкая цётка, перадала мёд ад сваякоў.

Добра, не буду. Я ўжо і да хвоі баюся ісці: увесь Каленкавіцкі раён будзе ведаць.

•

Доня выселіла мяне з каморы. А ў мяне нармальны інтэрнет толькі там е. У сенцах інтэрнет высока – пад столлю. Таму выходжу ў сеціва пааконску – стоячы. Калі да зімы мне не правядуць тэлефонны провад, мне спатрэбяцца валёнкі, фуфайка і вядро гарбаты, каб зрабіць такі допіс.

•

Над Варварыным ложкам вісіць пучок палыну. Але я ж не магу сказаць, што гэта проста сохне Artemisia absinthium L. Я ж магу толькі бязглуздзіцу прыдумаць. Пра чароўныя зёлкі, якія наўмысна павесіў тут, каб

доні не сніліся пачвары. Калі-небудзь Варвара стане старэнькай бабулькай. Да яе прыедуць унукі цяперашніх СЭТаўцаў збіраць фальклор. Баба Варка раскажа пра чароўныя зёлкі, якія бацька колісь вешаў над ейным ложкам. І я са сваёй травой ад запораў траплю ў кнігу.

•

Камбінезон – не самае простае слова для вымаўлення. Мы з Варварай дамовіліся камбінезон называць кабзонам.

– А калі я кабзона абсікаю?

– Нічога, нічога.

Як той кажа, Кабзона можна і абкакаць.

•

Радзіва «Прудок». Лірычная вітамінка.

Знічкі па начах падаюць у вядро ля студні.

Яшчэ яны перакідаюцца ў ваўкоў і сыходзяць у лес. Але знічкі, што згаслі цалкам у калодзежнай вадзе, назаўжды застаюцца пажоўклым лісцем.

•

Заязджаў дзядзька Андрэй – бацькаў сябар. Стаім, гамонім. Ля калгаснай канторы пачалі гучна сварыцца мужыкі.

– Во, аўцюкі б'юцца за работу. Я пабёг, бо ўсю работу разбяруць і мне не хопіць, – дзядзька скочыў у трактар і памчаў у калгас.

•

Камбайнеры камбайнуюць. Трактарысты трактаруюць. Малакавозы малакавозяць.

А я нейкую лухту пра знічкі выдумляю. Гуманітарый у вёсцы – гэта як ружовы бант на свінні.

•

Надзеў на сланечнікі рознакаляровыя Варварыны калготкі і паўдня рагачу.

•

Радзіва «Прудок». Перадача «Ішчу цібя».

Мае шаноўныя сваякі з Каленкавічаў, дзеці і ўнукі маёй дваюраднай бабы Наташы, прыём! Я ўчора спрабаваў знайсці вас, але згубіў паперку з вашымі нумарамі тэлефонаў і імёнамі, якую мне перадалі малакавозам. Я знайшоў усіх каленкавіцкіх Пільчанкаў, з некаторымі мы нават амаль высветлілі сваяцтва. А вас не знайшоў. Я ведаю, вы чытаеце мой фэйсбук. Накіруйце, калі ласка, дадатковы малакавоз з цыдулкай.

•

Адскроб я сёння з Варвары пясок, а з ноўтбука – мушыныя какашкі. Наадэкалоніўся. І пайшлі мы ў госці да чатырохюраднай сястры, якая прыехала з Балгарыі.

Сонца ўжо ўпала за страху кароўніка. Каровы ўсміхаліся. Сухі палын пах на руках. Варвара скакала ў хмызняку, ноўтбук біў па плячах. Змучаныя калгаснікі сёрбалі пад покуцямі крышані. У дамах закіпала вада на чай. Усё было добра. Адным словам – па-вясковаму вечарэла.

А балгарская сястра-псіхатэрапеўтка і кажа:

– Твой переезд в Прудок связан с какой-то психологической травмой?

•

Іду па Мінску. Усе людзі чужыя. Няма каму «здрасця» сказаць.

•

От што я вам скажу, даражэнькія. Мінск – цэ Еўропа. Лухта, што мінчукі не ўсміхаюцца ў метро. Парыж – амаль такі еўрапейскі, як вуліца Карла Маркса. У Амстэрдаме амаль столькі ж раварыстаў, як на праспекце Незалежнасці. Негры ёсць. Кітайцы ёсць. Арабы ёсць. Прыгожыя жанчыны ёсць. Хіпстары ёсць. Лесарубы ёсць. І ўсе гарманічна суіснуюць. Дзіўна толькі, што бязвізавы рэжым з Прудком.

•

У цягніку я заўсёды трапляю ў эпіцэнтр храпучых мужыкоў. Яны сапуць і пярдзяць, а ў мяне тонкая душэўная арганізацыя.

•

Радзіва «Прудок». Урок беларускай мовы.
Сёння вывучаем сітуацыйныя дыялогі.
Дыялог №1.
– Як здароўе?
– Ааа... хярова. У цябе е што?
– Няма.
Дыялог № 2.
– Як маешся?
– Гарую.
– Ну, гаруй, гаруй – не буду перашкаджаць.

•

Яшчэ некалькі месяцаў мыцця ў вядры – і я пайду працаваць у прудкаўскі цырк шапіто галоўным акрабатам. Добра, што ў тыдні адзін чысты чацвер.

•

Не-не-не! Не трэба +20!
Вярніце спякоту!
Кавуны дагадаваць трэба.

•

Дыні, кавуны, багамолы.
Гэта Беларусь, дзетка.

•

Радзіва «Прудок». Ізноў перадача пра гараванне.
Палескі жаночы ген перадаецца праз слова «гараваць».
Палескі мужчынскі ген перадаецца праз слова «змагацца».
Калі я жыў у Мінску, да мяне часта прыязджаў брат, прывозіў бульбу-варэнне ад маці. На развітанне казаў:
– Ну, давай, змагайся.
Маўляў, я табе дапамог, чым мог, далей цягніся да сонца сам.

Потым званіла маці:

– Трэба гараваць. А як ты думаў – што ўсё лёгка будзе?

Учора мяняў шыбу ў акне. Зайшоў у двор Коля, які год таму пазычыў трыццаць тысяч і дагэтуль не вярнуў:

– Ну што, змагаешся?

– Змагаюся.

– Змагайся.

Потым цётка:

– А ты ўсё гаруеш?

– Гарую.

– Гаруй.

Пакуль замяніў адну тую няшчасную шыбу, я пазмагаўся і пагараваў.

Гэтыя два словы не перакладаюцца на расійскую мову. Яны складаюць структуру інь-ян, у якой гараванне стрымлівае змаганне. Параўнайце з расійскім змаганнем: яно нястрыманае, бязвектарнае. Нашае ж – заціснутае ў гараванне. То бок мужчынская энергія стрымліваецца жаночай. Стрымліваецца не для знішчэння, а для захавання. Каб энергіі змагання хапіла і нам, і нашым маленькім змагарам.

Палеская філасофія сцвярджае: ты можаш дасягнуць любой вышыні, але суразмерна заплаці за яе. Колькі пагаруеш, столькі назмагаеш. Гэта і ёсць беларуская мова, а не як называць посуд для кіпячэння вады – імбрыкам ці чайнікам.

•

Маці расказала пра свайго бацьку.

У пачатку лета 1961 года ў вёсцы Бярозаўка ва ўзросце 37 гадоў паміраў мой дзед Іван, матчын бацька. Перад смерцю ён нясцерпна захацеў ігрушавага расолу. І мая дзевяцігадовая маці пайшла да свайго дваюраднага дзеда Сафрона – адзінага ў вёсцы, хто квасіў дзічкі. Дзед Іван здаволіўся тым расолам і памёр.

Маці дагэтуль штогод квасіць дзічкі па тым рэцэпце – з жытнёвай саломай, соллю і лістом смародзіны.

– Дзеўкі, наце вам кастрыцы, – казаў дзед Сафрон бярозаўскім дзеўкам і раздаваў квашаныя грушы.

Спіце спакойна, дваюрадны прадзед Сафрон і дзед Іван. Потым, калі я стану дзедам Андрусём, буду квасіць дзічкі і чапляцца да прудкаўскіх дзевак:

– Дзеўкі, наце вам кастрыцы.

•

Прудкаўская пошта пачынае злавацца на імя Андрусь у афіцыйных дакументах.

– Ёсць жа, – кажу, – Кастусі. Чым вам Андрусі не падабаюцца?

– Няма такога імя, – кажуць. – Кастусь ёсць. Андруся няма.

– Вось ажанюся, – кажу, – стану Андрэем.

– Ну то хутчэй жаніся.

•

Я падумаў: калі мяне не бяруць у касманаўты, то трэба стварыць новую школу і працаўладкаваць сябе ў яе. І стварыў – Беларускую віртуальную школу УКантакце. Сказаў, што я яе дырэктар, і даслаў каля дваццаці запрашэнняў у розныя куткі Каленкавіцкага раёна. Паведамленні былі аднолькавыя, але вельмі натхнёныя.

Першы адказ прыйшоў хутка ад патэнцыйнай кліенткі з лаканічным імем Люда:

– И зачем оно мне?

Я хуценька расказаў Людзе пра ўсе перавагі адукацыі, пра гарызонты, якія адкрываюцца перад ёй на шляху да самаўдасканалення, пра перспектывы, пра магчымасць сфарміравацца дасканалай пасяховай асобай і змяніць увесь свет. Адказ ізноў прыляцеў імгненна:

– Оно мне надо?

Чатыры дні да першага верасня. Сяджу, чакаю вучня. Спадзяюся знайсці хоць аднаго, перадаць яму цяжар свайго жыццёвага вопыту і сысці на пенсію выразаць з дрэва свістулькі.

•

Калі я быў падлеткам, на гарышчы бацькавага леціішча чытаў «Зямлю пад белымі крыламі» Караткевіча. Шыфер за дзень награваўся так, што моцна пахла сухім пылам. На лямпачку зляталіся мятлушкі-самагубкі. З хаты даносіліся гукі радзіва: «Аддзел кадраў мясакамбіната віншуе з юбілеем нашу дарагую, любімую, усімі паважаную бухгалтарку Маргарыту Пятроўну». Праз маленькае акенца ў падстрэшша цякла вечаровая прахалода.

Кожны раз, як я бяру ў рукі «Зямлю», уяўляю бухгалтарку Маргарыту Пятроўну ў святочнай блузцы.

•

Сёння я чакаю ў госці сваю бабцю – гаспадыню хаты, якая памерла тут 18 гадоў таму.

•

Дзядзька Пятро робіць трубу.

Першага верасня дзеці пойдуць у школу, а хата закурыць дровы. Пацячэ дым з трубы. Прачнуцца энергіі. Пачнецца жыццё ў заспанай хаце.

## ВЕРАСЕНЬ

•

Учора бацька папрасіў у свайго сябра, дзядзькі Андрэя, азбеставую трубу на дымаход. Дзядзька Андрэй пачасаў патыліцу, сказаў, што ў яго няма і ён не ведае, дзе ўзяць, але да раніцы знойдзе.

Увесь вечар бацька запэўніваў нас: ён знойдзе, бо паабяцаў. А не знойдзе, то ўкрадзе – здыме з чыёйсьці хаты, пакуль гаспадары спяць. Калі аўцюк што абяцае, то зробіць. Потым мы праслухалі даўгую лекцыю «Калі твой сябар – аўцюк, то ты як за Богам». Затым яшчэ адну: «У вайну за аднаго аўцюка восем эсэсаўцаў давалі». Я канчаткова пераканаўся, што сябар-аўцюк – яшчэ большае шчасце за жонку-аўцючку, і пайшоў спаць.

Ранкам трубы не было.

Мой бацька хадзіў пануры. Пячнік дзядзька Пятро еў болей сала: назапашваў сілы на дымаход з цаглінак. Усе прачухаліся пасля вечаровага ідэалізму. І аўцюкоўская дубальтоўка раз у год не цаляе ў мішэнь. Мой бацька яшчэ болей пастарэў. Яго вочы згаслі.

Восем гадзін раніцы.

Дзевяць гадзін раніцы.

Трубы не было. Бацька старэў і старэў. Але сядзеў на ганку і ўсё адно чакаў.

У нейкі момант мы ўсе азірнуліся. За плотам стаяў трактар. З трактара тырчэла азбеставая труба.

Ужо не так яна, труба, была патрэбна, як вера ў сяброўскае абяцанне.

Дзе ён узяў тую трубу, мы не ведаем. Зарослую стогадовым мохам – верагодна, дзядзька Андрэй, сапраўдны аўцюк, за якога б восем эсэсаўцаў далі, выцягнуў яе з іншасвету.

•

Маці прывезла з дому вугалькі са сваёй печы. Ёсць такая традыцыя, калі бацькі дзеляцца з дзецьмі агнём з сямейнага ачага. Кідала яна тыя вугалькі ў маю грубу і прыгаворвала:

– Каб жонку сабе знайшоў, каб дзетак нарадзілі, каб цёпла было.

От так замоўлены-зачараваны агмень.

•

Я залез на страху, каб залатаць дзірку. Дым з трубы гуляў у маіх валасах, а я фоткаў кароўнік за хатай і думаў пра тое, што яшчэ летась губляў раўнавагу, калі залазіў на табурэт, каб укруціць лямпачку. Цяпер я нічога не губляю на любой вышыні.

•

Дзядзька Пятро за вячэрай кажа майму бацьку:

– Ты браканьер.

Бацька з усяго дуру б'е кулаком па стале так, што самагонка ўзбіваецца да масла.

– Я не браканьер! – пена закіпае на бацькавых вуснах.

Поўня. Ціша. Пад Аўцюкамі брэша сабака. Дрыжыць сэрца дзядзькі Пятра. Пад бацькавымі вусамі, як дзіцятка, нараджаецца ўсмешка.

– Я маленькі браканьерчык.

•

Прыём! Тут ёсць спецыялісты па алгебры за 9 клас? Трэба дапамагчы маёй вучаніцы.

•

У дзявятым класе я быў закахаўся ў настаўніцу. Я нават прызнаўся ёй у гэтым праз газету «Чырвоная змена». Але пад прызнаннем стаялі мае ініцыялы – каб яна не здагадалася.

А ўчора вучаніца-дзевяцікласніца маёй віртуальнай школы напісала мне: «Я вас кахаю». І ведаеце што? Я ўзрадаваўся. Бо яна ўпершыню напісала па-беларуску без памылак.

# Сонейка, хадзем

Антон любіў паляваць на дзевак на бацькавым УАЗіку. На маё «карочэ» ён адказваў:

– У каго карочэ, той дома сядзіць.

То я і не сядзеў, каб тая прымаўка не прыліпнула да мяне. Хоць і меў малы ўзрост – гадоў чатырнаццаць, – бавіў час у яго кампаніі.

Антон быў самым гучным ва УАЗіку. З аўтамабільных дынамікаў раўла расійская папса, рагаталі хлопцы, радасна пішчалі дзеўкі, але Антонавы жарты былі над усім гэтым.

З дыскатэкі мы ехалі ў вясковую хату. З аднаго боку жыў стары паліцай Сцяпан, з другога – баба Маруся, якая ніводнага разу не была з мужчынам. Хтосьці любіў падкалоць Антона:

– Ідзі да Пятроўны. Яна дзевачка.

У хаце добра выпівалі, закусвалі гуркамі са слоікаў. Дзеўкі ўжо былі абмацаныя, іх п'яныя позіркі губляліся. Смех сціхаў, святло згасала, і пад стогны з дзеўкамі рабілася тое, за што маткі маглі пабіць іх мокрымі ручнікамі. А я станавіўся выпадковым сведкам – нецікавым і непатрэбным нікому праз свой узрост.

Аднаго разу дзяўчына, якую счапіў сабе Антон, завагалася і, як той кажа, не дала. «Сонейка», як ён называў яе, прыліпнула да мяне, бы смала. Антон угаворваў:

– Сонейка, хадзем. Хадзем, сонейка.

Сонейка дрыжала ўсім целам і трымалася за мае худыя плечы, як за адзіныя бяспечныя мужчынскія той ноччу.

Да світання мы сядзелі ў кухні, варажылі адно аднаму на картах. Антон ляжаў у куце на канапе – то спаў, то прачынаўся і пачынаў мармытаць сваю каціную песню:

– Со-о-о-онейка. Со-о-о-о-о-о-онейка. Хадзем.

Мы ціхенька хіхікалі з яго. Ужо пачынала світаць, куты станавіліся светлымі, няможна было зацягнуць у іх дзеўку і схаваць там грэх.

Тое Сонейка так і не пасвяціла Антону, і днём я спаймаў ад яго кухталя – каб на ўсё жыццё запомніў, што няможна ноччу ў кухні хіхікаць з чужой дзеўкай.

Адным разам Антонава паляванне скончылася жаніцьбай. І стрэльба ўжо страляла толькі ў сямейным ложку.

Нядаўна я наведаўся да іх. Мы павячэралі ўтрох. Пакуль Антон разбіраў мне ложак, мы з Аксанай засядзеліся. Ён ужо пайшоў спаць, а мы сядзелі і сядзелі. Размаўлялі пра рознае, хіхікалі.

Гадзіны праз дзве да нас прыйшоў Антон. Ён стаяў у трусах і паўтараў:

– Со-о-о-онейка. Со-о-о-о-о-о-онейка. Хадзем. Со-о-о-онейка. Со-о-о-о-о-онейка. Хадзем.

Мабыць, усё-такі я не надта добра засвоіў, што няможна ноччу ў кухні хіхікаць з чужой дзеўкай.

Раздзел 5

# Жыццё – гэта шарлотка белая, шарлотка чорная



•

Кожны каток мае права на печ.

•

Перанёс сёння на гарышча 800 кілаграм гліны, а маці і кажа:

– Каб мне хто калі сказаў, што мой Андрэйка будзе працаваць рукамі да трэцяга поту, я б карову паставіла, што такога ніколі не будзе. Ён жа ў мяне толькі кніжкі чытае.

Учора адраманатаваў суседцы тэлевізар. Трэба было наладзіць адзін канал. Зрабіў дзевяць. Суседка дала мне рулецік.

– То магарыч, – кажа.

Калі я выйшаў з хаты і пасунуўся ў цемру вуліцы Дзяржынскага, яна выбегла і закрычала:

– Стой! На шчэ сала і батон!

Ніводную жанчыну я так не ашчаслівіў, як суседку.

Мама, я не гуманітарый. Не гуманітарый я, мама! Я сала магу зарабіць яшчэ і адвёрткай!

Бацька, памятаю, заходзіў да мяне, а я сядзеў за сталом пад цьмяным святлом лямпы і перапісваў у сшыткі бібліятэчную кнігу «Древняя Русь и Великая степь» (навошта?). Ён доўга-доўга глядзеў на мяне і ні разу нічога не сказаў. Я і так разумеў яго расчараванне і – перапісваў «Древнюю Русь» яшчэ больш спрытна. Потым узяў і напісаў «Повесть о настоящем сыне» – пра хлопчыка, які згубіў свайго бацьку і шукаў цягам доўгіх гадоў.

Гэта я тады думаў, што бацьку можна адшукаць на бязлюдным востраве. Папраўдзе ён тут – у хаце, дзе нарадзіўся. Звоніць хлопчыку і кажа:

– Хачу прыехаць памагчы табе насіць гліну.

•

Раніцой кнігі піша, днём гліну носіць, увечары тэлевізары рамантуе, ноччу шарлоткі пячэ. Не мужык, а мара гэты ваш Горват.

•

Прыйшоў да цёткі Дуні. Катлеты ем.

– Рамонт я зрабіла. Засталося разабрацца з мянтамі, калдаўством і пасадзіць часнок. Жуй катлету.

– Больш не хочу.

– Што ты – «Не хочу ды не хочу»? Жуй! А я, пакуль вада закіпіць, пайду шыфер паладую.

– Давайце я...

– Ся-я-ядзі-і-і. Ты мужы-ы-ык. Табе есці нада.

•

Прыехаў дваюрадны брат. А ён качок. Я падумаў, што грэх не выкарыстаць у сваім селішчы качка, і папрасіў яго панасіць на гарышча гліняны раствор. Даў вялікае дваццацілітровае вядро. Але брат насіў гліну памаленьку ды паціху.

– Набірай поўнае, – кажу.

– Цяжка.

Паехаў ён дадому качацца далей, а я хуценька закінуў на гару яшчэ паўтоны гліны ды пайшоў дровы калоць.

От я і думаю: нашто чалавеку мышцы? Ну няхай адна з прычынаў – прываблівАць самак. Касцямі можна прывабіць толькі курэй: яны на кальцый вядуцца. Але насіць на сабе кускі мяса, праціраць іх алеем і паказваць даяркам, якія будуць думаць: «Уаў!» – пф, не смяшыце мае жылы.

•

Трэба проста зрабіць гэта. Мой дзед зрабіў бы. Ён быў ворагам народа ў чатырнаццаць гадоў, спаў стоячы ў лесе і нічога не баяўся. Мой бацька зрабіў бы. Ён сто два разы скочыў з парашутам, камандаваў палком і нічога не баяўся.

Трэба проста зрабіць гэта. Трэба проста выліць на сябе раніцой вядро ледзяной вады са студні.

•

У мяне засталося 100 рублёў. Запалкі каштуюць 400. Мяне гэта турбуе? Мяне гэта не турбуе.

У Мінску без ста тысяч у кішэні мне страшна было выйсці з кватэры.

Сёння я ўпэўнены, што грошы і рэчы ўсяго толькі дапамагаюць адцягнуць увагу ад унутранай цішы ды перажыць адзіноту.

Калі я стану старым разумным дзядзькам, я напішу пра гэта кнігу.

•

А мо я ўжо стаў старым і разумным? Сёння памыюся і пачну пісаць раман.

•

Прыйшоў да цёткі.

– Што ты там пішаш?

– Раман.

– Пра што?

– Ай, вы не зразумееце.

– Думаеш, цётка Дуня такая тупая?

– Ну, гэта антыўтопія з элементамі...

– Чай будзеш?

•

«Дорогая хозяюшка! Спасибо, что взяла меня с полки!» – сказаў мне пральны парашок у прудкаўской краме сонечным ранкам.

•

Калі прыязджала маці, вучыла мяне, як мыць бялізну пранікам. Яшчэ я праслухаў бонусную лекцыю пра тое, як пазаліць бялізну.

•

Радзіва «Прудок». Перадача па заяўках.

По мнагачысленых просьбах трудзяшчыхся і дармаедаў расказваю, як заліць бялізну. Спосаб паходзіць ад маёй бабулі – барусканскай аўцючкі, у жылах якой цякла гарачая кроў украінскіх казакоў. Мабыць, гэтак жа залілі па ўсёй Беларусі.

Заліць мы будзем лён: прасціны, ручнікі, посцілкі, кашулі – што, несумненна, ёсць у кожнай мінскай кватэры.

Да залення бялізну трэба памыць усім нам вядомым і зручным спосабам – біццём. Гаспадыні бяруць у рукі пранікі, што выразалі з грабу мужы, і гурбай ідуць з бялізнай, пранікамі, гаспадарчым мылам на Мінскае мора. Там ужо мужы збудавалі драўляныя трохкутнікі. А тыя гаспадыні, чые

мужы лайдакі і не збудавалі трохкутнікі, ідуць на мора ў гумовых ботах, і біць давядзецца аб іх. Далей пачынаюцца біццё, мыццё, пакуты. Усе дружна спяваюць абрадавыя песні. У небе лётаюць буслы.

Потым вяртаемся ў свае кватэры, выграбаем залу з пячэй і распальваем у іх. Памытае і адбітае складаем у начоўкі з дзіравым дном, паверх сцелем фартух, на яго кладзем залу. Дастаем з печы чыгуны з кіпнем і ліём у начоўкі. Так некалькі разоў запар. Потым хуценька, пакуль бялізна гарачая, бяжым на Мінскае мора і там яе палошчам.

Усё проста.

•

Выпытаў у маці, як у іх казалі – зала ці попел.

– Сільна граматныя казалі «зала», нармальныя – «попел».

Хоць не ўсе з гэтым пагодзяцца, але я нармальны. Попел дык попел.

Мяне яшчэ развесяліў матчын аргумент:

– Нават баба Ганна называла попелам, хоць яна ў школе працавала!

А баба Ганна працавала ў школе прыбіральшчыцай.

•

Дзядзька Саша пазваніў у лякарню сваёй сястры – цётцы Вользе. У той былі праблемы з настроем, і цётка Вольга накрычала на свайго брата – дзядзьку Сашу. Дзядзька Саша пазваніў другой сваёй сястры – маёй маці – і пажаліўся ёй на цётку Вольгу, што тая накрычала на яго, калі ён пазваніў ёй у лякарню. Мая маці пазваніла сваёй сястры – цётцы Вользе – і накрычала на яе за тое, што тая накрычала на іх брата – дзядзьку Сашу, калі той пазваніў ёй у лякарню. Цётка Вольга пазваніла дзядзьку Сашу і выбачылася за тое, што накрычала на яго, калі ён пазваніў ёй у лякарню. Заадно цётка Вольга папрасіла дзядзьку Сашу не жаліцца маёй маці, калі зноў накрычыць на яго. Дзядзька Саша пазваніў маёй маці, расказаў, што пазваніла цётка Вольга, выбачылася за тое, што накрычала на яго, калі ён пазваніў ёй у лякарню, і папрасіла не жаліцца маёй маці, калі зноў накрычыць на яго. Заадно дзядзька Саша папрасіў маю маці, каб тая не расказвала цётцы Вользе, што ён пазваніў ёй і расказаў, што пазваніла цётка Вольга, выбачылася за тое, што накрычала на дзядзьку Сашу, калі той пазваніў ёй у лякарню, і папрасіла больш не жаліцца маёй маці, калі зноў будзе крычаць на яго. Мая маці пазваніла цётцы Вользе і накрычала на яе за тое, што тая пазваніла дзядзьку Сашу, выбачылася за тое,

што накрычала на яго, калі ён пазваніў ёй у лякарню, і папрасіла не жаліцца ёй, калі цётка Вольга зноў будзе крычаць на дзядзьку Сашу. Цётка Вольга пазваніла дзядзьку Сашу і накрычала на яго за тое, што ён пазваніў маёй маці і расказаў пра тое, што яна пазваніла яму, выбачылася за тое, што накрычала на яго, калі ён пазваніў ёй у лякарню, і папрасіла не жаліцца маёй маці, калі зноў будзе крычаць на яго. Дзядзька Саша пазваніў маёй маці і накрычаў на яе за тое, што тая расказала, што ён расказаў, што цётка Вольга расказала.

•

Б'ю пранікам бялізну. Прыходзіць цётка Дуня.

– А што то ты робіш?

– Гарую паціху.

– А хто паціху гаруе? Трэба гараваць так, каб у Шарэйках было чутна.

Цётка закасвае рукавы, бярэ маё сподняе і пачынае біць па ім пранікам з усяго дуру так, што са свістам вылятаюць душы мікробаў.

– Во так трэба! Во так! Во так!

– Ага, давайце, я сам.

– Пачакай. Во так! Во так!

Перабіла мне ўсё вядро.

– Во так! Што ў цябе яшчэ е? Усё нясі!

Пранік – мегакрутая прылада! Зімой будзе ісці гарачая пара ў халоднае паветра. Мабыць, гэта прыгожа.

Калі я жанюся, буду сварыцца з жонкай за права мыць бялізну.

•

Першы тэлефонны званок быў ад Алісы. Я лупіў фасолю. І тут – Аліса.

– Здароў. Ты дзе?

– У фасолі.

– У якой фасолі?

– У сваёй. А хто гэта?

– Эта Аліса.

– Якая Аліса?

– Саня?

– Не, не Саня.

Наша гутарка перарвалася. Ну памылілася дзяўчына – з кім не бывае. Фасоля лупілася далей. Аліса забывалася.

Мо і забылася б, калі б назаўтра не было Надзі.

– Не, не Саня.

– Праўда не Саня?

Я і сам шкадаваў, што не Саня. Што меў агарод з фасоллю замест Алісаў і Надзяў.

А другой ночы прыйшла эсэмэска: «Ты где?» – «Сплю» – «Козёл!».

Пакуль фасоля сохла, я пераznaёміўся з усімі Саневымі дзеўкамі: Машай, Светай, Ленай, Тамарай, Хрысцінай, Наташай і Златай.

Я пасадзіў яблыню. Я раскідаў гной. Я патынкаваў сцены.

Саня схадзіў у кіно. Саня выпіў у кавярні. Саня нажэрся ў клубе.

Нарэшце мне надакучыў гэты спрытны хлопец. Годзе ўжо, сказаў я сабе. А яму даслаў эсэмэску: «Дарагі Саня, сам кажы сваім дзеу'кам, што у' цябе МТС».

Саня адказаў: «Дорогой Андрусь, сам говори своим пилорамам, сельсоветам и коровам, что у тебя Velcom».

•

У Мазыры самая вялікая канцэнтрацыя прыгожых жанчын на квадратны метр. У мяне ажно вочы баляць. Але не бачу ніводнай, якая б захацела жыць са мной у адной каморы.

•

Калі б я не меў свайго прозвішча, юравіцкі святар запісаў бы мяне ў метрычную кнігу Каморнікам. Паўгода я жыў у каморы, мая актыўная жыллёвая плошча складала два на два на два метры. У гэтым кубе з маленькай дзіркай у сцяне можна спаць, есці, адпачываць, пісаць тэксты, глядзець кіно, чытаць кнігі. Можна рабіць гэта ўдвох, утрох. У кубе я навучыўся быць аскетам. Усё думаў: от зраблю рамонт у хаце, тады і перасялюся. Але рамонт, мабыць, скончыцца разам з маім жыццём.

Учора перасяліўся. Паўночы сядзеў у ложку, глядзеў на прастору і думаў, што з ёй рабіць, як у ёй не згубіцца.

•

Гляджу я на леташнія фоткі хаты, параўноўваю іх з сённяшнімі і не разумею, адкуль у мяне было столькі дурной смеласці распачаць.



•

Старадаўні палескі спосаб зрабіць аконную замазку – змяшаць вапну з алеем. Потым можна замаляваць разам з рамай. Вельмі простая і, як сцвярджае традыцыя, функцыянальная сумесь.

А можна пайсці наўпрост у краму і купіць пластылін.

Але гэта нудна.

•

Калі я выходжу з крамы, мяне на ганку чакаюць два каты: Рома і дзед Ануша. Абодва каўкаюць, плятуцца за мною да хаты.

– Дай.

– Не.

– Каў.

– Не.

•

Разбіў трохлітровы слоік з малаком. Баба Параска ішла міма, сказала:

– Ох, гора-гора.

Вечарам па тым асфальце будзе вяртацца карова-гаспадыня. Падумае, што я разява.

Жыццё – гэта шарлотка белая, шарлотка чорная.

•

Хачу насенне кветак, якія ядуць мух. Яшчэ трошкі – і мяне ні пачуццё гумару, ні аптымізм не ўратуюць. Яшчэ трошкі – і я вазьму на сябе місію пазбавіць свет ад мух.

•

Прыходзіць цётка з лесу. А я ў двары дыні на варэнне рэжу і мух ад іх адганяю.

– Іду па лесе, – кажа, – спрабую грыб унюхаць, а пахне дынямі. Цю-ю-ю, думаю. І так дыньку захацелася.

Даў.

А ўчора яна два кавуны ўнюхала.

•

У мяне бульба расце па прынцыпе «адзін мех закапаў – адзін выкапаў, ніводная не прапала». То бок вельмі пагана.

Толькі закапаць – мала. Яшчэ трэба палоць, збіраць і травіць жукоў. Потым усё адно зарасце хмызняком – то касіць. Я прыкінуў, што сёлета ўраджаю не будзе, і вырашыў не капаць.

Пазваніла маці.

– Як гэта не капаць?

– Тупа не капаць.

– Пасадзіў – і не капаць?

– Не капаць.

– Цю-ю-ю... Я прыеду і пакапаю.

– Едзь і капай, калі табе няма чаго рабіць.

Прыехала. 100 км. Выкапала два мяхі чарвівай бульбы.

– Во, – кажа.

Беларусы падзяляюцца на тых, хто любіць стаяць ракам на бульбяным полі, і тых, хто здаўся. Я знаходжуся на мяжы.

Восенню здаюся. Кажу:

– Усё, ніколі! Ніводнай! Нідзе!

Вясной прыходзіць думка: «Ну, адно вядро ж трэба, каб малодзенькая на стале была». Затым – другая думка: «Дзе вядро, там і два». Пасля – трэцяя думка: «А мо сёлета вырасце?». І – самая паскудная – чацвёртая: «Ай, а што, як не бульбу? Няхай трава расце? От тут шчэ месца е. І тут. І тама. Бульбачка – мая прэлесць. Трэба сваё мець. Няма бульбы – то нічога няма».

Усё, капец. Пасля чацвёртай думкі то ўжо прапашчы чалавек. Бульба – гэта наркотык.

Скажыце, дзе сустракаюцца ананімныя мазахісты. Я запішуся на курсы. Я хачу пра гэта падумаць цяпер, пакуль у мазгі не трапіў крухмал.

– Мяне завуць Андрусік Іванавіч. Мне 32. Я ведаю, што бульбу прасцей купіць, але вясной не змагу спыніцца.

•

Увесь белы свет і ўвесь чорны свет цяпер думаюць, што я паганы агароднік. Я не хацеў расказваць вам пра памідоры, але самі напрасіліся. Дык от. У жніўні цётка Дуня прыходзіла да мяне і здымала на відэа мае градкі з памідорамі. Яна яшчэ пазваніла Марусі Зайчыкавай:

– Маруся, чуеш, што я табе скажу? Ты такога ніколі не бачыла! Тут страх што робіцца! Дзе-дзе? У Горвата ў агародзе. А памідораў! А мама мая родная! Страх, Маруся! Кідай усё, бяжы з хватаапаратам.

А бульба ў мяне не расце. Проста не расце. Не любіць яна маю зямлю. І ў бабулі бульбы не было. І ў дзядулі не было. І ў братулі не было. І ў мяне няма. От і казцы канец.

•

Радзівапастаноўка пра кабачкі.

Сяджу ў крэсле насупраць Касячок.

– Што ў вас?

– Хачу напісаць тэкст. Прыйшоў па дазвол.

– Пра што тэкст?

– Пра кабачкі.

– Што вы імеяцця ў віду?

– Гародніну.

– З якой цэлью?

– Расказаць пра свае кабачкі.

– Пры помашчы якіх срэдств вы будзеце расказываць пра кабачкі?

– Пры дапамозе прыметнікаў: вялікія і ўжо спелыя.

– Эээ, гэта прызыў да несанкцыяванай акцыі. Давайце без «ужо».

– Добра.

– І ваабшчэ – раскажыцця пра тыя кабачкі, якія яшчэ не сазрэлі.

– Добра.

– І самыя маленькія.

– Угу.

– Якое калічаства кабачкоў вы сабіраецесь ахваціць у сваім тэксце?

– Я думаю, каля трыццаці.

– Больш за тры нялььзя, самі панімаецця.

•

Прысніцца ж такое...

Пайшоў у лес па саджанцы яблынь. Капаю. Толькі то не яблыні – акцёры Купалаўскага тэатра. Галовы пад зямлёю. Валасы сталі карэннем. Спадара Рамана Падаляку выкапаў. Даруйце, трохі прычоску рыдлёўкай сапсаваў. Пайду глядзець сон далей, бо там яшчэ некалькі акцёраў тырчэла з зямлі. Дабранач.

•

Сёння я адмовіўся ад сваёй апошняй фрыланс-падпрацоўкі.

Тынкую сцяну. Слухаю радзіва «Культура».

Не хачу падманваць сябе: «Гэта часовая праца – вось заўтра стану на ногі, тады і займуся, чым хачу». Ніякіх заўтра – толькі сёння. Толькі цяпер.

Усе гурбаю хуценька цiснем на «выйсці з сістэмы» і хадзем здзяйсняць мары!

Гэта лёгка – як выліць на сябе вядро вады са студні.

## КАСТРЫЧНІК

•

У мяне за хатай жыве таямнічы дзядок. Ён прасвідраваў у сцяне нябачную дзірку і праз яе прасоўвае ў хату мух. Потым зазірае ў дзірачку, глядзіць, як я бегаю з мухабойкай, і ціхенька смяецца. Гэта адзінае лагічнае тлумачэнне, што я маю.

•

Разоў дваццаць чуў грукат у дзверы.

Адчыняю – нікога. Потым нават падумаў: усё, галюны. І на ўсялякі выпадак стаў цікавіцца:

– Хто там?.

А там – дзятлы.

•

Сёння стала вядома, што Святлана Алексіевіч атрымае Нобелеўскую прэмію.

Думаю: ранішнія дровы прынясу раніцой. Цёмна ўжо ісці ў двор. Потым: от беларуска Нобель атрымала, а мне цёмна ісці ў двор. Іду.

Эфект Нобеля ў Прудку.

•

Бадай што ў кожным прудкаўскім двары сёння сякуць дровы. Сусед за канавай сячэ. Мужык ля крамы сячэ. Я сяку. Нашыя сякеры гамоняць

адна з адной, расказваюць пра моц рук і гатунак дрэва. А вецер шэпча пра восень. Вецер кажа, што Зямля ляціць у Космас. Дзяды на могілках хваляцца адзін аднаму:

– Мой ужо пабіў усе дровы.

– І мой.

На могілках растуць хвоі. І я там калі-небудзь вырасту. Буду стаяць на адным месцы і глядзець у Космас. А ветранымі вечарамі я буду размахваць рукамі і казаць:

– Ууувввшшшшшшш.

А вы мне пра нейкія выбары.

Я, калі начытаюся пра выбары, бяру ў рукі сякеру і іду дровы калоць. Негатыў сцякае ў рукі, потым у сякеру – і расшчапляе дрэва.

Няма мне справы да выбараў. Свой выбар я ўжо зрабіў.

•

Сяджу, нікога не чапаю – прыходзіць цётка Дуня.

– Андрэй, етае во, а чаму ты нічога не пішаш?

– Ай, каму мая пісаніна трэба?

– Глупства! Я, етае во, пачала чытаць, дык спачатку плюнула, бо што ні слова, то срака. А потым уцягнулася. У цябе еты во, як яго? От мне спадабалася, як ты пісаў, што ляжыш у лапухах.

– У лебядзе.

– Ага, у лебядзе, як на акіяне.

– Як на курорце.

– Ага, на курорце. І пра ката твайго Васю.

– Рому.

– Ага, Рому. А што людзі кажуць, што ты жэнішся? Хіба праўда?

– То не я, а сусед.

– Ну добра. А ты пішы. Пішы, Андрэй, – і пра акіян пішы, і пра ката Васю пішы. Бо жэнішся – не будзе калі пісаць.

•

Радзіва «Прудок». Яшчэ адна перадача пра сон.

У сне прыйшоў незнаёмы дзед і сказаў:

– Я хачу расказаць табе сакрэт. Але ты ўсё роўна спіш, то забудзешся.

І знік. А я прачнуўся.

Я б запомніў. Дзед, вярніся.

•

Два гады таму я шукаў менавіта Ромку. Менавіта такога. Знайшоў абвестку ў інтэрнэце, якую даў валанцёр. Ромка тады скочыў да яго ў машыну і не хацеў выходзіць.

Сёння Рому збіў грузавік.

Ён з раніцы вельмі хацеў малака. Ён ведае дні, калі і ў колькі я хаджу па малако. Заўсёды мяне суправаджаў – плёўся крыху ззаду. Як і сёння. Я здалёк бачыў, як ён выйшаў на шлях.

Я мусіў яго падстрахоўваць.

Гэта ўрок на ўсё жыццё – пільна сачыць за тымі, хто давярае і ідзе ўследкі.

Цяпер Ромка ляжыць пад маладой бярозкай за хатай. Побач у міску наліта малако.

А я не веру. Здаецца, зараз за спінай пачую:

– Каў.

Пакуль што да мяне не дайшло тое, што адбылося. Пакуль што я заблакаваны для таго, каб гэта ўспрыняць. Бо гэтага проста не можа быць.

•

Хаджу і ненавіджу сябе. Хаджу і кляну сябе. Хаджу і вінавачу сябе.

Вялікі здаровы барадаты мужык. А Ромка – маленькі. Ён учора вечарам лёг мне на плячо, і такая пяшчота да яго ўзнікла.

•

Зноў сніўся той самы дзед. Мы ноччу сядзелі на падлозе перад грубай і выразалі драўляныя лыжкі. Гэта не мой дзед, але ў сне ён быў гаспадаром хаты. Было спакойна. Ромка спаў дзе заўсёды. Трашчалі дровы. Дзед павольна распавядаў. Потым я выйшаў у двор да студні папіць вады і ўбачыў, што хата свеціцца.

Я прачнуўся, але паспеў пачуць словы дзеда ўздагон:

– Гэта любоў.

А мо то не дзед сказаў, а я сам так падумаў.

Паўгода я напаўняў хату любоўю. Сёння яна напаўняе ёю мяне. А боль трашчыць у грубе.

От Ромка залез на гарышча. От Ромка ўпершыню выйшаў у двор. От Ромка сустрэў мяне з крамы. От Ромка завёў сабе брунетку. З'еў муху



Наташу. Прыцягнуў пацука. Не даў спаць. От Ромка грэецца ля грубы. От ён у свой апошні вечар прытуліўся да майго пляча. А я сказаў яму:

– Мы з табой каманда, Ромка.

І я па-ранейшаму кладу ногі ў ложку не пасярэдзіне, а збоку, каб пакінуць месца для Ромкі. Я па-ранейшаму сяджу за сталом так, каб Рома мог легчы мне на калені.

І гэта не боль, а любоў. Не смутак, а падзяка. Не пачуццё віны, а пяшчота.

Мы – банда-каманда, Рома!

# Цётка Воля

Цётка Воля ляжыць у анкалагічнай клініцы. У яе цэлы букет захворванняў – ад хваробы крыві да пухліны на плячы. Па восемдзесят пяць таблетак штодзень.

Мінае другая гадзіна нашай тэлефоннай размовы. А яна ўвесь час паўтарае:

– Я бы на курорце.

Мы трошкі размаўляем пра хваробу, амаль увесь час – пра агароды, якія пасадзім налета.

Высвятляем, што ў каго лепей расце, і вырашаем у наступным годзе зладзіць інтэрактыўнае агародніцтва: я вырошчваю тое, што любіць расці на маім пяску, яна – тое, што ўпадабала яе запруду. А потым усё падзелім.

Калі я яшчэ набіваў гузак на лбе, ходзячы пад стол, я ўжо тады любіў цётку Волю. Усё навокал было аднолькавым савецкім. А цётка вытыкала дываны, вышывала шторы ў сваю сталінку з высокай столлю. Любіла чытаць казкі і лячыла шэптам.

Потым кінулася ў рэлігію. Шаптаць кінула. Вытыкаць кінула. Вышываць кінула. Замест казак пачала чытаць Біблію. І я згубіў да цёткі цікавасць.

Нашыя жыцці перасекліся зноў, калі я падаўся ў Прудок. Цётчына кватэра стала для мяне заезным дваром паміж маёй хатай і Мінскам.

Цётка зноў пачала вышываць. Па вечарах я сядзеў на падлозе побач з ейным ложкам, назіраў за яе спрытнымі пальцамі і слухаў аповеды пра бабу Ганну ў Германіі, пра дзеда Івана, пра каленкавіцкіх цыганоў і пра тое, як пазнаёміліся мае бацькі. Усе нашы размовы я потайкі запісваў на дыктафон. Ма́ю ахвоту кіламетры запісаных гадзін перавярнуць некалі ў тэксты.

Я люблю цётчыну мову: «Прыйдзецца прытыкаць лоб», «Гада кінь – і той спячэцца», «Шараваць дываны», «Тут ходзяць вампірскія вочы», «Нянаскія хлопцы». У цёткі часта і «той кажа», і «анігадкі», «навек» замест «назаўжды»: «Я навек-навек запомніла»... Не ўсё паспяваў запісваць за ёй. Шмат чаго згубіў.

Калі напачатку лета цётка Воля ноччу ў ложку зламала ключыцу, я стаў дапамагаць ёй з агародам. Мы пешкі хадзілі да яе градак. Спачатку горадам: дварамі (яна паказала дом, дзе я нарадзіўся), гаражамі. Потым пераходзілі чыгунку і асфальт з Гомля і сунуліся ляснымі сцежкамі, на якіх ляжалі гадзюкі.

На тых сцежках я зразумеў, што яе любоў да наваколля такая ж лірычная, як у Коласа. А свет такі ж таямнічы і жывы, як у Яна Баршчэўскага.

І яшчэ што цётка – знічка. Як тая колішняя Беларусь, якая саступае месца новай Беларусі – з вышымайкамі і падабайкамі. Калі цётка-знічка ўпадзе ў вядро ля студні, яна паспее перакінуцца ў ваўчыцу і збегчы ў лес ці згасне ў калодзежнай вадзе і стане пажоўклым лісточкам з ігрушы, які трапіць у палескую зямлю?

Я баяўся згубіць цётку. А з ёй – колішнюю Беларусь. Але пасля ўчорашняй тэлефоннай размовы зразумеў, што і Беларусь, і цётка будуць жыць надалей.

Мінае другая гадзіна нашай гутаркі. Цётка расказвае:

– Я ніколі не здаюся, сынок. Я вельмі жывучая. Я век такой жывучай была. Як бы цяжка ні было, я раблю ўсё, каб жыць.

Усе падваконні ў бальнічнай палаце цёткі Волі занятыя. На іх раскладзена насенне. Лякарня смяецца з яе: прыехала фермерка.

– Я адусюль, як патраплю, збіраю насенне. Пасадзім з табою разам.

Пасадзім, цётка. Абавязкова пасадзім. Яно вырасце, дасць новае насенне, і я раскідаю яго далёка-далёка па свеце.

Раздзел 6

# Я – дармаед

•

Як па-беларуску «ау!» (калі ў лесе заблукаў)? «Аву»?

•

Калі б я пайшоў уладкоўвацца на працу ў калгас, маё рэзюмэ выглядала б так:

1. Сацыяльны работнік.
2. Дыстрыб'ютар касметыкі, кніг, бытавой тэхнікі.
3. Расклейшчык абвестак.
4. Начны вартаўнік у кіёску.
5. Аўтар, рэжысёр, мантажор тэлевізійнай прадукцыі.
6. Дызайнер газет, часопісаў, кніг, прадукцыі жаночага праваслаўнага манастыра.
7. Аўтар, галоўны рэдактар, намеснік галоўнага рэдактара ў газетах і часопісах.
8. Дворнік на рынку і ў тэатры.

•

Жраць, спаць, сраць.

Усё, што трэба ведаць пра сайты вакансій Каленкавіцкага раёна.

Рабі ты што хочаш, займайся ты чым заўгодна. Але мы будзем плаціць табе толькі за тое, што дапамагае нам жраць, спаць, сраць.

Вы праслухалі дзённы выпуск радзіварэфлексій. Не пераключайцеся.

•

Я – гэта маленькая мадэль беларускай нацыі. Сяджу на сваім гістарычным кавалку зямлі, кармлюся датацыямі і ніяк не магу сфарміравацца.

•

На мінскім балконе я думаў, што знайсці працу ў вёсцы нескладана. Заробкі тут малыя, людзей няма, дый адныя пенсіянеры, працаваць ніхто не хоча. Думаў, прыеду, а мяне чакаюць з чаркай-скваркай. Мясцовы народны калектыў у фабрычных строях праспявае рытуальную песеньку.

Плячысты старшыня ўрачыста пацісне мне руку, прамовіць нешта кшталту: «Усё будзе добра. Мы не кінем у бядзе, дружа. Будзеш жыць, як у Бога за печчу». Як той кажа, нягадкі!

Ну добра, скваркай не сустрэлі. Мо не ведалі, што я прыеду. Мо пасаромеліся. Аднак рады ж будуць, калі я скажу, што хачу настаўнічаць у школе, – гэта я так разважаў. Такое шчасце звалілася: чалавек са сталіцы, з добрай адукацыяй, з ахвотай. Але і тут быў абломчык. Тры навакольныя школы маюць укамплектаваныя штаты. Апроч настаўнікаў-пенсіянераў з марксісткай загартоўкай, сюды зганяюць маладых спецыялістаў пасля вучобы. Калі размеркавальны тэрмін скончыцца, маладыя спецыялісты з'едуць, на іх месцы прыгоняць новых. У гэтым кругавароце няма дзіркі, каб мог праціснуцца чалавек з ахвотай настаўнічаць. Гэта дзіўная неэфектыўная схема: хто хоча – не можа, хто не хоча – мусіць.

Я не быў гатовы да таго, што прыйдзецца прытыкаць вока, хадзіць, прасіць працу. Усё, што мне раілі там, на вялікай зямлі, я выконваў. Сябры кажуць: усюды патрэбныя сацыяльныя работнікі, ідзі і працуй. Я падумаў: чаму не? Людзей люблю, буду слухаць байкі, мыць падлогу, хадзіць у краму – нармальная праца. Аднак штат укамплектаваны. Вакансій няма – ва ўсім Каленкавіцкім раёне.

– К сажаленію, вакансій нету.

– Не, няма.

– Вакансіі? Не, што вы!

– Што-што?

– Якія вакансіі?

– Пазваніця туды.

– Пазваніця сюды.

– Няма.

– Нету.

– Не будзе.

– Не было.

– Нас няма.

– Вас няма.

У суседнім Боруску жыве мой дваюрадны дзядзька Валодзя. Ён майстар па дрэве, якіх ва ўсёй Еўропе можна пералічыць па пальцах. Пры належных умовах дзядзька мог бы быць вельмі паспяховым чалавекам. Аднак ён нават сваёй хаты не мае, жыве ў састарэлых бацькоў, а зарабляе тым, што сячэ суседзям дровы. І ён і я – непатрэбныя гэтай краіне людзі. Нас няма. Ён ужо з гэтым звыкся, а я яшчэ буду змагацца.

•

Некалькі дзён я выношваю ідэю пайсці да дзядзькі Валодзі ў чаляднікі і заваліць свет прыгожымі рэчамі – ад лыжкі да хаты.

Ёсць тэорыя, што калі нешта варта зрабіць, то Космас дапамагае распачаць.

Космас, я тут, і я ўважліва цябе слухаю.

•

«Гэта ненармальна, калі малады здаровы мужык цэлымі днямі сядзіць у хаце і думае пра Космас», – падумаў я.

І пайшоў думаць пра Космас у двор.

•

Хаджу па хаце, вучу свой маналог:

– Дзядзька Валодзя, я не ўмею размаўляць па-барусканску. Але я навучуся. Я ўжо ведаю, што малатком – гэта малаткэм. Я не ўмею працаваць тым малаткэм. Але таксама навучуся. Вы толькі пацярпіце. Вы, скажу, майстар ад бога. А я, таксама скажу, маю падвешаны язык і ўменне прадаваць электрачайнікі. Давайце мы разам зробім што-небудзь патрэбнае. Напрыклад, таўкачык для бульбы. І будзем у трэндзе. А калі не будзем у трэндзе, то будзе трындзец мне.

А ён мне такі:

– Андрэйка, што ты там бармочаш? Чаго ты хочаш?

– Хачу рабіць простыя рэчы.

– То ідзі і зрабі таўкачык для бульбы.

– Так давайце разам зробім.

– Так бы адразу і сказаў. А то – бэ-мэ. Хочаш – рабі. Не хочаш – не рабі. Усё ж проста. Павывучваюцца ў сваіх універсітэтах, а два словы звязаць не могуць.

•

Маці прыехала канапаціць вокны. А я сяджу ў крэсле пасярод хаты і распавядаю ёй пра Льва Сапегу.

– Не дуры мне галаву, – кажа. – Ідзі канапаць.

Іду.

•

Я не люблю выконваць традыцыйную жаночую працу. От усё гэта: памыць, пачысціць, наварыць. Няхай мне даруюць «людзі, якія займаюцца фемінізмам», але ў вёсцы падзел абавязкаў на мужчынскія і жаночыя вельмі лагічны. У Мінску жаночыя справы займалі мала часу, а ў Прудку – увесь. Таму я прыдумаў такі спосаб – лакалізаваць праблему і накрыць яе зверху посцілкай. А ў нейкую суботу выяўляецца, што ўжо няма куды хаваць. Уся хата становіцца адной вялікай хованкай праблем.

Трэба напісаць такі закон, каб, калі ў хаце няма жанчыны, у ёй не было б і жаночых спраў. Добра ж я прыдумаў, ну?

•

Палюднела.

Гэта калі на вокнах фіраначкі вісяць, а паміж шыбамі на ваце ляжаць шышкі. Калісь баба Дуся не шышкі туды клала, а галінкі каліны. Але каліну я ў лесе не знайшоў.

– Во, бачна хоць, што ўжо людзі жывуць у хаце, а не бабыль.

Маці шчаслівая. Фіраначкі дурацкія. Я па-філасофску заплюшчваю вочы на сваё дызайнерскае мінулае.

•

Сёння я развітаўся з цёткай Дуняй. Яна падарыла мне дзве даматканыя посцілкі, мех картоплі, недаетае масла, смятану, якая «скісла, але ўсё адно забяры, бо мне шкода выкідаць», і паляцела зімаваць у цёплую кватэру.

Наперадзе доўгая зіма без «паслухай мяне сюды».

•

У вядры ў двары замерзла вада.

Прыедзе да мяне якісьці сталічны мажор, расчэпіць важна гузікі на паліто. А я, каб паказаць, што таксама чуў пра горад, прапаную яму:

– Мо каньяк, віскі, сырадой?

Буду спадзявацца, што адмовіцца. А не адмовіцца, то пашукаю трохі ды скажу, што свіння ўлезла ў склеп, усё віскі папіла.

Але ён не папросіць віскі. Ён скажа:

– Я так упарился в дороге. Я бы не отказался от чистой питьевой воды со льдом.

А ў мяне яно е! Цэлае вядро!

•

Радзівапастаноўка «Кукуруза».

Дзед: То мо кукурузу вязуць?

Баба: Кукурузу пруць, ага.

Дзед: Во, адумаліся. Памерзла. Бач, якая белая. Каб зялёненькая была, а то такая белая. Во як!

Баба: Дык ён у Акцябры колькі год пражыў. Там на паляванне хадзіў, там сябры ў яго. Сябры не якія папала. То настаўнікі. То міліцыянеры.

Дзед: Была зялёная кукуруза...

Баба: Дык туды хоча.

Дзед: Чакаюць, пакуль памерзне...

Баба: Жыць няма дзе. Я кажу: там што, у сяброў будзеш жыць? У алкашоў? Што заробіш, тое прап'еш. І галодны, і ўсякі будзеш.

Дзед: Ужо падурэлі людзі.

Баба: Дык цяпер матак ніхто не слухае.

Дзед: Начальства недалёкае. Сядзелі, пакуль кукуруза не памерзла.

Баба: Гарэлка даражэй усяго на свеце, даражэй жыцця. Я казала і казаць буду.

Дзед: Сухую збірае... Эх, падлы! Іці вашу мацы! Чэрці! Дзе б зялёную збіралі, дык польза была б. Скаціна!!! Накорміш ужо... Сухою...

Баба: Галодныя паядуць і сухую.

Дзед: Сухое – гаўно то сабачае! То зялёненькае. А то – сухое!

Баба: Ох-ох-ох.

•

Зрэзаў я бараду і пайшоў у Боруск да дзядзькі ў чаляднікі. Дванаццаць кіламетраў па лясах. Калі б не фэйсбук, не паверыў бы, што я ў тым самым сёння, што і вы.

Па дарозе пакланіўся дзедавай магіле.

У Аўцюках быў у гуморы і ўсміхнуўся карове. А яна адвязалася ад калка і прычапілася да мяне.

– Ідзі, – кажу, – дадому. Я не твой гаспадар.

– Мууу.

Пляцецца за мною і таксама ўсміхаецца.

Думаю, трэба неяк па-аўцюкоўску з ёй. Успомніў слова «хэйма» – «хадзем».

– Найн хэйма, – кажу. – Ду ю андэстэнд мі? Найн хэйма. Чашы адселя, дура рагатая.

У Борускy павітаўся з бабцяй.

– Добры дзень, – кажу.

– Добрага здароўя.

Хм. Трэба запомніць.

Другой бабці кажу:

– Добрага здароўя.

А яна мне:

– Добры дзень, галубок.

Ага, думаю, хітрыя барусканскія бабкі! Я нянаскі хлопец, то можна мне і галаву дурыць.

•

Я ў маці пацікавіўся, як адно да аднаго звярталіся раней у вёсцы. Кажа: «Гэй, Пятро! Гэй, Маня!».

Але на Палессі ёсць і традыцыя разам з імем ужываць слова, якое паказвае на сваяцтва: сват, дзядзька і г. д. («Сват Васіль, як здароўе?») Ёсць нават такія словы, якіх у Мінску дагэтуль не чулі. Напрыклад, «дзянна» («дзядна») – гэта жонка дзядзькі. Мая маці да бабы Гашы заўсёды звяртаецца «дзянна Гаша».

То для мяне баба Гаша – мо дзедна?

•

Тая дзедна Гаша якраз ладавала свежыну. А тут я прыпёрся – ахвочы да сала.

Прайшоў я, значыць, дванаццаць кіламетраў да дзядзькі Валодзі, а таго дома не было.

Нашыя прашчуры на гэты конт напрыдумлялі выразаў:

«Прыйшоў, таўкача аблізаў дый пайшоў».

«Круп шылам наеўся».

«Торбу жаб прынёс».

«Дулю з'еў».

«Пайшоў, як мыла з'еўшы».





•

Я расказаў дзеду Косціку пра жаданне навучыцца рамяству. Ён выслухаў мяне, пакашляў, выйшаў «кудыліся» і прынёс «адтуліся» старэнькі разец і ножык.

Вярнуўся я ў Прудок. Распаліў грубу. Расклаў інструменты.

От табе, Андрусік Іванавіч, разец і ножык. І ў цябе ёсць тры тыдні, каб зарабіць грошай.

•

– Ты ж, – маці кажа, – барані божа, нічога не рабі сёння, бо свята.

– А лыжку выразаць можна?

– У хаце, – кажа, – можна. У хаце ўсё можна. У двары нічога не рабі, каб людзі не бачылі.

•

Нешта паменела ў мяне сёння энтузіязму. У мроях былі прыўкрасныя вырабы з карункавымі арнаментамі. А на справе атрымалася лыжка для галоднага бамжа.

Доктар, я ні на што не здатны.

•

Шкада, што няма такой паслугі – «бабка на зіму». Я б выпісаў адну. Яна б ляжала за грубай, а я б ёй жаліўся на жыццё.

•

Аднак жаліцца на жыццё давялося не бабцы, а прудкаўскому ўчастковаму Пазняку. Той зайшоў даведацца, што за барадаты мужык штомесяц прывозіць у закінутую хату на ўскрайку вёскі маленькую дзяўчынку.

Нават мне не хапіла б фантазіі даць участковаму прозвішча Пазняк.

•

Я шмат усяго магу дараваць мышам. Толькі не лён! Ну як можна было лён зжэрці, падлы вы кашлатыя небеларускія!!!

•

Радзіва «Прудок». Вячэрні выпуск навінаў з перадавой.

Мышы па начах адсоўваюць цяжкую накрыўку з чыгунка і жаруць маю кашу.

У хаце засталася адна муха з высокім інтэлектам. Яна перасоўваецца толькі ў цемры.

•

Я компас згубіў.

Апошні месяц жыву без компаса. І мне здаецца, што я дайшоў да нейкай Нетуды.

•

Восень, дождж, печ, дровы, вецер у галінах бэзу, цётку з парасонам на лісапедзе і гарачую гарбату прыдумалі наўмысна для пісакаў.

Кастрычніцкая ціша.

Здаецца, рух Зямлі ў Космасе спыніўся.

Я ўпэўнены, што ўсе газеты сёння напісалі, што мы больш нікуды не рухаемся.

Рух адмяняецца. Перадайце ў Цэнтр: рух адмяняецца.

•

Компас дагэтуль не знайшоўся. Мо хто памятае, куды я збіраўся ісці?

Я тады сказаў: «Бывайце здаровенькі, а я пайшоў у…».

У светлую будучыню? У трудагалізм, нацыяналізм, пафігізм, дармаедства, хрысціянства?

•

Мне кажуць: Андрусь, не наганяй тугу.

Я ж не тугу – аптымізм хачу нагнаць. Аптымізм лепей за ўсё наганяць на шэрае.

На белым яго і так зашмат.

Калі будзе кепска, проста падумайце, што недзе ў глухой глушы, у ціхай цішы зімуе адзінокі дзядзька без ката, працы і перспектыў.

•

Стаіш такі, галодны і здзічэлы, у прыцемку ля грубы, з уяўнымі сябрамі гамоніш. Не ведаеш, які ўжо дзень ці год. А тут – грукат у шыбу, і на фоне цемры, што насоўваецца з лесу, галава дзядзі Віці, якога ты ў дзяцінстве на кожную Радаўніцу бачыў.

Усрацца можна. Але я стрымаўся.

•

Сяджу а шостай раніцы на сінім табурэце ў цёмным пакоі і слухаю класічную музыку па радзіве.

•

Сёння буду начаваць у Мінску. Як там – нармальна? Хопіць кіслароду яшчэ на аднаго чалавека? Ці везці з сабою?

•

Вагаўся, што купіць: новыя шкарпэткі ці новы «Дзеяслоў». Калі падумаць, старыя шкарпэткі не такія ўжо і дзіравыя.

•

У маім жыцці было ўсё, думаў я, пакуль запраўляў падушку ў навалачку ў рэдакцыі часопіса «Я – Женщина!».

•

Прывёз сваёй маці Варвару. А яна і кажа:

– Я бацьку на Кастрычніцкую рэвалюцыю шкарпэткі купіла. Даць?

– Дай.

•

Шэсць дзён таму будаваў я дрывотню пад дажджом. Я ж ніколі не хварэю, падумаў я – і захварэў. Усе гэтыя шэсць дзён праляжаў з тэмпературай трыццаць восем і восем, якая не збівалася. Ну як праляжаў: пасадзіў

маліну, з'ездзіў у Мінск, перадаў бабулі ўнучку. Учора вярнуўся ў Прудок, лёг і падумаў, што могуць прыйсці кандарыкі. Ці хандарыкі. Яны, мусіць, сваякі між сабою. Прыйдуць, а я ўвесь такі непадрыхтаваны. У хаце не прыбраў. Тастамент не склаў. Куды ўціснуць слова «анігадкі» на надмагільнай пліце, не прыдумаў.

Прачнуўся а шостай – трыццаць шэсць і шэсць. Паслухаў радзіва – трыццаць шэсць і шэсць. Схадзіў па малако – трыццаць шэсць і шэсць. Ці то скласці тастамент, ці то дрывотню далей будаваць. Ці то да смерці рыхтавацца, ці то да жыцця.

•

«Наша Ніва» дала ганарар за мой дзённік.

Калі я бег праз увесь агарод, каб расказаць пра Гароха Андрэевіча, я не думаў, што хтосьці захоча заплаціць мне за гэта. Я не прасіў ніякіх ганарараў – проста пісаў, як кажа дзед Косцік, ад душы. Усе свае ганарары я даўно атрымаў у фэйсбуку. Але «Наша Ніва» зрабіла прыгожы жэст, і цяпер да 2016 года я, мабыць, дажыву, калі прыстрэт не нападзе. А там і да вясны блізенька.

Увесь час, што я жыву ў Прудку, грошы з'яўляюцца самі – з нечаканых месцаў і ў патрэбны момант.

Я быў упэўнены, што Космас не можа мяне любіць. Бо касмічныя законы – жэрці маленькія галактыкі і ўрбанізавацца вакол помнікаў Леніну. А я смяюся з гэтых законаў. Я нават з самага беларускага слова – «стабільнасць» – пасмяяўся. Думаў: зараз Ён як ударыць па галаве Птушыным Шляхам, каб я сядзеў пад венікам. Але я мала ведаю пра Космас. Я нічога не ведаю пра Космас. Сёння ўвечары я пагляджу туды і скажу: «Космас, я нічога пра цябе не ведаю, але ты клёвы».

# Ягор выйшаў з крамы

Ягор выйшаў з крамы, дайшоў да перакрыжавання дзвюх вясковых вуліц, упаў пасярэдзіне і не падняўся. Людзей навокал не было. Ніхто не бачыў, як гэта здарылася. Першай Ягора запрыкмеціла паштарка. Яна ехала лісапедай і яшчэ здалёк убачыла, што пасярод дарогі ляжыць нешта вялізнае. Падумала, што то чорны пакет. Зблізу пазнала хлопца.

– Ягор! А божачкі! Ягорка!

Валя асцярожна падышла да цела, але дакранацца пабаялася. Ягор не варушыўся, ляжаў ненатуральна, то яна адразу падумала, што ён памёр.

Выйшла Зоя Казлянская – прадаўчыха ў краме.

– Што там, Валя?

– Ягор во.

– Жывы?

– Бог вед. Мо і п'яны.

– Не, не п'яны. Толькі што быў у мяне. Ды й не п'е ж.

– Ягор, ну, не п'е. Мо машына збіла?

– Ніхто не ехаў. Я не чула.

– Ягор не п'е.

– Жывы хоць?

– Памёр хіба?

– А што здарылася?

Цёткі разгублена стаялі побач з нерухомым Ягорам, але дакранушца баяліся, хоць вакол цела крыві не было.

– А ў мяне курава закончылася. Я яму кажу: «Увечары прыходзь. Машына з райпо ўвечары прыедзе».

– Хіба ў сераду яна ўвечары?

– Ну.

– Цю-ю-ю, я думала, ранкам.

– Не, увечары.

– Ягор жа не п'е.

– Не п'е.

– А мо выпіў?

– Я б учуяла.

Міма на трактары ехаў дзядзька Андрэй.

– Андрэй! Стой! Стой, кажу!

– Што там? Сабака?

– Чалавек тут! Едзь сюды!

– Які чалавек?

– Ягор.
– Чый? Валодзеў?
– Іванаў.
– А, Іванаў.
Дзядзька спыніў трактар ля крамы, хутка падбег да цётак і Ягора.
– Жывы?
– Не варушыцца. Андрэй, паглядзі ты.
Дзядзька прысеў, памацаў хлопцу шыю, руку.
– Астыў ужо?
– Не, цёплы. Кроў бяжыць.
– То жывы?
– Ну.
– Дзякуй богу!
– Ягор! – дзядзька Андрэй ударыў хлопца па твары. Ніякай рэакцыі. – Дык што ён – сам упаў?
– Сам, ну. Няўжо не сам. Па курава заходзіў. А ў мяне няма. «Увечары, – кажу, – прыходзь». Ён шчэ кажа: «Добра, цётка, зайду ўвечары». А я падумала: во, маладзец хлопец, не п'е. Шчэ б не курыў.
– Зоя, не піздзі! Ты як мая жонка: бу-бу-бу, бу-бу-бу. У Юравічы ідзі звані! А я яго табе зара занясу. Кінь што мяккае на падлогу.
Дзядзька Андрэй паспрабаваў падсунуць пад Ягора руку, але дарма: цела бы прыліпнула да зямлі.
– А што такое?
Ён і так, і гэтак – а ўзяць хлопца не можа. Валя хацела падсабіць, ды таксама не можа падняць хлопца.
– Бы жалезны. Пабач ты!
– Валя, бяжы па мужыкоў. У кантору бяжы, там Фёдаравіч з Колем. Заві іх сюды. Ды куды ты пабегла?
– У кантору, ну, па мужыкоў.
– От дура! Лісапедай бяжы. Лісапедай!
– А, ну.
Хутка вакол Ягора сабраўся натоўп. Мужыкі і ўдвох, і ўпяцёх – а не могуць падняць Ягора. Ён бы жалезам наліўся ды прыліпнуў да зямлі. Усе толькі чэшуць патыліцы і сваім вачам не вераць.
– А што такое?
– Прыліпнуў, ну. Бы ў зямлю ўрос.
– Мо падкапаць?
– А ў інтэрнеце глядзелі?
– А што ў інтэрнеце?

– Там усё е.

– То ж трэба ўмець шукаць.

Прыехала фельчарка з Юравіч. Тэмпературу памерала, ціск, паслухала сэрца.

– Жывы.

– А што такое? Мо з'еў што?

– У Каленкавічы трэба везці.

– А як жа везці? Не падняць жа.

– То ўчастковаму званіце.

Пазванілі ўчастковаму. Участковы пачухаў патыліцу, як усе, ды таксама разгубіўся.

Пазванілі старшыні сельсавета:

– Мар'янавіч, тут такое дзела...

Мар'янавіч прыехаў службовай машынай. Паслухаў людзей. Свабоднай ад партфеля рукой паспрабаваў сам падняць хлопца, але дарма.

– Бацюшку трэба зваць. Бацюшка няхай паглядзіць.

Пазванілі бацюшку. Пакуль бацюшка ехаў, баба Параска прынесла з дому свянцонай вады.

– З Вялікадня стаіць. Коля мой на Вялікдзень у царкву хадзіў. Я сама не хаджу. У мяне ногі нягожыя. Хадзіцікі не магу.

– Пырскай, Параска, не цягні ката за яйцы!

Параска пырскнула, шчэ і перахрысціла цела. Але ўсё дарма.

Прыехала машына з райпо. Кіроўца выйшаў, паглядзеў, паслухаў людзей. Пакурыў цыгарэтку, сказаў:

– Во дзялы. Ну дзялы.

Паехаў назад.

Казлянская вынесла з крамы пачак цыгарэт, паклала побач.

– Ён курыць хацеў. Прыйшоў да мяне, кажа: «Цётачка, а курава е?». Я кажу: «Няма, Ягорка, няма, мой харошы. Увечары прыходзь, мой галубок». От і вечар, Ягорка. Курава тваё прывезлі. Машынка прывезла з Каленкавіч. А ты ляжыш тут, не купляеш – каму я цяпер прадам яго? Няма каму ўжо, Ягорка, курыць тваё курава.

У адной маладзіцы ад споведзі Казлянскай на вочы набеглі слёзы. Максімка, меншы сын Зоі, таксама заплакаў.

– Дайце яму пакурыць, – прапанаваў нехта.

Дасталі з пачкі адну цыгарэту, паднеслі да рота. Але ўсё дарма.

Пад самы вечар прыехаў бацюшка. Вакол Ягора сабралася ці не ўся вёска – мо сто чалавек.

– Што з ім, айцец Алексій?

Бацюшка памаліўся па кніжцы, памахаў кадзілам. Стала ціха. Запахла ладанам. Баба Параска шчэ раз абліла Ягора свянцонай вадой. Праз дзесяць хвілін бацюшка з'ехаў, сказаў, што будзе маліцца ў сябе.

Калі пачало цямнець, хтосьці прапанаваў накрыць Ягора коўдрай. Набліжалася жнівеньская ноч, мужыкі прынеслі дроваў і распалілі вогнішча. Цяпер на скрыжаванні дакладна сабраліся ўсе. Адно што не было цёткі Тамары.

– Андрэй, едзь трактарам па Тамару!

– Бляха! А на Тамару мы і забыліся. Яна ж шаптуха.

Людзі ажывіліся: як яны маглі забыцца на шаптуху?

– Яна майму Васю нашаптала – той перастаў сцацца.

– Ну, і майму. Тамара ўмее.

– Умее. Ведае от гэта ўсё, ну. У яе бацька ўмеў.

– Ён павесіўся.

– Згарэў жа ў хляве.

– Спачатку павесіўся, а потым згарэў.

– От яно што...

Андрэй вярнуўся хутка. Вярнуўся з Тамарай. Тая прысела ля хлопца, папрасіла людзей трохі адысці ды пачала шаптаць. Ох жа і круціла яе! Бы чорт усяліўся! Білася Тамара аб зямлю, крычала, плявалася, а Ягор усё адно ляжаў нерухома.

Пачалася ноч. Ніхто не вяртаўся дадому. Людзі папрыносілі коўдраў. Побач з Ягоравым вогнішчам з'явілася яшчэ некалькі. На Ягора забыліся. Усё, што можна было расказаць пра яго, расказалі. Надзівіліся, наплакаліся. Далей пераключыліся адзін на аднаго. А Ягор ляжаў пасярод сам па сабе.

Ігар падагнаў свой мэрсэдэс і ўключыў музыку. Тыц-тыц-тыц – загучала вёска. Валя прынесла з дому сівуху.

– Сама гнала?

– А табе якое дзела? Пі.

– Не раскажу я ўчастковаму. А то ты мяне не знаеш!

– Ты не раскажаш – людзі раскажуць.

Хтосьці прынёс сала, гуркі. Казлянская вынесла з крамы хлеб, мінералку.

– Усе скідваемся па два рублі. Чуеце?

– Новымі ці старымі?

– Я скідвацца не буду: я не ем.

– Андрэй, як уборачная?

– Табе праўду расказаць ці для газеты?

Ігар абняў Васільеўну.

– Васільеўна, я ж думаў, што ты паганая, а ты харошая баба! Міравая баба ты, Васільеўна!

– Ай, ідзі ты!

Маруся Зайчыкава прыцягнула вядро малака.

– Нашто ты, Маруся? У нас во – сваё малако е!

– То дзіцям, дзіцям.

Дзеці набегаліся, нагуляліся ды паснулі на коўдрах ля агню. Старыя трохі паспявалі, трохі пагаманілі ды таксама паснулі. Маладзёны шапталіся доўга – мо да трох ночы. Ды й яны здаліся, палеглі.

Першым апрытомнеў дзядзька Андрэй. Ён падняў галаву. У галаве штоліся стрэльнула.

– Вой, бляха...

Ля вогнішча сядзеў Ягор, курыў цыгарэту. Андрэй сеў побач.

– Будзеш? – паказаў на трохлітровы слоік з рэшткамі сівухі на дне.

– Я ж не п’ю.

– А, ну...

Выпіў адзін. Дзядзька зірнуў на трактар, прыпаркаваны ля крамы. У галаве зноў стрэльнула.

– Добра, дзядзька. Пайду я, – сказаў Ягор.

– Ну, ідзі.

Ягор пайшоў дахаты.

Раздзел 7

# Дзяды

•

– Цётка Воля, які дзед Арцём быў?

•

Мой прадзед Арцём быў вясковым мажорам. Ніколі не выходзіў з двара ў ненашараваных да бляску ботах. Не любіў вошай, таму мыў сваё адзенне штодня. Мая маці неяк заўважыла на ім жоўтую кашулю.

– Дарма, унучка. Там на сяле ў таго і таго вошы. І ў баб вошы е. А ў мяне вошай няма, я не люблю. Няхай яна жоўтая, але не ўшывая.

А як у печы паліць ды ўмажа рукавы ў сажу, жаліцца:

– От, ужэ ў сажу палез, не закасаў. Ужэ ізноў мыць.

Яшчэ ён казаў: «Трэба есці так, каб вош на жываце можна было забіць».

Наеты, памыты, пайшоў прадзед на сяло (жыў на хутары ў Боруску) і вярнуўся дадому з самай прыгожай дзеўкай – маёй прабабкай Юстынкай. Ён хоць і глухаваты быў, але Юстынка пайшла за яго. У чыстых ботах і без вошай жа!

Цётка Воля расказвала:

– Ён на нейкай вайне ваяваў, яго кантузіла, от ён і стаў глухі.

– Гэта ў Першую хіба?

– Ага. Як тыя паны былі. У тую вайну ваяваў. А потым снарад разарваўся, і яго кантузіла.

– Маці расказвала, што ў іх з бабай Юстынкай усе дзеці ўміралі, – праўда?

– У іх багата дзяцей памерла. Баба нараджала, а яны ўсе ўміралі. А потым баба Ганна нарадзілася.

Але цётка з хрысціянскіх памкненняў утоіла, што баба Юстынка хадзіла да знахаркі. Знахарка тая штосьці нарабіла і наказала ўвесь дзень маўчаць. Баба Юстынка вярнулася дадому, а дзед Арцём ёй:

– Ну, штэ маўчыш? Кажы ўжэ.

А баба Юстынка – ні слова. Дзед спужаўся: гамон, жонка гаварыць развучылася!

Але ўзаўтры ўсё расказала. От пасля таго і нарадзілася баба Ганна. А потым яшчэ два сыны: Алёша і Касцік.

– Алёша на міне падарваўся, – працягвае цётка Воля, – ногі паадрывала яму. У бабы Ганны на руках і памёр. Везлі ў Каленкавічы, ды не давезлі.



І баба Юстынка доўга не пажыла. Захварэла на тыф.

– У Каленкавічах пахавана. І ніхто магілку не знае. Багата ж людзей паўмірала. Тады іх у адну ямку закопвалі. Ну а крыжоў жа не рабілі. А дзеда якраз дома не было. Яе закапалі і трэсачку паставілі. Трэсачку мо які сабака бегаў ды абярнуў. Дзед прыйшоў, хацеў знайсці, ды не знайшоў. Павялі паказаць ды трэсачку тую не знайшлі. Па сёння не знаем таго месца. Тут от, блізенька, па Куйбышава. А дзе – бог яго вед. І апошні, хто бачыў яе, – дзядзька Коля. Ён знізу ляжаў, а яна ўверсе. От. Гаворыць, яму тады кепска было, ён заснуў. Ён таксама на тыф хварэў. От. Дык, кажа, прачнуўся – ужо бабы не было, убралі. І ён, гаворыць, зразумеў, што яна памерла. Тых, хто ўміраў, кажа, хутка ўбіралі. От. А сястру бабы Юстынкі, бабу Веру, што некалькі кажухоў мела ды некалькі андаракоў, дык у Сібір саслалі, і яна ўсё жыццё пражыла ў Сібіры. А сюды яна пераехала ў самым канцы. Я прыехала паглядзець бабу – покуль падымалася да яе ў кватэру, дык яна за гэты час памерла. Жывой не бачыла – толькі на мёртвую пагглядзела. Таксама красівая вельмі была. Мама казала, яны з бабай Юстынкай нашай падобныя былі. Дык я захацела пабачыць. Прыйшла, а яна ж за гэты час кончылася.

– А які дзед Арцём быў?

– Непаганы. Вельмі добры дзед быў. Бывала, як насушыць грыбоў, дык па торбе цэлай прэ. А пах, а пах які! Такія смачныя былі! І дзеці любілі дзеда Арцёма. Прыйдзе ён у школу, а яны давай крычаць: «Дзед, раскажы казку!». І ён расказваў казку. Уся вёска збіралася паслухаць тыя казкі. От. Тады ж тэлевізара не было. Тады быў толькі дзед Арцём.

•

Мне даслалі старыя фота Прудка, якія зрабіў у 1912 годзе Ісак Сербаў. На адным з іх драўляная царква. Кажуць: «А даведайся, дзе тая царква стаяла». Пасля двух тыдняў бязмэтавых бадзянняў я, нарэшце, знайшоў сабе новую хваробу. Цяпер я хачу ведаць усё пра Прудок. Спытайцеся ў маёй былой жонкі: пакуль радавод усіх прудкаўскіх катоў не будзе задакументаваны, спыніць мяне ўжо няможна. Яна ведае.

•

У 1912 майму прапрадзеду Апанасу было 48 гадоў. Цікава, калі б ён ведаў, што я пабачу гэтыя фота, ён бы бегаў перад фотаапаратам Ісака Сербава з плакатам «Здароў, Андрусь!»? Я б бегаў.

•

Ісак Сербаў мусіў ехаць гасцінцам з Каленкавіч у Хойнікі, ля якога жыву я. Сёння той гасцінец злучае толькі краму з кароўнікам.

Здалёк было відаць прудкаўскія хаткі. Па дарозе Сербаў пабачыў амаль дасканалы авал панскай сажалкі. У ім патанула мая траюрадная цётка. У ім патанула ўся памяць пра паноў.

На месцы маёй хаты раслі каноплі. Ці лён. А мо і жыта.

Першая хата была там, дзе сёння стаіць суседняя Дэдалева. За крамай (якой тады, вядома, не было) стаяла драўляная царква з маладой бярозкай побач.

Сербаў зрабіў тры фота. Збегліся дзеці паглядзець на дзіўнага дзядзьку. Мой прадзед Андрэй, які потым памрэ далёка ад Прудка за тое, што ўмеў працаваць лепей за астатніх, дакрануўся да фотаапарата. А Сербаў, мабыць, сказаў яму:

– Асцярожна, не зламай мой дэвайс.

Прадзед меў шмат пытанняў. А як? А колькі што каштуе? А, а, а?..

Прудкаўцы павялі Сербава ў карчму. От мінулі хату габрэя з дзвюма вялізнымі елкамі, якія калісь уразілі пляменніка Сяргея Палуяна – пісьменніка, рэвалюцыянера, лепшага сябра Максіма Багдановіча. Старога габрэя не было дома: ён паехаў на кірмаш у Юравічы.

Перайшлі рачулку Закаванку, якую я называю конскай канавай і ў якой мыліся мае талакоўцы. А тады там мае прабабкі мылі хусце. Прыносілі ў начоўках залёную бялізну, недаверліва пазіралі на дзіўнага нянаскага чалавека Ісака Сербава.

У карчме Сербаў і самыя спрытныя прудкаўцы выпілі. Мой прапрадзед Апанас, мабыць, прыйшоў па сына, бо праца без яго не спорылася. Але зацікавіўся Сербавым дэвайсам:

– Калі хату старога габрэя сфоткаць, можна пабачыць, дзе ён грошы хавае?

Карчмар усміхаецца. Ягоныя дзеці ганяюць па двары драўлянае кола.

У Прудку была не толькі вайна.

•

Калісь я напісаў у фэйсбуку, што да мяне заходзіў пазнаёміцца ўчастковы Пазняк.

Сёння мяне спынілі на вуліцы і запыталі:

– А праўда, што ты пра нашага ўчастковага стаццю ў газету напісаў?

•

Мая прабабка Агапа ў 1938-м падпісала такое прызнанне: «Я вижу, что следственные органы располагают материалами, изобличающими меня в том, что я знала о контрреволюционной шпионской работе мужа. Поэтому считаю всякое запирательство перед следствием бесполезным, а посему решила рассказать откровенно всю правду».

Так і ўяўляю сабе хатні дыялог:

– Гася, чаму свінням не дала?

– Я вижу, что мой законный супруг располагает сведениями, изобличающими меня в том, что я не дала свиньям. Поэтому считаю всякое запирательство перед супругом бесполезным, а посему решила рассказать откровенно всю правду.

•

Шліфую падстаўку пад патэльню і думаю пра тое, што заўтра часночны дзень. І я не ведаю, чаму заўтра, а не сёння і не ўчора. Маці сказала садзіць часнок. Заўтра дык заўтра.

А там і Дзядоў сустрэну.

## ЛІСТАПАД

•

У 1815 годзе мой прапрапрапрапрадзед Кандрат збег з Прудка. Яму было 35 гадоў. Ён меў жонку-прыгажуню Хаўронню, трох дачок і аднаго сына.

Не ведаю, дзе ён бадзяўся, але вярнуўся і памёр дома.

Дзед Кандрат і астатнія 60 прудкаўскіх дзядоў, запрашаю на вячэру.

Я вас ведаю і люблю.

•

Дзяды паелі, папілі ды пайшлі да маёй маці. Яна сёлета саступіла мне права прыняць шаноўных гасцей першым.

– Ну што, пайшлі ўжо?

– Пайшлі.

– Добра, тады я свечку запалю, каб не заблукалі.

•

Хто б і мне свечку запаліў, каб і я не заблукаў у гэтым вашым Мінску.

Добра, што я з'ехаў адсюль, калі ўжо былі электронныя кампосцеры. Уменне кампасціраваць дапамагае рабіць выгляд, што я мінчук.

І яшчэ.

Калі б я так прыціснуўся да Колевай жонкі, як у вас тут можна прыціскацца адно да аднаго ў тралейбусе, Коля б мяне пабіў.

•

Цётка Дуня казала, што цырульніцы – вядзьмаркі. Забіраць чалавечае шчасце праз дакрананне да валасоў – распаўсюджаны вядзьмарскі спосаб. Учора ў мінскім салоне «Чарадзей» я ўзгадаў цётчыну параду: калі цырульніца стрыжэ, а галава пачынае балець, трэба думаць пра сябе: «Не дам, не дам, не дам». Я мармычу простую замову, а з пасмамі валасоў падаюць долу нажніцы. Раз падаюць. Два падаюць. Галаўны боль сціхае.

•

Спыніўся на начлег у Каленкавічах. Не магу тут спаць: хачу дадому. Выбіраю паміж пайсці пешшу зараз ці да раніцы чытаць сектанцкую літаратуру цёткі Волі і паехаць аўтобусам.

Беларусы за мяжой, вы для мяне загадка. Я адну ноч за дваццаць кіламетраў ад хаты выю паланезам. Як жа вы там маецеся?

•

Я цікавіўся, як будзе «ау» па-беларуску. Шукаў у слоўніках і ў польскіх этнографаў, пісаў у фэйсбуку. А сёння ішоў па лесе. Там адна бабця другой крычала: «Ганя, у-у-у! Ганя, у-у-у!». Гэта добра, што я знайшоў адказ. Але займеў новае пытанне, і яно мяне мучыць. Што робяць бабкі ў лесе ў кастрычніку? Грыбоў няма. Труп хаваюць?

•

Пакуль я пра бабак у лесе пішу, цывілізаваны свет цешыцца уберамі. Уберы-шмуберы. А ў прудкаўскай краме свечкі скончыліся. Ото ж дзе праблема. Усе свечкі на Дзяды папалілі.

•

Радзіва «Прудок». Замалёўкі з жыцця птушак.

Раптам высвятляецца, што птушкі ядуць маю аўтэнтычненькую аконную замазку. Ядуць нягашаную вапну. Вапну!

•

У маёй бабулі песня фірмовая была: «А я зязюля, зязюля шэрая, не вылечу з саду». То нібыта маладая дзеўка пяе, як пертварылася ў зязюлю, каб прыляцець у бацькоўскі дом і паплакацца сваёй матцы на горкую долю. От, напэўна, і ў маіх птушак яно так. А што, калі то не птушкі, а якія дзеўкі згубілі дарогу да сваіх бацькоў і жаляцца мне? Бо хата мая стаіць на ўскрайку вёскі каля лесу пад Птушыным Шляхам. Ляцелі, ляцелі дзеўкі, стаміліся, селі на вокны і пачалі дзяўбці замазку. З гора.

•

Маці была ў мяне, калі пазванілі з клінікі і сказалі забраць яе сястру. Усім стала зразумела: цётку Волю адпускаюць дадому памерці па-людску. Каб не ў бальнічнай палаце сярод чужых хворых людзей, а дома.

Маці плакала.

– Эх, сястра... Узяла на сябе матчын лёс...

Калі было лета, я любіў слухаць цётчыны аповеды. Яна шмат расказвала пра дзяцінства. Як не ўмела ўседзець дома, хадзіла на вячоркі ды на спатканні, а мая маці гаспадарку вяла, квіткі ў Доме культуры прадавала. От яны і сварыліся між сабою. Маці, хоць і прыгажэйшая ды маладзейшая за цётку была, але ўзяла на сябе ролю лакаматыва ў сямейным цягніку.

Тая традыцыя захавалася і тады, калі сёстры сталі пенсіянеркамі. Жылі ў розных мястэчках, аднак па-ранейшаму нібы ў адной хаце. Маці бурчэла, што цётка рамонт у сябе не робіць, што ў секту падалася. Цётка ж хадзіла на агароды і да Іеговых сведкаў.

Гэты сямейны цягнік няспынна бег у касмічную прастору, пакуль не пазванілі з клінікі і не сказалі забіраць цётку дадому.

І я ўбачыў маці па-новаму.

Яна плакала, калі расказвала мне па тэлефоне, што ў цёткі Волі позірк далёкі-далёкі, што яна ўжо не тут. Што цётка не хоча есці, не можа варушыцца.

Маці карміла яе, мыла, насіла на вядро. Усё, што я дагэтуль ведаў пра пяшчоту, не каштуе нічога. Пра сапраўдную пяшчоту мне расказалі дзве бурчлівыя сястры.

Прайшоў тыдзень. З далёкага падарожжа вяртаецца цётчын позірк.

– Дзе ты была? Чаго ўсміхаешся? Я з табой нашуся, бы з хрустальнай вазай, а ты ўсміхаешся.

Маці звоніць мне і расказвае, што цётка прыдурваецца са сваёй хваробаю. Я разумею: цягнік пабег далей.

Праз месяц маці ідзе ў двор і з галін і дошак збівае для сястры хадункі. Яшчэ праз месяц цётка Воля з'язджае ў сваю каленкавіцкую кватэру з высокай столлю. Я ведаю, што яна сядзіць у халаце на разасланым ложку. Вышывае пейзаж. У пакойчыку ціха, гарыць цьмяная лямпачка начніка. За вокнамі восеньская цемра мястэчка. Маці – у сябе – тэлевізар глядзіць.

А разам яны – сям'я.

•

Прыгатаваў суп, смачнейшы за мамін. І мяне гэта пужае. Суцяшаю сябе тым, што сёння ж перанёс у дрывотню дзесяць кубоў дроў.

•

Маю хату не абслугоўвае машына, што збірае смецце. Я падышоў да праблемы банальна: спрабаваў вырашыць яе праз сельсавет, але пакуль што безвынікова. Учора ініцыятыву ў свае рукі ўзялі дзве бабкі. Яны беглі за машынай па вуліцы і спрабавалі спыніць яе сваімі целамі. У наступны аўторак я далучуся да бабак. Утрох мы яе абавязкова спынім.

•

А тым часам у Каленкавічах у кінатэатры «ЗНАМЯ» з'явіліся раскошныя канапы для закаханых «Love Seat». А вы кажаце – глухое Палессе.

Трэба закахацца і схадзіць. Толькі мышцы спачатку накачаю.

•

Узбіванне ў масла двух літраў смятаны ў трохлітровым слоіку замяняе шэсць паходаў у трэнажорную залу.

А з казінага малака робяць масла?

•

«Першае, што трэба трымаць у сакрэце, – свае планы», – кажуць мудрыя. Упс. А я якраз хацеў напісаць, што назаву казу Цёцяй. То не буду пісаць, як назаву казу.

•

Дарэмна я бурчу на мясцовых чыноўнікаў. Заўтра самі прыедуць, каб заключыць са мною дамову на вываз смецця. Самі! Прудок – цэ Еўропа!

Трэба бабак папярэдзіць, каб у аўторак не кідаліся пад трактар.

•

Што там заўтра – яны ўжо сёння прыехалі. Мо фэйсбуку свечку паставіць?

Кажуць, свечкі ўжо е ў продажы.

•

Выдалі мне ў краме рэшту, а там прудкаўскі артэфакт – шыфроўка на тысячнай купюры:

«ми пошли
за
коровой».

•

Паштарка грукае ў шыбу і крычыць:

– Андрушачка! Андрушачка! Пасылка з Вільні!

Абавязкова папрасіце вашых паштароў грукаць у шыбы і называць вас Андрушачкамі.

•

Мінулі 42 дні адзіноты.

Сёння прыедзе котка. Пад страхой хаты пачнецца новае жыццё.

Я не пайду спаць – дачакаюся таго жыцця.

Дзякуй, Ромка, што ты быў.

•

Уяўляеце, яно там жывое і варушыцца! Даўно ў маёй хаце нічога не варушылася. Тым больш – жаночага полу.

•

Дарэчы, калі вам прыходзяць апавяшчэнні, што з'явіўся новы допіс, іх можна адключыць. Бо вы займаецеся сваімі справамі, і тут з усіх бакоў: «Увага! Увага! Усё кідайце! У Горвата котка пакакала!».

Але пакакала ж!

•

Калі я гроб лісце вакол Купалаўскага тэатра, я слухаў на тэлефоне Мележавых «Людзей на балоце». Адкалупваю прымерзлыя недакуркі, чыноўнікі ідуць у Адміністацыю прэзідэнта, а тым часам Хадоська прабіраецца праз дрыгву да знахаркі, каб зрабіць аборт. Мне падабалася існаваць у двух паралельных светах.

Яшчэ я памятаю акцёра Рамана Падаляку. Я думаў: ён такі клёвы, ён так шмат усяго робіць! І не было мне як з маімі рыдлёўкамі і вёдрамі падысці да яго і сказаць «здрасця».

Хадоська зрабіла аборт. Я з'ехаў. А Раман стварыў радзіва Prudok FM і паставіў Мележа. Усё пераблыталася, але купалаўцы і людзі на балоце засталіся побач. Паменела толькі недакуркаў ды чыноўнікаў.

•

Выбачай мне, радзіва «Культура», але я перайшоў на Prudok FM.

Там цяпер Вольскага даюць. А ты, «Культура», не можаш мне даць Вольскага, быццам Вольскі – ніякая не культура.

•

Сёння прыехаў госць з Мазыра. Ён прачытаў пра мяне ў газеце. Мы сядзелі на табурэтках у паўцёмным пакоі і маўчалі. Было чутна сёрбанне кавы і шкрабанне мышы. У Ляліным страўніку бурчэў тварог.

Мой госць праехаў 30 кіламетраў, бо бліжэй няма нікога, з кім можна памаўчаць на агульныя тэмы. Палеская адзінота.

•

У кухні ляжыць мышыны хвост, і Ляля ў позе сфінкса круціць галавою, бы турэмны пражэктар. То хвост Верачкі – самай паскуднай мышы.

І не шкадуйце яе. Верачка лён зжэрла. Няма ёй ніякага шкадавання пасля такога антыбеларускага злачынства.

•

Рома з'еў Наташу. Ляля з'ела Верачку.

Не камедыя, а horror: персанажы жаруць адно аднаго.

•

Ёсць прычыны, чаму я хачу жыць навідавоку. Ёсць – чаму хачу залезці ў куфар.

Учора маёй маці расказалі, што прачыталі пра мяне ў інтэрнэце. Пра тое, што я жыву ў антысанітарыі. Што гарбузы ляжаць на падлозе (і гэта адзінае, што я ем). Што я маргінал і бомж. Маці не спала ўсю ноч. Мне цяжка данесці да яе, што тое напісалі не сябры.

Праз адно неасцярожнае слова можа не спаць чыясьці маці.

Мама, я сёння еў крышані, грачнёвую кашу з салам і бутэрброды з маслам. У мяне ёсць грошы. Машына ўжо вывезла смецце. А я іду ў сад прыбраць галіну яблыні, якую зламаў ноччу вецер.

Усё нармальна, мама.

•

Толькі паляшук у слове «мама» можа зрабіць дзве памылкі і напісаць «сала».

•

Сёння гадавіна смерці майго дзеда.

Я думаў: от прыйду на могілкі і раскажу дзеду пра свае справы. Пра Рому і Лялю. Пра Цёцю. Пра тое, што я сяджу без працы. Ці што дагэтуль не знайшоў сабе жонку (потым прызнаюся, што і не шукаў). Пра няпэўнасць і пэўнасць. Пра любоў, памяць і ўдзячнасць. Прыйшоў – і словы ў маёй галаве сціхлі.



На могілках восеньская мокрая ціш. Калі б не было дажджу, я б усё адно напісаў, што сёння ішоў дождж. Я блукаў сцежкамі між кручаных хвояў, углядаўся ў прозвішчы, вочы і даты. Папраўляў стужкі, выносіў смецце. Чужых дзяцей не бывае – няма і чужых магіл. Яны розныя, як прудкаўскія хаткі: каменныя і драўляныя, абнесеныя плотам і згубленыя ў хмызняку. Драўляныя крыжыкі без агароджаў – пад імі пахаваныя не людзі, а памяць пра іх. Ад гэтага крыжыка застаўся адзін слупок. Вунь там – то крыжык ці проста тырчыць з зямлі сухая галіна?

Вяртаюся той самай даўгой вуліцай дадому і думаю, што з кожным крокам прудкаўскія могілкі ўсё далей і далей ззаду. Папраўдзе ж яны ўсё бліжэй і бліжэй наперадзе.

Пакуль я дакрочу, у мяне, мабыць, ёсць час дабудаваць хату, вырасціць сад і расказаць унукам пра Космас.

# Матка

Я, Іван, нядаўна мужыка пахавала. Шэйсят два гадочкі мне. Вой-вой-вой. Была здурнела мая галава...

От мы на хутары за мастом. Там жа няма ні свету, нічога, Іван. Тамака ні свету, нічога няма. Там от адзін Толік е, дурачок такі. Пенсіянер. Яму семдзесят гадоў. Яго жонцы далі пятнаццаць ці то трынаццаць: парубіла яго. Толік мне кажа:

– Я прыйду ў прымакі.

А я кажу:

– Знаеш што? Я са сваім папагаравала. Піў-піў-піў. Хадзіў-хадзіў, ганяў мяне, ганяў. Я ўжо не хочу.

Мужыка майго атравілі. Далі такой гарэлкі. І ўсё – і кончыўся. Я засталася адна. От.

У мяне падруга Анюта, яна таксама адна. Ёй ужо шэйсят пяць. От учора пайшла, пабачыла яе, пагаманіла з ёй. У яе і тэлевізар е, дачка ў Мазыры на мясакамбінаце – вялікая такая.

Анюта два мільёны пенсіі палучае.

– Хопіць, – кажа.

– Ты ўжо ўсё, – кажу, – стары чалавек.

Мае хлопцы, якія са мной вучыліся, усе ў горадзе. Усе ў горадзе. Ніводнага няма тут, у Прудку. Што зробіш... Такі мо лёс. А мне ўжо шэйсят два гады. Анюце шэйсят пяць. Мужык у яе ў Азарычах жыве ў прыстарэлым. Дачка красівая-красівая! Так яна шкадуе матку, навязе ёй поўны халадзільнік. Ну, за грошы. За грошы. А мужык у прыстарэлым жыве. Біўся, Іван, біўся – уся чорная была.

А да мяне мо пяць прыходзіла. Хлопец малады, мо трыццаць гадоў. Дык я кажу:

– Знаеш што, чалавек? Ты мяне будзеш шкадаваць, а ці ты хлопцаў маіх пашкадуеш? Не будзеш. Шуруй і шукай дзеўку ці жанчынку і жыві. Думаеш, гэта так проста? Гэта не так проста.

•

– Алё.

– Галя?

– Не, не Галя.

– А дзе Галя? Пазавіце Галю.

– Куды вы звоніце? Тут няма Галі.

•

Куды вы, кажа, звоніце. Яны звоняць, а трэба ж ведаць нумар тэлефона, куды званіць. А хто яго знае, куды. Ну, яны звоняць. Гэта з горада звоняць, ну. У мяне сястра ў горадзе жыве. Дваюрадная. Я туды ездзіла ды кажу:

– Сынок, што мне рабіць? Не хочаш ты мяне глядзець. Пайду ў прыстарэлы.

– Як хочаш, мамо.

– Жаніцца ты не будзеш, – кажу.

Усё. Сорак гадоў. Ён ужо адвык. Быў ўзяў цыганку. От тут яны цыгане, у Шарэйках, у Юравічах. У мяне шэсць кароў было. А дзеўцы, Іван, чатырнаццаць гадоў! Цыганё і е цыганё. Цыганё і е цыганё... І яго абакралі. Усё ўкралі. І газавую пліту – усё. У мяне ўсё было, усё было. Што я папамучылася. Што я папаплакала... А піла! А курыла! А білася! А божа мой! А цэлы табар! Дзеўцы чатырнаццаць гадоў! Мне спакою не было. І цяпер спакою няма. Увесь пабіты быў. Адзін раз пабіты быў, другі...

Мой сынок, Іван, ля крамы ходзіць. Мо бачыў? Дрэнна з галавой яму. От ён і ходзіць. Быў чатыры гады, Іван, у турме ў Мазыры. Там яму пабілі галаву. Ужо нічога не ведае. Нічога. Я ездзіла ў турму. Лепей ты зарабі сваім трудом. А хлопцы якія сядзяць, Іван! Красаўцы! Вой-вой-вой...

От прыходзіць сынок і пачынае піць чыфір. Я кажу:

– Сынок, кінь той чыфір піць. Што ён дае? Нічога ён не дае.

Я ўжо купляла, купляла, Іван. Ды кажу:

– Знаеш што, сынок? Мільёны нада. Гараваць нада. А як жыць? Нада гараваць. От дровы сёння пакалоў – маладзец. Я запаліла, наварыла булёну. Ты прыйшоў, – кажу, – картоплі налупіла. От. Ты і сам умееш. Ты ўжо прывучаны да ўсяго.

У мяне ўся радня багатая, Іван. Уся. А што я магу зрабіць? У дзярэўні якую худобіну гадаваць – а якую гадаваць? Парася якое. Парася карміць трэба. А чым карміць? Божа, божа... Гаспадара няма. Усё, няма. Божа, божа. Ну што ты зробіш? Будам як-небудзь жыць. Мамачка ж, кажу, не вечная...

Мне даюць капейкі. Мільён. Ну, там, мільён чатырыста. Прыходжу ў краму, на дзевак кажу:

– Знаеце што? Дайце, каб хлопец мой быў як хлопец. Каб не стаяў ля крамы гэты хлопец мой і не прасіў нічога. Я палучаю пенсію, – кажу, – так дайце, дзеўкі, паесці хлопцу.

•

– Алё.
– Галя?
– Тут няма Галі. Куды вы звоніце?
– Пазавіце Галю.
– Гэта Прудок. Куды вы звоніце?

•

– Так яна ўжо другі раз звоніць? Некаму яна звоніць. Гэта жанчына званіла? Гэта, мусіць, з горада. А я вырасла ў Прудку. Малая была, во такая во, дванаццаць гадоў, як матка мая памерла. Я ў дванаццаць гадоў без маткі засталася, Іван. І выгадавалася. Усё жыццё прагаравала ў калхозе. І цяпер яшчэ сын кажа:

– Мама, пойдам дровы рэзаць.

– А пойдам. Што такое, сынок, я ўмею. І перакалоць умею. Усё ўмею, – кажу. Жыццё прымусіць. У дзярэўні вырасла.

Гарадскія не разумеюць, не ўмеюць. От адзін прыехаў: не ўмее палена пакалоць. Гаворыць:

– Я не панімаю.

От дзве дзеўкі такія красівыя, дык у іх такія во кіпцюры накрашаныя.

– Ну што вы, дзеўкі, ну што вы, дзеўкі?

– А нічога, – кажуць.

Колькі табе гадоў? Трыццаць тры? Майму сорак. Пад сорак гадоў ужо. Кажа:

– Пойдзёш у прыстарэлы?

– Ай, не, – кажу, – у прыстарэлы не пайду.

– Там і чыста. Там і кормяць. Там яшчэ і даюць капейку. І ўсё – жыві.

– Не пайду, – кажу.

Я пайду ў лес. Лісянка е, грыб е, ягада е. Можна от так жыць летам. Былі па дваццаць тысяч. Няхай па дваццаць – ідзі, не лянуйся, кажу...

Во тут была харошая хатка. Нейкая была таксама з галавою, запаліла. І ўсё. Была такая харошая хатка. Сын у горадзе. Дачка ў горадзе. Не паехалі. А нашто яны паедуць у дзярэўню?

– Нашто яно, – кажа, – мне? Матка ўжо памерла, ды і ўсё.

Бацька прыязджае да цябе? Машынаю? Машына е, бачыш ты! Вучаны. І мама граматная? Так? Во як! Бач як. Так табе трыццаць тры гадочкі? Майму сорак. Кажа:

– Мама, нашто мне тая жонка? Я ўжо адвык.

– Ну правільна, – кажу, – калі ты ўжо адвык, дык яно табе і не трэба. Гэта я ў дваццаць выйшла.

Маладая была, красівая. Такая кукла была. А ўжо шэйсят два мне.

А сын кажа:

– Мамо, ты паможаш дровы складаць?

– Памагу, сынок. Няўжо ж не памагу. Пайду і памагу. Пакалоў дровы, дык я памагу.

От.

•

– Алё.

– Дзе Галя?

– Куды вы звоніце?

– Не дуры мне галаву! Я ведаю, што Галя там. Яна мне гэты нумар дала. Пазаві Галю.

– Гэта Прудок. А вы куды звоніце?

– Галя ў Прудку? Перадай ёй, каб дамоў не вярталася!

•

От не кажа, адкуль яна. А мусіць сказаць, з Каленкавіч яна ці з Мазыра. З Мазыра то не пазвоніш сюды. Ну, нехта ж даў нумар. І зноў, і зноў. Яна яшчэ будзе званіць. Яна, мусіць, не разумее. Пайшла б у справачнае бюро, спытала б:

– Скажыце мне нумар, дзе Галя, мне трэба пазваніць туды.

Нехта ж, мусіць, даў, што яна звоніць. Ды ўжо трэці раз. Галю нейкую шукае. Мо дачка. Хто яе знае.

У мяне ж яшчэ адзін сын е – Іванчык. Робіць па людзях. У калхоз не ходзіць. Усё спасобны. І дровы коле. А людзям жа тут перарабіў! Божа мой, божа. Паў-Прудка! От Іванчык у мяне чыфір не п'е. Я малінніку наламала. От які чай розавенькі, харошы.

Што яму жанчына тая? Ён у мяне сам наварыць.

Нехта ж даў нумар, што яна звоніць. То яна матцы не сказала, дзе знаходзіцца. Мо то дачка. Маткам во гора гэтым. Вой-вой-вой. Я ўсё перажыла. То я знаю гэта. Я днямі і начамі не спала. Мой Іванчык быў у Аўцюках, працаваў. Суткі няма, другія няма. Я плачу. Гэта ж Аўцюкі! А божа! Там дзесяць свіней, дзесяць баранаў, дзесяць кабыл, Іван! Божа,

ён раб тамака. Акалечыўся. І руку паламаў, і нагу паламаў тамака. Ох, што я папагаравала. Сказала:

– Будзь дома. Каб я цябе бачыла. Паможаш якому чалавеку. Цябе тут усе людзі знаюць. Ты тут вырас, выгадаваўся тутака, усе знаюць.

Ён нарадзіўся ў Казахстане. Знаеш, дзе Казахстан, Іван? Гэта ў Карагандзе! Туды нашыя паехалі працаваць. А там прапала мо пяць хлопцаў. Тыя, што вярнуліся, пазараблялі па пяцьдзясят мільёнаў. Я кажу так:

– Тут рубель зарабі. Мільён заробіш – хопіць. Хопіць табе мільёна, каб ты купіў хлеба, купіў макаронаў. Хопіць. А гэта ты паедзеш бог вед куды, а я спаць не буду ды буду плакаць. Ай, мне такое не трэба. Хопіць і тут, – кажу. – Грошы плацяць.

Так гэта жанчына звоніць? Яна шукае, відаць, дачку. То мо дачка. Так нехта ж даў! Я раз таксама пазваніла, дык мне адказалі:

– Жэншчына, вы што, не панімаеце? Пазваніце ў справачнае бюро.

Вой, а што то лезе? Коцік? Ко-о-оцік, во, бач, дзе сядзіць! А ў мяне два. Картоплі пакладу. Палезуць на печ і не ядуць. Дык біла сёння, раз пяць біла. Дзе я вам мяса вазьму, кажу. Дзе я вам мяса? А ў цябе была жонка? Так? Вой-вой-вой! Гарадская, не захацела жыць, бачыш ты. Мамачкі! Вой-вой-вой! Ты ж не п'еш, я ведаю. Не п'еш? От, бач, як! Я кажу:

– Іванчык, піць не трэба.

– Мамо, я не магу.

Вой, пабач, які коцік! Вочкі ты мае, во якое малое, разумны такі.

Яна не будзе адна. Ёй хапае. У горадзе мільёны і мільярды. Вунь адзін таксама прыходзіў з Мазыра, таксама гаворыць:

– Кінула мяне.

Дык я кажу:

– Ты піў – і кінула. Нашто ты п'еш гарэлку?

А што зробіш? У нас колькі тут хлопцаў было! Мільярды! Тут рабілі кароўнікі і жылі ў маёй хаце камандзіровачныя. З Воршы! І ўсе мяне паважалі. З мужчынамі лягчэй гаварыць, чым з жанчынамі. Я з жанчынай не магу. За бацькам і за маткай яна гора і не бачыла. Адкуль яна бачыла гора? Мама выгадавала, бацька.

А ты не п'еш, бач ты! Мой Іванчык таксама ўмее і наварыць, ён такі хлопец. А перажывае за мяне:

– Мамо, каб ты хаця б не прапала.

Я, кажу:

– Не прападу. Я паважаю і шкадую людзей.

Свечку запалю. Заране спаць кладземся. У цямніцы сядзець пагана. Свечка і е свечка. Іванчык заране спаць ідзе. Нагаруецца, звечарэе і спаць

кладзецца. Куды хадзіць? А нікуды няма хадзіць. Куды ты пойдзеш. А тут і клуб закрыты. Яны ўсе ў хатах тэлевізар уключаць ды сядзяць. Сусед мой адзін жыве. Семдзесят год. Два сыны, Іван, з Мазыра – і адмовіліся. От як. От да чаго ты дажыўся, кажу. А ў Юравічах у прыстарэлы дачка здала матку. Матку здала сама! Іванчык:

– А ты што, – кажа, – мамо?

А я што? А я нічога. Я пакуль хаджу. Буду хадзіць. А хто паможа табе, кажу. А ніхто, кажу.

– Ты ўжо не бяры ніякую. Ты ўмееш наварыць. Жыві адзін, без клопату галава. А то ты паб'еш яе, – кажу, – і ў турму пасадзяць.

Не, наш Лукашэнка маладзец. У нас от гаруй колькі хочаш. Колькі хочаш...

Жыццё не склалася. Не склалася жыццё. Во гэта нага баліць. Папацягалася я па той ферме. Ляжала мо месяц у бальніцы. Божа мой, божа! І цяпер баліць. Іванчык кажа:

– Мамо, мамо. Божа мой, божа, журышся.

– Журуся, – кажу. – Дарма, я крэпкая.

Перажывае, бач які!

Засталася адна. От хлопчыкі гэтыя, ды і ўсё. Мо пяць прыходзіла. Яшчэ паб'юць іх. Тут паўсяла прымакоў папрынімалі. Я кажу:

– Хто вас знае.

А што ты тут адзін сядзіш? Радзіва хоць якое трэба. Радзіва якое трэба, каб іграла.

Раздзел 8

# Калі глядзець наперад, можна ўбачыць сваю спіну



## СНЕЖАНЬ

•

Мінчукі жаляцца на цёплую зіму, а я гляджу ў Космас і маўчу.

•

І месяца не прайшло, як цётка Дуня з'ехала ў горад. Мы з ёй урачыста развіталіся. Прагучалі абяцанні не забываць адно аднаго і чакаць вясну.

Праз два дні яна мне звоніць:

– Андрэй! Бяжы сюды!

– Куды, у Каленкавічы?

– Якія Каленкавічы?! Ты з дуба ляснуў? Тута я.

Прыбег я лісапедай.

– Чуеш, што скажу?

– Ну.

– Не нукай. Ідзі мне кран выкруці.

У двары з зямлі тырчэла труба, сагнутая ў кран.

– Нашто?

– Маўчы і круці.

– Куды пакласці?

– Туды во пакладзі. Усё, ідзі, а я кран схаваю. Толькі ж маўчы, нікому не кажы. Вясной вярнуся – укруціш назад.

Мы яшчэ раз урачыста развіталіся, і я пабег лісапедай дадому.

Сёння ўсю ноч пісаў. У сем гадзін раніцы лёг спаць. А ў восем – грукат у шыбу.

– Андрэй! Андрэю! Ты што там, спіш?

– Сплю.

– А я табе званю, званю.

– Я ж сплю. А што такое?

– А нічога! Менш спаць нада! Дзе б дзеўку шукаў, а ён спіць. Так усё праспіш.

– Вы прыехалі сказаць пра дзеўку?

– Было б пра што гаварыць. Чуеш, што скажу?

– Ну.

– Ладна я, цётка старая, не падумала. А ты ж малады хлопец і не сказаў мне.

– Ды што?

– Што, што! Што ты штокаеш? Я ж паехала, а пробкі – ПРОБКІ з шчотчыка не выкруціла!

•

Даўно хацеў пахадзіць па Прудку з дыктафонам і запісаць успаміны пра колішні Прудок. Цётка сказала мне, да каго ісці. Сяджу, чакаю заўтра і думаю: хоць бы на бабак прыстрэт не напаў, хоць бы бабкі дачакаліся маёй экспедыцыі, хоць бы не паўміралі за ноч.

•

Вынікі маёй першай этнаграфічнай экспедыцыі.

Баба Наташа:

– Я ўжо старая, я нічога не помню. Да свіданія.

– А царкву помніце?

– Помню. Стаяла царква, ды ўжо няма. Да свіданія.

– А дзеда майго хоць помніце?

– Помню. Быў дзед ды няма дзеда. От што. Да свіданія.

– Давайпака.

•

Радзіва «Прудок». Навуковая перадача пра беларусаў.

Расійская душа існуе ў гарызанталі. Яе наканаванне – распаўсюдзіцца ад гарызонта да гарызонта. Беларус жа мае вертыкальную душу. Ён сілкуецца сваёй глыбінёй – пад лясамі і балотамі, пад Прыпяццю, Дняпром і Дзвіной.

Нашай нацыянальнай гульнёй я б вызначыў не хакей, а хованкі. Перамагае той, хто схаваў і сам не ведае, дзе і навошта. Як баба Наташа сёння, якая ніяк не хацела распавядаць пра прудкаўскую царкву і майго дзеда.

•

Трэба гараваць і жаліцца на жыццё.

Няможна пісаць, што шкарпэткі дзіравыя: сорамна.

Няможна пісаць увогуле: сорамна.

Па-беларуску можна размаўляць толькі ў цёмным-цёмным пакоі з аднадумцамі.

Быць асаблівым дазваляецца толькі пасля смерці.

Суседка запыталася:

– Чаму пераехаў?

– Захацелася.

– Дзе працуеш?

– Нідзе.

– Нейкі ты не такі.

Участковы дапытваў:

– Чаму пераехаў?

– Захацелася.

– Дзе працуеш?

– Нідзе.

– На ўчоце састаіш?

– Не.

– Я праверу.

Цётка кажа:

– Зрабі плот вышэй.

– Навошта?

– Каб людзі не бачылі.

Кожны беларус мусіць быць партызанам. Самы лепшы беларус – такі, які зрабіў штосьці неверагоднае, а пра яго не напісалі ў газеце пры жыцці.

Але я свой партызанскі ген згубіў. Пра мяне нават прыказка е: язык у роце, як чорт у балоце.

Прыміце мяне такім.

– Каго любіш?

– Люблю Беларусь.

– То трымайся.

•

Быў у Мінску, шукаў на вакзале разетку, каб падзарадзіць тэлефон. Знайшоў толькі платны аўтамат. Але, бляха, я ўжо стары вясковы дзядзька, каб разбірацца, якім бокам што куды ўтыкаць. Калі ў мяне не было сваёй электрычнасці, я зараджаў тэлефон або ў калгасе, або ў краме.

Калгаса на вакзале я не знайшоў, то пайшоў да касіркі.

– Можна, – кажу, – я ў вас усуну на дзесяць хвіліначак?

І тыкаю ў яе провадам ад падзарадкі – паказваю, як я гэта збіраюся зрабіць.

Касірка адказвае:

– Маладой чалавек, вы ваабшчэ адкудава зваліліся? У какоя врэмя вы жавёцця? У нас ёсць платный аўтамат, ідзіця і ўсуньця ў яго.

– У вас жа ёсць разетка. Я толькі на пяць хвіліначак усуну, і ўсё.

– Ідзіця, – кажа, – у аўтамат. І не дурыця мне галаву.

У аўтамат я не пайшоў, а пайшоў у прыбіральню, знайшоў там бясплатную разетку. Уваткнуў провад у яе.

Апасля спусціўся ў пераход і купіў букецік кветак. Прыношу касірцы.

– Гэта вам, – кажу.

– За што? Я ж не дала ўсунуць.

– Я ўжо ўсунуў. Мне болей не трэба. Гэта проста так. Бясплатна.

•

А тым часам у Прудку.

Учора ў краме:

– Цукар е?

– Няма.

Сёння ў краме:

– Цукар е?

– На, я табе з дому прынесла.

•

Першыя хвіліны гэтага года я сустрэў у натоўпе ў Вільні. Апошнія хвіліны я правяду ў адзіноце ў сваёй хаце ў Прудку. Будзе мароз і снег. Будзе гарэць агонь у печы. І я спалю ў ім усё непатрэбнае. Я памыюся ледзяной вадой, буду піць гарбату ў лесе і глядзець у неба. У мяне няма тэлевізара, алкаголю і салатаў. У мяне ёсць толькі лес, Космас, вада і агонь. У мяне няма нічога, але я маю ўсё.

•

Быць зімой дармаедам у вёсцы фізічна прасцей, чым быць зімой дворнікам у Мінску. Летась я насіў на сваіх плячах вялізныя гурбы снегу. Учора пачысціў маленькую сцежку для паштаркі, і яна прывезла паштоўку з Купалаўскага тэатра – клёвую, дурную, як я люблю.

Шаноўны Тэатр, прыём! Гэта Прудок. Дзякуй, што не забываеце нас, ветэранаў, раскіданых па свеце. Вы – гэта мая вялікая мінская батарэйка.

# 2016 год

## СТУДЗЕНЬ

Існі ў навагоднюю ноч у лес страшна. Ён блізенька, але ж вельмі цёмны – наперадзе толькі чорная сцяна з дрэваў. Адразу ўзгадваюцца фантазіі пра палешукоў, што перакінуліся ў хвоі. Стаяць і шумяць:

– Увшшшш.

І ніхто іх не чуе.

Потым страх сыходзіць. Відаць ашмёткі неба між галінаў. І як хвоі цягнуцца галінамі да таго неба. У гэтым ціхім натоўпе дрэваў на некалькі хвілін перастаеш быць чалавекам. Як выпускаеш з цела душу палётаць.

•

Радзіва «Прудок». Навагодні выпуск.

Шчаплю лучыну. Коля едзе на лісапедзе па галалёдзе.

– Змагаешся?

– Змагаюся.

– Е што?

– Я ж не п'ю.

– Ну і дурак.

– Ідзі ў сраку.

– Заходзь у госці.

– Добра.

– Давайпака.

– Давайпака.

•

Старадаўняя прудкаўская народная прыкмета.

Калі памыўся і памыў падлогу, ніхто гэтага не ўбачыць. Калі тыдзень жыў нясвежым бяздушным кабачком, прыедуць новыя госці і навек запомняць цябе такім.

•

Уся тэрыторыя, якая пачынаецца за метр ад грубы, называецца зонай высялення. Я туды хаджу толькі па сала. А раздзецца перад сном – гэта зняць куртку і шапку-гандонку.

•

У такі мароз хадзіць да ветру можна толькі з бацькавага блаславення.
Добра, што трэба ехаць у Мінск. Хоць пагрэюся ў маршрутках.

•

Па дарозе заехаў да бацькоў.
А вы ведалі, што цёплая вада цячэ з крана? Гэта такая штука, якая тырчыць са сцяны.

•

Радзіва «Прудок». У нас на прамой сувязі прудкаўскі дзядзька, які ходзіць па праспекце.
У гэтае вашае кіно я сходзіў, свае валёнкі мінчукам паказаў, у «Цэнтральным» быў, у «Логвінаве» быў, на тэатр паглядзеў.
Мінск! Хто возьме на ноч няп'ючага дзядзьку з дзярэўні?

•

Прынамсі адно жаданне ў жанчын я выклікаю – жаданне мяне накарміць.

•

У архіве:
– На дваццаць восьмага.
– На двадцать восьмое?
– Так, на дваццаць восьмага.
У касе чыгуначнага вакзала:
– На сёння.
– На сегодня?
– Так, на сёння.
У маршрутцы:
– У Каленкавічах.
– В Калинковичах?
– Так, у Каленкавічах.
У прудкаўской краме:

– Паўкіло шакаладных канфет.

– Цукерак?

– Так, цукерак.

Я дома.

•

Я мусіў вярнуцца дадому заўтра. Аднак нясцерпна захацелася ў Прудок, і я здаў свой квіток на начны цягнік і паехаў маршруткай.

Прыехаў. У хаце нуль градусаў. У коткі абледзянела вада ў місцы. У слоіку з малаком плавае лёд. У вядры з вадой плавае лёд. Усё адно цёпла, бо я – дома.

Сябар-талаковец кажа: «Можаш жыць у мяне тыдзень і хадзіць у свой архіў». У яго цёпла і добра, але я не магу. Хтосьці мусіць паліць у грубе. Бо, калі з хаты выходзіць цяпло, з мяне бы сыходзіць душа.

Яшчэ ў Мінску насіць валёнкі лічыцца вычварэнствам. Ніколі раней я не адчуваў сябе так навідавоку. Тут не лічыцца. Тут я нармальны.

Дома – гэта там, дзе ты нармальны.

•

Маці пытаецца: «Не сумна табе там аднаму?»

Я не адзін, мама. Я тут з псіха-эратычнымі думамі.

Я выходжу ў двор і кажу зямлі:

– Я хачу спазнаць тваю глыбіню, зямля, – і зацята сую ў яе свой дыктафон.

А яна маўчыць і не пакараецца мне.

– Баба Наташа, а вы помніце штоліся?

А баба Наташа зачыняе дзверы.

Я прашу ў архіве пяць спраў. А мне прыносяць адзін танюсенькі сшытак з лічбамі пра зямельныя надзелы, бо астатнія справы на рэстаўрацыі.

Я кажу:

– Хачу глыбей.

Калісь у мяне быў штодзённы рытуал. Я прачынаўся а шостай раніцы, выходзіў у двор, зачэрпваў вядро чыстай халоднай вады са студні і мыў ёю вочы. Так можна ўгледзець ўтоеную ад непамытых вачэй прыгажосць.

Трэба зноў прачынацца а шостай, мыць вочы, сядаць на ўслончыку ля грубы і думаць, думаць, думаць. Думаць, чаму глыбіня не даецца мне.

•

Гляджу я на сваю кавяню і думаю. От яна складаецца з атамаў. Атамы – з электронаў, пратонаў і нейтронаў, унутры якіх – кваркі. Кваркі ж складаюцца са струнаў. Вібрацыі гэтых струнаў скрыўляюць час і прастору ў дзесяці неймаверных вымярэннях і ствараюць форму ўсяму.

Гляджу я на сваю кавяню і баюся браць яе ў рукі.

•

Дзень народзінаў пачаўся з таго, што я ноччу глядзеў дакументальныя фільмы пра кваркі і атамы і праспаў усё што можна: і памыць падлогу, і схадзіць па малако.

Прыехаў мой чатырох'юрадны брат са сваімі бацькамі. Мы пазнаёміліся нядаўна праз «Нашу Ніву».

Мне 33. І гэта добра. Я ўжо не 32-гадовы мінчук, які з'ехаў у дзедаву хату, а 33-гадовы прудкавец, які застаўся жыць у ёй.

•

Суровыя беларусы віншуюць беларусаў так:

«Гараваць»;

«Трымайся»;

«Цярпення»;

«Добра гараваць»;

«Палескага цярпення»;

«Гаравання!»;

«Шмат гараваць»;

«Каб гараванне прыносіла плён».

Але сёння я не спраўджваю тых наказаў. Пакуль нармальныя прудкаўцы гаруюць, я працягваю думаць пра скрыўленне часу-прасторы і што баба Наташа – гэта Еўропа, шосты спадарожнік Юпіцера, дзе пад тоўшчай ільду ёсць вада, а мо і жыццё з рыбкамі.

•

Каця зрабіла мне падарунак на дзень народзінаў – паэмы Янкі Купалы ў выданні 1949 года. Кніга мае два подпісы. Першы 1953 года: «Желаю, как реалист, прожить и встретить 1990 год, где жизнь человека будет,

можно сказать с полной уверенностью, полнее, краше, счастливее и человечнее. В дар белорусу от белоруса». У 2016 годзе побач з'явіўся яшчэ адзін подпіс – мне: «(...) Цікава, як там будзе ў 2053 годзе? Беларусу ад беларускі».

Як там будзе ў 2053? Ці будуць людзі больш шчаслівыя і чалавечныя, я не маю ўпэўненасці. І Каця, відаць, не мае, інакш напісала б.

Але я ведаю, што ў 2053 годзе дакладна будзе Янка Купала.

Станавяцца ў хатах
Дзяды па кутох,
Час агонь паліці,
Ночкі цень залёг.

•

Калі ноччу сядзець на ганку і глядзець далёка наперад, то можна ўбачыць сваю спіну.

•

Маці кажа:
– Туды-сюды, і студзень скончыцца.
Я кажу:
– Яшчэ будзе люты.
Маці кажа:
– Туды-сюды, а люты кароткі.
Я кажу:
– А сакавік?
Маці кажа:
– Туды-сюды, а бацька ўжо піша планы на вясну.

Туды-сюды, і трэба купіць сшытак, падпісаць яго «Агарод», нарысаваць схему градак і планаваць вясну, як бацька.

•

Стабільнасць так абрыдла, што нават цыклон – гэта радасць.

•

Глыбіня снежнага покрыва вымяраецца ў валёнках. Сёння – 0,8 val.

•

Мінскі гарвыканкам неспадзеўкі даслаў эсэмэску: «Убедительно просим убрать снег у машиномест и во дворах».

Я назад засыпаў снегам сваю сцежку ў двары.

•

У 1864 годзе прудкаўскія сяляне «изъявили своё неудовольствие на то, что у них мало огородов и тесно стоят постройки».

Прыйшоў такі ўпаўнаважаны да Міхася, Матвеевага сына, і кажа:

– Убедительно просим изъявить своё неудовольствие.

– Шо?

От гэтыя чыноўнікі – ніяк па-чалавечы не навучацца размаўляць.

•

Я, пэўна, адзіны чалавек у Прудку, якому прыносяць «Народную волю». Мяне на яе падпісала Марыя Вайцяшонак, каб я не кіс у палескім інфармацыйным вакууме. Думаў нават, што паштарка не будзе болей любіць мяне, калі даведаецца, што я чытаю. Але не – прыносіць газету, грукае ў шыбу і крычыць:

– Андрушачка, Андрушачка, выходзь!

Выходжу.

– От табе твая газета. От табе часопіс тоўсты. От табе за тэлефон квітанцыя. От табе пісьмо, распішыся тута. Маладзец. Ідзі, чытай.

•

Мае тэксты можна чытаць на аўтобусным прыпынку і ў метро. Я пішу іх для людзей, якія спяшаюцца жыць.

А от да апавяданняў Марыі Вайцяшонак заўжды трэба рыхтавацца: уключыць цішыню і цмянае святло лямпы, заварыць багун, выбачыцца перад гадзіннікам на сцяне за спынены, скрадзены час. Тады словы расцякуцца па целе водарамі.

«Маё лецішча насупраць, бачу Тамару з вакна. Я да Бога: «Божа, пажажы ты ёй, Божа шчыры, пажажы...». Іншы раз, каб толькі дзверы яна ў сваёй хаце адчыніла, яна мне быццам толькі дзеля самой хаты».

•

Маці кажа, што дзверы не зачыняліся: было шмат калядніkaў.

– А да цябе прыходзілі?

– Не, не было.

І я ўзгадваю траіх хлапчукоў, якія ўчора доўга стаялі ля плота і спрачаліся аб нечым. Але так і не наважыліся зайсці да здзічэлага дзядзькі.

Помню, у верасні мінаў дзіцячы натоўп пад брылём крамы – яны там хаваліся ад дажджу – і чуў:

– Здрасця!

– Здрасця!

– Здрасця!

– Гэта той дзядзька, што жыве ў хаце з прывідзеннямі.

– Здрасця!

•

Чытаю «Матэматычныя пачаткі натуральнай філасофіі» Ісаака Ньютана, а ў галаве праносіцца думка: «Мо купіць пляшку і пайсці да Колі?».

Не, ну нафіг.

•

Не пайшоў я сёння да Колі. Замест гарэлкі купіў у краме трыста грам цукерак. Сяджу, гляджу на агонь і ем цукеркі. Грукат у шыбу. Бачу Колеву галаву.

– Здароў.

– Здароў.

– Што робіш?

– Цукеркі ем.

– А гарэлку п'еш?

– Я ж няп'ючы.

– Я ведаю. Мо е што?

– Няма.

– Гора. І купіць няма дзе.

– Ніхто самагон не прадае?

– Прадае. Ды маёй раскажа.

– Ты сваю баішся?

– Зараз урэжу.

– Праўда баішся? Што яна табе зробіць?
– Ай, пайшла яна ў сраку.
– Што так?
– Ай, адчапіся.
– Цукерку даць?
– Дай.
– На.
– Дай яшчэ адну. Маёй аднясу.
Кахае.

•

Учора глядзеў на старую акацыю і думаў, што прыйдзецца яе спілаваць. Летась на ёй была толькі адна зялёная галінка.

А сёння вецер. Акацыя трэцца аб страху і рыпіць.

Не рві мне душу, старая акацыя. Мы яшчэ сустрэнем вясну разам.

•

Пазваніла маці і сказала, што памерла цётка Вольга.

Там, куды яна пайшла, яе будуць чакаць дзясяткі людзей, успамінамі пра якіх яна дзялілася. А мы, пазасталыя, развітаемся з ёй заўтра тут, на зямлі. Але развітаемся толькі на кароткі час.

•

Цётка Воля расказвала:

«Вельмі добры быў бацька мой. Ніколі не біў нас. Нічога ніякага. Ён быў сільна добры. Але хварэў. Баба Ганна знізу вось цяпер жыла, так? А то насупраць наверсе мы жылі. Там наша хатка была. Каморка. Баба Еўга, бацькава маці, выгнала бабу Ганну з дзедам Іванам у камору. Там вада замярзала. Я яшчэ і сёння помню тую хатку. Ішла я ў першы клас з той хаткі. Мама напаліць печку крэпка. Мы ўсе – і папа, і мама – усе на печы. І кругом посцілкамі паабпінае. Так і спалі. Я так добра гэта запомніла.

Вой, Госпадзі. Дарма што без бацькі жылі. Бацька памёр. Але ў нас мама была такая, што ўсё ў нас было. Яна сама і плацці шыла нам. У нашых сябровак па адным плацці, а ў нас з Юляй хапала. Галя сяброўка была. Яна ў мяне потым кумою стала. Хрысціла маіх хлопцаў. Во. Дык яна з бацькам жыла, з маткай. Ніколі матцы сваёй нічога не раскажа.



Ніводнага сакрэта матка яе не знала. А наша матка ўсе сакрэты Галіныя знала. Усё раскажа. Прыйдзе:

– Арцёмаўна, сядай, я табе раскажу.

А хлопец які цукерак дасць ці што – яна нясе:

– Арцёмаўна, на, ты першая, потым я.

Ніколі сама не з'есць без маткі. Усе цукеркі матка з ёю ела. Прыйдзе, стаіць пад нашай хатай з хлопцам, захацела пасцаць, а стыдна хлопцу сказаць. Прыбяжыць:

– Вой, Арцёмаўна, не магу ўжо болей. Дай хутчэй быстрэй куды штонебудзь.

Тая вядро ёй паставе. Пабегла ізноў да таго хлопца. Канцэрт! То не Галя была, а я не знаю – конь! Матка яе ўсю дарогу любіла».

Цётка Воля гучна смяецца. І я смяюся разам з ёю.

•

Я выдаліў з тэлефона нумар цёткі Волі. У мяне няма болей яе нумара, але засталося штосьці большае. Сваё жыццё я пражыву з любоўю, пражыву без злосці. Так, як яна мяне навучыла.

– Цётка Воля, а баба Ганна расказвала што-небудзь пра канцлагер?

– Расказвала. І шмат чаго расказвала. Я таксама часта ёй такія пытанні задавала.

(Відавочна, што размова не пра канцлагер, а пра прымусовыя працы, на якія масава звозілі беларусаў, але сямейная традыцыя вырашыла называць гэта так.)

Дваццаць гадоў ёй было тады. Багата каго гналі ў цягнікі і везлі. І яе разам з усімі забралі. І яе дваюрадную сястру Полю забралі. Дык яны разам былі. Толькі на розных цэхах працавалі. У цёткі Полі быў сільна ўрэдны немец. А ў маткі непаганы быў. Гаворыць, адзін раз правяраў яе: сказаў, каб убрала ў яго кабінеце. Я, кажа, пайшла ўбіраць – там грошы ляжаць, там ляжаць. Усюды маркі валяюцца на падлозе – то там, то там. Я, кажа, пасабірала і на стол паклала. Аж ён прыйшоў і гэтыя грошы бачыць – ляжаць. Мабыць, праверыў, колькі там. Ён жа знаў, колькі раскідаў. Захацеў праверыць, ці не ўкраду.

– Аня, хадзі сюды. Ком!

Я, кажа, пайшла. Ён:

– Што за грошы? – паказвае.

А я, гаворыць, і кажу:

– Гэта вашыя. Там знайшла, там знайшла. У мяне не было. То вашыя – не мае.

І ён ёй усе аддаў і ад таго заўсёды давяраў ёй кабінет убіраць.

•

Ну куды іх? На які завод? На той, дзе бомбы робяць! Дык, кажа, брак усё рабілі, стараліся. Немцы пазней прыходзілі. А мама ў пяць раніцы. Зараней іх гналі туды. От. На ногі давалі такія калодкі. Дык, кажа, ідзеш – і як зляціць тая калодка каму ў спіну. От. Гаворыць, я ўжо прыйду загадзя, дык гэты немец, што грошы раскідаў, кажа:

– Аня, ідзі паспі.

І ключ дасць. А там склад – бомбы ўкручвалі ў розныя анучы. А ён гаворыць:

– Калі хто прыйдзе з начальства, дык я пастукаю ў вакно зверху, скажу «Аня, угу» – ты ўжо знай, што трэба ісці.

І я, гаворыць, пайду, паляжу там, яшчэ спрашу ў яго ды наўбіраю сабе ласкуткоў. І сукенкі шыла. От такое мама расказвала.

•

І дзед Арцём пакойны расказваў, матчын бацька, што ў лесе немцы яго злавілі. Тады Боруск спалілі, а ён хаваўся па акопах. Немцы на яго:

– ПартЫзан, партЫзан!

– Які ж я партызан? У мяне дачка ў Германіі. – І выняў картачку, ну, паштоўку, што мама даслала, паказаў, дык адзін немец кажа:

– Гэта мая дома. Бацька, я еду дадому ў отпуск, дык калі што хочаш перадаць, то я завязу доні тваёй.

Дзед казаў, што даў: і сала даў, і яшчэ штосьці даў. Знайшоў той немец маму і перадаў перадачу. Кажа, ніколі б не падумала. І сказаў:

– Гэта ад бацькі табе пасылка.

От табе і немец!

•

Так, каб рабілі што, то не. Не здзекуліся. Кажа, вадзілі ў лазню. Яны таксама любяць чысціню. Так, каб вошы ці хто з'елі, то такога не было. Расказвала, што зубы лячыла адна немка – дзевачка яшчэ была. Яна дружыла з нашым салдатам. І ўжо хацелі ажаніцца. А сільна прыгожая была, кажа. Адзін немец афіцэрам быў ці кім, не помню. Дык хацеў яе знасілаваць. А мы, гаворыць, цэлымі начамі сядзелі па чарзе, то вышывалі, то яшчэ што-небудзь рабілі, каб ён нічога не зрабіў ёй. І так кожную ноч. Потым расказалі ўсё-такі начальству, і яго хутка ўбралі. Дарма што немцы, але яны не дазвалялі, каб такое было.

•

Ужо як фосфар кідалі амерыканцы, там і нашыя пленныя салдаты, гаворыць, былі. Як ужо пачнуць біць, фосфар кідаць, дык усюды гарыць. А мы хаваліся ў бліндажы, кажа. Дык мы, гаворыць, хлопцавы пабяром чамаданы ды ўцякаем, калі бамбёжка пачынаецца. Калі мы на заводзе, а яны дома, то яны нашыя чамаданы цягаюць. Адзін раз пачалі біць і кідаць фосфар. Патрапіць на каго, дык згарае чалавек увесь. Ну мы, гаворыць, пападалі ў бліндаж і ляжым. Бомба ўпала ды блізка каля нас. І нас, кажа, прывaліла зямлёй. Потым хлопцы нашыя папрыходзілі з работы – дзевак няма. А яны зналі, дзе мы хаваемся, у якім месцы. Прыйшлі, а мая, кажа, рука вотакаво выткнулася. І пярсцёнак імянны.

– Хлопцы, дзеўкі нашыя тут!

Давай раскопваць нас, гаворыць. Дык я, гаворыць, бегла, і не знаю куды, я не помню. Ледзьве не задахнулася ў той зямлі. Хлопцам – ці то адкопваць далей, ці то мяне трымаць, бо я бягу куды папала. Потым адкапалі ўсіх дзяўчат, дык дзве ўкраінкі задахнуліся нанізе.

•

Немка прыйдзе – кажа, на абед, – дык і я сяду, памагаю ёй штопаць наскі. Яна і мне дасць наскоў. Адным разам немка сказала, што нарве палявых кветак, бо ў начальніка, што даваў ключ, дзень народзінаў. На заводзе папера такая рознакаляровая была – ёй абкручвалі гільзы. Мама набрала той паперы, усю ноч сядзела і накруціла букет кветак – прыгожы, кажа, зрабіла. Гаворыць, увярнула ды нясу. На прахадной правяраюць.

– Што нясеце?

Яна сказала, што дзень народзінаў у начальніка і што букет кветак нарвала ды нясе. Ён прапусціў. Схавала ў шафу і працую, кажа. Тая немка прыйшла, глянула ў шафу, ўбачыла і ўсім расказала, што я зрабіла. Ужо чакаюць не дачакаюцца, кажа, як я гэты букет падару. Як падарыла, ніхто не паверыў.

– А што, у цябе машынка такая е, што кветкі гэтыя робіць?

Мама гаворыць:

– Не, сама.

Яны прынеслі паперу:

– Рабі перад намі. Мы пабачым.

Мама зрабіла. І потым, кажа, мне лягчэй стала. Бо я, гаворыць, зраблю кветак і пайду ў горад, калі пускалі, – дык мне за тыя кветкі маркі давалі. І мы хлеба купім і, кажа, больш не пухлі ад адной броквы. А некатарыя нашыя пухлі, бо нічога не ўмелі рабіць.

•

А ўжо як прыйшлі нашыя, то мама была перакладчыкам. Нямецкую мову добра ведала. Чытаць яна не ўмела, таму што ў школу не хадзіла, але яўрэйскую мову знала, бо ля яўрэяў жыла. Дык я, гаворыць, у Германію трапіла – немцы размаўляюць, а я ўсё разумела. Цётка Поля дзесяць класаў скончыла. Чытаць умела, а перакладаць не магла, дарма што вучыла нямецкую. Як пойдуць яны ў горад, дык цётка Поля чытае, дзе што напісана, а мама перакладае. Так і жылі. Дык, кажа, як нашыя ўжо вызвалілі, немцаў на працу ганялі, я ўжо перакладала, што яны гавораць.



•

Яшчэ матка расказвала, што нашыя сільна здзекуліся. Гэтыя... паліцаі. Немец, кажа, як застане каля калючага дрота, то яшчэ нічога, яшчэ можа прайсці. А ўжо як паліцай – усё, кажа, канец. Нашыя яшчэ горшыя, кажа, за немцаў былі. Нічога, усюды злыя людзі ёсць. Але і, куды ні зірні, добрых людзей усё адно болей.

•

Калі матка вярнулася дадому і выйшла замуж за майго бацьку, твайго дзеда Івана, то неяк разгаманілася з яго братам. Ён таксама ў вайну працаваў на нямецкім заводзе. Выпіў чарку і расказвае матцы:

– Раніцою мы ішлі на завод, а за высокім плотам вялі дзевак. Мы іх не бачылі, але чулі. От. І была сярод іх адна, якая вельмі хараша пела. Я век не забуду яе песень. Я, – кажа, – і чакаў новы дзень, толькі каб паслухаць яе. Як выведуць нас, як пачую, што і дзеўкі ўжо ідуць, то крычу: «Аня, пой!». І яна пела: «Я зязюля, зязюля шэрая, не вылечу з саду». Каб не тая Аня, не ведаю, што б са мной стала.

Баба Ганна слухала, слухала ды запела:

Трудна жыці на чужыні, не маючы роду.
Перарабілась у шэру зязюлю да ў род уляцела.
Уляцела ў сад – сад раднесенькі,
Стала на калена, стала кукаваць,
Шчэ й расказваць, як жыць на чужыні.
– Калі доч мая, доч раднесенька, захадзі ў хату,
Калі зязюля, зязюля шэрая, вылятай з саду.
– А я доч твая, доч раднесенька, не пайду ў хату.
Я зязюля, зязюля шэрая, не вылечу з саду.

Раздзел 9

# У Польшчы ёсць усё, акрамя дзедавай хаты



•

Сёння з'ездзіў на селішча бабы Ганны.

•

Я правёў сваё дзяцінства ў вёсцы Бярозаўка. Гэта недалёка ад Прудка. Там жыла мая любімая баба Ганна. Сёння я заехаў туды.

Цяпер я не буду спаць шэсць начэй, а праз шэсць начэй захачу выкупіць тую зямлю і ўсё аднавіць. Ад хаты застаўся толькі фундамент. Дзе стаяла печ і шафа, растуць канадскія клёны. Ёсць стары, зарослы хмызняком сад і вялікі агарод, на якім, як казала бабуля, і дзіця вырасце, калі яго туды пасадзіць. Раней там было балота, а потым мой дзед нацягаў наверх чорнай зямлі. Я не ведаю, што рабіць. Я не ведаю, дзе ўзяць грошы, рукі і яшчэ адно жыццё, каб вярнуць гэтае селішча ў генеалагічнае дрэва. Але я вельмі хачу.

Я не магу адвярнуцца і зрабіць выгляд, што мяне гэта не кранае і што ў мяне няма сілы.

•

Баба Ганна размаўляла па-беларуску. Да пяці год мяне гадавала яна.

У школе я напісаў у сачыненні «баба Ганна» – настаўніца выправіла на «баба Анна». Але ніякай бабы Анны я не ведаў.

У інстытуце прафесар Іўчанкаў прымаў у мяне залік. Я сядзеў у яго кабінеце і сарамліва пазіраў на свае нямецкія туфлі. Амаль увесь час я маўчаў, бо не меў беларускіх словаў у галаве, а тыя, што былі, не мог ніяк спалучыць. Але мне далі дыплом і выпусцілі ў свет невукам.

Два гады таму я прачнуўся з думкай, што пачну размаўляць па-беларуску. Пайшоў у кавярню «Ў». З не самым цвёрдым «ч» (каб па-беларуску, але не вельмі заўважна) вымаўляю:

– Мне чай чорны.

А дзяўчына такая:

– З цукрам?

Я разгубіўся, пачаў мыкаць. Яна падумала, што я не разумею беларускую, і пераклала:

– С сахаром?

Мне з цукрам хацелася, але я піў з сахарам і вёў унутраны дыялог з рэфлексіямі. Рэфлексіі вынеслі вердыкт, што я гаўно, і я з імі пагадзіўся.

Нейкім ранкам я адчуў большую смеласць і паабяцаў сабе, што ўвесь дзень буду размаўляць толькі па-беларуску. Але схітрыў і абіраў словы, сугучныя з расійскімі.

– Адзін жэтон.

– Выходзіце?

Па гэтым прынцыпе купіў сіні «ўінстан» замест чырвонага. На чырвоны смеласці не хапіла.

Першы сапраўдны дзень, які я пражыў па-беларуску, адбыўся ў Беластоку.

Мы туды паехалі з Евай. Калі выйшлі з маршруткі, я адразу перайшоў на беларускую. Было лёгка і прыемна. Яна па-расійску, я – па-беларуску. Усе сцены кудысьці зніклі.

А вярнуліся дадому – і мяне зноў заклініла.

Ева падарыла зборнік вершаў Барадуліна.

– Почему ты в Беларуси не говоришь по-белорусски?

Да паездкі ў Беласток я быў упэўнены, што праз страх выдзяляцца, які выдаюць кожнаму інтраверту пры нараджэнні. Але там мне, наадварот, увесь час хацелася размаўляць гучна, каб усе чулі. Гэта як выйсці з пограба, дзе сядзеў трыццаць год, і ўсім целам адчуць свабоду.

У Беларусі гэтай свабоды я не адчуваю. Адчуваю віну. Нібыта ў спакойным і стабільным беларускім моры я высунуўся са сваёй прыхамаццю і наганяю вецер, і абуджаю пытанні і непаразуменні.

Людзі падзяліліся на тых, з кім я размаўляю па-беларуску і з кім па-расійску. Амаль з усімі спрабаваў наладзіць беларускі кантакт, але цяжка камунікаваць на розных мовах.

– Каву будзеш з цукрам?

– Да-да, с сахаром.

Ну скажы ты: «Ага, з цукарам, з цукарам!». Але не, там жа ў галаве такая пазіцыя: «Я уважаю белорусскоязычных (афробелорусов), но сам разговариваю на русском и не буду марать свою речь белорусскими словами, потому что нужно или так, или так».

Але мне галоўнае, каб быў кантакт. От для гэтага кантакту я часта саступаю і пераходжу на расійскую. Для гэтага кантакту і мне саступаюць і пераходзяць на беларускую.

З двухмоўем узнікаюць шызоідныя сітуацыі, калі, напрыклад, я сустракаюся адразу з двума людзьмі, якія размаўляюць са мной і паміж сабой па-расійску, а я з адным па-беларуску, а з другім – па-расійску, бо так склалася. І мы гаворым утрох, яны толькі так, а я – і так, і гэтак. І нас не тры, а чатыры, бо мяне – два, і адзін з іх лішні.

Ці калі звоніць тэлефон, а там незнаёмы нумар, – паніка! паніка! хто гэта? на якой мове я з ім размаўляю?

Мне кажуць:

– Ай, не выпендривайся.

Не, ну шо, я проста выпендрываюся. Мне ж падабаецца ўся гэта блытаніна ў галаве. Для мяне беларуская мова – панты, ну. Я люблю рэфлексіі, люблю ненавідзець сябе, што не заўсёды маю смеласць казаць гучна, як я хачу. Гэта кайф такі – купляць сіняе замест чырвонага.

А бывала і так:

– Дайце, калі ласка... Ой, простите, то есть пожалуйста.

Я сябе ламаю, а яна там сядзіць з прычоскай і тупа ўсміхаецца, маўляў: «Нічога, нічога, з кім не бывае, і мне часам ранні Купала сніцца».

Прасціця-ізвяніця, што я парушыў ваш спакой і пасмеў па-беларускі абраціцца.

Я не разумею да канца гэты страх. Мусіць, ён на генным узроўні. У каго такі самы дыягназ, хадземце да мяне ў палату, будам лячыцца разам.

Яно лепей узяць і опа – ніякіх кампрамісаў. Бо чым далей, тым болей кашы ў галаве і ўнутраных канфліктаў. Трэба, як той кажа, рэзаць к чортавай маціры, не дажыдаясь перытаніту. Трэба вучыцца ўнутранай свабодзе, якая паўсюль, а не толькі ў Беластоку.

•

Маці просіць, каб я напісаў сачыненне майму пляменніку Арцёму.

– Напішы, бо я не дам рады. Я беларускую мову не ведаю.

– Ты сказала два сказы па-беларуску без памылак.

– Не дуры галаву.

– Ужо тры сказы.

– Адчапіся.

– Чатыры.

•

Ад мамы я навучыўся двум трапным выразам (калі вы прынцэса, то лепей не чытайце).

Гэта аналаг расійскаму «за рубль удавится» – «за капейку і ў царкве пердне».

І яшчэ адзін, больш жорсткі: «пасрэ і панюхае, хаця б дух не прапаў».

Уся душа і фантазія беларусаў у гэтых фразах.

Адна сяброўка выдаліла мяне з фрэндаў у фэйсбуку пасля таго, як я напісаў ёй такое.

– Вашы словы, якія вы не пасаромеліся ўжыць пры жанчыне, сведчаць пра адсутнасць выхаванасці. Не маю жадання болей з Вамі камунікаваць. Бывайце, – сказала яна мне.

Прапашчы я чалавек.

•

Прыехаў дваюрадны брат і захацеў запаліць у грубе. Кажа:

– Где у тебя бумага и спички?

А я кажу:

– У мяне е толькі папера і запалкі.

Не з русафобіі так раблю, а з урэднасці. Гэта даўняе сямейнае.

– Запалками и паперой я не буду, – сказаў ён таксама з урэднасці і прынёс з машыны бумагу і спічкі.

– У мяне, – кажу, – беларускамоўная груба. Так не распаліш.

– Не дури голову.

Мучыўся, мучыўся. Праз паўгадзіны здаўся:

– Ладна, давай сваю паперу. Дзякуй, калі ласка, пачакай, вельмі.

Болей слоў ён не ўспомніў, але гэтых хапіла, каб дровы загарэліся.

•

Мне не падабаецца слова «попельніца». Ніхто без вышэйшай адукацыі тут так не гаворыць. Я год трымаў вушы напагатове, чакаў, пакуль хтосьці з жывых людзей назаве попельніцу па-чалавечы. Летась з Ягорам спрабавалі прыдумаць сваё слова, але мазгоў не хапіла. Падумалі нават, што ў старадаўніх беларусаў попельніцы не было ўвогуле. Яны курылі і кідалі долу.

А мой дваюрадны брат кажа:

– Дзе ў цябе попелка?

Во! – падумаў я. – Дай бог табе здароўя, – падумаў я яшчэ.

•

Выпадкова паглядзеў тэлеперадачу пра Амерыку і Расію. Журналістка кажа:

– За што вы любіце Амерыку?

Амерыканка такая:

– Амерыка – гэта свабодная дэмакратычная краіна з вялікай гісторыяй.

У Расіі.

– За што вы любіце Расію?

– Расія – гэта вялікая краіна, краіна Пушкіна і Дастаеўскага.

Але я лічу, што вялікага для любові мала. Для любові трэба маленькае.

Калі мо два гады таму на галоўную ялінку ў Мінску начапілі беларускія арнаменты, шмат хто смяяўся з іх, нібыта арнаменты не самыя аўтэнтычныя, гэта ўжо пазнейшы mauvais ton, не статусныя, не вялікія, не, не, не. А я якраз такія бачыў на ручніку ў Аўцюках. І мне было цёпла, што Мінск не чужына мне, што Мінск – таксама Аўцюкі.

Усе гэтыя медалі, прэміі і статусы – не ведаю – мабыць, таксама маюць важнасць. Але калі англічанін скажа:

– Я люблю Англію, бо гэта вялікая краіна.

Француз:

– Я люблю Францыю, бо гэта вялікая краіна.

Немец:

– Я люблю Германію, бо гэта вялікая краіна.

Я скажу:

– Я люблю Беларусь, бо тут мы з Вовам Зайчыкавым закапалі сакрэт.

Мы яго глыбока закапалі пад клёнам. Той сакрэт дагэтуль там ляжыць. Ужо Вова Зайчыкаў памёр, а сакрэт усё адно ляжыць.

Усе краіны вялікія. А мой сакрэт ёсць толькі ў Беларусі. І мова. Я буду любіць тую мову, на якой дзекаюць і з цвёрдым «р» кажуць:

– Не дуры мне галаву.

Я буду любіць яе не праз Статуты ВКЛ ці кніжныя словы, на якіх вісяць карункавыя фіранкі, а праз маленькіх людзей, якія мяне ёй навучылі.

Ат, ізноў узнёсла атрымалася!

•

Я не ведаю, якое сёння свята. Але сёння свята, бо баба Параска ходзіць па Прудку, гамоніць з сабой і хрыплым голасам пяе песню пра тое, як яе, дзеўку маладую, кінуў хлопец. Недзе апоўначы яна прыйдзе ў мой двор папіць вады. Будзе грымець вядром ля студні і мармытаць пад нос:

– Трэба памаленьку, каб чалавека не пабудзіць. Чалавек раненька паедзе на работу ў Каленкавічы (яна чамусьці думае, што я не дармаед).

А пасля яна пойдзе дадому, за скрыжаваннем пачне крычаць на ўсю дзярэўню, у якой хаце прастытутка жыве, а ў якой – злодзей.

Я люблю бабу Параску.

•

Сёння мо ўпершыню пачуў ад бацькі слова «сынок».

Усім, незалежна ад узросту, наказваю: паглядзіце ў вочы свайму дзіцёнку ці пазваніце яму і скажыце чатыры простыя словы: «Я цябе люблю, сынок», «Я цябе люблю, доня».

Нават барадатыя дзеці ад гэтага дужэюць.

•

Спазніўся на аўтобус. У дзевяць раніцы мушу быць у мінскім архіве, а потым забраць Варвару. А я стаю ў прудкаўскім лесе з ліхтарыкам пасярод адлігі. У паветры малако. Баба Гаша сказала б: «Харашэ!».

Не ведаю, як я траплю ў той архіў. Але мне харашэ.

•

Вырашыў пайсці пешкі.

•

Прайшоў адзін кіламетр. Ноч, лес, адліга. Усё мокрае і слізкае. Каця паглядзела ў інтэрнеце, што хуткасць чалавека – шэсць кіламетраў за гадзіну. Агулам мне трэба прайсці каля дваццаці. Калі б бацька не хадзіў пешшу ў школу ў Юравічы, я б вярнуўся дадому і не трапіў бы заўтра ў архіў. Але ён мог, і я магу. Так я думаў у цемры на мёртвай трасе.

І тут мяне абагнала машына, спынілася, адтуль выйшаў нейкі мужык і сказаў:

– Дзядзько, чаго ты ідзеш ноччу, бы не свой. Сядай, падвязу.

Потым пытае:

– Ты скуль?

– З Прудка.

– У мяне там радня жыве.

– Хто?

– Усе.

Што я хачу вам сказаць? Пакуль я стаяў, мяне не ўзялі дзесяць машын. Калі пайшоў, узяла першая. Хоць я гэтага не прасіў і нават не спадзяваўся. Такі от урок прудкаўской філасофіі.

Мой любанскі сябра Анатоль казаў:

– Пакуль мы будзем рухацца, жыццё нас будзе слухацца.

Што праўда, то праўда.

Ну і ведаць, што ўмеў рабіць бацька, таксама можа спатрэбіцца.

•

Калі я быў малы, то чытаў Янку Маўра дома пад коўдрай з ліхтарыкам. Цяпер я вырас, у мяне з'явілася шмат правоў і я магу чытаць у цягніку пад коўдрай з ліхтарыкам Караткевіча.

•

Дзякуючы прыўкраснай Вользе Дземцы ў прудкаўскім кнігазборы цяпер ёсць мой любімы О. Генры на мове арыгіналу!

Добра, што свет такі featured рознакаляровы і што можна чытаць О. Генры па-англійску, Міцкевіча – па-польску, Чэхава – па-расійску, Караткевіча – па-беларуску.

А паштарка, напэўна, хутка павесіць у хаце карту мацерыкоў. Раней у ейным ўяўленні за Гомлем пачыналася касмічная зеўра. А праз маіх сяброў яна патрымала ў руках кавалкі Польшчы, Літвы, Германіі, Чэхіі. Цяпер вось і далёкай невядомай Амерыкі, дзе людзі ходзяць на галовах і ўсё дагары нагамі.

•

Разам з кнігай Вольга даслала з Амерыкі ледзянец для Варвары.

Я мыю посуд, Варвара смокча ледзянец і гаворыць:

– Дзядзі не мыюць пасуду.

– А хто?

– Цёці.

– А дзе я вазьму цёцю?

– Ну, наплімер, няхай памые пасуду тая цёця, якая прыслала мне ледзянец.

Цёця, якая прыслала ледзянец, цяпер хочаш не хочаш, а мусіш прыехаць са сваёй Амерыкі і памыць мне посуд.



•

Самае цікавае, што можа быць у жыцці, – выносіць з каморы хлам, сарціраваць яго і расстаўляць па новай схеме, набытай горкім вопытам. А яшчэ кожны раз у каморны дзень знаходжу новую ежу. Гэтым разам – мех з кукурузай. Я і забыўся, што кукурузу сушыў.

•

– Варвара, што будзеш: шарлотку ці сала?

– Сала-сала-сала-сала!

Наш чалавек!

•

Павёз Варвару назад у Мінск.

Ля Прудка спынілі машыну. Пакуль уладкаваліся, дзяўчына, што сядзела побач з кіроўцам, адчыніла дзверы і паставіла на асфальт пакет са смеццем. Яна нават не кінула яго ціхенька ў лес пад покрывам ночы, каб ніхто не ўбачыў. Дзяўчына выкінула вялікі пакет са смеццем наўпрост на асфальт на маіх вачах.

Паміж ёй і маладым кіроўцам адбыўся дыялог:

– Забяры назад.

– Ай, не дуры галаву, паехалі.

– Забяры назад.

– Паехалі.

– Забяры.

– Паехалі.

– Я не паеду, пакуль не забярэш.

– А куды яго дзець?

– Вунь мусарка. Выкінь у мусарку.

– Не дуры галаву. Паехалі.

– Выкінь у мусарку, я не паеду.

– Дастаў!

Дзяўчына вылезла з машыны і выкінула пакет у сметніцу.

Пакуль мы ехалі, я практыкаваў перадачу думак на адлегласці – глядзеў хлопцу на паголеную галаву і намаўляў: «Давай спынім машыну і выкінем дзеўку на асфальт. Давай спынім машыну і выкінем дзеўку на асфальт».

Ён не спыніў і не выкінуў, бо не прывучаны нічога выкідаць, нават такіх дзевак.

Але гэтае смецце ўжо нікуды не знікне. Не ў прудкаўскім лесе, дык у іншым месцы – яно будзе. Ні эколагі, ні вытворцы не ператвораць яго ў канфеці. У горадзе гэта цяжка ўсвядоміць. Здаецца, што ўсім кіруюць разумныя людзі. Яны ўсё ведаюць і ўсё робяць правільна. Ні-хе-ра. Усім кіруем мы, і за наша смецце адказныя таксама мы. І лепей я буду мыць посуд содай і дзіравымі трусамі, чым аддаваць сваю адказнасць чалавеку, якому пляваць на маю планету.

Калі я чытаю каменты кшталту «Каменный век, ей-богу», я хачу нагадаць, што ў каменным веку, да таго, як з'явіліся людзі з харошай адукацыяй, высокім IQ і прыгожымі манерамі, на маім Палессі не было зоны адчужэння. А былі балоты і дубровы.

•

Камунальнікі штотыдзень прыязджаюць па смецце, а ў мяне няма.

Другі месяц не магу назбіраць адзін пакет. Калі бачу іх, вінавата хаваю вочы. Прабачце, даражэнькія, няма, няма, няма. Каб штосьці выкінуць, трэба штосьці купіць. Прыязджайце ў сакавіку, я абавязкова што-небудзь куплю ў сакавіку.

•

Раней я часта ездзіў у Польшчу і прывозіў стуль падарункі Варвары. Калі яна прасіла купіць якуюсь цумаўскую ляльку-страшыдлу, я казаў:

– Давай я прывязу табе з Польшчы прыгожую?

З часам у Варвары склалася ўражанне, што ў Польшчы ёсць усё.

Я разумею людзей, якія з'ехалі з краіны цумаўскіх лялек. Я рады, што яны ўбачылі магчымасць застацца сабой і скарысталіся ёю.

Я сам двойчы пачынаў пакаваць чамаданы. Але не з'ехаў, бо ў Польшчы ёсць усё, але няма хаты майго дзеда і яго магілы.

•

Лёг спаць. Зачасалася нага. Расплюшчыў вока. Праз фіранку ўбачыў зорку ў небе. Падняўся. Заварыў багун. Надзеў бушлат «Хатабуд».

Іду ў двор піць гарбату. Выходзьце. Сустрэнемся на Птушыным Шляху. Я з чырвоным кубкам, калі што.

•

Радзіва «Прудок». Выпуск навінаў пра «Еўрабачанне».

Сёння ўсе прышчавыя дзевачкі з Гомля будуць галасаваць за праект IVAN, бо ён круты дзядзька з даўгімі валасамі, як у рокера, і пяе па-англійску. Нармальна пяе, не буду хлусіць. І сам модны, і песня ў яго модная, і прадзюсар модны.

Але яго крутая англамоўная песня не мае дачынення да культуры маёй краіны. Яна не вырасла з палескага балота.

Сапраўдная перамога – гэта паказаць сябе як ёсць, без накладання вусаў ці валасоў.

Таму я заклікаю фэйсбучнікаў уцерці насы дзевачкам з Гомля і прагаласаваць за дуэт NAVI. За нашу простую, шчырую, нармальную беларускую песню. Як ёсць.

І няважна, якое месца будзе ў той Еўропе. Мы пераможам, калі прызнаем сябе тут, а не калі прызнаюць нас там.

•

Радуйцеся, прышчавыя дзевачкі з Гомля.

Усё адно Нобельнаш, а NAVI мы будзем любіць проста так.

•

Успомніў сёння цёцю Галю Рудакову.

Яна была мамінай сяброўкай, а потым паехала ў Мінск і стала дыктаркай на тэлебачанні. Калі цёця Галя сядзела ў тэлевізары, мама разглядала яе і каменціла:

– От які пінжачок харошы. А я шчэ помню, як мая матка ёй плацці шыла і як з Галяй на адной печы спалі.

Ці званіла ёй і казала:

– Галя, чуеш? Бачыла цябе сёння, ага. От. Як дзялы?

Калі я паступаў на журфак, мы пайшлі да цёці Галі ў госці. Жыла яна на праспекце каля станцыі метро «Усход» у вельмі акуратнай светлай кватэры. Узялі з сабой шампанскае і вафельны торцік. Мама хацела папрасіць цёцю Галю, каб тая дапамагла мне паступіць, нават прывезла ў Мінск некалькі кілаграм сырой рыбы ў якасці хабару. Але прасіць пасаромелася і павезла рыбу назад на Палессе.

Цяпер цёця Галя жыве ў Італіі. Ніколі болей я яе не бачыў.

## ЛЮТЫ

•

Сяджу ў дзядзькавай кухні ў Каленкавічах. Дзянна Марыя серыял глядзіць. Тарахціць старая лядоўня. Быццам і няма нагодаў адчуваць шчасце, а яно плыве над галавой і само лезе ў вушы.

•

«Калі Бог дзяліў прыгажосць, я спала. Калі Бог пачаў дзяліць шчасце, я ўстала».

Гэтыя словы сказала сто гадоў таму італьянская графіня Францішка Анела Паўленс дэ ла Рохэ, жонка галоўчыцкага пана Горвата, на глухім беларускім Палессі.

•

Аднекуль чую цыганскую музыку. Апранаю бушлат і выходжу ў двор. Пад акном стаіць цыганка і слухае песню на тэлефоне.

– Добры дзень.

– Здрасця.

Сядаю на ганак. Ніякіх пытанняў адно аднаму. Усё і так зразумела – мы слухаем цыганскую музыку ў маім двары. Маё – тваё... Гэта прыгажосць. У прыгожага няма прыналежнасці.

Сядзі, маўчы і слухай.

•

– А то мо ён твой брат?

– Ну.

– Харошы хлопец. Рабацяшчы. І жонка ў яго харошая. От. Заходзя да цябе?

– Не, мы пасварыліся.

– Ааа, от яно што. Абы-што, а не хлопец. І жонка ў яго абы-што.

•

Старадаўняя беларуская традыцыя – на апошнія грошы купляць торт.

•

У барбароўскіх памешчыкаў Горватаў у хаце віселі Рэмбрант і Рубенс. Ад Прудка да Барбарова можна на лісапедзе даехаць. Адно што на той бок Прыпяці пераплысці трэба. У пана Алесіка была жонка – цётка Ядзя. Мемуарысты жартавалі, што яна носіць на галаве вароніна гняздо.

Праз сто гадоў ні палаца, ні Рубенса, ні Рэмбранта.

•

Калі б я з'ехаў з Беларусі, я б парваў з ёй усе сувязі. Я б не мучыў сябе згуртаваннямі нацыянальных меншасцяў і праглядамі бабуліных спеваў на ютубе. Я б сказаў, што я кактус і заўсёды рос тут.

Я магу зразумець жаданне з'ехаць, але не магу зразумець настальгію. Гэта мазахізм.

Гэта падобна на тое, як сказаць жонцы: «Я цябе кахаю, але буду жыць у суседняй кватэры і лайкаць цябе адтуль».

Вядома, я кажу не пра выпадкі, калі хтосьці з'ехаў не па сваёй волі або на час вучобы, а калі падаўся за сіня мора, пабудаваў там хату і пасадзіў каля яе дуб.

Калі я жыў у Мінску, я папрасіў маці даслаць мне паўкіло палескай зямлі. Падчас прыступаў настальгіі я высыпаў зямлю на газетку і басанож станавіўся на яе.

Усе гэтыя эміграцыі – гэта вандроўкі па свеце ў гаршках і на газетках.

На маю думку, ёсць толькі два выйсці: быць хвояй тут ці стаць кактусам там.

•

От мне тут сказалі, што польскія гуралі падзяляюць людзей на тры гатункі: пні, кусты і птушкі (pnioki, krzoki i ptoki). Адны не могуць пераехаць на новае месца, другія могуць, трэція перасоўваюцца, як ім хочацца.

Я стары пень, я не магу.

Учора напісаў, што на новым месцы стаў бы кактусам. Але, пэўна, я б проста ссох. Я чалавек-дрэва: магу лічыць сваім толькі тое, што бачу, – зямлю ад гарызонта да гарызонта і касмічны кавалак над галавой.

У мяне ёсць карані, у кагосьці ёсць крылы.

Я гэта пачуў і буду ведаць.

•

Радзіва «Прудок». Экстраны выпуск навін.

От і перазімавалі. «Гэты ваш мінчук збяжыць, збяжыць!» Анігадкі! Трэба вастрыць рыдлёўку.

Да вясны засталіся чатыры гарбузы і два кабачкі. Абяцаю з'есці іх найхутчэй.

А Лялю папрашу жэрці снег.

•

Год таму мы з Ромкам ужо збіралі свае рэчы. Люты – апошні месяц, які я не жыў у Прудку. Скончыцца ён – усё абнуліцца і пачнецца нанова. Калісь мы з былой жонкай прыдумалі Нялюту – свята ў ноч з зімы на вясну, калі от люты, а от ўжо нялюты. Рабілі пудзіла бабы Люты і палілі яго разам з усім непатрэбным. Сёлета трэба будзе адсвяткаваць тую Нялюту – мой прудкаўскі Новы год.

•

Роўна год таму адбыўся купалаўскі алкаранішнік. Любоў Пятроўна, Каця, Арцём, віншую з гадавінай! Прывітанне з месца баявой славы.

Я патрабаваў ад эмігрантаў забыцца на настальгію, а сам ціхенька стаю ля тэатра і глытаю слёзы.

# Прашу перадаць мне ва ўласнасць палац

«Прашу перадаць мне ва ўласнасць палац, размешчаны па адрасе: вуліца Кастрычніцкая, дом 20», – напісаў я на аркушы сшытка ў клетку і панёс заяву ў райвыканкам.

Даўно то было. А пачалося шчэ даўней.

Добра помню першую паездку ў Нароўлю. Мы з Воляй выйшлі з маршруткі, убачылі дом і прывязаліся да яго на шмат гадоў.

У прыцемку на беразе Прыпяці стаяў вялікі мураваны палац. Занядбаны, без вокнаў, з купамі травы на твары, з бярозкай на страсе. Але ўсё адно – велічны. Я адчуў сябе маленькай драбінкай, якая адкалолася ад сцяны, лётала па ветры і от нарэшце вярнулася назад.

І сёння баліць, хоць я ў Нароўлю больш не езджу і спрабую менш пра тое думаць.

Мы правялі ноч ля палаца. Нараніцу з'ехалі ў Мінск, але з таго часу ўсё навокал змянілася: і людзі, і я сам. Змянілася, бо я пачаў марыць жыць у гэтым доме.

Чаму менавіта ў ім? Бо ён быў радавым гняздом памешчыкаў Горватаў. Я не ведаў, ці жылі ў палацы мае прадзеды. Напэўна, мая прывязанасць да яго ўзнікла праз патрэбу мець уласную гісторыю. А тады яе ў мяне не было.

Цяпер у палацы жылі не прадзеды, а совы. Совы і цені.

Мы з Воляй блукалі па парку і гулялі ў Артура і Караліну. Я срэбнай лыжачкай тапіў цукар у кубку з чаем на палацавай тэрасе, яна з польскім акцэнтам пераказвала мне газетныя плёткі. Сярод хмызняку, вусеняў і цагляных аскепкаў мы былі ідэальнай шчаслівай парай. І яны – Артур з Каралінай – былі ідэальнай шчаслівай парай.

Іх сын Эдвард заснаваў самую старую з сённяшніх беларускіх кандытарскіх фабрык. Яна не называлася «Красный мозырянин», як сёння, – так яе ахрысцяць потым. А ў 1913 годзе гэта была проста сямейная фабрыка, якая здзяйсняла маленькі цуд: ягады і фрукты пératварала ў мармелад.

Я ўпэўнены, што чалавек, які вырашыў рабіць мармелад, не можа быць паганым.

Калі ў 1919 годзе Эдвард з'ехаў адсюль назаўсёды ў польскі маёнтак, то перабудаваў там браму на ўзор нараўлянскай і заснаваў такую самую фабрыку.

Як мы з Воляй гулялі ў шляхту ў хмызняку сярод слімакоў і цэглы, так ён гуляў там, у Польшчы, у Нароўлю.

Гуляў дваццаць гадоў – да смерці.



Два гады я штомесяц ездзіў у Нароўлю... Архівы, бібліятэкі, польскія мемуары, сустрэчы, перапіскі – я даведаўся ўсё што можна пра палац і яго гаспадароў. Я ведаў не толькі даты і колішні выгляд пакояў, а і звычкі людзей, якія ў тых пакоях жылі. Хоць мой радавод і радавод памешчыкаў сышліся толькі ў трынаццатым калене, кожная мая паездка ў Нароўлю была вяртаннем дадому.

От тады я купіў каву ў вулічнай кавярні на беразе Прыпяці, выдраў з сшытка аркуш у клетку і напісаў: «Прашу перадаць мне ва ўласнасць палац». Якраз выйшла адпаведная праграма па перадачы помнікаў архітэктуры, якія не выкарыстоўваюцца. Нараўлянскі палац быў у гэтым спісе пад нумарам 15.

Такая драбяза, а я дагэтуль помню.

Вядома, сваіх грошай на рэстаўрацыю я не меў, але ідэі, дзе іх узяць, у мяне былі. Я вёў перапіску, ладзіў сустрэчы з прадстаўнікамі розных фондаў і арганізацый. Былі і рэальныя прапановы фінансавай дапамогі. Я мог аб'яднаць вакол сябе людзей, ахвочых гэты будынак захаваць. Я быў гатовы на любыя ўмовы перадачы «аб'екта», абы кіно, якое ішло ў маёй галаве, спраўдзілася.

Я напісаў заяву і быў упэўнены, шо справа пойдзе. Палац месціўся на ўскрайку горада. Ён быў вялікі, ён быў непатрэбны. Ён быў надмагільнай плітой гісторыі мястэчка. Я думаў, што ў райвыканкаме прачытаюць маю заяву і зладзяць салодкі стол з радасці, што пазбавіліся гемарою. Бо ёсць маленькія чыноўнікі з вялікімі партфелямі, а ёсць закінутае памяшканне на балансе. І адно другому не патрэбна.

Але мне прыйшоў адказ: маўляў, палац наш, мы яго пачынім, адкрыем у ім цэнтр дасугу і будзем радавацца.

Я доўга вёў перапіску. Я біўся аб гэтую цвёрдую нерухомую сцяну, але разбіў не яе, а свой лоб. Шэсць гадоў ужо мінула, як я сказаў сабе, што буду жыць у свеце, дзе Нароўлі няма.

Часам выпадкова бачу ў сеціве фота палаца. За шэсць гадоў ён разбурыўся шчэ болей. Прыпяць выдзірае з яго абдымкаў каменныя лавы і падбіраецца бліжэй. Калі-небудзь рэчка праглыне гэтую надмагільную пліту гісторыі мястэчка і маёй гісторыі, як ужо праглынула тыя лавы, сямейную капліцу і сцежкі з бэзам.

Я баюся ехаць у Нароўлю. Баюся, бо ведаю, што калі ўбачу палац і дакрануся да яго, то ўспомню, як колісь зрабіў разрэз на руцэ і пяднаўся з ім крывёю. Прыеду, убачу, успомню, адчую – цагляны пыл у маёй крыві ўзбудзіцца, заварушыцца, і я захачу зноў біць свой лоб аб цвёрдую нерухомую сцяну сістэмы.

Раздзел 10

# Бацька



•

Пазаўчора я пахаваў бацьку.

•

Ён сышоў як сапраўдны палкоўнік: прачнуўся, памыўся, пагаліўся, першы раз у жыцці пайшоў у лякарню і вярнуўся адтуль у дамавіне. Усе гэтыя дні ў мяне не было слоў. У мяне быў толькі камяк у горле.

Сёння я прачнуўся, памыўся, пагаліўся і паехаў на лісапедзе на прудкаўскія могілкі выпіць з бацькам гарэлкі. Цяпер мы з ім побач. Я буду садзіць яблыню, а ён будзе бачыць. Ён ляжыць пад хвоямі – на месцы, якое я для яго выбраў.

Калі я хоць напалову буду такім чалавекам, як ён, я пражыву жыццё не дарэмна.

Мой самы вялікі гонар, маё самае вялікае шчасце – быць тваім сынам, папа. Ты гэта ведаеш. Але няхай і свет ведае таксама, што ты найлепшым чалавекам быў. Я вывучу ўсе словы на свеце, але я навучуся расказаць пра гэта. Я раскажу.

•

Маці дражніла бацьку:

– Валодзя да цябе падобны. Тут адразу відаць, што твой сын. А Андрэйка – от хадзі і думай: твой ці не твой.

Бацька адказваў:

– Не дуры галаву. У Андрэйкі мой характар. Гэта мая парода. Гэта мой сын.

– Твой, твой, – адказвала маці. – Чай будзеш?

Праз паўгадзіны бацька прыносіў стос фотаздымкаў:

– Нос мой. Вушы мае. Губы мае.

– Твае, твае.

– Што ты мне кажаш, што не падобны?

– Падобны, падобны. Пі маліну.

•

Люблю разглядаць стары сямейны фотаздымак, на якім дзед Валодзя, баба Дуся і іх дзеці ў маім двары. Толькі адзін чалавек з іх яшчэ ходзіць



па свеце. Астатнія ляжаць пад хвоямі – гэтак жа блізенька адзін да аднаго, як на здымку.

Я думаю: от яны жылі ў адной хаце, выйшлі ў двор, сфоткаліся, разляцеліся, атрымалі дыпломы і кватэры, а потым ізноў сабраліся разам на могілках. Іх прынеслі, прывезлі – з розных месцаў у адно.

•

Мне думаецца, што няма ніякага жыцця пасля смерці. Хочацца верыць у яго, але вера ёсць страхам. Колькі свечак ні запалі, колькі кадзілам ні махай, а людзі знікаюць назаўсёды.

Мама кажа:

– Налі свежай вады бацьку.

Я наліваю. Але не бацьку. А каб працягваць адчуваць яго прысутнасць. То нам вада.

Крыжы, помнікі, Дзяды, Радаўніцы патрэбныя толькі жывым – каб не адчуваць сваёй адзіноты, каб спадзявацца, што пасля смерці будзе працяг. Але працяг адзін: цела згніе і дасць перагной дрэвам, у галінах якіх будуць жыць птушкі.

Не, пэўна, ёсць у целе і нейкая жыццёвая энергія, якую называюць душой, якая не ўмірае, але пасля смерці цела энергія не можа ўсвядоміць сябе. Гэтая энергія не можа падумаць: «От я і ўмёр». Каб падумаць, патрэбныя мазгі.

Я, пэўна, зараз ізноў кагосьці пакрыўджу, але мне думаецца, што ўся заклапочанасць сваёй душой ёсць эгаізмам.

Усё, што засталося пасля бацькі, – гэта мы з братам і памяць. От і ёсць бацькава жыццё пасля смерці.

Людзі, якія ўчора хацелі набіць мне морду, прыходзяць і кажуць:

– Твой бацька харошым чалавекам быў. Дзякуй.

Яны дзякуюць проста так – за тое, што я яго сын. Яны паціскалі руку і сыходзілі ў сваю шэрую будзённасць. Бацька памёр, але пакінуў мне разуменне, як трэба жыць, – каб людзі з тваёй вёскі сказалі: «Дзякуй». Не начальнік у офісе. Не блогеры. Не калегі. А менавіта гэтыя простыя людзі. Калі яны не кажуць «дзякуй», значыць, ты тут не жыў, а калі жыў, то дарэмна. От і я напісаў вельмі шмат непатрэбных слоў. Я атрымаў за іх лайкі, але не пачуў «дзякуй» тут. У сваім Прудку.

Цяпер я буду думаць пра тое, каб пасля сыходу маім дзецям не сорамна было людзям у вочы глядзець, а не пра тое, каб мая душа спявала ў нябёсах.

•

Калі цётка Воля памірала, у мяне забалела спіна. Спіна балела, балела, балела. Я хадзіў па хаце літарай «Г». На цётчыным пахаванні спіна перастала балець.

На саракавы дзень я пабачыў цётку ў сне. Яна ляжала ў ложку і вышывала. Ложак стаяў у пустым светлым пакоі. У другім пакоі быў я – з бацькам і маці. Мы глядзелі на цётку, яна хітравата пазірала на нас. Бацька пайшоў у цётчын пакой і знік у ім. Я ўглядаўся ў белую прастору – яго не было відаць. І от я бачу, што і маці збіраецца туды ісці. Але я схапіў яе за руку і не пусціў.

Прачнуўся, пайшоў па дровы і сарваў спіну. Яна балела, балела, балела. Я хадзіў літарай «Г». Ноччу амаль не спаў. А раніцой памёр бацька. Сышоў у цётчын светлы пакой, як было ў сне.

Тыдзень таму я пераехаў да маці, бо ў яе адняло ногі і ўвесь гэты час не было ніякай ахвоты жыць. Учора мы выклікалі хуткую. А ў мяне пачала балець спіна. Яна балела, балела, балела...

І я ўбачыў на падваконні бацькаў партрэт. Падышоў да яго і сказаў:

– Не аддам.

Бацька пазіраў на мяне і ўсміхаўся.

Я пазіраў на яго і сціскаў губы.

Сёння я пішу гэты тэкст, а мама пыласосіць дываны.

А заўтра я вярнуся ў Прудок, бо ў мяне больш не баліць спіна, і я адчуваю, што гэты сон скончыўся.

## КРАСАВІК

•

Дзядзька кажа:

– За сорак дзён у Прудку ніхто не памёр. Уладзіміравіч маладзец. Не пацягнуў нікога за сабой. Палкоўнік.

Усім, каму бацька сніцца, ён штосьці дае: з тым выпіў, таго накарміў, а мне сказаў у сне:

– Сынок, надзявай маю вопратку.

Я корпаюся ў шафе, не ведаю, што надзець. Надзявай, кажа, маю вопратку. Сынок, кажа.

Мама гаворыць:

– Забірай бацькаву кватэру і жыві ў ёй.

– Я забяру бацькавы кеды.

– Ну забірай кеды.

Забраў кеды. Сёння вярнуўся ў іх дадому. Кеды на адзін памер большыя. Але я буду расці.

Пап, я дарасту.

•

Калі я працаваў у манастыры, неяк раз мы з Евай пайшлі на бераг Свіслачы. Сядзелі, гаманілі. Было цёплае лета. Ева расказвала, як памірала яе маці:

– Яна ўмірае, а мне радасна.

Ева няўпэўнена сказала тое слова «радасна» – цішэй, чым іншыя словы. Нібы не спадзявалася, што я зразумею. Я і падумаў пра сябе, што ніколі не змагу зразумець яе.

Сёння я выйшаў з хаты і адчуў гэтую радасць. Бацька памёр, але яго нібы стала болей. Цяпер ён усюды: у паветры, у небе, у зямлі. Нібы памёр не ён, а тое, што не давала любіць яго.

•

Колісь я марыў найхутчэй вылецець з бацькоўскага гнязда. Ну, як усе.

Адным вечарам яшчэ не спаў і пачуў размову бацькоў у кухні. Яны кінуліся ва ўспаміны, смяяліся, перабівалі адно аднаго. Маці сказала:

– Ты ведаеш, што, калі ноччу зайсці да Андрэйкі, ён павернецца на другі бок. Як бы ты ціха ні зайшоў, а ён усё адно павернецца.

Каб даказаць свае словы, маці павяла бацьку ў мой пакой. Яны краліся ціхенька-ціхенька. Але я зрабіў выгляд, што сплю, і павярнуўся на другі бок, каб яны былі рады. У той мамант усе гармоны сціхлі, і я адчуў пяшчоту да бацькоў. Такую сарамлівую, троху нязвыклую пяшчоту.

Ці вось жыў я на хутары з жонкай і доняй. Адным ранкам прачнуўся раней за ўсіх і ўбачыў жончыну каленку, якая высуналася з-пад коўдры. І так нясцерпна захацелася мне пацалаваць тую каленку! Такая ўдзячнасць была да яе! Я пайшоў у поле, нарваў кветак, паставіў у вазу побач з жонкай.

І гэта таксама была пяшчота.

Прыязджаю да маці – мучыць смага, бяру слоік з бярозавікам, выпіваю мо літр. Маці ўсміхаецца, кажа:

– Здаволіўся?

Здаволіўся.

Як гэта сапраўднае сказаць інакш? Як перакласці яго? Можна перакласці слова, але пяшчота хіба перакладзецца разам з ім?

•

Маці прывезла бацькаў архіў. Там у акуратных пакецiках выразкі з газет і выпіскі:

«Полезные советы».

«Разное».

«Первая помощь человеку, укушенному животным».

«Косище изготавливается из осины, ясеня, елки» (а я, дурань, зрабіў з бярозы).

«Третий тост на помин всех погибших и умерших».

«Бог мусульманина – Аллах. Бог любви – Амур».

«Бывает, и заяц на лису кидается, когда понимает, что каюк ему».

«Хилять – убегать».

«Что легко достается, счастья не приносит».

Яшчэ ёсць сшыткі на кожны месяц.

«Август. В сухую погоду поливать молодые деревья. После сбора ягод почву под крыжовником, смородиной, малиной подрыхлить».

Ёсць і бацькавы планы на верасень. Планы ёсць – бацькі няма.

У дзяцінстве я баяўся яго. Ён быў палкоўнікам. Цяпер бачу, што ён быў... ну, такі... просты.

А сшыткі працягну весці.

•

Сёлета я навучыўся не баяцца смерці. Я люблю жыць. Пісаць люблю, людзей люблю. Люблю садзіць моркву, люблю думаць пра сваю старасць. Не хацеў бы жыць там, дзе няма восені і старасці.

Але калі раптам так станецца, што мне застанецца жыць адзін дзень, хацеў бы ведаць пра гэта загадзя. Гэта мая адзіная просьба да смерці.

Мне няважна, калі і ў колькі. Я адно хачу: ведаць загадзя.

Я б не змагаўся за жыццё, не думаў пра рай – я не веру ў рай, – я толькі хацеў бы прыбраць пасля сябе, памыць шкарпэткі, выдаліць непатрэбныя тэксты. Потым проста думаць. Мне здаецца, у чаканні смерці можна зразумець нашмат болей пра жыццё. Само жыццё з'яўляецца перашкодай, каб ведаць пра яго ўсё.

Калі я пачую, што смерць ідзе, я буду ўсхваляваны і ўрачысты. Я буду радасны.

Пакуль не чутно, як яна крочыць, мая прапанова – жыць і ствараць, колькі е дуру.

•

Калі прыязджаю ў Мінск, адчуваю сябе маслам, якое намазалі на хлеб.

Сёння ў Мінску парваліся бацькавы кеды. Яны даўно былі нягожыя, але я шчэ насіў іх. Цяпер пачаў губляць на тратуары кавалкі падэшвы і да крамы дайшоў ледзьве не ў адных шкарпэтках. Зайшоў у краму і адразу ўбычыў іх – самыя хіпстарскія, самыя чырвоныя мае новыя кеды.

– Бацька б такія не надзеў, – сказаў унутраны голас.

– У мяне далей свая дарога, – так адказаў я яму.

А дзеўкам кажу:

– Дзеўкі, дайце мне чырвоныя кеды. Маёй душы так захацелася.

Дзеўкі даюць кеды. Я шпацырую ў кедах па праспекце. Я – масла ў чырвоных кедах. Я таксама чалавек.

Штосьці скончылася, штосьці – чырвонае – пачынаецца.

•

Прыснілася сёння, што ем я кільку ў таматным соўсе, а да мяне старац падыходзіць і дае дзіця. Дае і кажа:

– Назаві яго Васілём.

Васіль выслізгвае і падае долу.

Я бяру яго на рукі.

– А чаму ён не плача? – пытаюся.

– Бо шчаслівы.

•

– Во, ізноў прыляцеў матылёк. Здаровы-здаровы. Я такіх ніколі не бачыла. Калі па Івану сорак дзён было, ён прылятаў. Сеў мне на плячо і сядзіць. Я яму гавару: «Іван, ты?». А мо то Воля была. Яно ж так бывае, што душа лётае. Я з ім пагаманіла. Няма розніцы, чыя душа: чыясьці ж душа. І паляцеў. Цяпер во ізноў тут. Дрыжыць. Чаго ты дрыжыш? Табе што, холадна? Ляці ў хату. Во, я дзверы адчыніла.

Мама.

## Цётка Воля, а як пазнаёміліся мае бацькі?

А ты хіба не ведаеш?

Матка твая працавала на пошце. Начальніка аддзялення падмяняла. Ну і папала ў Прудок і сільна дзеду Валодзі прыглянулася. Яна ў іх на хаці жыла. От. І з дзеўкамі – са Светай, Тамарай – мама сябравала. А бацька твой недзе вучыўся. У Саратаве ці дзе. Адзін раз дзед Валодзя і кажа на дзевак:

– Выдурце ў Юлі фатаграфію.

Яны і выдурылі:

– Ты зараз скончыш работаць і паедзеш, а нам фатаграфію дай на памяць.

Юля і дала. А дзед Валодзя напісаў Івану ліст у Саратаў: «Сынок, я табе знайшоў жонку. Сільна харошая дзевачка. От. І я высылаю фатаграфію. Паглядзі: прыглянецца ці не прыглянецца». Той паглядзеў, яму сільна прыглянулася. Юля ўжо працавала ў Бярозаўцы. Ён напісаў ліст і падпісаў: «Начальніку аддзялення (Юлі)». Начальнікам аддзялення Маруся Рыжая была. Ёй і прынеслі ліст. Ну, начальніку, дык я ж начальнік. А там у дужках – Юлі.

– Гэта тваё, – кажа. – Гэта не маё.

Юля пачытала, прыйшла дадому, на маму гаворыць:

– Што мне рабіць? Сын дзядзі Валодзі даслаў ліст, а я не ведаю, што адказаць.

А мама кажа:

– Адкажы, ты ўсё-такі жыла ў іх. Нядурна напісаў ліст.

Юля і адпісала. І так некалькі раз пісалі адно аднаму.

У нас ярмарка дваццаць пятага была ў Юравічах, і баба Дуся пайшла на ярмарку і сустрэла Юлю там. Кажа:

– Юлька, прыедзь, памажы бульбу капаць.

– Добра.

– Ды і Іванчык прыедзе.

– Раз Іванчык прыедзе, то я не паеду.

Не паехала. От.

Аж Іванчык заехаў у Валгаград да Галі з Толікам і кажа:

– Я еду жаніцца.

– То ты не бачыў дзеўку.

– Я не бачыў. А бацьку прыглянулася, то і мне спадабаецца.

І папрыязджалі ўсе. І Галя прыехала, і Толік – усе сюды прыехалі.

А твой бацька дзеду Валодзі кажа:





– Вязі мяне.

Помню, бульбу капалі мы. Я з жыватом была якраз. Не помню, якім хлопцам, мо Толікам. От. А Юля мяхі высыпае. Ды ў гразнай адзёжы. Прыйшлі з Юляй з копкі, а яна памідораў нарэзала са смятанай, есць.

Нехта грукае ў дзверы. От. Яна адчыніла.

– Ой, дзядзя Валодзя!

– Пачакай, Юлька, я ж не адзін, я з Іванам.

Юля бягом за штору ды давай хутчэй адзявацца. От. Яны зайшлі ў хату. Мама, праўда, на стол паставіла, сто грам дала, усё-такі дочкін гаспадар.

Потым селі на лавачку. Юля кажа:

– Пайшлі ў клуб.

– Ты што, хочаш мне сваіх дзевак паказаць? Я прыйшоў да цябе, а не да тваіх дзевак.

І ўсё. Мама паслала свёкру з Іванам, каб яны палеглі ўдвох. А яна ўжо легла са мной на падлозе. Адна ж хатка ў бабы Ганны была. От. Потым назаўтра ўжо ехаць у Прудок. Іван ні ў якую:

– Я не паеду без Юлі. Толькі калі яна паедзе.

Матка ў голас:

– Зганьбяць дзеўку! – давай плакаць.

А ён:

– Нікуды не паеду і ўсё.

Ужо свёкар просіць матку:

– Ну пусціце, няхай праедзе. У мяне таксама дзевачкі. Яна будзе з дзевачкамі. Ну, пусціце.

Так зайшло, што матка кажа:

– Божа мой! Адна зганена, што разышлася, а тут яшчэ другую забяруць ды зганьбяць!

Іваньчык не паехаў, покуль не забралі Юлю. Паехала Юля, пабыла там, пагуляла, пераначавала з дзеўкамі. І назаўтра прыязджаюць з Іванам. І ўсё – і ўжо ў сваты. За тыдзень і вяселле зрабілі.

За адзін год Юля выйшла за Івана і паехала, я сышлася са сваім, у Каленкавічы паехала, Саша, наш брат, у войска пайшоў – у той самы год. Усе мы так разляцеліся. То ўсе з мамай былі, а то ўляцелі.

Яна, бедная, павесіць фатаграфіі нашы ды паглядае на іх і плача-плача: адна засталася. Было трое дзяцей, усе з ёй жылі, а то за адзін год усе ўляцелі.

От як матка твая выходзіла замуж за твайго бацьку.

Раздзел 11

# Хадзяін



•

Хадзяін – той, хто ходзіць па сваёй зямлі.

•

Раблю апошнія вечаровыя агледзіны агарода: кукуруза не прарастае, зато гарох павылазіў. Рана я тую кукурузу пасеяў ці што?

Раптам знекуль прама па маёй разоры ідзе нянаскі хлопец.

– Здароў, хадзяін!

– Здароў.

– Слухай, а ты не скажаш, якая гэта дзярэўня?

– Прудок жа!

Дарма я адразу прызнаўся. Партызаны-прудкаўцы не ўхвалілі б. І ўжо не возьмуць мяне з сабою пускаць цягнікі пад адкос, калі пачнецца вайна. Трэба было, як баба Наташа, усё адмаўляць: «Нічога не ведаю, хлопча. Я ўжо старая, хворая на галаву. А што ведала, даўно забылася. Няма ў мяне часу з табой вазюкацца. Ідзі з богам і не дуры мне галаву».

І – перахрысціць яго. А як павернецца задам, ціхенька плюнуць уследкі тры разы – на ўсялякі выпадак, ад суроку.

– Прудок... А я ў Крышычы іду.

– То туды ідзі, туды.

Я ўзгадаў, што ў Крышычах жыў Сяргей Палуян.

Сяргей скончыў жыццё самагубствам у дзевятнаццаць гадоў – столькі, мабыць, гэтаму хлопцу, які пайшоў у Палуянаву вёску.

А болей за сто год таму тым самым шляхам Палуян прыходзіў у Прудок і агітаваў мясцовую моладзь. Мой прадзед быў на шэсць гадоў старэйшы за яго. Ён быў самым заможным і ўплывовым тут. То, пэўна ж, сустракаўся з Палуянам. Мо нават піў з ім сівуху, як мы ўчора з палякамі, якія прыехалі да мяне ў госці і з якімі мы гаварылі пра Палуяна. А прудкаўцы недаверліва пазіралі на нянаскія нумары машыны і ўсміхаліся, калі іх называлі панамі.

Дзіўна быць панамі на фоне парахні на сценах.

Апроч Палуяна, мы размаўлялі пра тое, якое слова больш беларускае – гаспадар ці хадзяін. Я ў слове «хадзяін» чую, як нехта ходзіць па сваёй зямлі. Ходзіць і ладуе яе. От як я глядзеў свае градкі, а той хлопец сказаў: «Здароў, хадзяін».

Але цяпер хаджу не я, а ідзе дождж. За вокнамі хмарна, вецер дзьме і размазвае халодную ваду з тых хмар па агародзе і сцяне маёй хаты.

«Парахня сыплецца са сцен, мох паўсыхаў на стрэхах. Гніе вёска ў гразі і брудзе, а хоча яшчэ аджыць на сонцы», – пісаў Сяргей Палуян пра Крышычы ў кнізе, якую мне даслала Вольга Бабкова з Купалаўскага тэатра.

Палякі з'ехалі на тую зямлю, дзе яны хадзяіны.

А я не хаджу – я сяджу і гляджу на хмары, якія ганяе па небе неспакойны вецер.

Мама называе такія хмары гуракамі.

•

Доўгія тэлефонныя развітанні.

– Ну добра, мам, давай ужо.

– Ну добра, ыгы, давай.

– Ну ўсё.

– Ыгы.

– Ну давай.

– Ну добра, усё тады.

– Ыгы.

– От алыча цвіце-цвіце!

– А ў мяне не цвіце. Я кабачкі пасадзіў.

– А я нічога сёння не садзіла. Учора вінаград абразала, натамілася.

– Закатай на зіму вінаградны кампот.

– Кампот закатаць? А мо сок?

– Закатай сок. Ну добра, мам, давай ужо.

– Ну добра, ыгы, давай.

– Ну ўсё.

– Ыгы.

– Ну давай.

– Ну добра, усё тады.

– Ыгы.

– А персікаў не будзе.

•

Калі жыццё пасля смерці ёсць, я б хацеў, каб на ўваходзе на Той Свет выдавалі садовы інвентар: рыдлёўку, граблі, капаніцу. Каб можна было пісаць дурныя тэксты.

От думаю, а лепшых нябёсаў, чым яно ёсць, прыдумаць не магу.

•

Радзіва «Прудок». Экстраны выпуск навінаў.
Пабудаваў сёння сральню.
Прыедзе да мяне якаясьці прынцэса і запытае:
– Дзядзько, а дзе ў цябе прыбіральня?
– У мяне толькі сральня е.
– А што рабіць? Бо я ў сральню не магу, я не такая.
– То цярпі.

•

Едзе Міхайлаўна на кані.
– Андруша, прывет!
– Добры дзень, Міхайлаўна.
– Андруша, у цябе хораша выходзіць. Красіва ўсё робіш, маладзец.
– Дзякуй, Міхайлаўна.

•

У Мінску на пешаходным пераходзе стаю за цёткай гадоў шасцідзесяці – з начосам, у джынсах і бліскучых кедах.

Калі я прыязджаю ў Мінск, я не магу наглядзецца на людзей. Мінчукі не такія, як прудкаўцы.

От хлопец па праспекце ідзе. У яго даўгая барада і тонкія ногі ў вузкіх портках. Знізу блішчаць голыя белыя лыткі. Нармальна? Нармальна.

У Прудку да мяне людзі хадзілі на споведзь, бо праз маю бараду думалі, што я святар. Я доўга не мог зразумець пытання: «Табе ўвогуле піць можна?». Потым дацяміў і пачаў галіцца. Бо тут мой мэсыдж «я модны еўрапейскі хлопец, трохі філосаф, трохі пацыфіст, я таямнічы, але бяскрыўдны для людзей» ніхто ў маёй барадзе не прачытаў. Няма разумення – няма барады.

Быць худым у вёсцы – гэта быць хворым. Калі ў цябе агарод, то мусіш выглядаць дужым. «Ты мо хварэеш?» – цікавіліся дзядзі і цёці з шырокімі плячыма. І от год прайшоў – я палюбіў беспамерныя бушлаты, шырокія тоўстыя нагавіцы. Я палюбіў апранацца так, каб хаця б здалёк быць падобным да чалавека, які падыме тачку з каравякам.

У вёсцы баба ў шэсцьдзясят – то баба. Глядзіш на яе і не разумееш, дзе баба заканчваецца, а дзе пачынаецца кабыла, на якой тая баба сядзіць.

От калі свята, то іншая справа. На свята баба апранаецца ў касцюм клумбы. Тут няма культу цела – ёсць культ пейзажных замалёвак.

Таму мяне ўразіла цётка ў джынсах і бліскучых кедах. Я глядзеў і не разумеў, які ў яе агарод. Я не змог яе прачытаць.

Палешукі – гэта зямельныя надзелы. От выйшла даярка за плот, сустрэла ля крамы іншую даярку. Не людзі, а два агароды кідаюць адзін у аднаго насенне кабачкоў.

– Ты картоплю пасадзіла?

– Пасадзіла, няўжо ж не пасадзіла!

•

Восенню я сказаў:

– Картоплю садзіць не буду. Не-не-не. Ніколі.

А мне сказалі:

– Як так? Пагана без картоплі. Не па-людску.

А я сказаў:

– Нашто яе садзіць? Мне толькі паўмяха на ўсю зіму трэба. Купіць ці ўкрасці прасцей. Садзіць нелагічна.

А мне сказалі:

– Яно-то так. Але картоплю садзіць трэба.

І от вясна. Саджу картоплю. Каб палоць яе, абкапваць, каб травіць жука, капаць, перабіраць. Каб будаваць для яе пограб.

Картопля – мая прэлесць.

•

– Нахрана ты ліпы пасадзіў? Трэба было сірэнь.

– А чаму ты адзін жывеш? Трэба з мамай, яна памые і накорміць.

– Не капай агарод рыдлёўкай. Папрасі каня.

– Нашто табе тыя дыні? Тут столькі картоплі пасадзіць можна.

Гэта толькі сённяшнія парады ад прудкаўцоў. Давайце, расказвайце мне, як трэба жыць.

•

Мне прывезлі курэй, і я пачаў будаваць куратнік. Шэсць беленькіх дурніц з інкубатара, якія ніколі не бачылі волі. Мы з Лёшам, які дапамагаў мне, назіралі, як куры баяліся пераступіць цераз адну нешырокую

дошку, прыбітую ўнізе дзвярнога праёма. За дошкай была яшчэ адна турма, але з сеткай замест сцен – там можна было дыхаць ветрам і глядзець у неба.

– Куры бы тыя беларусы, – сказаў Лёша. – Вунь воля – толькі ідзі. Але баяцца пераступіць цераз дошку.

Куры таўкуцца ля дошкі, глядзяць на тую лепшую турму са сваёй горшай і не ідуць.

От і мы тут – таксама дурныя куры. Нарабілі сабе загончыкаў і сядзім у іх. Мне не трэба ўвесь свет. Я пасадзіў восем ліп і хачу глядзець, як яны пацягнуцца ўгору. Сёння іх можна зламаць адной рукой, а праз шмат гадоў я на якуюсь галіну павешу арэлі для ўнукаў. Нідзе ва ўсім свеце няма болей маіх ліп.

Мне страшна думаць, што адбудзецца нешта, што змусіць мяне кінуць і курэй, і ліпы, і ўсе планы. Што мая зямля стане не маёй.

Сёння трыццаць гадоў, як Чарнобыль паставіў маіх землякоў перад страшным выбарам: рызыкнуць здароўем дзяцей ці з'ехаць.

Летась гарэў лес ля Чарнобыля, дым даходзіў і да майго Прудка. А разам з дымам – страх згубіць сваю зямлю. Даходзілі і водгукі гісторый пра згубленыя сямейныя гнёзды – разбітыя, раскрадзеныя радыяцыяй і чалавекам.

Баба Васіліна расказвае, як брат забраў яе ва Украіну. А яна пажыла там месяц ды вярнулася дадому.

– Лягу спаць, а мне сняцца лясныя сцежкі.

Дзед Сцяпан, ужо нябожчык, памятаю, нават тэорыю вывеў, што радыяцыя – гэта добра. Унь грыб пабольшаў – хіба то пагана? Так ён меркаваў. Ён бы вывеў трыста іншых тэорый, абы апраўдаць тое, што нікуды не з'ехаў пасля Чарнобыля. Што застаўся на сваёй зямлі.

Яшчэ ёсць версія, што нідзе ў свеце няма чыстага месца, усюды так. І хто яго ведае, ці будзе там лепей. Усе памруць. У кожнага свая доля.

Вы пачуеце тысячу прычын, чаму на забруджанай тэрыторыі можна жыць. А праўдзівая прычына толькі адна – от тыя ліпы і арэлі на іх галінах.

От з'еду я, і чужыя людзі будуць назіраць, як мае ліпы цягнуцца ўгору, павесяць на іх арэлі для сваіх унукаў. Унукі атрымаюць дыпломы і напішуць новыя кнігі. І ў гэтых кнігах не будзе маіх дзядоў.

Мо гэта і лёгка – пераступіць цераз дошку і з'ехаць туды, дзе няма радыяцыі. Дзе ёсць перспектывы, праца і відаць неба за алюмініевай сеткай. Але там няма маіх ліп, няма дзеда Ганушы з хітрай добрай усмешкай, няма магіл маіх дзядоў. Няма магілы майго бацькі.

•

– Сынок!

– Оў!

– А што ў цябе куры без пеўня?

– Няма, цётка.

– Не перажывай, знойдам табе пеўня, будзе таўкці тваіх курэй.

– Добра, бо адны бабы ў селішчы. Трэба мужыка.

– А ты ж мужык.

– Я адзін. Мяне мала.

•

У мяне кура – інтравертка.

Галоўная кура – Марына – біла яе. Кура-інтравертка спала асобна ад усіх. Марына спала з народам. Яшчэ дзве куры – «мы з Тамарай ходзім парай». Яны не з Марыніным народам і не з інтраверткай, а ўтварылі свой незалежны апалітычны кагал.

Потым Саша прывёз мне пеўня з Пеніцы.

Певень стаў таўкці Марыну, інтравертку, народ, Тамару з сяброўкай – і куры згубілі сваю індывідуальнасць.

•

Калі ў мяне пад вокнамі калгасная начальніца піліць Колю, што той недзе бадзяўся, ён думае толькі пра адно: «Фемінізм, прыйдзі на наша глухое Палессе».

Калгаснікі чакаюць прыходу фемінізму даўно. Яны мараць пра часы, калі будуць роўнымі з жанчынамі і змогуць насіць у кішэнях грошы.

•

У краме.

– Дай нуль пяць.

– Коля, у мяне ад цябе даўленне падымаецца.

– Дай пацалую – яно ўпадзе.

– Вой, шчэ і горш будзе. Пацалуеш – усё падымецца, не толькі даўленне.

•

У курэй секс – гэта пакаранне. Певень таўчэ тую куру, якая не туды лезе і не тое робіць. Калі куры робяць тое, певень усё адно таўчэ іх для прафілактыкі.

Певень – заўсёды гопнік. У яго ёсць «паняцця».

А куры могуць быць і гопніцамі, і інтэлігенткамі.

Інтэлігентныя куры нясуць акуратныя яйкі.

У курэй ёсць феміністычная практыка. Феміністычнай практыкай займаюцца фалічныя куры.

Фалічныя куры – гопніцы. Кура-гопніца вяртаецца ў куратнік пасля пеўня і думае, што яна певень. А певень таўчэ яе, каб не думала.

## ТРАВЕНЬ

•

Відаць, мяне ўкусіў нейкі шалёны беларус. От свята сёння, а я выю на столь, што няможна рабіць. Было б добра штосьці выкапаць ці закапаць, прыбіць, пакалоць, парэзаць. Каб не языком, а рукамі. Каб у руках не чарка-яйка, а сякера.

•

Колісь я напісаў, што мая старая акацыя рыпіць і рве мне душу. У каменты набеглі спецыялісты, якія дакладна ведалі, што мне рабіць з той няшчаснай акацыяй. А ўчора прыехаў Анатоль, прывёз пілу, залез высокавысока і спілаваў усе сухія галіны.

•

Паехаў у Фабіянаўку купляць казу.

– Добры дзень!

– Добрага здароўя! А чый то ты?

– Горватаў.

– А чаго ты хочаш?

– Казу хочу. То ж у вас козы?

– Ну, у мяне. У мяне, сынок, такія харошыя козы, што і не расказаць!

– Прадасце адну?

– Не прадам. От пайшлі пакажу, якія ў мяне козы. От тая харошая. Але прадаваць не буду.

– Яна мо мільён каштуе.

– Усё адно, прадаваць не буду.

– А мо і болей за мільён.

– Мабыць, болей.

– Ну, то ж каза ўсё-такі, а не кура.

– Харошая каза. Глянь, якая! Ух! Не буду прадаваць.

– Не дык не. Паеду шукаць далей.

– Болей нідзе няма коз – толькі ў мяне.

– Ну не ведаю, яна ў вас трохі старая.

– А мо і мільёна не будзе. То ж каза, а не карова.

•

Учора ўпершыню ў жыцці даіў казу.

Рабіць гэта вельмі страшна. Цыцкі ў казы не такія мяккія, як у жанчыны, але цёпленькія. Хвілін дзесяць я мучыў Цёцю: і ціскаў, і дзёргаў – усё дарма. Лоб ужо пачаў макрэць. Пад ілбом пабеглі думкі: «Бляха! У краме ж малако каштуе дзесяць тысяч!». Як той кажа, не мела баба клопату, купіла парася.

Потым пабегла малако. Сапраўднае белае малако! Цёця адчула маю радасць і стала церціся галавою аб нагу.

Калі ў мяне быў кот Рома, сяброўка ў мінскім гастраноме сказала:

– Ты пахнеш Ромам.

– ?

– Не ромам, а Ромам.

Цяпер я пахну Цёцяй. Цёцяй Моцяй.

Купіць малако ў краме – гэта як секс з прастытуткай. Лёгка, якасна, за грошы. Так, не трэба баяцца наблізіцца да казы, не трэба выціраць з ілба пот. Але ніхто і не лашчыцца пысай, калі бярэш той пакет ці пластыкавую бутэльку з паліцы.

Нікому не скажаш:

– Цётачка, харошая ты мая. Дзякуй!

•

Радзіва «Прудок». Перадача «Красіва жыць не запрыціш».

Я марыў пра ванну год. Цяпер яна ў мяне е.



Мая ванна – самая вясковая ванна ў свеце, бо яна пад небам, а не пад столлю. І вада ў яе трапляе не з трубы, а са студні і вогнішча. То адгалосак гарадскога жыцця, упісаны ў палескае неба.

Не разумею я гэтых вашых алігархаў, якія сядзяць на залатых унітазах і думаюць пра ўладу, пра сферы ўплыву, пра ворагаў і пра грошы, думаюць і п'юць пілюлі ад імпатэнцыі. Ляжу ў ванне, гляджу ў неба і думаю не пра ўладу і грошы, а пра бясконцасць. А калі будуць падаць знічкі, я буду думаць пра імгненнасць.

Парадокс у тым, што самае дарагое заўсёды бясплатнае.

•

Цётка Дуня сказала, што мой дзед, як і я, любіў спаць у двары. Пад яблыняй у садзе стаяў металічны ложак, скуль дзед глядзеў на тое самае неба.

Дзіўна гэта ўсё.

Я здымаў кіно ў Піцеры, жыў у Самары, сустракаў Новы год у Вільні, святкаваў дзень народзінаў у Беластоку, працаваў у Купалаўскім тэатры і жаночым манастыры ў Мінску.

А ўсё адно знайшоў дарогу пад дзедава неба.

## ЧЭРВЕНЬ

•

Сеў складаць верш – нарысаваў схему поручняў на тэрасу.

Днямі пачаў пісаць вялікі тэкст – атрымаўся ванны пакой.

Сёння я бачыў толькі аднаго чалавека.

Ёсць адчуванне, што людзі скончыліся. Засталіся толькі дошкі і словы пра іх.

•

Не, то добра, што заўтра свята і можна адпачыць. Не буду нічога рабіць. Спакойна прыбяру ў хаце, перамыю посуд, перанясу дровы з хлява ў новую дрывотню, паладую шыфер. Гуляць дык гуляць – яшчэ накручу пару банак парэчак і напішу артыкул. А потым лягу спаць і буду думаць, як пасля свята зрабіць лаз у падмосце пад тэрасай (там будзе хованка ад акупантаў на выпадак вайны).

•

У Прудку хтосьці штосьці скраў і папаўся. Бабкі-цёткі-дзядзькі пастанавілі, што напісаць ананімку мог толькі я.

От такая ў мяне тут рэпутацыя.

Я спачатку пакрыўдзіўся і хацеў ніколі больш не любіць прудкаўскіх бабак-цётак-дзядзек і не спрабаваць інтэгравацца ў іх суполку. Але потым баба Параска прынесла мне букет ландышаў ды гаворыць:

– Хораша, блізенька лес, красата. Красата. Я пайшла ў лес ды так прылегла. Трэба ж ісці, кажу, утамілася, утамілася. Сёння Мікола. Раньшэй хадзілі людзі – і ў госці, і... Цяпера пазашываюцца ў норы. Не, няма ўжо старыкоў. Нас няма. Нейкія панаваломквалі – бог знае якія. А я хаджу. Я да ўсіх хаджу. Папіць е вада? Піць хочу. Паела таго жырнага, ох.

Апоўначы чую крыкі на вуліцы. Выходжу ў двор. Ля крамы баба Параска голасна пяе «Цячэ вада ў ярок», а дзядзька крычыць на яе шчэ галасней:

– Параска, ідзі! На работу рана. Дай людзям спаць.

– Пацалуй мяне ў сраку! Я п'яная, і ў мяне душа баліць. Вада халодненька, а я мало-о-одзе-е-енька-а-а-а!

Брэшуць усе сабакі Прудка. У бабы душа баліць.

Я вырашыў: няхай яны думаюць пра мяне свае паскудствы, а я ўсё адно буду любіць іх.

•

Калі я палю агарод у цішыні, Цёця Моця дае днём літр малака, калі пад Лявона Вольскага – літр і 200 грам. Я гэта называю «Лявонавы 200 грам».

•

Пакуль доіш казу, добра думаецца пра еўрапейскія кавярні, у якіх я ніколі не буду. Пра мора, Таскану і Харватыю. Пра космас, скуль касманаўты глядзяць на Зямлю, дзе цёплае малако льецца ў слоік.

Нехта забіраецца на высокую гару. Цёця жуе траву, а хтосьці караблём разразае акіян на дзве часткі. Той, хто на гары, цяпер глядзіць на ўвесь свет і думае, што на гэтай вялікай Зямлі нехта доіць казу. Цёплае малако льецца ў слоік. Каза весела жуе траву. А ў хаце цёпла і спакойна. І ён разумее, што ў яго так ніколі не будзе.



•

– Пра што ты яшчэ напісаў?

– Пра казу. Я напісаў, што, калі іду па двары, каза мне кажа: «Ме-е-е», а я ёй адказваю: «Гуляй, гуляй». Яна ўжо думае, што яе завуць Гуляй-гуляй.

– Гэта ўсё?

– Усё.

– Абы-што. Паслухай мяне сюды. Напішы пра Марусю Зайчыкаву.

•

Сёлета мама садзіла агарод з выкарыстаннем інавацыйных тэхналогій. Яна забіла ў тэлефон усе спрыяльныя дні, а тэлефон, калі трэба, паведамляў ёй: «Гарох» ці «Кукуруза».

Засталося пасадзіць толькі чорную рэдзьку. А чорная рэдзька не звоніць і не звоніць. Мама пачынае хвалявацца.

– А, то ты звоніш... Я ўжо падумала, што рэдзька.

•

– Чыгуны пахавай. На калодзезь павесь замок, каб матор не ўкралі. А куры пад замком?

– Не.

– Не? А каза?

– І каза.

– Вой-вой-вой. Ты паслухай мяне сюды. От там пасадзі слівы: яны разрастуцца, і цябе ніхто не будзе бачыць. Пра мяне не пішы.

•

Куды ты мяне дзяўбеш! От тута во дзяўбі. Во, бачыш? Я тута во паклаў. Ты што, сляпая?

Цётачка, не прасі: я цябе пакарміў.

А куды ты дзяўбеш, паскуда! На табе – сюды кладу, бачыш?

Цётачка, ціхай! Зараз пойдам гуляць.

Ляля, ідзі ў хату, я табе паклаў у міску.

Ды не дзяўбі ты маю руку! Цёця, тшш, зараз буду ругацца. Ляля, кыш!

Раніца. Сняданак.

•

Летась я распавядаў пра слаўную беларускую традыцыю – талаку.

Сёлета буду расказваць пра яшчэ адну традыцыю – батрацтва. Нядаўна падарылі мне на адзін дзень парабка.

Той парабак прыехаў, адразу ўзяў сякеру і пайшоў за хату калоць дровы. Што з ім рабіць, як яго даглядаць, я не ведаў.

Наліў сто грам, нарэзаў сала. Занёс яму за хлеў.

– На, выпі, – кажу.

Ён выпіў, закусіў і пайшоў працаваць далей. А я сеў снедаць за стол на тэрасе, бы той барын.

Работаў парабак добра. Я яго пакарыстаў і папрасіў яшчэ.

От мне заўтра прывязуць новага – мусульманіна Мрата. І я яго буду даглядаць і карміць.

•

Але карміць мусульманіна – не самая простая задача. Усе мае запасы сала сталі сувенірам. Я паставіў на агонь бульбу і пабег у краму. З прадаўчыхай зрабілі поўную рэвізію палічак, але знайсці да бульбы штосьці без свініны было надзвычай цяжка.

– Ай, бяры каўбасу, скажаш, што з гавядзіны. Хіба ён чытаць умее?

– Хто яго ведае.

•

Першае, што я запытаў ў Мрата, – ці ёсць у Туркменістане мухі.

Мухі ў Туркменістане ёсць, і іх там не меней, чым у Прудку.

•

Па-беларуску Мрат ведае толькі такое: «асцярожна, дзверы зачыняюцца», «наступны прыпынак» і, чамусьці, «цыбуля». Нават слова «дзякуй» для яго новае. А «бульба» па-туркменску – «картошка», што мяне нават раззлавала.

Усе чатыры гады, што Мрат правёў у Беларусі, ён пражыў у кокане, сапраўднага беларускага жыцця так і не зведаў. У Прудку ён упершыню еў кабачкі. У мяне Мрат даведаўся, што ў смятану можна дадаваць цукар, каб макаць туды аладкі.

•

Першыя два дні я адчуваў сорам. Мне было сорамна, што чалавек прыехаў здалёк і вымушаны батрачыць на прудкаўскога маргінала-дармаеда. Што нашыя стасункі мелі сацыяльную іерархію.

Але парабак з яго быў ніякі.

– Мрат, сядзь адпачні, – кажу.

Мрат у тую ж секунду ўсё кідаў і казаў мне сваё філасофскае:

– Харашо.

Рэха ад маіх слоў не паспявала астынуць у паветры, а ён ужо сядзеў на пні і адпачываў. Не здольны Мрат гараваць па-беларуску. Як, напрыклад, талакоўцы-беларусы, што дапамагалі мне летась.

– Злазьце са страхі, – крычу ім. – Абед ужо стыне.

– Няма калі абедаць, дзядзько, – адказваюць. – Тут самы кайф працаваць прыйшоў. Ідзі, – кажуць. – Не дуры нам галаву са сваімі абедамі.

•

Сёння ўвечары Мрат вернецца дадому.

Пакуль што ён ляжыць на маёй канапе на верандзе, мяккай рукой ляніва адганяе мух. Я тым часам, значыцца, батрачу. Штосьці пайшло не так.

Нават у тым, дзе мы спалі, была парушана ўсялякая логіка. Я спаў у двары на савецкай канапе. Ён – у вялікім пакоі з чатырма вокнамі і абразом Дзевы Марыі на сцяне. Прысутнасць хрысціянскай Маці Божай яго не бянтэжыць – Мрат нават дакрануўся да яе і не згарэў сінім полымем, як мне ўяўлялася.

•

Мрат запытаўся, каму належаць ягады ў лесе. Я адказаў, што ўсе ягады ў лесе належаць Марусі Зайчыкавай. Хто такая Маруся Зайчыкава, ён не перапытваў, бо, пэўна, адчуў, што любы адукаваны чалавек мусіць гэта ведаць, і не хацеў выглядаць невукам.

•

– Напісаў?

– Ну.

– Мо пра Марусю?

– Ага.

– От маладзец! Хадзі сюды, мой галубок, сядай во на чысценькае. Тут чысценька. Не бойся, то я батон ела. Ну?

– Была раніца. Маруся Зайчыкава ішла з кароўніка стомленая.

– Не цвёрда сядзець? На во посцілку пакладзі пад сраку.

– Маруся Зайчыкава ішла з кароўніка стомленая.

– Куды ішла? Посцілку пакладзі пад сраку, кажу.

– Дадому. Ішла яна звыклай сцежкай паўз лес і думала толькі пра адно: пра свае памідоры, якія трэба было пасынкаваць і пападвязваць.

– Дык яна іх у суботу падвязала!

– От. А то ішла яна ў пятніцу.

– Добра, чытай. А пра грамату будзе?

– Будзе. Маруся ўспомніла, што ёй няма чым падвязваць памідоры. Яна пачала ўглядацца ў хмызняк і шукаць вяроўку.

– Няхай бы да мяне прыйшла. У мяне вяроўка е. От Маруся – сама ніколі не папросіць.

– За густымі галінамі акацыі Маруся ўбачыла вялікае яйка. Не проста вялікае, а вялізнае – вышэй за яе рост.

– Што ўбачыла?

– Яйка.

– Якое яйка? Курынае?

– Вышэй за яе рост. Яйка было белае, бы ад куры з інкубатара. Раней гэтага яйка Маруся тут не бачыла, таму сказала: «Цю-ю-ю…»

– Цю-ю-ю… А дзе такое яйка ляжыць? І я ж хачу пабачыць. То як ад кароўніка паўз лес ісці?

– Ага, там. Яна зірнула налева і направа, нікога не ўбачыўшы, высунула руку з торбай наперад, каб не чапляць тварам павуцінне з павукамі і дохлымі мухамі, і палезла ў хмызняк. Зблізу яйка аказалася шчэ большым – туды мог улезці цэлы куратнік. Маруся хоць і верыла ў цуды радыяцыі і пасля Чарнобыля ўсяго пабачыла, але яйка здавалася ёй ужо надзвычай ненатуральным.

– Мо грыб?

– От і Маруся Зайчыкава так падумала. «Мо то грыб?», – сказала яна ўголас і тыкнула яйка ў бок галінкай. Яйка не лопнула, дарма Маруся заплюшчыла вочы. Навобмацак яно было гладзенькае і цвёрдае.

– Давай Валодзю скажам, няхай ён паглядзіць! Той усё ведае. Ён і чорта за лысіну схопіць і скажа, з чаго той зроблены.

– Маруся тыкнула галінай яшчэ раз – раптам яйка засвяцілася і ў ім адчыніліся дзверы. То быў касмічны апарат.

– Ай, цьху ты! Ідзі ты! Я думала, ён што сур'ёзнае напісаў, шчэ і посцілку яму пад сраку дала, а ён – хвантастыку!

– Там далей Маруся Зайчыкава паляціць у космас. Паслухайце! Будзе цікава.

– Усё, не дуры галаву! Ідзі адселя! Я батон ем!

•

Сёння ў публічным месцы ў прысутнасці чатырох сведак паштарка сказала, што я гарований хлопец. Гэта найвялікшы камплімент, якім могуць ушанаваць у вёсцы. Гэта амаль такі самы гонар, як быць злодзеем.

Я так узрадаваўся, што падпісаўся на раёнку.

Іванчык гаворыць:

– Мамо, дзе мне ўзяць курыць?

Я гару:

– Дзі, – кажу, – да Івана. Ён табе дасць п’яць папірос, а яны не дадуць, – кажу.

Не было ў краме ў нас. У мяне і гэты курыць, і той курыць. А я закалебалася акуркі збіраць. Хаджу, хаджу, хаджу, хаджу... А я пайшла, Колю бачыла, ага, дык:

– Прыехала твая дама?

– Не прыехала, – кажа.

За хвранцуза пайшла. Божа! Што мы за такія людзі! Сядзі ты ў Беларусі з беларусамі! І мамка твая адна засталася, Іван, так? Адна? Яна ўжо і будзе адна. Анікова не будзе ўжо. Так і я. Даюць мне мільён – ну і харашо. Спасіба, кажу. От і добра.

Якая-та ў цябе тут бегала дзеўка, лятала? Ну. Яна ж бегла паўз мяне, дык я бачыла. Іванчык у ёй усё параспрашваў. Мой хлопец такі. Шустры – сорак гадоў. А ён ужо адвык ад гэтых жэншчын – ад гэтага ўсяго. І той, большы, адзін цягаецца, плоха з галавой стала.

Я кажу:

– Паеду да сястры, ды давай будам лячыць. Ці будам шаптаць, ці штота рабіць.

Хлопец быў як лялька – спасобны на ўсе: і рыбу спаймае, і грыбоў набярэ. Ета ў мяне такія хлопцы. Варыць умеюць самі – смачней за мяне наварыць.

– Мамо, ета ты не варыла? Ляжала?

– Ляжала, – кажу, – дроў прывезла ўчорай, сынок. Ляжала, – кажу, – баліць нага, хадзіцькі няможна.

– Так мучышся, бедненька.

А брат твой хараша жыве? Добра? Багата дзяцей? Двое? Не п’е? Трохі? Ну, каб не саўсім п’яніца быў. Каб п’яніца быў, хіба б жонка жыла?

Ну а тая дзеўка тут лятала, а Іванчык кажа:

– Мамо, мо мне жаніцца?

Я кажу:

– Перш чым узяць, нада пакарміць.

Яна не будзе картоплю есці. Я не перабіраю. Навару таўчонкі, а калі булёну, налопаюсь. А яны ўсе мяса хочуць. Не, у аўталаўцы е мяса. Я рыбіну капчоную купіла. Кажу:

– Дай мне рыбіну капчоную. Захацела, – кажу, – дай капчоную рыбу. Я ж грошы, – кажу, – палучаю. Мільён! Што мая душа захоча, – кажу. – Я ўжо сваё адгаравала.

От.

А Іванчык кажа:

– Мамо, мо мне жаніцца?

Я кажу:

– Жонку перш нада пакарміць. А чым ты пакорміш? От я хаджу, – кажу, – акуркі для цябе збіраю. Чым ты пакорміш?

Цяпер Лукашэнка ўзяўся. Сільна ўзяўся – не шчадзіць нікога! Хіба ён будзе далей работаць? Будзе? Яго, гавораць, не хочуць, бо сільна ўзяўся. І за маладых узяўся, хто не робіць – па тры мільёны! А божа ж ты мой! А дзе іх узяць? Ідзі ў цюрму. Мой Іванчык спужаўся:

– Мамо, я пайду, буду кусок хлеба свайго зарабляць.

Яго прасілі сторажам. Я кажу:

– Сынок, не йдзі. Гэта трэба мужчына, і добры мужчына. Лучшэй удзень адрабі, – кажу. – Спакойна.

Сорак гадоў. Яны ў мяне абое красівыя. То мо ён ідзе. Агай! Не даждаўся. Не даждаўся. Яна не дасць папірос, кажу. Хадзі, што ты баішся? На, от табе, пабач – акуркі! На.

Паглядае...

Будзеш цяпер гараваць, сынок. Хадзем, мо яна дасць, я папытаюся. А не, дык рассерджуся, буду ругаць! Ты што, сынок, – хай не будуць такімі агаістамі. А жаніцца хочаш – жаніся, сынок. Я мільён палучаю. Хопіць.

Раздзел 12

# Надакучыла мне гэтае вашае вясковае жыццё



•

Бляха! Я забыў падаіць казу!

•

Чытанне фэйсбука падобнае да адзіноты ў пустым пакоі на першым паверсе з гукаізаляцыяй. Калі адчыніць акно, то ўсе гукі, якія ёсць звонку, імгненна напаўняюць пакой. Чалавек крычыць. Грае музыка з машыны Матолькі. Упала і плача дзіця. Хтосьці расказвае пра канец свету і якой рыбай я быў у мінулым жыцці. Здалёк чуваць званы царквы і гук бензапілы. З кавярні пахне дранікамі, сушы і кавай. У «Макдональдсе» граюць на балалайках мядзведзі. Натоўп нясе па вуліцы цяжарную дзеўку раджаць. Яна крычыць: «Не хачу!». А яны ёй: «Нада, не гняві Божаньку!». Дзесьці побач хтосьці выкрыквае: «Жыве Беларусь!», а дворнікі змятаюць жоўтае лісце.

Ля акна збіраюцца людзі і расказваюць пра сябе:

– У мяне сёння дзень народзінаў.

– Мая дачка з'ела кашу.

– Я паэт. От мой верш: «Я лісце жоўтае сухое. Якое ўпала на асфальт. А дворнікі мяне змятаюць. О, фак, фак, фак. О, фак, фак, фак».

А потым я зачыняю акно. Гукі і пахі працягваюць біцца ў галаве – у пустым пакоі на першым паверсе з гукаізаляцыяй. Пасярод пакоя расце яблыня, да якой прывязана каза. Вакол яблыні грабуцца куры.

А ў галаве: тук-тук-тук.

Тук. Тук. Тук.

•

Да чатырох раніцы пісаў тэкст. У восем сплю бы муку прадаўшы.

У шыбу грукае цётка:

– Андрэй! Андрэю!

Надзяваю на сябе штосьці, выходжу ў двор.

У двары амаль зіма, а я не магу – спаць хачу, пазяхаю ўсім тварам. Гляджу на гадзіннік: бляха, шчэ восем ночы!

– Оў, – кажу. – Што вам нада?

– Андрэй, ты што, спіш?

– Ну, сплю.

– Я табе спаць не дам.

– Ага, я ўжо паняў.
– Андрэю, чуеш?
– Што такое?
– А табе не холадна так стаяць? Падштанікі хоць надзеў?
– Калі мне было што надзяваць? Вы ж так крычалі, што я спужаўся.
– Паслухай, што скажу. А яйцы ў цябе е?
Я ажно да самага канца прачнуўся. Нічога сабе пытанне зрання!
– Якія яйцы? Вы, цёця, пра што?
– Пра курыныя. А ты што падумаў?
– Я нічога не падумаў. Колькі нада?
– Пісят будзе?
– Ну будзе. А нашто вам?
– Якое табе дзела? Што ты стаіш і мёрзнеш? Ідзі ў хату.
– Дык яйкі вам даць хочу.
– А то я не знаю, дзе ты свае яйкі хаваеш! Сама вазьму. Ідзі.
– То нашто мяне пабудзілі?
– Хто цябе будзіў? Я? Ідзі спі, не дуры мне галаву. Андрэй, чуеш?
– Што такое?
– А пакецік дай.
– Наце.
– А яйкі тама?
– Ну.
– То прынясі, усё адно ж стаіш тут, нічога не робіш.

•

Я ведаў, я прадчуваў, што калі-небудзь гэта здарыцца, і гэта здарылася сёння: тэлефон упаў у сральню. Я пазваніў яму туды з хатняга нумара – «абанент урэменна недаступный».

Даступный я, даступный! Гэта ў апарата абанента праблемы. Апарат абанента выключан ілі находзіцца ў гаўне.

•

Радзіва «Прудок». Экстраны выпуск навін.

Цяпер у мяне для поўнага шчасця ёсць блохі. Палез я пад падлогу засыпаць прызбу, ну і адчыніў ім дзверы ў мой рай. У пограбе блох разводзяць мышы, і яны там жывуць спакойна, покуль якісьці дурань не пакажа ім свае ногі. Радасныя блохі перабіраюцца жыць бліжэй да ног.

Я ўжо звёў на іх усю кроў, усю сівуху і ўвесь палын, а яны не падыхаюць. П'яныя і абкураныя – шчэ болей шчаслівыя. Заўтра буду рабіць самае страшнае, што бывае ў жыцці бабыля-дармаеда, – генеральную ўборку. Хужэй генеральнай уборкі могуць быць толькі блохі.

•

Пяць гадзін генеральнай уборкі займае чытанне паштовак і раскладанне квітанцый аб уплаце па месяцах.

•

Падмёў падлогу, памыў палыном, зверху пасыпаў соллю, содай, пемалюксам і вапнай. А блохі радасна пазіраюць і кажуць:

– А можна музычку чуць-чуць грамчэй? Паддай джазу, дзядзя!

Заўтра паеду на завод бытавой хіміі і скажу:

– Дзеўкі, дайце мне атамную бомбу. Дайце мне атамную бомбу, дзеўкі, і я ўсё расхерачу.

•

Сёння я памыўся, пагаліўся, надзеў усё белае і паехаў у горад купляць дзіхлафос. Амаль шэптам кажу:

– У вас дзіхлафос ад блх е?

– Ад каго?

– Ад блх, – паўтараю шчэ цішэй.

А цёця-прадаўчыха такая гучна-гучна:

– Ад блох?

Я памяншаюся ў росце і спрабую знікнуць у самім сабе.

– Ніна! – крычыць цёця-прадаўчыха ў падсобку. – Ніна, чуеш? У нас дзіхлафос ад блох е?

– Ад каго?

– АД БЛОХ!

•

Мне кажуць, што маё жыццё – гэта шоу. Гэтыя людзі таксама купляюць дзіхлафосы ад блох. Потым вяртаюцца дадому і расказваюць пра цёцю-прадаўчыху і пра Ніну з падсобкі сваім жонкам і мужам.

А я вяртаюся дадому і не расказваю нікому, бо я жыву адзін.
Таму мне важна пісаць.

•

Прыехаў да мяне сябар з Пеніцы, пайшлі мы да цёткі Дуні.
– Я гэтага хлопца шкадую, – кажа цётка.
То яна мяне шкадуе.
Сябар паслухаў ды стаў пярэчыць:
– А нашто яго шкадаваць? Што ён, убогі які?
Цётка сплюнула на зямлю ды кажа:
– Я яго шкадую, бо ён адзін.
І з гэтым шкадаваннем я сутыкаюся амаль штодня. Ёсць за мной такі грэх: як пагляджу на якую цётку, выклікаю ў яе жаданне даць мне перцаў фаршыраваных.

•

– Андрусік Іванавіч, напішы што-небудзь просценькае. Напішы што-небудзь міленькае.
Харашэ. Як пазбавіцца ад блох.
Трэба сабраць палын у венічак і нібыта месці ім падлогу. Месці ды шаптаць:
– Грабу, грабу, усіх блох выграбу. Скуль прыйшлі, туды йдзіця.
Потым трэба пайсці на скрыжаванне дарог і кінуць венік правай рукой цераз левае плячо. Кінуць ды ціхенька сказаць:
– Хто мне блох наслаў, да тога няхай яны йдуць.
Вяртаемся дадому моўчкі, не азіраемся.
Дома пад абразом запальваем царкоўную свечку. І – херачым дзіхлафосам! Херачым блох дзіхлафосам. Памагае.

•

У мяне ўпаў ноўтбук і разбіўся манітор.
Потым загарэлася праводка, патанула вядро ў студні, абрынулася прызба ў падмосці. Я не кажу пра расколаты лоб і пабітую талерку – то дробязі. Заварыў вядро палыну і ізноў памыў гэтай ядронай гарбаткай падлогу.
Не ведаю, ці дапаможа, але штосьці ж трэба рабіць з усім гэтым.

•

Суровыя палешукі выцягваюць кляшча з пальца пласкагубцамі.

•

У Петрыкаўскім раёне жыве адна баба з вампірскімі вачыма. Як што ў каго возьме, прыстрэт нападзе. Узяла яна ў маёй маці яек – куры пераcталі несціся. Мама прыехала да мяне, паглядзела на маіх курэй, кажа:

– От у цябе куры як куры, а ў мяне абы-што.

Паехала – і мае куры таксама перасталі несціся.

Суседка дала мне малітву ад суроку курэй.

Дваццаць першае стагоддзе, бляха. А я, чалавек з вышэйшай адукацыяй і, можна сказаць, перспектывамі, іду ў куратнік і шаптацьму. Курам. Малітву. Я.

•

– У Прудку, – кажу, – шаптуха е?

– Ну е.

– А вядзьмаркі колісь былі?

– Ну былі.

– Мо і цяперака е?

– Ну е.

– А хто?

– Ну я.

– Як у вас чысценька ў двары!

– А што?

– Не-не, нічога, нічога.

## ЛІПЕНЬ

•

Жук еў, еў – не даеў. Сонца паліла, паліла – не дапаліла. Град біў, біў – не дабіў. Туман жэр, жэр – не дажэр. Цяпер недаедзены, недапалены, недабіты агарод ляжыць у халодных лужах і гніе. Яшчэ адзін такі дзень – і ўваскрэснуць людзі на балоце, пачнуць пракладаць гаць. А я (гараваў, гараваў) плюну на ўсё і сяду пісаць камедыю.

•

У 1920 годзе Прудок быў уцягнуты ў польска-савецкую вайну, і мой прадзед схаваў у пограбе сям'ю габрэяў.

Пакуль яны сядзелі ў пограбе, хтосьці зайшоў у хату. Мой прадзед, кажуць, застрэліў яго. Мо праўда, а мо і хлусня. Але сямейная легенда гучыць так.

З тых часоў у сям'і майго прадзеда з'явіўся трафейны набор з шасці лыжак FRAGET N PLAQUE. Яны зроблены з альпакі і пакрыты срэбрам. Лыжкі былі падзелены між дарослымі членамі сям'і – кожны насіў сваю пры сабе і еў толькі сваёй. Разам з маімі продкамі лыжкі трапілі ў Свярдлоўскую вобласць на медныя руднікі, дзе мае дзяды і бабкі елі імі з металічных місак і частым шкрабаннем зрэзалі ў іх краі.

Апасля прабабка Агапа вярнулася назад і прывезла з сабой дзве лыжкі. Учора тыя дзве лыжкі даехалі і да Прудка.

Я не ведаю, што з імі рабіць. Ці то пакінуць іх у куфары бабы Агапы ў якасці памяці пра людзей, якіх ніколі не бачыў, але з якіх я пайшоў. Або зрабіць адну лыжку «сваёй» – і так працягнуць гэтую сямейную гісторыю, якая пачалася ў 1920 годзе падчас польска-савецкай вайны.

•

Каб даведацца, што габрэяў, якіх хаваў у пограбе мой прадзед, звалі Зэльдай і Ізькам, мне давялося сёння выпіць сто грам самагонкі з інфарматарам. Цяпер, калі на нейкай літаратурнай вечарыне ў Мінску будуць зачытваць успаміны пляменніка Сяргея Палуяна: «У Прудку мне запомніўся дом аднаго яўрэя з дзвюма вялікімі елкамі перад ганкам», я магу смела падняць руку і сказаць:

– То ж Ізькаў дом! А Зэльда шыла!

Усе паглядзяць на мяне і падумаюць, што я разумны. А я падумаю: «Добра, што пляменнік Палуяна толькі пра адну хату напісаў, бо іначай я б спіўся».

•

Радзіва «Прудок». Яшчэ адзін экстраны выпуск навін.

Суседскі конь убіўся ў мой агарод і панадкусваў усе кавуны гатунку «сахарный малыш».

•

Мой прадзед праткнуў віламі суседскага каня за тое, што той еў яго сена. Потым гісторыю трохі перабрахалі. Калі мая маці ішла за майго бацьку, бабы на сяле казалі:

– За кога ты ідзеш, дурная? Яго дзед праткнуў віламі суседа.

Месяц таму суседскі конь патаптаў маю граду з часнаком. Я паправіў граду, але ўсё адно думаю пра гэта.

Цяпер – кавуны.

Мой унутраны прадзед заўсёды помніць, дзе стаяць вілы. Мае ўнутраныя бабы кажуць:

– Тшш, тшш.

•

От дабяруцца да Прудка новыя грошы, а вы ўсе такія стомленыя будзеце ад гэтых фотак, а я такі вазьму і зраблю 100500 сэлфі: гэта я такі трымаю грошы, гэта я такі купляю аўсянку, гэта грошы такія ляжаць, гэта капейкі такія раскіданыя па падлозе, грошы і коцікі, грошы і куры, а гэта я такі даю казу, а ў бідончыку капейкі.

От так от!

•

Разглядаю старыя здымкі, на якіх маё жыццё да Прудка, і нічога не разумею. Дзе каза? Дзе «Наша Ніва»? Дзе абы-што? Як гэты хлопец можа быць мною? Чаму я не помню, як гэта – быць ім?

•

Я хачу, каб у лесе была таемная сцежка ў Мінск. Каб можна было ёю хадзіць да людзей з вышэйшай адукацыяй, якія не пачынаюць размову пытаннем: «У цябе е што?». Каб былі кавярні і праспекты з чыстай пліткай, канцэрты Лявона Вольскага, ГУМы і ЦУМы. Але і каб быў Прудок, хата, куры, каза.

Мабыць, у мяне дзве душы. Мабыць, гэта называецца ўнутраным канфліктам.

Канфлікт прыйшоў да мяне, мы каву заварылі і думаем, як цяпер мяне склеіць.



•

Надакучыла мне гэтае вашае вясковае жыццё!

Пайшоў у краму, кажу:

– Дзеўкі, дайце мне марожку. Я ганарары палучаю – магу купіць усё, што душа пажадае.

Дзеўкі далі мне марожку.

Іду дадому – куры бягуць насустрач, каза мекае, сусед слухае «Тыц-тыц-тыц».

Думаю: «Не, праўда, надакучыла мне гэтае вашае вясковае жыццё».

•

Мыю бідончык, каб даіць казу, і ўспомніў, як вельмі даўно мы здымалі кіно ў Піцеры. На канале Грыбаедава шукалі месца, дзе раненька можна было скінуць заплечнікі і пераапрануцца ў сцэнічныя касцюмы. Знайшлі краму «Белорусские колбасы». Ці нешта такое. «Дыяспара, нашы!» – падумалі мы. Пайшлі – а там узбекі, якія з жывых беларусаў бачылі толькі ваўкавыскую каўбасу. Мы ім беларускія грошы паказваем, а яны пужліва ўсміхаюцца. Нараніцу не пайшлі мы да ўзбекаў, а зрабілі грымёрняй публічную платную сральню, дзе піцерская пенсіянерка-касірка пільна сачыла, каб мы чаго не ўкралі. А што там было красці?

Я быў рэжысёрам і яшчэ меў эпізадычную ролю палюбоўніка Марлен Дзітрых. Мы з фраў хадзілі туды-сюды паміж беларускімі каўбасамі і расійскай сральняй.

От мыю бідончык, каб даіць казу. І думаю, што ўсё гэта таксама было кіном.

•

Дзве двухрублёвыя манеткі дзынкнулі ў пустую ячэйку касавага апарата, і пад радасны рогат прадаўчых у Прудок прыйшла дэнамінацыя, вера ў прагрэс, справядлівасць і магчымасці маленькага чалавека.

•

– Сынок, от што я табе скажу. Паслухай сюды старую цётку. Чуеш?

– Ну.

– Ніколі не хадзі ў талет з манетамі.

– А што такое?
– Не-не, нічога. І яшчэ дай што скажу.
– Ну.
– Калі сёння-заўтра будзеш штоліся купляць у краме, не бяры манеты.
– А што?
– А проста так.
– Ай, ну скажыце.
– Ай, не дуры галаву. Нічога я табе не казала.
– Казалі.
– То ты не дачуў, мабуць.
– Вы што, манеты ў гаўно ўпусцілі?
– Ат, абы-што! Ідзі адселя!

**ЖНІВЕНЬ**

•

Калі я пераехаў у Прудок, мне пісалі, што зімой рай стане пеклам, трэба шмат гараваць, не будзе працы, я памру з голаду і сап'юся. Зіма, праца, грошы, гарэлка і іншыя водаправоды – гэта дробязі. Гэта лёгка і нават цікава. Самае цяжкае ў вясковым жыцці – гэта адсутнасць магчымасці надзяваць маску.

У Мінску я мог бадзяцца па вуліцы – ніхто мяне не ведаў, я не ведаў нікога. Я мог не несці адказнасці за свае ўчынкі і словы. Упаў, напрыклад, а праз дзесяць хвілін людзі, што бачылі гэта, раз'ехаліся на метро, а вакол мяне новыя людзі, і я для іх новы. Можна вечарам пайсці на свінгер-паці ці БДСМ-вечарынку, а нараніцу прадаваць пілюлі і мікстуру ў белым халаце. Можна быць рознымі людзьмі адначасна.

А ў Прудку, дзе б я ні быў, што б я ні рабіў, я ўсё адно Андрусік Іванавіч. Іду ў краму – Андрусік Іванавіч. Купляю прэзерватыў – Андрусік Іванавіч. Харошы і паганы – а ўсё, што я раблю, адразу становіцца мною. Гэта як увесь час глядзецца ў люстэрка.

•

Сёння ў Петрыкаве падыходзіць да мяне старэнькі дзядзечка і кажа:
– Андруха, здароў!
– Дзядзя, вы хто? – пытаюся.
– Я твой аднакласнік Сярожа, – адказвае той і кашляе ў слюняўчык.

Апасля да мяне дакалупваецца гопнік:

– Ты ваабшчэ адкуда ціпа такой?

Я яму:

– А якое табе дзела?

Ён такі:

– Не, ну не абіжайся, брацішка.

Потым сустракаю бабулю ў ружовых кедах. Кеды такія ружовыя, што жывыя ружы побач з імі – убогая сепія.

Я кажу бабулі:

– У вас класныя кеды!

А яна мне:

– Ага, іду памаленьку.

Затым прыехаў лісапедай дзед. Прыехаў і павесіў на лісапеду вялізны замок. Замок такі іржавы, што дзед замыкаў яго пятнаццаць хвілін. Пяць чалавек ляніва пазіралі, як ён вазюкаецца. Калі замкнуў, пайшоў дзед у банк.

– Банк на абедзе, дзед, – сказалі пяць чалавек.

– А каб вас! – сярдзіта адказаў дзед і яшчэ пятнаццаць хвілін адмыкаў той замок.

Пяць чалавек ляніва пазіралі.

Калі дзед адамкнуў замок, адчыніўся і банк.

– А каб вас! – яшчэ раз сказаў дзед.

От такі ён – горад майго дзяцінства.

•

– Сынок, а дзе твая барада?

– Я ж, цётка, узаўтры ў Мінск еду.

– Яйкі зварыў?

– Зварыў.

– Вернешся, я Зайчыкаву пазаву, а ты сядзеш тутака во і раскажаш нам, што цяпер у Мінску робіцца.

– Я і так раскажу. «Анлайнер» замазаў на фатаграфіі бел-чырвона-белы сцяжок, знаёмую аштрафавалі за налепку з беларускім арнаментам на машыне, баявік Іван не абяцае нічога харошага тым, хто размаўляе па-беларуску. Небяспечна, цётка, сёння беларусам быць. А вы хто па нацыянальнасці?

– Не скажу.

•

Пяць гадоў мяне стрыгла Рыта з салона прыгажосці. Стрыгла і не ведала, што я з дзярэўні, думала, што я проста такі мінскі патлаты неахайны дзядзька.

І мне кожны раз было сорамна ісці да яе. Яна рабіла прыгажосць неймаверную на маёй галаве, а я тую прыгажосць не даглядаў і заростаў, бо ў Мінску бываю зрэдку і не кожны раз маю лішнюю хвіліну на цырульню. А цяпер усё, болей не хачу Рыту. Болей не хачу апускаць вочы долу, маўляў, ну так, я пудзіла лясное.

Заўтра буду ў Мінску. Хто з маіх фрэндаў умее трымаць у руках нажніцы ці хаця б сякеру?

•

У Мінск прыязджаю, нібы да бабулі ў вёску. От білборд нахіліўся да зямлі. Пажоўклі фарбы на праспекце Незалежнасці. І шмат майго basaногага лета схавана ў гэтым тумане.

•

– Ну што, сынок, з’ездзіў у Мінск? І як людзі ў тым Мінску – шчаслівыя?

– Розныя. Ходзяць туды-сюды.

– І не сядзіцца ж ім на месцы, пабач ты!

– Некаторым сядзіцца. Я на Карла Маркса хлопца аднаго запомніў. Ён сядзеў у карчме і піва піў. Увесь памыты такі, з барадой, у шортах. Я шчэ падумаў, што я б такім самым быў, каб жыў у Мінску. І не баліць жа яму, што сена можа намокнуць!

– А пра што людзі хоць гавораць? Пра град у Прудку чувацъ што?

– Не, там не ведаюць, што ў нас град быў. Каму мы, цётка, трэба ў тым Мінску? У іх свой клопат. Яны пра сваё і гамоняць. От новы раман Марціновіча чытаюць. «Возера радасці» называецца.

– А ў нас жа возера Крывуля е. Скажы гэтаму пісьменніку, няхай прыязджае і паглядзіць на Крывулю. Там і жабкі, там і кураслеп! Красіва! Няхай прыедзе, паглядзіць і пра наша возера напіша. Скажы, сынок. Людзям трэба падказваць, пра што пісаць. Яны ж усяго не ведаюць.

– Пра Крывулю, цётка, нікому не будзе цікава. Каб напісалі, трэба каб там штоліся здарылася.

– А што там можа здарыцца? Крывуля яна і е Крывуля.

– Мо хто патануў?

– Мо і патануў. Бог яго вед.

– Тады трэба, каб быў якісьці скандал. Эксгібіцыяніст мо лазіў у карчах? Калі з Расіі, то будзе бомба.

– А што то такое?

– То такі дзядзька, які ходзіць і паказвае дзеўкам свае прычындалы.

– Абы-што! У нас тут такога няма. У нас людзі харошыя. Толькі Коля Валодзін можа якой шкоды нарабіць. Але ён па п'яні.

– От таму пра Крывулю і не пішуць. Зараз возера без эксгібіцыяніста – дзела прапашчае.

– А харошае ў Мінску е што?

– Забава новая з'явілася. Трэба хадзіць і шукаць пакемонаў.

– А што то такое?

– Гульня на тэлефоне. Калі ўзяць тэлефон і навесці яго, напрыклад, на ваш хлеў, нібы фатаграфію хочаце зрабіць, а там, значыцца, ён пакемонаў паказвае, дзе яны хаваюцца.

– А хто то? Звер які?

– Ну нешта такое.

– Гэта так бывае, сынок. Вунь Маруся паказвала картачку. Там яны ў двары стаяць – уся сям'я: і Маруся сама, і яе Вова, і сваты. Ага. А за спінай матка Марусіна. Чуеш? А яна памерла летась. А на картцы стаіць за спінай, ага. Бы дым. О як бывае! Маруся пабачыла і ў царкву пайшла, свечку паставіла.

– От так і тыя пакемоны. Мы іх не бачым, а яны ўсюды хаваюцца.

– І што з імі трэба рабіць?

– Я ўжо не помню, цётка. Я сам не гуляў, то мне расказвалі. Штоліся з імі робяць.

– Трэба бацюшку пазваць. Ён ведае, што рабіць. Падкажы людзям, сынок.

– А што ў нас тут было без мяне? Раёнка хоць прыйшла?

– Прыйшла, сынок, прыйшла. Я некралогі пачытала. Ніхто з нашых, дзякуй богу, не памёр.

– Дайце хоць загалоўкі пачытаю.

– Чытай, сынок. Хіба мне шкада.

– «Спасатели в полной боевой готовности», «Учёные помогут аграриям», «Увеличилась рождаемость», «Как уберечь себя от сальмонеллеза». Усё нармальна, цётка. У нас толькі глісты.

Усё астатняе – нармальна.

**ВЕРАСЕНЬ**

•

Сяброўка з Украіны папрасіла мяне напісаць тэкст пра тое, як дабро перамагае зло. І што ўсё будзе добра. І з прыкладамі з Прудка. Паколькі да раніцы ёсць чатыры гадзіны, я маю час нарабіць паскудных спраў, перамагчы іх добрымі ўчынкам і напісаць пра гэта. Можна, напрыклад, пабудзіць Марусю Зайчыкаву і перавесці яе праз дарогу.

Дарагая сяброўка з Украіны! У Прудку ўсё добра. У гаспадарках раёна поўным ходам ідзе нарыхтоўка кармоў і сяўба азімых. Да выбараў дэпутатаў засталося адзінаццаць дзён. А выбары для беларускага народа – вялікае свята, на якое ў нашай краіне прынята хадзіць сем'ямі.

І гэта я пакуль толькі да другой старонкі раёнкі дачытаў.

•

– Андрусік Іванавіч, напішыце пра выбары.

– Добра, без праблем!

Бляха, якія выбары? У нас былі выбары? А што мы выбралі?

Не, я помню партрэт дзядзі з вялікім носам на вакзале ў Каленкавічах. Я чакаў цягніка. Рабіць не было чаго: сасіску ў цесце я ўжо з'еў, новую сторублёўку на плакаце ў каленкавіцкім «Хутка-жудка» разгледзеў, – то я пачаў шукаць арфаграфічныя памылкі ў яго перадвыбарчай праграме. У такіх праграмах адно толькі арфаграфічныя памылкі могуць быць.

У мяне таксама шнобель на твары яшчэ той. Асабліва на фота, якое зрабіў Сяргей Гудзілін. Таму ніякіх прэтэнзій да чыйгосьці носа я не маю. І памылак у дзядзевай праграме я не знайшоў. От усё, што я знаю пра выбары.

Сапраўдны выбар чалавек робіць, калі прачынаецца, глядзіць у акно і думае, што шмат жыцця прайшло і хочацца пачаць жыць лепей. І робіць выбар – з'ехаць з Беларусі. Ці ў суседняй хаце прачынаецца іншы чалавек, таксама глядзіць у вакно на тую самую вуліцу, таксама думае пра жыццё. І таксама робіць выбар – застацца і яшчэ раз паспрабаваць жыць лепей тут.

Я належу да цэлага пакалення людзей – і ў вёсцы, і ў горадзе, – якія стаміліся верыць у абстрактнае. Я-мы прачнуліся, паглядзелі ў акно, убачылі, што шмат жыцця прайшло, і зрабілі свой выбар – будаваць свае маленькія хаткі на ўскрайках вялікіх сусветаў.

Я-мы возім цэглу іржавымі тачкамі на адным коле і просім не прыязджаць да нас з урнамі і разбудзіць, калі выбары скончацца.

•

Найбольш люблю час пасля дзевяці вечара. Усе пакормлены і спяць. Спіць каза Цёця Моця. Спяць каты і куры. Спяць мухі. Спяць багамол Вася і павук Валянцін. Спяць гармоны. Спіць унутраны нерэалізаваны касманаўт. Спіць усё, што днём спаць не дае.

Самае прыемнае пасля дзевяці вечара – ляжаць на канапе на верандзеганку і не спаць.

•

Сёння 28 гадоў, як памерла мая любімая баба Ганна.

Гэта першая смерць, якую я ўбачыў. Я гэтай смерці не збаяўся – сядзеў ноччу ля труны і расказваў бабулі свае гісторыі. А потым заснуў побач з ёй. Бабуля казала, што я вырасту не такім, як усе. Яна вельмі хацела паглядзець, якім – не такім – я вырасту. Але не паспела.

Калі я прыходжу на магілу бабы Ганны, я заўсёды кажу:

– Можа, цяпер я ўжо вырас? От такім вырас я.

І расказваю ёй свае гісторыі, як яна любіла іх слухаць – прыдуманыя ў гэтую хвіліну.

– От шышка ляжыць. Усе шышкі ўпалі з хвоі ўніз. Гэтая шышка вырасла пад зямлёй і ўпала пад хвою ўверх.

•

Начное неба паціху, памаленьку апускаецца на хаткі. У хатках цёткі наварылі вячэру свінням і мужам. Мужы сёрбаюць крышані, слухаюць радзіва. Як раптам на ўсю дзярэўню выбухае:

– Жыве Беларусь!

І гэта крычу не я.

•

Калі вы дачытаеце гэты сказ да кропкі, Зямля праляціць яшчэ сто кіламетраў. Усё, праляцела. Праўда, гэта неверагодна? Рэмарк схапіўся за траву, калі зразумеў гэта.

•

Да мяне цяпер у двор прыйшлаа карова, нешта мне сказала і пайшла ў лес. Я не ведаю, ці нармальна гэта ўсё.

•

– Сынок.
– Оў!
– А чым то ты курэй корміш?
– Кавунамі, дынямі.
– Паслухай мяне сюды. Чуеш?
– Ну.
– Дай мне кавуна, я табе сама яйка знясу.

•

Прыехаў да мяне ў госці Ягор. Сам ён беларус, але вучыцца ў Польшчы, то да яго ў Прудку трохі завялікая ўвага. У Беларусі Ягор размаўляе па-беларуску. Не так, як прудкаўцы, а па-граматнаму.

Летась прадаўчыха любіла яго слухаць. І цяпер не паспелі мы ўвайсці ў лаўку, як яна гучна закрычала:

– Як прыемна вас бачыць!

Гэтым разам Ягор амаль увесь час маўчаў, але яна ўсё адно хваліла яго.

– Мне зубную шчотку, – кажа.

– Ах, як ты хараша гаворыш!

Я з яго потым увесь дзень кпіў.

– Ягор, скажы «стол».

– Стол.

– Як ты хараша гаворыш па-беларуску!

– Ідзі ў сраку, – адказваў Ягор.

•

Цётка Дуня папрасіла мяне кінуць ёй у пограб дымавую шашку, каб прагнаць стуль жукоў. Дазналася, што я не адзін, то запрасіла нас на сняданак. У мяне ў галаве адно было – уцяпліць куратнік. Я даўно толькі пра куратнік і думаю. Але сняданак е сняданак. Вырашыў, што паснедаем хуценька і пойдам з Ягорам працаваць. Не ўсё так проста аказалася.

Калі цётка дастала пляшку, я зразумеў, што хуценька не атрымаецца.

– Шо наліць: самагонку ці віно?

– Не, не трэба. Мы ж не п'ем, – кажу.

– Ай, ідзі ты! Чалавек у гасцях!

Чалавекам быў Ягор. Мне цётка дык толькі адзін раз налівала, калі паміналі маю самагонку.

Але адмовіцца ніяк не можна было. Мы пагадзіліся на сэма.

Покуль смажыліся катлеты да дранікаў, цётка Дуня паставіла на стол парэзаныя памідоры, цыбулю, сала.

«Ну, няхай, – думаю. – Вып'ем хуценька, закусім – і да курэй».

Але недзе праз гадзіну я заўважыў, што мы яшчэ сядзім.

– Андрэю наллю трошкі, бо ён піць не ўмее. Вочы ўжо касыя.

Ну так, вочы ў мяне скаселі яшчэ пасля трэцяй. У Ягора былі не лепшыя.

Пасля чацвёртай я зрабіў спробу ўстаць.

– Куды? Сядзець! Я шчэ дзедавы граматы не паказала.

Граматы Ягор разглядаў неахвотна, але мусіў быў.

– Ты пачытай! Што ты ўжо адкінуў?

– Не-не, я чытаў. Усё пачытаў.

– Ай, што ты там пачытаў! Нічога ты не пачытаў. У мяне дзед майстар на ўсе рукі быў. Вунь у Андруся ці Андрэя – як цябе называць?

– Як хочаце, – сказаў я, а пра сябе падумаў: «Толькі адпусціце вы нас, цёценька!».

– У Андрэя таксама дзед рукасты быў, але – няхай не крыўдзіцца – да майго дзеда яму было далёка. Бачыў у пограбе – як цябе там? Ягор! Бачыў, Ягор, як я дошчачку прыбіла?

– Ну.

– Не, ну ты красівы хлопец, я ж не кажу нічога. Што, праўда дзеўкі няма?

– Ну няма.

– А куды яны глядзяць? Такі хлопец! Як акцёр з кіно! Ты б так прыбіў?

– Што?

– Што, што! Дошчачку!

– Не.

– А я – баба – прыбіла! То ж адмераць трэба, адрэзаць. Гэта навука! Гены! Гэта ўсё гены. Куды? Сядзець! – крыкнула цётка мне.

Але я быў напатпітку, то пачаў сваволіць.

– Нам ужо трэба, цётка – як вас там? Дуня! Куратнік. Тое-сёе. Планы.

– Ай, плюнь і дунь! І ў мяне планы. Я шчэ Ягору ваенны снарад пакажу.

Паглядзелі мы і снарад. «От добра, – думаю, – за стол вяртацца не будзем. Тое-сёе, патопчамся ля ганка, падзякуем дзесяць разоў ды пойдам з богам».

– Куды? А кофа?

•

Запішу я сюды адно слова, каб не забыцца, і пайду спаць.

«Ціхайця!»

Азначае «так, усім маўчаць, пакуль я шукаю ў накладной, колькі каштуе чай».

•

Засунуў я ў лядоўню дваццаць літраў кавуновага соку, а лядоўня ляснула. Сок пачаў брадзіць. То я зліў яго ў бутыль, уставіў трубку і чакаю, калі будзе віно. Я не люблю кавуны і кавуновае віно. Я віно ўвогуле ніякае не люблю. Але люблю маяцца дур'ю.

Я вельмі люблю дур'ю маяцца.

•

Слухайце, няўжо і праўда «дур'ю маяцца» – не беларускі выраз?

Так, у расійскай мове е «дурью маяться», а калі калькаваць, то ў нас мусіла б быць – «дурам мецца». Але – ну як так? І што цяпер? Як цяпер жыць? Чым цяпер «маяцца» без «дур'і»?

## КАСТРЫЧНІК

•

У мяне на верандзе на канапе заўсёды ляжыць якаясьці кніга. Гэтым разам – «Чарнобыльская малітва» Алексіевіч. Я яе даўно прачытаў, яшчэ калі ў школе вучыўся, але мне падабаецца пераклад, які зрабіў Міхась Гіль.

Дык от. Прысеў, чытаю ўрывак: «Зайду на могілкі. Мама там ляжыць... Дачушка малая... вайною ад тыфу згарэла... толькі мы занеслі яе на могілкі, закапалі, як вызірнула з-за хмарак сонейка. І свеціць-свеціць. Хоць ты вярніся ды адкапай. Гаспадар мой там... Федзя... Пасяджу ля ўсіх.

Паўздыхаю. А пагаварыць можна і з жывымі, і з мёртвымі. Мне аніякай розніцы. Я і тых, і другіх чую. Калі ты адна... І калі маркота... Глыбокая маркота...».

І тут прыйшла баба Параска. Села на канапу побач, кажа:

– То я з лесу ішла ды падумала: наведаю я гэтага хлопца, як ён адзін тут жыве. А ў лес прыйшла – там туман-туман кругом. Густы-густы. Хоць ты кладзіся на яго ды ляжы... От пасяджу, пагляджу на цябе ды пайду на могілкі, з хадзяінам сваім пагаманю. Раскажу яму, што грыбоў няма. Што туман у лесе.

•

Мыць сем шкарпэтак – гэта такі тэст на песімізм-аптымізм. Песіміст знервуецца, што адной шкарпэткі не хапае. Аптыміст узрадуецца, што адна шкарпэтка дадатковая.

## ЛІСТАПАД

•

Сёння хадзіў батрачыць. Зарабіў мех кабачкоў, вядро зерня, абед і камплімент «мужык».

•

Цягну па Прудку кабачкі, бачу далёка цётку.

– Цётка! – крычу.

– Оў! Дзе то ты?

– Я тута!

– А, ну. Што табе нада?

– У вас коўдра е?

– Якая коўдра?

– Старая.

– Нашто?

– Курам дзверы ababіць.

– Што курам?

– Дзверы ababіць.

– Чым?

– Коўдрай.



– Якой коўдрай?
– Старой.
– Ну ababi. А што ты ад мяне хочаш?
– Не, нічога.
– Сынок!
– Оў!
– Паслухай мяне сюды.
– Ну.
– Калі ў цябе кавалак коўдры застанецца, мне прынясі: мне нада.

•

Калі мяне пабудзіць ноччу і запытаць:
– Горват, для чаго ты жывеш?
Адразу адкажу, нават думаць не буду:
– Я жыву для сваёй казы.
Прачынаюся і, перш чым ісці да ветру, даю казе паесці. Магу пайсці да сну галодны – каза не можа. Не думаю, ці будзе мне халодна зімой, – абы цёпла было казе. Каза хоча сексу. І я не пра свой секс думаю, а пра казіны. Сёння цягну па Прудку мяшок кабачкоў. Насустрач баба Параска ідзе. А яна ж цікаўная. Ёй жа галоўнае ў жыцці – ведаць, што я нясу.
– Здраствуй, сынок. А што то ты нясеш?
– Грыбы.
– Дурыш.
– Дуру. Кабачкі.
– Казе?
– Казе.
– Ну нясі, нясі. Казе нада.
Нада. Мне нічога не нада. Ні есці, ні да ветру, ні сексу, ні каб цёпла. Абы мая каза была шчаслівая.
Калі мяне пабудзіць ноччу і запытаць:
– Горват, для чаго ты жывеш?
Адразу адкажу, нават думаць не буду:
– Я жыву для сваёй казы.

•

Пайшоў даіць Цёцю, а яе няма. Бляха, думаю, куды падзелася каза з замкнёнага хлява? Вырашыў ужо, што ў мяне слепата курыная – на двух

квадратных метрах не магу ўбачыць вялікую цёплую казу. Пятнаццаць хвілін часаў патыліцу бідончыкам. А Цёця неяк пералезла цераз агароджу ў паўтара метра, за якой ляжыць сена. Пералезла, закапалася глыбока ў ім і схавалася ад зімы, вайны і папулярнасці.

•

Радзіва «Прудок». Ранішняе абы-што.

Сем раніцы. У сенцах вару каву. У мяне там электраплітка стаіць. Чую, як за дзвярыма дыхае жанчына. Не, думаю, не можа быць. У двары цёмна і халодна – не можа там ніхто дыхаць. П'ю каву ў хаце. Праз дзесяць хвілін звоніць цётка.

– Андрэй!

– Оў!

– Ты мне адразу скажы: адзін ці з дзеўкай? Калі з дзеўкай, я заходзіць не буду.

– Якой дзеўкай?

– Ну я ж чую, у цябе нехта гамоніць.

– То радзіва.

– Цьху ты! А я хаджу, хаджу, гляджу ў вокны, ужо шыю скруціла. У цябе ж гэтыя – як іх? – вісяць, нічога не бачна. То адчыняй, бо я змерзла.

Адчыніў. Цётка скідае вялікі салдацкі заплечнік, сядае ля грубы.

– Пабач ты! У цябе і радзіва е.

– Ну, от слухаю.

– Ты не бойся, я толькі на пяць хвілінак. Паўгадзіны пацярпі. Няхай развіднее, бо ў мяне ў хаце цёмна, не хочу шчотчык уключаць.

– Мо чаю наліць?

– Не буду я твой чай. Я табе нешта сказаць хачу.

– Ну, што?

– Выключай сваё радзіва, паслухаеш дзеўку потым, цяпер паслухай мяне.

– Што такое?

– Ты мне от што скажы. За каго б ты галасаваў: за Хілару ці за Трампа?

Я ведаў, я прадчуваў, што не трэба цётку ў горад адпускаць.

•

Сёння з раніцы быў вельмі паганы настрой. Ну, такі стандартны набор рэфлексій бабыля-дармаеда. Пра ўнылае гаўно і ўсё такое.

Потым я павесіў у куратніку навагоднюю гірлянду, уключыў яе. Пятнаццаць хвілін рагатаў, і мяне адпусціла.

•

Паехала мая каза да казла. Гляджу на сябе ў люстэрка і кажу:

– От так выглядае свабодны чалавек, які да серады можа начаваць дзе захоча.

Вы не ўяўляецце, якое гэта багацце – тры дні свабоды. Гэтыя тры дні я, вядома ж, правяду дома. Але з правам налева сядзець дома весялей.

•

Цётка, якой я ўчора адвёз казу, не адказвае на мае званкі. Спачатку не адказвала, а цяпер «абанент урэменна недаступный». Мо таксама тэлефон у сральню ўпаў? Сяджу і накручваю сябе. Уяўляю, як з яе двара пахне шашлыком. Ці што мая Цёця ляжыць у калодзежы і заве мяне з апошніх сілаў. Не, не хачу я такой свабоды.

Свабода – гэта калі ўсе дома.

•

Калі я спускаюся ў пограб, заўсёды ўяўляю, што цяпер вайна, а да мяне ў хату прыйшла хавацца маладая дзеўка з двума дзецьмі. Дзеці галодныя. Большы енчыць:

– Мамо, я есці хочу.

А меншы толькі плача.

Дзеўка дае ім пасмактаць сваю хустку, а я ёй паказую пограб.

– От там у мяне бульба ляжыць. То – унь, бачыш? – то памідоры. Ну, там сок таматны, соус. Варэнне з цукарам. То во цыбуля вісіць.

– Дзядзько?

– Оў.

– А што то за ворах такі?

– То, дзеванька, буракі кармавыя.

– М-м-м, кармавыя... Мае любімыя.

– Каза малако дае. Куры яйкі нясуць. Перазімуем?

– Перазімуем.

І так радасна на душы становіцца, што я хадзяін харошы і ўсю зіму буду карміць уяўную галодную дзеўку з дзецьмі.

•

Хутка паеду забіраць Цёцю. Бляха, мала часу, позна падумаў – не паспею намаляваць плакат: «Ві а глэд ту сі ю эгэйн, Ціёція!». Болей за ўсё па ёй сумуюць куры: іх з Цёцяй падзяляе толькі невысокая перагародка з дзіркамі, у якія можна глядзець курынымі вочкамі на вялікую цёплую казу. Котка паглядае на пусты бідончык. А мне няма з кім размаўляць. Куры... А што куры? Яны дурныя. Я ім толькі «Ціхайця!» кажу і ўвечары: «Ну што, дзеванькі, выключаю святло?». От і ўсе размовы з курамі.

А Цёця – яна такая, ага. Як чалавек, толькі каза.

•

Доўга стаю на прудкаўской пошце. Новая праграма на камп'ютары вісне. Плацяжы не прымаюцца. Чарга маўчыць, каб не чыніць перашкодаў нябачным аперацыям. Наступае палескі дзэн, калі ніхто нікуды не хоча ісці, калі ўсе забываюцца, куды яны прыйшлі і навошта.

За акном рабіна хіліцца да зямлі.

Адна цётка доўга глядзіць на непагадзь і кажа:

– На дварэ зюзя.

Другая дадае:

– То шчэ не зюзя.

– Зюзя.

Камп'ютар вісне. Плацяжы не прымаюцца. А мы стаім і ўглядаемся: зюзя ці не зюзя за вакном.

•

Радзіва «Прудок».
Перадача для тых, хто дапамог гэтай кнізе з'явіцца на свет.
Для маіх сяброў і фрэндаў.
Для Купалаўскага тэатра.
Для газеты «Наша Ніва».
Дзякуй!
Канец эфіру.

•

# Змест


3 **Раздзел 1. Мемуары дворніка**
31 Лахатрон

33 **Раздзел 2. Тут палку кінь – і тая папаўзе**
55 Палескае сафары

57 **Раздзел 3. Сёння я піў самагон**
72 У Шуры ёсць толькі сабака Палкан

75 **Раздзел 4. Мяне не бяруць у касманаўты**
93 Сонейка, хадзем

95 **Раздзел 5. Жыццё – гэта шарлотка белая, шарлотка чорная**
111 Цётка Воля

113 **Раздзел 6. Я – дармаед**
126 Ягор выйшаў з крамы

131 **Раздзел 7. Дзяды**
145 Матка

151 **Раздзел 8. Калі глядзець наперад, можна ўбачыць сваю спіну**
166 Войны скончацца – мы застанемся

171 **Раздзел 9. У Польшчы ёсць усё, акрамя дзедавай хаты**
186 Прашу перадаць мне ва ўласнасць палац

189 **Раздзел 10. Бацька**
197 Цётка Воля, а як пазнаёміліся мае бацькі?

201 **Раздзел 11. Хадзяін**
219 Матка (працяг)

221 **Раздзел 12. Надакучыла мне гэтае вашае вясковае жыццё**

Літаратурна-мастацкае выданне

**Горват** Андрусь Іванавіч

# Радзіва «Прудок»

Дзённік

Рэдактар **Наталля Русецкая**
Карэктар **Ірына Купцэвіч**
Мастак **Ніка Сандрас**
Дызайн і вёрстка **Кацярына Пікірэня, Арцём Міцкевіч**
Фота **Арцём Багаслаўскі, Кацярына Гусева, Андрусь Горват, Яніна Мяцельская, Вольга Бяляева**

Падпісана да друку 17.11.2022. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 14,3. Улік.-выд. арк. 8,4.
Дадатковы наклад 1000 ас. Замова 187962. 16+

Выдавец:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Альфа-кніга».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/480 ад 30.12.2015.
Вул. Смалячкова, 9/1, оф. 318, 220005, Мінск.

Паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/34 ад 23.12.2013.
Вул. Смалячкова, 9/1, оф. 113, 220005, Мінск.



– Сынок, напісаў кнігу?

– Ага.

– От маладзец! Хадзі, мой галубок, сядай во на чысценькае. Тут чысценька. Не бойся, то я батон ела. Пра што кніга?

– Як я спачатку працаваў дворнікам у Купалаўскім тэатры. Потым пераехаў жыць у дзедаву хату ў Прудок.

– То я гэта ведаю! Не цвёрда сядзець? На во посцілку пакладзі пад сраку. А кніга пра што?

– Пра тое, як я жыў у разбуранай хаце, спаў у каморы, а там было плюс восем. Яшчэ як я ішоў па Прудку з малаком, а сабака: «Рррр». А гаспадар яму: «Няможна, свае». А я радаваўся, бо прыемна быць сваім. Гэта кніга пра дзеда Ганушу і ката Рому. Пра жукоў у пграбе, цётку на лісапедзе, калгасную даярку і аўцюкоўскіх дзевак. Пра тое, што ў Мінску людзі ходзяць памытыя і не даюць усунуць у разетку падзарадку ад тэлефона, а ў Прудку размаўляюць так: «Е?» – «Е!».

– Дык у цябе вясёлая кніга?

– І страшная. Там яшчэ пра прудкаўскую чупакабру е.

– Ай, цьху ты! Ідзі ты! Я ж думала, ён што сур'ёзнае напісаў, шчэ і посцілку яму пад сраку дала. Усё, не дуры галаву!

– Ды не, там і пра сур'ёзнае е. Пра адзіноту і пра смерць. Пра блуканні і дарогу дадому.

– Ад мяне чаго хочаш?

– Каб вы кнігу пачыталі.

– Пра Марусю Зайчыкаву будзе?

– Будзе.

– То добра. А цяпер ідзі адселя. Я батон ем.

ISBN 978-985-7272-46-4

БОЛЕЕ 5 ЛЕТ • БОЛЕЕ 11 ТИРАЖЕЙ
BEST SELLER

АНДРУСЬ ГОРВАТ • РАДЗІВА <ПРУДОК>

дзённік